Адказваючы на патрэбы арміі, МГК стварае ўласныя лячэбныя ўстановы. І хаця на працягу ўсёй вайны бальніц у веданні губкама было няшмат, ужо на 1 чэрвеня 1915 г. спіс шпіталяў, якія знаходзіліся ў веданні МГК, налічваў 9 устаноў, агульнай колькасцю 769 ложкаў (усяго па імперыі ў веданні УЗС было 3429 шпіталяў на 170 817 ложкаў). Вылучалі ложкі 3 катэгорый: 1 — для цяжкапараненых (вялікая хірургія), 2 — для лёгкапараненых (малая хірургія), 3 — для тых, хто выздараўлівае, а таксама заразныя. У шпіталях УЗС на тэрыторыі Мінскай губерні ложкаў 3 катэгорыі не было, налічвалася звыш 400 хірургічных ложкаў і звыш 300 — для заразных хворых [52].



На 1 студзеня 1916 г. у веданні камітэта былі два хірургічныя лазарэты, тры патранаты, тры ўрачэбна-назіральныя і два ўрачэбна-харчовыя пункты, зубаўрачэбны камітэт, рэчавы і аптэчны склады. На красавік 1916 г. па Мінскай губерні значыцца ўжо 8 шпіталяў (4 — у Мінску, 1 — у павятовым горадзе, 3 — у пасяленнях) [11, № 37—38, с. 17]. Даныя ГК УЗС дазваляюць прасачыць даволі выразную тэндэнцыю скарачэння колькасці ложкаў у медустановах МГК — ад 842 у канцы 1914 г. [11, № 5, с. 6] да 305 у пачатку 1916 г. [5, с. 5]. З'ява дастаткова натуральная, паколькі з развіццём ваенных дзеянняў паступова мяняюцца і тыя задачы, выкананне якіх браў на сябе УЗС.

Пры пераглядзе франтавой арганізацыі УЗС, выкліканых вылучэннем самастойнага Заходняга фронту, паўстала пытанне эфектыўнасці работы саюза ў раёне дзеючай арміі. На пасяджэнні камітэта ПЗФ УЗС 21 верасня 1915 г. адзначалася, што ў сувязі з адступленнем арміі значна ўскладніліся задачы франтавой земскай арганізацыі. Існуючая сетка ўстаноў не магла справіцца з узрастаючай колькасцю бежанцаў, таму сфера адказнасці франтавога камітэта павінна быць абмежавана, а далейшая дзейнасць франтавой земскай арганізацыі накіравана, галоўным чынам, на задавальненне патрэб непасрэдна арміі, «памятуя, что въ сліяніи съ арміей и въ обслуживаніи всѣхъ ея нужд лежит прямое назначеніе всѣхъ земскихъ на фронтѣ» [24, л. 3 адв.]. Было вырашана прыцягваць да працы па дапамозе бежанцам «мясцовыя земскія сілы» нават там, дзе ўжо меліся ўстановы камітэта СЗФ. 22 верасня 1915 г. замест камітэта Паўночна-Заходняга фронту былі сфарміраваны камітэты УЗС Паўночнага (з цэнтрам у г. Пскоў) і Заходняга (з цэнтрам у г. Мінск) франтоў. За апошнім была замацавана большасць устаноў УЗС рэфармаванага фронту. Структура КЗФ была прадстаўлена ўпраўленнямі, створанымі для адпаведных пяці армейскіх раёнаў і сямі раёнаў прыфрантавой тылавой паласы (Аршанскі, Бабруйскі, Барысаўскі, Гомельскі, Мінскі, Полацкі, Смаленскі) [13, с. 3—4].

Дарэчы, сам губкам не лічыў «неабходным больш шырокі свой удзел у гэтай справе», паколькі ў губерні існавала дастаткова арганізацый па дапамозе бежанцам. Пры гэтым МГК пагаджаўся выступаць у ролі каардынатара для пераадолення «неўзгодненасці дзейнасці ўсіх гэтых арганізацый» [37, л. 54—55]. Аднак паступова на працягу 1916 г. тылавыя раёны, акрамя Аршанскага, перадаюцца ў веданне губернскіх камітэтаў.

Ва ўмовах набліжэння лініі фронту з'яўляліся новыя выклікі для УЗС. Несупынна павялічвалася колькасць бежанцаў — да мая 1916 г. у Мінскай губерні іх налічвалася ўжо каля 120 тыс., і «такая надбаўка прышлага насельніцтва разам з раскватэраванымі па вёсках воінскімі часткамі павялічыла скучанасць насельніцтва, а разам з тым павялічыла і да таго антысанітарны стан … вёсак» [37, л. 6]. МГК галоўнай сваёй мэтай абвясціў «ахову арміі ад заносаў у яе заразных захворванняў з боку мясцовага насельніцтва і бежанцаў». Гэта абумовіла паступовае фарміраванне сеткі ўстаноў, пераважана эпідэміялагічнай

скіраванасці. Характэрна, што структура такіх устаноў зацвярджалася Галоўным начальнікам забеспячэння армій Заходняга фронту [40, л. 95].

Адбывалася павелічэнне маштабу дзейнасці МГК за кошт перадачы яму ўстаноў іншых структур. У пачатку 1917 г. КЗФ паведамляў губернскім уладам аб немагчымасці працягу клопату аб бежанцах у раёне дзеяння 10-й арміі з-за адсутнасці сродкаў. Аднак Мінская губернская нарада па ўладкаванні бежанцаў не хацела браць гэтую справу на сябе і ва ўльтыматыўнай форме запатрабавала ад МГК «паведаміць аб тых распараджэннях, якія будуць зроблены для забеспячэння далейшага лёсу бежанцаў» [30, л. 72]. Не адмаўляючыся ад перадачы, МГК абмежаваўся ўнутрысаюзнымі «перамовамі» з КЗФ, але на ўмовах прыняцця харчпунктаў толькі разам з фінансавым забеспячэннем. Акрамя таго, у 1916—1917 гг. адбывалася перадача МГК устаноў ад Упраўлення галоўнаўпаўнаважанага па ўладкаванні бежанцаў Паўночнага і Заходняга франтоў («Поўначдапамога») [40, л. 95; 15 с. 108]. Губернскі камітэт прыняў размешчаныя ў Бабруйскім, Барысаўскім, Мазырскім, Мінскім і Рэчыцкім паветах харчовыя пункты, бальніцы, амбулаторыі, прытулкі і інш. [43, л. 2]. Перададзеныя ўстановы забяспечвалі харчовым пайком каля 50 тыс. бежанцаў. Урэшце ўдзел МГК у бежанскай справе набыў такія маштабы, што ў жніўні 1917 г. спецыяльная эвакуацыйная камісія вымушана была прызнаць, што губкам УЗС «з’яўляецца арганізацыяй, якая пераважна абслугоўвае бежанцаў і мясцовае насельніцтва, і толькі параўнаўча ў нязначнай частцы абслугоўвае сваімі медыцынскімі ўстановамі непасрэдна армію» [35, л. 13].

Адным з важных напрамкаў дзейнасці УЗС была арганізацыя матэрыяльнага забеспячэння ўласных устаноў (шпіталі, харчпункты і інш.), а таксама дапамога ў пастаўках для арміі. З самага пачатку справа гэта была наладжана праз цэнтральны склад у Маскве, аднак паступова ствараюцца склады і ў губернях. Першым з іх стаў склад у Мінску, адкрыты згодна з пастановай ГК ад 19 верасня 1914 г. У сваім дакладзе па гэтым пытанні старшыня МГК, упаўнаважаны ГК Б. М. Самойленка абгрунтоўваў неабходнасць адкрыцця склада як патрэбамі забеспячэння земскіх лазарэтаў і іншых устаноў, так і выкарыстаннем магчымасці размяшчэння буйнога размеркавальнага пункта бліжэй да лініі фронту. Мінскі склад стаў забяспечваць пастаўкі арганізацыям саюза ў Брэст, Варшаву, Броды, асабліва ў тэрміновых сітуацыях, для цягнікоў саюза, прыпісаных да Беластока. У далейшым падраздзяленне цэнтральнага склада УЗС было адчынена і ў Брэсце, улічваючы транспартную зручнасць і прыдатнасць такога размяшчэння для задавальнення патрэб УЗС у раёне тыла Паўднёва-Заходняга фронту [11, № 11, с. 63—64; № 12—13, с. 34—35].

Аналізуючы колькасны і якасны склад устаноў МГК УЗС, неабходна ўсведамляць некалькі праблем. Па-першае, характар дзейнасці саюза абумовіў тое, што, за выключэннем пачатковага перыяду вайны, сетка ўстаноў адрознівалася заўважным дынамізмам. Па-другое, вельмі недасканалай была методыка ўліку ўстаноў: адны і тыя ж установы маглі быць падлічаны як адна



(лазня; урачэбна-харчовы пункт у Мінску), або як дзве ці нават больш (лазня і лаўка пры лазні; урачэбна-харчовы пункт у Мінску ў складзе сталовай, лазні, прытулку, школы, інтэрнату і інш.). Акрамя таго, дакументы не пазбаўлены адавочных памылак падліку.

Сетка ўстаноў МГК была вельмі нестабільнай — губкам не толькі сам ствараў ці ліквідаваў установы, але і вымушаны быў мець справу са шматлікімі ўстановамі іншых структур. Калі ў першай палове 1916 г. колькасць устаноў МГК складала крыху больш 30 [26, л. 96—96 адв.; 31, л. 206—208], то на пачатак верасня яна ўзрасла да 91 [36, л. 5—6 адв.]. Такая дынаміка можа быць патлумачана асаблівасцямі арганізацыі ўліковай справы ў МГК, аднак на самой справе яна адлюстроўвае завершанасць перадачы ў веданне губкама ўстаноў тылавога характару ад КЗФ. Дарэчы, пытанне аб характары і канкрэтным складзе ўстаноў, якія павінны быць перададзены губкаму, выклікала даволі вострыя дыскусіі: калі кіраўніцтва «Поўначдапамогі» імкнулася перадаць усе свае ўстановы, аддаленыя ад фронту (геаграфічны прынцып), то Б. М. Самойленка адстойваў пазіцыю аб тым, што «неабходна кіравацца характарам устаноў» (функцыянальны прынцып). У выніку быў прыняты варыянт МГК — перадаваліся толькі ўстановы па абслугоўванні бежанцаў незалежна ад месца знаходжання [18, л. 41—53 адв.].

У канцы 1916 — пачатку 1917 г. у МГК склалася даволі разгалінаваная сетка разнастайных па характары і маштабе дзейнасці падведамных устаноў. Дакладную колькасць па названых раней прычынах вызначыць амаль немагчыма, аднак можна казаць аб тым, што ўстаноў было не менш за 65 [31, л. 509; 44, л. 37—40; 30, л. 65—68 адв.]. Цікава, што паводле звестак ГК у гэты ж час усяго сетка ўстаноў УЗС была прадстаўлена 7728 установамі, з іх 4100 — на фронце [59, с. 180].

На пачатак 1917 г. пад кіраўніцтвам Мінскага губкама дзейнічалі такія арганізацыі і ўстановы, як аддзелы, павятовыя камітэты, упраўленне, склады, пральні, харчовыя і ўрачэбна-харчовыя пункты, санітарна-дэзінфекцыйныя і эпідэмічныя атрады, прытулкі, прытулак-школа, школы, бальніцы, лазарэты, зубаўрачэбныя кабінеты, лазні, хлебапякарня, майстэрня, канюшня [30, л. 65—68 адв.]. У камітэце прымаліся спробы правесці сістэматызацыю падведамных устаноў, аднак нейкага канчатковага варыянта так і не было выпрацавана. Групіроўкі ажыццяўляліся ў залежнасці ад таго, для якіх патрэб праводзіліся. Так, установы падзяляліся па накірунках дзейнасці, ступені важнасці, тэрытарыяльным ахопе і іншых прыкметах на: медыцынска-санітарныя, харчовыя, транспартныя, вытворчыя і склады; падлягаючыя і не падлягаючыя эвакуацыі; абслугоўваючыя патрэбы арміі, мясцовага насельніцтва і бежанскія; створаныя губкамам і прынятыя ад іншых структур.

Фінансавыя сродкі УЗС складаліся з некалькіх крыніц: сродкі агульназемскай арганізацыі, узносы і ахвяраванні земстваў, урадавых субсідый. З цягам часу роля першых у агульным аб’ёме сродкаў падала, а апошніх — узрастала.

Так, калі ў жніўні 1914 г. дапамога ўрада склала 1 млн руб. з 4,5 млн агульных паступленняў, то ўжо ў наступным месяцы ўрад выдаткаваў 9 млн з 16,4 млн руб. [11, № 1, с. 43]. Паступовa заўважнай крыніцай сродкаў УЗС робяцца грашовыя і рэчавыя ахвяраванні грамадзян. Спісы ахвярадаўцаў публікаваліся ў афіцыйным выданні галоўнага камітэта УЗС (напрыклад, [11, № 7]).

ГК імкнуўся да таго, каб фінансаванне дзейнасці мясцовых камітэтаў ажыццяўлялася на падставе каштарысаў, аднак распаўсюджанай была і практыка выдаткавання сродкаў па хадайніцтвах на спецыяльныя патрэбы. Што да МГК, то першапачаткова сродкі паступалі непасрэдна ад ГК УЗС, а з прыёмам устаноў КЗФ — праз апошні [40, л. 95 адв.]. Дакументамі за 1916 г. пацвярджаецца паступленне плацяжоў праз дзяржаўнае казначэйства [32, л. 6]. Прадукты, матэрыялы, абсталяванне ўстановы МГК атрымлівалі з ГК (у першае паўгоддзе дзейнасці саюза Мінская губерня атрымала матэрыялаў на суму звыш 500 тыс. руб. і была па гэтым паказчыку трэцяй у імперыі [11, № 12—13, с. 23]), інтэнданцтва, складоў КЗФ. Камітэт меў і іншыя крыніцы паступлення сродкаў. Напрыклад, у справаздачы аб дзейнасці Мінскага губернскага камітэта за I паўгоддзе 1916 г. прыведзены наступныя фінансавыя паказчыкі:

*Табліца 1*

**Паступленні і выдаткі МГК за перыяд з 01.01.1916 па 01.05.1916 [37, л. 51]**

| Найменне артыкула | Сума, руб. |
|---|---|
| Паступленні | |
| Галоўны камітэт | 1 335 000 |
| аднаразовыя дапамогі земстваў | 60 000 |
| ахвяраванні | 7167,81 |
| продаж рэчаў | 2 929 830,97 |
| выпадковыя паступленні | 19 102,45 |
| пераходны астатак | 64 600 |
| **Усяго** | **4 415 701,23** |
| Выдаткі | |
| шпіталі і лазарэты | 280 274,28 |
| харчовыя пункты | 109 942,4 |
| склады | 1 724 908,39 |
| розныя ўстановы камітэта | 2 089 377,42 |
| іншыя ўстановы | 15 049,89 |
| **Усяго** | **4 219 552,38** |

Дастаткова вялікія матэрыяльна-грашовыя абароты стваралі рэальную прастору для неэфектыўнага выкарыстання часткі сродкаў. Невыпадкова ў цыркуляры МГК ад 14.11.1916 канстатавалася «надзвычай неэканомнае вядзенне гаспадаркі …, што можа … падарваць крэдыты камітэта». У сувязі з гэтым МГК звяртаў увагу ўпаўнаважаных і ўсіх устаноў камітэта на неабходнасць збераження сродкаў дзяржаўнага казначэйства [32, л. 6].



За кошт урадавых субсідый маглі быць пакрыты не толькі кошты матэрыяльных паставак для шпіталяў і інш., але і выдаткі па кіраванні на ўзроўні губернскіх і павятовых камітэтаў пры ўмове, што такія выдаткі панесены згодна з вызначанай каштарысам схемай і выкананнем патрабаванняў па справаздачнасці [11, № 14, с. 10—11]. Восенню 1915 г. ваенныя ўлады ўзгаднілі выдаткаванне УЗС сродкаў па гэтым артыкуле крыху больш за 50 000 руб. штомесяц (каля 1200 руб. на губерню) [11, № 26—27, с. 5—7]. Па даных бягучай справаздачнасці УЗС сярэдзіны 1916 г. на ўтрыманне губкама ГК выдаткоўваў 2500 руб. у квартал [5].

Кадравае забеспячэнне МГК развівалася па некалькіх напрамках. У дачыненні да кіруючых органаў асновай фарміравання асабовага складу сталі служачыя земскай арганізацыі, што адпавядала прынятым пры стварэнні саюза рашэнням. Колькасны склад губкама дакладна вызначаны ніколі не быў, можна толькі казаць, што членаў камітэта не павінна было быць менш за 10 чалавек (па колькасці абіраемых гласных; забароны ж на абранне гласным прадстаўніка земскай управы не было). У якасці пэўнай асаблівасці, што выявілася пры фарміраванні мінскага губкама, можна адзначыць уключэнне ў склад камітэта прадстаўнікоў ад горада. Паводле апублікаваных ГК звестках, колькасны склад МГК восенню 1915 і 1916 гг. быў 22 і 21 члены адпаведна. Персанальна склад МГК выглядаў наступным чынам: старшыня — Б. М. Самойленка, таварыш старшыні — С. Б. Хржанстоўскі, члены камітэта — А. М. Авраамаў, М. С. Анціповіч, І. Д. Арскі, М. М. Бурнашаў, Д. К. Вашчынін, К. М. Дземідзецкі-Дземідовіч, кн. І. Э. Друцкі-Любецкі, І. М. Івануха, С. Ф. Карзон, С. А. фон Мораншыльд, Ю. М. Пацехін, кн. А. Г. Радзівіл, С. М. Свяжынскі, І. І. Свянціцкі (толькі на 1915 г.), П. А. Смародскі, Я. М. Трушынскі, І. М. Шамігонаў, прадстаўнікі ад горада — А. І. Лапацін, К. В. Фалькoвіч, В. В. Янчэўскі [7].

Улічваючы, што тэрмін абрання членаў земскай арганізацыі складаў тры гады, а выбары прайшлі ў пачатку 1915 г., то можна казаць, што ў такім складзе МГК і функцыянаваў да пачатку 1918 г. (з улікам, канешне, выбыцця асобных дзеячаў).

Працай і камітэта, і ўправы камітэта кіраваў старшыня. Мінскі губкам ад моманту яго стварэння і да восені 1917 г. узначальваў Б. М. Самойленка (1878—1936). Пасля паспяховага выпуску з Пскоўскага кадэцкага корпуса быў прыняты ў Мікалаеўскае кавалерыйскае вучылішча ў Санкт-Пецярбургу, якое скончыў «па 1-м разрадзе». Удзельнічаў у руска-японскай вайне, за ўдзел у баях (у т. л. на Халхінголе) быў узнагароджаны шэрагам ордэнаў. Пасля звальнення з ваеннай службы ў студзені 1911 г. быў абраны навагрудскім павятовым прадвадзіцелем дваранства. Пачынаючы з 30 жніўня 1911 г. — старшыня Мінскай губернскай земскай управы (пераабраны ў лютым 1915 г.). У жніўні 1914 г. абіраецца старшынёй МГК. У час вайны займаў і шэраг іншых пасад — упаўнаважанага ГК УЗС па Мінскай ваеннай акрузе, члена КЗФ УЗС, старшыні эвакуацыйнай камісіі пры Мінскім ваенна-прамысловым камітэце, галоўнаўпаўнаважана-

га міністэрства земляробства па захаванні і эвакуацыі племяннoй жывёлы, упаўнаважанага па нарыхтоўкам хлеба для патрэб арміі і інш. 4 сакавіка 1917 г. пастановай Часовага ўрада быў прызначаны Мінскім губернскім камісарам «з пакіданнем у іншых пасадах» [23]. Верагодна, у 1917 г. пераехаў у Маскву. Пасля кастрычніка 1917 г. праз Шанхай з'ехаў у ЗША, пасля чаго апынуўся ў Францыі (як, дарэчы, і старшыня КЗФ В. В. Вырубаў, і галоўнаўпаўнаважаны УЗС князь Г. Я. Львоў). Сябраваў з вядомым кампазітарам С. С. Пракоф'евым [49].

Пасля ад'езду з Мінска Б. М. Самойленкі справамі МГК займаўся член губернскай земскай управы Д. К. Вашчынін [19, л. 1; 22, л. 53].

Што тычыцца кадравага забеспячэння падведамных губкаму ўстаноў, то асабовы склад апошніх фарміраваўся самымі рознымі шляхамі. Гэта ўключала і ініцыятыўныя звароты грамадзян з просьбай «прыняць на службу», і размяшчэнне звестак аб вакансіях у друку, і пераводы з іншых устаноў (у т. л. па хадайніцтвах ваенных улад). Існавала і практыка, якую сёння назвалі б кадравым аўтсорсінгам (пэўныя пасады замяшчаліся арцельшчыкамі з Масквы паводле дагавораў паміж УЗС і Гандлёва-прамысловай біржавой арцеллю [27, л. 9—9 адв.]). Склад служачых папаўняўся і пры перадачы МГК ад КЗФ, «Поўначдапамогі» розных устаноў, работнікі якіх афармляліся на працу ў земсаюз (напрыклад, у 1917 г. з прыняццем эпідэмічнага атраду ў м. Ленін Мазырскага павета на службу ў саюз паступае ўрач з адметным прозвішчам Гітлер [38, л. 1, 6—9]).

На працу ў земсаюз мог трапіць не кожны. У арганізацыі існавала практыка вядзення ГК канфідэнцыяльнага спісу «асоб, якія, як дапусціўшыя несумяшчальныя са службовымі абавязкамі праступкі, не могуць быць прыняты на службу» [27, л. 30—31]. Па агульным правіле не падлягалі найму і непаўналетнія. Аднак нарастаючыя цяжкасці з кадравым забеспячэннем устаноў УЗС, што асабліва было заўважна пры найме служачых—мужчын, заканамерна паставілі пытанне аб магчымасці пакідання на службе непаўналетніх (да 17 гадоў). Галоўнакамандуючы арміямі Заходняга фронту ў пачатку 1917 г. у адказ на шматлікія хадайніцтвы даў адпаведны дазвол. Пры паступленні на службу падлеткі абавязаны былі прад'явіць не толькі пасведчанне асобы, але і выдадзенае мясцовай паліцыяй пасведчанне добранадзейнасці (паслабленне «толькі ў выключных выпадках» магло быць зроблена для бежанцаў). Катэгарычна забаранялася прымаць на службу непаўналетніх, якія па месцы жыхарства належалі да акупіраваных тэрыторый [33, л. 46—46 адв.]. Зрэшты, такая падазронасць распаўсюджвалася і на дарослых, нягледзячы на тое што інтэграцыя «ссунутага вайной насельніцтва» паступова робіцца адным з напрамкаў працы УЗС.

Разнастайныя крыніцы дазволілі сфарміраваць даволі значны штат служачых. Па стане на пачатак студзеня 1917 г. персанал МГК і паведамных устаноў налічваў 1194 асобы, з іх 452 — вышэйшых, 742 — ніжэйшых [44, л. 37—40].

Служачыя УЗС як арганізацыі, што працуе на абарону краіны, маглі карыстацца адтэрміноўкамі ад вайсковай службы ці ўвогуле вызваляліся ад



выканання вайсковай павіннасці. Сярод ваеннаабавязаных з ліку служачых УЗС вылучаліся як тыя, хто ні пры якіх умовах не мог разлічваць на адтэрміноўку, так і тыя, хто па хадайніцтве ГК мог яе атрымаць, альбо тыя, хто ўвогуле вызваляўся ад прызыву. Пры гэтым у кастрычніку 1915 г. ГК, даводзячы пазіцыю ваеннага ведамства па пытанні адтэрміновак, у сваім цыркуляры мясцовым камітэтам адзначаў, што «няма ніякіх падстаў разлічваць на захаванне складу іх служачых у поўным аб'ёме». Мясцовыя камітэты павінны былі рыхтаваць спісы для хадайніцтваў аб адтэрміноўках, завяраць іх у мясцовай паліцыі і ў вызначаныя тэрміны прадстаўляць у ГК. Апошні ад свайго імя накіроўваў хадайніцтвы па служачых УЗС у галоўнае ўпраўленне Генеральнага штаба, які і прымаў канчатковае рашэнне — адмовіць у адтэрміноўцы, прадаставіць яе да вызначанага дня ці без пазначэння часу [11, № 26—27, с. 7—13]. Ужо ў снежні 1915 г. парадак прадстаўлення адтэрміновак быў істотна ўдакладнены: пры галоўным упраўленні Генеральнага штаба ствараўся галоўны камітэт і павятовыя (акруговыя, гарадскія) камітэты па справах аб прадстаўленні адтэрміновак ваеннаабавязаным. У склад такіх камітэтаў абавязкова ўключаўся прадстаўнік УЗС, канчатковыя рашэнні прымаліся на мясцовым узроўні [11, № 30—31, с. 4—5; 27, л. 39].

Натуральна, што такая прывілегія прываблівала тых ваеннаабавязаных, якія хацелі пазбегнуць накіравання ў часткі дзеючай арміі і, улічваючы дэзарганізацыю дзяржапарату, стварала шырокія магчымасці для злоўжыванняў. У канцы 1916 г. падчас пазапланавай праверкі ў арганізацыях раёнаў Заходняга фронту было выяўлена звыш 14 тыс. ухілістаў. Каменціруючы яе вынікі, камандуючы арміямі Заходняга фронту адказнасць ускладаў на мясцовыя цывільныя арганізацыі, якія «не прымалі меры да правільнай пастаноўкі справы камплектавання асабовага складу, ставячыся да гэтай справы абыякава і можа быць несвядома выступалі ў ролі ўкрывальнікаў ваеннаабавязаных асоб». Адказным за такое «злачыннае папусціцельства» камандуючы пагражаў прыцягненнем да суду [32, л. 52].

Падобныя прэтэнзіі пазней выказваў і Часовы ўрад: «у земскім і гарадскім саюзах і Земгоры ўдвая больш людзей, чым на ўсім фронце байцоў, паколькі … усяго толькі адна дзясятая частка прызваных у войска, сапраўды састаіць у шэрагах войскаў, дзевяць жа дзясятых — знаходзіцца ў тыле» [59, с. 333].

Статус супрацоўніка ўстаноў УЗС пацвярджаўся адпаведнымі асабістымі дакументамі (пасведчанні, асабовыя карткі, запісныя кніжкі), што выдаваліся арганізацыямі саюза. Кожнаму салдату пры паступленні на службу ў саюз выдавалася запісная кніжка, у якой фіксавалася праходжанне службы, выдача жалавання, абмундзіравання, амуніцыі, зброі, узнагарод. У асабовай картцы адлюстроўваліся даныя аб выплатах служачаму [28, л. 264—273, 342—347].

Паколькі такія дакументы станавіліся фактычным доказам не толькі прыналежнасці да УЗС, але і наяўнасці адтэрміноўкі (ці нават вызвалення) ад ваеннай службы, часта супрацоўнікі імкнуліся не вяртаць іх пры звальненні

альбо пераводзе. Нават дзеючыя вайскоўцы з ліку былых служачых УЗС злоўжывалі пасведчаннямі земсаюза, што засталіся ў іх на руках. Напрыклад, маглі па атрыманні адпачынку «для наведвання тэатра, бані і г. д.» зняць ваенную форму і явіцца ў гасцініцу па наяўных дакументах грамадскай арганізацыі. Такі стан у снежні 1916 г. стаў падставай для выдання спецыяльнага загада Галоўнакамандуючага арміямі Заходняга фронту «Аб адбіранні грамадскімі і прыватнымі арганізацыямі пры пераводах служачых альбо пры звальненні выдадзеных ім асабістых дакументаў» [32, л. 53].

Яшчэ на пачатку вайны для асоб, якія знаходзіліся на службе ў цывільных арганізацыях (і тылавых, і палявых), занятых у абароне дзяржавы і задавальненні ваенных патрэб, была ўведзена агульная для ўсіх, за выключэннем чыгуначнікаў, паходная форма [33, л. 47]. Усе элементы абмундзіравання выраблялiся ў асноўным па вайсковым узоры. Такая напаўваенная форма служыла наглядным сведчаннем прыналежнасці да асоб, якія састаяць на службе дзяржаве «на час дадзенай вайны» [32, л. 47].

Для супрацоўнікаў УЗС прадугледжваліся разнастайныя сацыяльныя гарантыі. Ужо 10 кастрычніка 1914 г. ГК зацвердзіў правілы забеспячэння на выпадак смерці і страты працаздольнасці сем'яў асоб медыцынскага персаналу, які знаходзіцца на службе земскага саюза. Далейшае развіццё дзейнасці УЗС «значна пашырыла кола асоб, якія хаця і не належаць да медыцынскага персаналу, але не менш яго … схільных да рызыцы захворванняў … раненняў ці іншых няшчасных выпадкаў». У сувязі з гэтым 30 чэрвеня 1915 г. згаданыя правілы былі перагледжаны: пашыраныя гарантыі былі распаўсюджаны на ўсіх служачых, за выключэннем ваеннаабавязаных і прыкамандзіраваных вайскоўцаў [11, № 20, с. 14]. У сакавіку 1917 г. ГК увёў дапамогу на пахаванне служачых УЗС з выплатай са сродкаў земсаюза да месячнага акладу, але не меней 100 руб. [11, № 58—60, с. 70].

Сярод грашовых кампенсацый для служачых УЗС вызначаліся «сталовыя», «кватэрныя», «абмундзіровачныя», памер якіх вызначаўся Галоўным камітэтам УЗС. Варта падкрэсліць, што МГК як орган УЗС прыфрантавой губерні карыстаўся асобным штатным раскладам акладаў, меў права самастойна з улікам мясцовых умоў вызначаць памер названых кампенсацый і выдаваць «абмундзіровачныя» ў памеры 10 руб. [33, л. 228—228а]. Для супрацоўнікаў, якія маглі пацвердзіць сапраўднасць патрэбы, прадугледжвалася магчымасць выплаты па рашэнні камітэта «пад'ёмных». Асоба, якая атрымала такую кампенсацыю, павінна была праслужыць не менш шасці месяцаў, а пры больш раннім звальненні — вярнуць усю суму [33, л. 41].

Цяжкасці ваеннага часу вымусілі летам 1917 г. пайсці на адступленні ад важнейшай гарантыі для працоўных — было абмежавана права на атрыманне адпачынку. Згодна з загадам ваеннага міністра А. Ф. Керанскага ўправай МГК 21 чэрвеня 1917 г. была прынята пастанова аб спыненні адпачынкаў служачых на ўвесь час вайны і пераглядзе ўжо прадстаўленых адпачынкаў. Рашэнне было



выклікана не толькі ўзрастаючым «кадравым голадам», але і істотнымі фінансавымі выдаткамі на замяшчэнне масава адсутных супрацоўнікаў [34, л. 85].

Вайна выклікала імклівае абясцэньванне грошай, таму каб неяк абараніць свае кадры, УЗС выкарыстоўваў індэксацыі і надбаўкі. Так, 16 кастрычніка 1917 г. на пасяджэнні ўправы МГК было прынята рашэнне аб устанаўленні працэнтных надбавак «на дарагоўлю» да акладаў усіх супрацоўнікаў МГК у памеры ад 100% да 25% [34, л. 92].

Прадугледжваліся асаблівасці аплаты працы ў МГК сумяшчальнікаў. Памер дадатковага ўзнагароджвання для іх абмяжоўваўся і вызначаўся з такім разлікам, каб агульная сума заробку не перавышала вызначанага штатным раскладам памеру [33, л. 41].

Асобы, занятыя ў земсаюзе ў раёне дзеючай арміі, маглі быць прадстаўлены да ўзнагароджвання з захаваннем патрабаванняў, вызначаных як імперскім заканадаўствам, так і актамі Расійскай арганізацыі Чырвонага крыжа [11, № 10, с. 5].

Дастаткова дэталёвую рэгламентацыю на ўзроўні УЗС атрымлівалі пытанні справаводства. Напрыклад, цыркуляр ГК ад 8 снежня 1915 г. № 13550 канстатаваў шматлікія парушэнні ў вырабе і выкарыстанні пячатак установамі УЗС і ўзмацняў адпаведныя патрабаванні, вызначаныя яшчэ ў красавіку 1915 г.: прадпісвалася форма пячаткі з пазначэннем наймення і падначаленасці ўстановы, ускладалася персанальная адказнасць за захоўванне і прыкладанне пячатак, забаранялася выкарыстанне пячатак для прыватнай карэспандэнцыі [11, № 28—29, с. 9—10].

Цыркулярам ГК ад 3 студзеня 1916 г. № 1 прадпісвалася адрасаваць карэспандэнцыю на канкрэтны аддзел, а ў адказах абавязкова пазначаць спасылку на ўваходны дакумент [11, № 30—31, с. 7].

На самым пачатку дзейнасці УЗС былі вырашаны пытанні арганізацыі фінансавага ўліку і справаздачнасці. У структуры ГК нават быў створаны спецыяльны кантрольны аддзел, неабходнасць якога абгрунтоўвалася «выключнымі памерамі аперацый земскага саюза» [11, № 4, с. 22].

Губернскія і павятовыя камітэты УЗС былі абавязаны складаць штомесячныя кароткія папярэднія справаздачы з указаннем крыніц даходу і артыкулаў выдаткаў па вызначанай схеме. Пасля атрымання звестак ад павятовых камітэтаў (да 10-га кожнага месяца), губкам абагульняў іх і разам з уласнай справаздачай павінен быў накіраваць у ГК (да 20-га кожнага месяца). Стымулам для трымання выканаўчай дысцыпліны была ўмова выдаткавання авансаў на наступныя месяцы толькі пасля прадстаўлення справаздач за папярэднія. Кіраўніцтва УЗС чакала, што вайна не будзе занадта працяглай: у правілах былі падрабязна ўрэгуляваны складанне, праверка і зацвярджэнне выніковай справаздачы «па заканчэнні кампаніі». Аператыўныя звесткі аб фінансавым баку дзейнасці УЗС падлягалі апублікаванню ў ІГК [11, № 4, с. 22—23]. Акрамя правілаў у дапамо-

гу мясцовым камітэтам, кантрольны аддзел падрыхтаваў метадычныя рэкамендацыі па вядзенні бягучага ўліку [11, № 14, с. 11—12].

У межах цэнтралізацыі кіравання на пачатку 1917 г. вядзенне ўліку па падаходным падатку ўсіх служачых УЗС засяроджваецца ў спецыяльна створаным падраздзяленні ГК у Маскве [34, л. 71].

Асобным напрамкам працы апарату было дакументаванне кадравай работы. Пры прыняцці на працу ў саюз заводзілася апытальная картка. Яе форма была ўніфікавана, аб чым сведчыла выкарыстанне тыпаграфскага бланка. У дадзеным дакуменце адлюстроўваўся «працоўны шлях» служачага, уключаючы род заняткаў да паступлення ў саюз [28, л. 350—350 адв.].

Для арганізацыі цэнтралізаванага ўліку супрацоўнікаў увосень 1916 г. у МГК быў створаны аддзел асабовага складу. На падраздзяленне ўскладалася вядзенне алфавіту служачых і асабовых спраў, выдача асабовых картак, камандзіровачных пасведчанняў і г. д. Усе ўпаўнаважаныя былі абавязаны пастаянна паведамляць у аддзел асабовага складу аб усіх кадравых зменах. Выдача заробку служачым магла праводзіцца толькі пасля зверкі спісаў супрацоўнікаў [34, л. 14—15].

У студзені 1917 г. пастановай управы МГК быў вызначаны парадак камандзіравання і аплаты адпаведных выдаткаў. Падставай для камандзіравання маглі быць распараджэнні МГК альбо заг. пунктам пры ўмове прызнання камандзіроўкі законнай губкамам. Памер камандзіровачных залежаў ад велічыні заробку супрацоўніка і вагаўся ад 2 да 5 руб. за дзень. Пры паездцы ў «буйныя гарады», да ліку якіх, акрамя Петраграда і Масквы, аднеслі Смаленск, выплаты маглі павялічвацца да 7 руб. Цікава, што адзначаным дакументам быў устаноўлены і абавязковы час працы ўсіх аддзелаў камітэта: з 10.00 да 16.00 і з 19.00 да 21.00 гадзін штодзённа, а па нядзелях — з 12.00 да 14.00 гадзін [33, л. 41 адв.—42].

Пры ўсіх намаганнях зрабіць работу апарату УЗС рацыянальнай, сістэме працы земсаюза былі ўласцівы «радавыя недахопы» цэнтралізацыі ў дзейнасці дзяржаўнага апарату, якія выклікалі шэраг недарэчнасцей у паўсядзённай рабоце. Загадчык урачэбна-санітарнага аддзела МГК урач У. І. Марзон на пасяджэнні ўправы МГК 8 мая 1917 г. апісваў іх наступным чынам: «… першая падстава для недарэчнасцей — псіхалагічная — адсутнасць жывой сувязі будуе сцяну адчужэння і недаверу, другая — маруднасць ажыццяўлення просьб з-за папярова-бюракратычнага вядзення спраў — нервуе персанал … і вядзе на шлях незадаволенасці ў адрас камітэта» [33, л. 96]. Разам з крытыкай У. І. Марзон выказваў меркаванне аб неабходнасці рэарганізацыі кіравання медыцынскай справай у камітэце па ўзоры Камітэта Заходняга фронту з уключэннем у склад медбюро трох урачоў (з падзелам сфер адказнасці). Дадзеная прапанова знайшла поўную падтрымку ўправы МГК [33, л. 96—97 адв]. У 1917 г. былі праведзены і іншыя арганізацыйныя пераўтварэнні ў самім камітэце (адкрыццё бежанскага і канцылярскага аддзелаў, заснаванне школьнага аддзела) [33, л. 154].



У кастрычніку 1917 г. у Мінск паступае выкліканае цяжкім фінансавым станам дзяржавы ўказанне Галоўнага камітэта УЗС па скарачэнні сеткі ўстаноў саюза. Кіраўніцтва МГК імкнулася падыйсці да выканання пастаўленай задачы максімальна прадумана, выключаючы механічнае скарачэнне лячэбных установ. Апошнія ліквідаваліся толькі тады, калі на адпаведнай тэрыторыі прысутнічалі медыцынскія арганізацыі мясцовага самакіравання. Калі ж установа УЗС функцыянальна дапаўняла сетку цывільнага медзабеспячэння, то яе імкнуліся захаваць, скарачаючы пры гэтым іх штаты да ўзроўню рэгулярнага шпіталя ці ўрачэбнага пункта [40, л. 95 адв.]. Акрамя таго, МГК прадугледзеў дастаткова мяккія ўмовы для супрацоўнікаў: звальняемым за скарачэннем штатаў альбо з-за ліквідацыі ўстаноў, без месячнага папярэджання павінна было выдавацца ўтрыманне за месяц наперад і, звыш таго, пазаштатнае ўзнагароджванне [36, л. 16].

Да пачатку 1918 г. фінансавае і рэчавае забеспячэнне МГК з вызначаных крыніц фактычна спынілася. Хаця каштарысы ўправай камітэта прадстаўляліся своечасова, сродкі па іх не паступалі з другой паловы 1917 г. Па стане на 1 студзеня 1918 г. камітэт недаатрымаў каля 3,2 млн руб. Катастрафічны недахоп сродкаў вёў да таго, што бежанцы ўжо з ліпеня 1917 г. не атрымлівалі датацый на жыллё і вопратку. Выдача пайкоў працягвалася да 1 кастрычніка [40, л. 53], але выключна таму, што мясцовыя пастаўшчыкі пагаджаліся выдзяляць харчы ў крэдыт. Не хапала грошай і на выплаты супрацоўнікам. Так, звальняемым у сувязі з ліквідацыяй устаноў работнікам палова кампенсацыі выдавалася ў форме даўгавых распісак. Тым жа, хто захаваў працу, з лістапада (некаторым супрацоўнікам — ужо з кастрычніка) 1917 г. заробак не плаціўся [40, л. 95 адв.].

У канцы снежня 1917 г. СНК Савецкай Расіі прымае дэкрэт «Аб рэарганізацыі Усерасійскага земскага саюза дапамогі хворым і параненым воінам», які абвяшчаў усе прадпрыемствы і ўстановы УЗС «уласнасцю Расійскай Рэспублікі». Дакумент цалкам мяняў склад ГК і даручаў апошняму «распрацаваць пытанне аб ліквідацыі» саюза [46].

Спыненне дзейнасці МГК УЗС не было ні імгненным, ні нават хуткім. XI надзвычайны Мінскі губернскі земскі сход 12 студзеня 1918 г. прыняў рашэнне аб перадачы функцый МГК губернскай земскай управе і ўскладанні на членаў апошняй абавязкаў членаў губкама. Аднак фактычна справамі камітэта з членаў управы займаўся толькі Д. Л. Вашчынін [19, л. 1—1 адв.].

19 студзеня 1918 г. у МГК атрымліваюць заснаванае на «прапанове» Прыёмачна-ліквідацыйнай камісіі грамадскіх арганізацый Заходняга фронту прадпісанне неадкладна распрацаваць план ліквідацыі ўстаноў камітэта.

Апынуўшыся ў надзвычай складаным становішчы, не маючы фактычна ніякіх сродкаў (23 студзеня засталося толькі крыху больш за 8 тыс. руб.) не толькі на аплату рахункаў падведамных устаноў, забеспячэнне бежанцаў, але і нават на заробкі членам управы, кіраўніцтва МГК, тым не менш, не прыпыняла дзейнасці, нават маючы на руках указанне аб ліквідацыі. Усведамляючы сваю

адказнасць за давераную справу, у першую чаргу — за папярэджанне эпідэмій і медыцынскае абслугоўванне, камітэт звяртаецца з просьбай аб фінансавай падтрымцы да СНК Заходняй вобласці і фронту. На падтрыманне медыцынскіх устаноў і выдачу харчпайкоў бежанцам запытвалася 1,5 млн руб. [40, л. 96].

На пасяджэнні ўправы МГК УЗС 30 студзеня 1918 г. было прынята рашэнне аб парадку перадачы ўстаноў камітэту. Так, майстэрні (за выключэннем пераплётнай, якая перадавалася бежанскаму выканкаму, і шавецкай, якая ліквідавалася), гаражы і лячэбныя ўстановы падлягалі перадачы ў Дээвакуацыйны камітэт, аптэчны склад — Рэчыцкаму земству ў вяртанне пазыкі, а харчовыя пункты, прытулкі і рэчавы склад— у Бежанскі выканаўчы камітэт Мінскага губернскага Савета сялянскіх дэпутатаў [41, л. 1; 39, л. 37]. Склад, дарэчы, нават праз месяц пасля рашэння аб яго перадачы быў далёка не пусты — там было тавараў на 65746 руб. (верагодна не паспелі распрадаць усе кашулі і кальсоны, бо іх засталося на 46,5 тыс. руб.) — не так мала ў параўнанні з 8 тыс. руб. у касе [42, л. 145].

Цікава, што ўжо 8 лютага 1918 г. земская ўправа цалкам перагледзела папярэдняе рашэнне МГК: усю маёмасць УЗС на тэрыторыі Мінскай губерні прыняць ва ўласнасць земства, а распачатую яе перадачу бежанскім арганізацыям прыпыніць. Пры гэтым прымаць якія-небудзь абавязацельствы ў дачыненні да служачых земсаюза ўправа не стала [19, л. 13 адв.].

Ліквідацыя аднаго з асноўных аддзелаў — бежанскага — прадугледжвалася з 1 сакавіка 1918 г., але нават на пачатку сакавіка то ў перапісцы пазначалася, што «адбываецца ліквідацыя ўстаноў Мінскага губернскага камітэта» [45, л. 25, 31], то губкам узгадваўся як «аддзел губернскай земскай управы па аказанні дапамогі насельніцтву» [19, л. 22 адв.]. Пазней (красавік—чэрвень 1918 г.) у складзе земскай управы функцыянуе аддзел (калегія) па ліквідацыі ўстаноў і маёмасцей УЗС [20, л. 40 адв.]. Цяжка дакладна вызначыць, калі была завершана ліквідацыя МГК: 20 мая 1918 г. земская ўправа стварыла кантрольна-рэвізійную камісію па справах, звязаных з ліквідацыяй устаноў і маёмасці УЗС [20, л. 42], аднак 24 жніўня 1918 г., разглядаючы пытанне «аб скарачэнні штата служачых ГК УЗС», тая ж управа зацвердзіла штат МГК у колькасці шасці чалавек [21, л. 114]. Але і гэта быў яшчэ не канец: 5 лістапада 1918 г. управа, адзначаючы «крытычны фінансавы стан», пайшла на яшчэ больш жорсткія меры і скараціла колькасць занятых справамі «былога МГК» супрацоўнікаў да чатырох і «перасяліла» яго з Архіерэйскага дома ў памяшканне ўправы. Заведванне справамі былога губкама было ўскладзена на «калегію па ліквідацыі б. Кам. ЗФ. УЗС» [22, л. 53—53 адв.].

Падагульняючы, варта адзначыць, што калі ніжнюю храналагічную мяжу дзейнасці МГК вызначыць нескладана — ён быў створаны ў жніўні 1914 г. па рашэнні Мінскага губернскага земскага сходу, то адказаць на пытанне, калі МГК спыніў існаванне не так проста. Можна сцвярджаць толькі, што актыўнасць губкама запаволілася з восені 1917 г., а расфарміраванне



ўстаноў было завершана не раней жніўня 1918 г. У юрыдычных адносінах ліквідацыя МГК завершана не была.

Сетка ўстаноў МГК не адрознівалася ўстойлівасцю. Калі на самым пачатку вайны было ўсяго шэсць устаноў, у пачатку 1916 г. — крыху больш за 30, восенню 1916 г. каля 90, а ў разгар зімы 1917 г. — не менш 65 з агульным штатам персаналу ў 1,2 тыс. чалавек. На служачых МГК была распаўсюджана сістэма сацыяльных гарантый, асабліва заўважная для ваеннага часу.

Прыфрантавое палажэнне Мінскай губерні ў значнай ступені абумовіла характэрныя напрамкі дзейнасці губкама, значэнне «дапамогі хворым і параненым воінам» у якой даволі хутка аслабла, а сам камітэт засяродзіўся на бежанскай справе, супрацьэпідэміялагічных мерапрыемствах і задавальненні разнастайных патрэб арміі. Да ліку асаблівасцей у дзейнасці МГК неабходна аднесці і заўважную неадмежаванасць яго кампетэнцыі ад кампетэнцыі іншых дзяржаўных і грамадскіх устаноў, хіба не ў першую чаргу, ад іншай структуры УЗС — Камітэта Заходняга фронту. Важным з'яўляецца і тое, што калі дзейнасць цэнтральных органаў земсаюза ў нямалай ступені звязваюць з удзелам у палітычнай барацьбе, то на ўзроўні губернскім такая скіраванасць не прасочваецца — у дзеячаў МГК на «высвятленне адносін» з дзяржаўнай адміністрацыяй проста не было часу.

Хаця прававое палажэнне МГК (як і ўсяго УЗС) працяглы час было даволі няпэўным, паводле паходжання і формы гэта была арганізацыя грамадская, паўстаўшая на падмурку земскага самакіравання. Паводле фактычнага характару ж дзейнасці, парадку і формах арганізацыі і ўнутранай рэгламентаванасці работы МГК выявіў сябе як у значнай ступені ўстанова дзяржаўная. У час, калі публічная адміністрацыя выявіла сваю няздольнасць выконваць важнейшыя дзяржаўныя задачы, менавіта ініцыятыва дзеячаў самакіравання і простых людзей (падтрыманая, праўда, дзяржаўным рублём) забяспечыла для арміі і насельніцтва пэўную «амартызацыю» цяжару вайны.

Як трапна адзначаў у верасні 1916 г. журналіст «New York Times», «расійскае грамадства праз свае сацыяльныя арганізацыі робіць тую ж працу, што і ўрады Англіі ці Францыі. Што яшчэ больш экстраардынарна, гэта тое, што недасведчаная маладая расійская дэмакратыя дасягнула столькі ж, калі не болей, чым высокацывілізаваныя і дасведчаныя французскі і англійскі ўрады» [60].

### Крыніцы і літаратура

1. Ассигнования губернских и уездных земств на нужды, вызванные войной / Ред. «Известий глав. ком. Всерос. земского союза». — М., 1916. — V. 63. 215 с.
2. Баженова, К. Е. Деятельность организаций Всероссийского земского союза и Всероссийского союза городов на Среднем Урале в годы Первой мировой войны (1914 — февраль 1917): автореф. дис. … канд. ист. наук: 07.00.02 / К. Е. Баженова; ГОУ Нижнетагильская гос. соц.-пед. акад. — Нижний Тагил, 2010.
3. Василенко, В. В. Изучение деятельности Всероссийского земского и городского союзов в российской и белорусской исторической науке / В. В. Василенко // Рома-

новские чтения — 7: сб. статей Междунар. науч. конф. / под общ. ред. А. А. Воробьева. — Могилев: УО «МГУ им. А. А. Кулешова», 2011. — С. 58—59.
4. Василенко, В. В. Организация и деятельность Могилевского губернского комитета Всероссийского земского союза (август 1914 — декабрь 1916 г.) / В. В. Василенко // Веснік Магілёўскага дзярж. ун-та імя А. А. Куляшова. Сер. А. Гуманітарныя навукі. — 2013. — № 1. — С. 26—32.
5. Ведомость № 6 расходов по содержанию учреждений Всероссийского земского союза помощи больным и раненым воинам (на срок до 1-го июня 1916 года) / Главный комитет Всероссийского земского союза. — М.: тип. т-ва Рябушинских, 1916. — 119 стр. 4 л. прилож.
6. Вестник Комитета Западного фронта Всероссийского земского союза: отдел службы связи / ред.: И. В. Ильинский. — Минск, 1916—1917.
7. Всероссийский земский союз. Личный состав учреждений Всероссийского земского союза / Всероссийский земский союз. — М., 1915—1916.
8. Дякин, В. С. Русская буржуазия и царизм в годы первой мировой войны (1914—1917) / В. С. Дякин. — Л.: Наука, 1967. — 363 с.
9. Ерошкин, Н. П. История государственных учреждений дореволюционной России: [Научно-педагогические труды]. 5-е изд., доп. / Н. П. Ерошкин; под ред. А. Е. Иванова, А. Д. Степанского. — М.: РГГУ, 2008. — 710 с.
10. Игнатенко, И. М. Февральская буржуазно-демократическая революция в Белоруссии / И. М. Игнатенко. — М.: Наука и техника, 1986. — 344 с.
11. Известия Главного комитета / редкол.: Г. Е. Львов (гл. ред) [и др.]. — М.: Главный комитет Всероссийского земского союза помощи больным и раненым воинам, 1914—1917. — №№ 1—60.
12. Загряцков, М. Д. Всероссийский земский союз (Общие принципы организации и юридическая природа) / М. Д. Загряцков. — Пг., 1915. — 29 с.
13. Краткий обзор деятельности Всероссийскаго земскаго союза на Западном фронте, 1915—1917 гг. / Ком. Западнаго фронта Всероссийскаго земскаго союза. — М: [б. и.], 1918.— 228 с.
14. Лаверычев, В. Я. По ту сторону баррикад: Из истории борьбы московской буржуазии с революцией / В. Я. Лаверычев. — М.: Мысль, 1976. — 288 с.
15. Лапановіч, С. Ф. Дзейнасць дзяржаўных і грамадскіх арганізацый па аказанні дапамогі бежанцам у Беларусі ў гады Першай сусветнай вайны (1914 — кастрычнік 1917 г.) / С. Ф. Лапановіч; М-ва ўнутр. спраў Рэс. Беларусь; установа адукацыі «Акадэмія М-ва ўнутр. спраў Рэс. Беларусь». — Мінск: Акад. МУС, 2010. — 127 с.
16. Минская губерния: государственные, религиозные и общественные учреждения (1793—1917) / сост. Т. Е. Леонтьева. — Минск: БелНИИДАД, 2006. — 392 с.
17. НГАБ. — Ф. 325. — Воп. 1. — Спр. 710. Материалы IV чрезвычайного минского земского собрания (доклады уездных земских собраний, положение о губернском земском союзе, списки лиц, прибывших на заседание).
18. Там жа. — Спр. 943. Журнал VIII чрезвычайного минского губернского земского собрания. Заседание 28.09.1916.
19. Там жа. — Спр. 1088. Журналы заседаний Минской губернской земской управы за январь—март 1918 г.
20. Там жа. — Спр. 1089. Журналы заседаний Минской губернской земской управы за апрель—июнь 1918 г.



21. Там жа. — Спр. 1090. Журналы заседаний Минской губернской земской управы 12.07.1918—31.08.1918.
22. Там жа. — Спр. 1091. Журналы заседаний Минской губернской земской управы за октябрь—декабрь месяцы 1918 г.
23. Там жа. — Спр. 1330. Личное дело Бориса Николаевича Самойленко.
24. Там жа — Ф. 700. — Воп. 3. — Спр. 8. Протоколы заседания от 15 октября 1915 г.
25. Там жа. — Воп. 2. — Спр. 2. Постановления Временного правительства, циркуляры Всероссийского земского союза о создании комитета и протоколы заседания комитета.
26. Там жа. — Воп. 1. — Спр. 4. Переписка с центральным вещевым складом Минского губернского комитета ВЗС по вопросам материальных заготовок.
27. Там жа. — Спр. 7. Переписка по личному составу.
28. Там жа. — Спр. 8. Списки служащих солдат, прикомандированных в Минский Губернский комитет ВЗС.
29. Там жа. — Спр. 28. Циркуляры Главного комитета ВЗС. Сведения о приютах, находящихся в ведении губернского комитета ВЗС.
30. Там жа. — Спр. 41. Переписка с Главным комитетом, врачебно-питательными пунктами и др. Об оказании медицинской и продовольственной помощи беженцам. Списки лечебных учреждений ВЗС.
31. Там жа. — Спр. 42. Список учреждений Минского Губернского Земского Комитета ВЗС, содержащихся на средства, отпущенные на помощь беженцам с целью охранить армию от заноса в нее заразных заболеваний.
32. Там жа. — Спр. 130. Циркуляры Минского губернского комитета ВЗС и контрольного отдела о ведении отчетности, взимании гербового сбора и др. Приказы по Минскому военному округу.
33. Там жа. — Спр. 137. Приказы по военному ведомству, переписка и списки личного состава.
34. Там жа. — Спр. 138. Циркуляры и выписки из протоколов заседаний Управы комитета о личном составе.
35. Там жа. — Спр. 159. Протоколы заседаний управы и общих собраний служащих губернского комитета.
36. Там жа. — Спр. 164. Выписки из журналов заседаний управы комитета.
37. Там жа. — Спр. 166. Отчет о деятельности Минского губернского комитета за I-е полугодие 1916 г. Сведения о населенных пунктах Минской губернии для оказания медицинской помощи, об обследовании населенных пунктов, о движении заразных болезней и др.
38. Там жа. — Спр. 219. Эпидемический отряд в м. Ленин Мозырьского уезда.
39. Там жа. — Спр. 226. Постановления управы МГК ВЗС.
40. Там жа. — Спр. 242. Докладная записка губернского комитета ВЗС о работе за период 1914—1918 гг. Переписка с Минским губернским беженским исполнительным комитетом о снабжении беженцев продпайком.
41. Там жа. — Спр. 359. Выписка из журнала заседания Управы о порядке передачи учреждений.
42. Там жа. — Спр. 360. Выписка из журнала заседаний Управы комитета. Список санитаров Центрального вещевого склада.
43. Там жа. — Спр. 364. Сведения об учреждениях, принятых от Североромощи.
44. Там жа. — Спр. 373. Список учреждений и обслуживающего персонала, находящихся в распоряжении Минского губернского комитета ВЗС.

45. Там жа. — Спр. 384. Протоколы общего собрания служащих, о выдаче им зарплаты. Списки личного состава губернского комитета ВЗС и переписка о закрытии некоторых учреждений комитета в связи с тяжелым финансовым положением.
46. О реорганизации Всероссийского земского союза помощи больным и раненым: Декрет Совета нар. комиссаров РСФСР, 29 дек. 1917 г. // Собр. узаконений и распоряжений Рабочего и Крестьян. Правительства. — 1917. — № 13. — Ст. 187.
47. Погребинский, А. П. К истории союзов земств и городов в годы империалистической войны / А. П. Погребинский // Исторические записки. — М., 1941. — № 12. — С. 39—60.
48. Полнер, Т. И. Жизненный путь князя Георгия Евгеньевича Львова: Личность. Взгляды. Условия деятельности / Т. И. Полнер; [вступ. ст. Ю. А. Трубникова]. — М.: Русский путь, 2001. — 464 с.
49. Прокофьев, С. Дневник, 1907—1933 / Сергей Прокофьев. — Ч. 2: 1919—1933. — Париж: Sprkfv, 2002. — 890 с.
50. Савицкий, Э. М. Революционное движение в Белоруссии: август 1914 — февраль 1917 гг. / Э. М. Савицкий; научн. ред. К. И. Шабуня; Акад. наук Белорусской ССР, Ин-т истории. — Минск: Наука и техника, 1981. — 180 с.
51. Слобожанин, В. П. Земское самоуправление в Белоруссии / В. П. Слобожанин. — Минск: ИООО Право и экономика, 2003. — 168 с.
52. Список госпиталей, состоящих на учете Всероссийского Земского Союза: (на 1 июня 1915 г.). — М.: Всерос. Земск. Союз. Отдел эвакуации. — 2-е изд. — 1915. — 421 с.
53. Солодков, Т. Е. Борьба трудящихся Белоруссии против царизма (1907—1917 гг.) / Т. Е. Солодков. — Минск: Наука и техника, 1967. — 376 с.
54. Старцев, В. И. Русская буржуазия и самодержавие в 1905—1907 гг.: Борьба вокруг «ответственного министерства» и «правительства доверия» / В. И. Старцев — Л.: Наука, 1977. — 272 с.
55. Стенографические отчеты. Приложения к стенографическим отчетам Государственной думы. 4 созыв. Сессия 4. — 1916. — № 111.
56. Судавцов, Н. Д. Земское и городское самоуправление в годы Первой мировой войны / Н. Д. Судавцов. — Ставрополь: Изд-во СГИ, 2001. — 718 с.
57. Туманова, А. С. Общественные организации России в годы Первой мировой войны (1914 — февраль 1917 г.) / А. С. Туманова. — М., 2014. — 327 с.
58. Шевырин, В. М. Земский и городской союзы (1914—1917): Аналит. обзор / В. М. Шевырин. — М.: ИНИОН РАН, 2000. — 63 с.
59. Юрий, М. Ф. Буржуазные общественные организации в период первой мировой войны 1914—1918 гг. (Всероссийский земский союз, Всероссийский союз городов, Земгор, Центральный военно-промышленный комитет) [[Микроформа]]: дис. … д-ра ист. наук: 07.00.02. — Черновцы, 1990. — 554 с.
60. Levine Don, I. How the Russian armies are supplied. / Isaac Don Levine // New York Times. — 1916. — 23 Sept. — P. 6.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 07.09.2015*



***Д. Ч. Матвейчык,***
*загадчык аддзела публікацыі дакументаў*
*Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі,*
*кандыдат гістарычных навук;*
e-mail: niab@niab.by

## МАНАГРАФІЯ УСЕВАЛАДА ІГНАТОЎСКАГА «1863 ГОД НА БЕЛАРУСІ: НАРЫС ПАДЗЕЙ»: СПРОБА КРЫТЫЧНАГА АНАЛІЗУ

Паўстанне 1863—1864 гг. з'яўляецца адной з самых вядомых, але разам з тым і неадназначных падзей у гісторыі Беларусі XIX ст. У сувязі з гэтым яно шматразова станавілася аб'ектам увагі з боку беларускіх даследчыкаў. Бібліяграфія іх прац на сённяшні дзень налічвае сотні пазіцый. Праца Усевалада Ігнатоўскага займае сярод іх асобнае месца, бо з'яўляецца адзінай выдадзенай да гэтага часу беларускамоўнай манаграфіяй комплекснага характару. З гэтай прычыны яна ўжо не раз трапляла ў поле ўвагі беларускіх гісторыкаў. У 1985 г. у працы Уладзіміра Міхнюка пра беларускую міжваенную гістарыяграфію кніга Ігнатоўскага згадваецца, але без глыбокага аналізу і крытыкуецца з пазіцый марксісцкай метадалогіі за недасканаласць [12, с. 220—221]. У 1991 г. у навукова-папулярным нарысе Іларыёна Ігнаценкі і Аляксея Караля на некалькіх старонках змешчаны пераказ яе асноўнага зместу, які пачынаецца са слоў *«У навуковых адносінах найбольш цікавая праца Ігнатоўскага «1863 год на Беларусі»*, а заканчваецца фразай *«Работа «1863 год на Беларусі» захавала сваю актуальнасць і сёння»* [8, с. 63—67]. Амаль такая ж рыторыка ў адносінах да кнігі змешчана і ў навукова-папулярным нарысе Пятра Брыгадзіна і Ірыны Мацяс, які выйшаў у 1998 г., дзе манаграфія ацэньваецца як *«апошняя і найбольш значная праца У. М. Ігнатоўскага»* і *«грунтоўны твор»* [3, с. 66—69]. Аднак невядома ніводнай спробы крытычнага разбору манаграфіі і змешчаных у ёй звестак.

Подводя итоги, отметим, что инбелкультовский период в археографии, несмотря на его непродолжительность (1925—1928), сыграл, тем не менее, заметную роль в истории отечественной археографии. Именно в это время последняя приобретает национальный характер. Знаменательным событием этого периода стал Первый съезд исследователей белорусской археологии и археографии, не только обозначивший «болевые точки», существовавшие в археографии, но и наметивший пути к их преодолению. Активное участие Археографической комиссии в решении вопросов реституции архивных собраний способствовало поступлению в белорусские архивохранилища многих документальных комплексов, находившихся за пределами республики.

Начавшиеся с 1930-х гг. в Беларуси, равно как и в России, Украине, репрессии против научных кадров гуманитарного профиля (аресты Д. И. Довгялло, М. В. Мелешко, В. У. Ластовского, Я. И. Лёсика, В. И. Пичеты и др., фактическая высылка М. В. Довнар-Запольского, самоубийство первого президента Белорусской академии наук В. М. Игнатовского) прервали процесс развития национальной археографической школы. Довершению ее разгрома способствовала передача в 1938 г. архивных органов и учреждений в ведение НКВД. Это мероприятие почти наглухо закрыло двери архивов перед историками и археографами, лишив первых важнейших источников, а вторых — потенциальных объектов публикации.

Литература

1. Белорусский государственный архив-музей литературы и искусства (БГАМЛИ). — Ф. 6 (И. И. и Н. И. Григоровичи). — Оп. 1. — Д. 14.
2. Бережков, Н. Г. Литовская метрика как исторический источник. Часть 1: О первоначальном составе книг Литовской метрики по 1522 г. / Н. Г. Бережков. — М.; Л., 1946. — 180 с.

3. Валк, С. Н. Обзор документальных публикаций / С. Н. Валк // Архивное дело. — 1928. — Вып 3 (16).
4. Васілеўскі, Д. Сталецьце краязнаўчай працы на Беларусі / Д. М. Васілеўскі // Наш край. — 1926. — № 2—3 (5—6).
5. Груша, А. «Малапрыстасаваныя» рэкамендацыі ці малападрыхтаваныя рэцэнзенты? / А. І. Груша // Беларускі гістарычны агляд. — Мінск. — Т. 10. — Сш. 1—2 (18—19). Снежань 2003. — С. 201—227.
6. Запартыка, Г. В. І. І. Грыгаровіч / Г. В. Запартыка, А. М. Запартыка // Беларускі археаграфічны штогоднік. — Мінск, 2001. — Вып. 2. — С. 260—267.
7. Иван Лобойко. Мои воспоминания // Вильна 1823—1824: Перекрестки памяти / Сост.: Федута А. И. — Минск, 2008. — 244 с.
8. Козлов, В. П. Заметки о прошлой и современной археографии / В. П. Козлов // Археографический ежегодник за 2011 год. — М., 2014. — С. 317—320.
9. Матэрыялы да гісторыі мануфактуры на Беларусі ў часы распаду феадалізма. — Мінск, 1934—1935. — Т. 1, 2.
10. Матэрыялы да 100-годдзя з дня нараджэння М. М. Шчакаціхіна (1896—1940). — Мінск, 1996.
11. Методические рекомендации по изданию и описанию Литовской метрики/ Сост. А. Л. Хорошкевич, С. М. Каштанов. — Вильнюс, 1985. — 133 с.
12. Национальный архив Республики Беларусь (НАРБ). — Ф. 1449 (Белорусское отделение Всесоюзного научного общества историков-марксистов). — Оп. 1. — Д. 13. — Л. 111—112 (Из выступления Д. И. Довгялло на заседании отделения 14 ноября 1930 г.)
13. Памятники русской старины, собранные и изданные в Минске [рец. на сб. док.: Собрание древних грамот и актов городов Минской губ., православных монастырей, церквей и по разным предметам. — Минск, 1848.] // Минские губернские ведомости. — 1849. — № 7. Неофициальная часть.
14. Первая всебелорусская конференция архивных работников, 12—15 мая 1924 г.: Док. и мат. — Минск, 1999. — 148 с.
15. Пичета, В. И. Введение в русскую историю (Источники и историография) / В. И. Пичета. — М., 1922. — 205 с.
16. Собрание древних грамот и актов городов Минской губ., православных монастырей, церквей и по разным предметам. — Минск, 1848.
17. Степанский, А. Д. К 225-летию русской археографии / А. Д. Степанский // Отечественные архивы. — 1992. — № 6. — С. 16—24.
18. Улашчык, М. М. Што ня зроблена / М. М. Улашчык // Беларускі гістарычны агляд. — Том 3. — Сшытак 1. Травень 1996. — С. 44—46.
19. Улашчык, М. М. Літаратурная спадчына Івана Грыгаровіча / М. М. Улашчык // Улашчык, М. М. Выбранае. — Мінск, 2001. — С. 140—143.
20. Улащик, Н. Н. Очерки по археографии и источниковедению истории Белоруссии феодального периода / Н. Н. Улащик. — М., 1973. — 303 с.
21. Улащик, Н. Н. По страницам отечественного летописания: Белорусско-литовское летописание / Н. Н. Улащик // Вопросы истории. — 1985. — № 1. — С. 63—72. Цит. по: Улашчык, М. М. Выбранае. — Мінск, 2001. — 604 с.
22. Хорошкевич, А. Л. Археографическая комиссия императорской Академии наук и ее традиции издания Литовской метрики / А. Л. Хорошкевич // Metriciana Т. 3. Минск, 2004.





23. Хоруженко, О. И. Современные принципы публикации актов Литовской метрики / О. И. Хоруженко // Археографический ежегодник за 2011 год. — М., 2014. — С. 347—364.
24. Центральный научный архив Национальной Академии наук Беларуси (ЦНА НАНБ). — Ф. 67 (Инбелкульт). — Оп. 1. — Д. 9.
25. Шпилевский, И. Ф. Белорусская Академия наук на пороге второй пятилетки. (Исторический очерк). Перевод с переработанного белорусского издания / И. Ф. Шпилевский, Л. А. Бобрович. — Минск, 1933. — 112 с.
26. Шумейко, М. Ф. Архивист и археограф Дмитрий Иванович Довгялло / М. Ф. Шумейко. — Минск, 2002. — 165 с.
27. Шумейко, М. Ф. Белорусская археография в XIX—XX вв. (Проблемы теории, истории, методики) / М. Ф. Шумейко. — Минск, 2007.— 498 с.
28. Шумейко, М. Ф. Первый съезд исследователей белорусской археологии и археографии 1926 года / М. Ф. Шумейко // Археографический ежегодник за 2007—2008 год. — М., 2012. — С. 171—180.
29. Єдиційна археографія в Україні у XIX—XX ст. Плани, проекти, програми видань. — Вип. 1. — Київ, 1993. — 231 с.
30. Latopisiec Litwy i kronika Ruska z rekopisu slawianskiego przepisane; wypisami z Wremennika Sofiyskiego pomnozone; przypisami i objasnieniami, dla czytelnikow polskich potrzebnemi, opatrzone; staraniem i praca Ignacego Danilowicza, professora zwyczaynego w Cesarskim uniwersytecie Charkowskiem. — Wilno, 1827.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 29.12.2014*

**В. В. Бараненка,**
*аспірант кафедры гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі*
*Рэспубліканскага інстытута вышэйшай школы,*
*магістр гістарычных навук;*
e-mail: v.baranenka@gmail.com

## ДАКУМЕНТЫ ЗАНАЛЬНАГА ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА Ў г. ПОЛАЦКУ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ГІСТОРЫІ ПРАВАСЛАЎНАЙ ЦАРКВЫ 1920—1930-х гг.

Вывучэнне гісторыі праваслаўнай царквы ў 1920—1930-я гг. і ўвядзенне ў навуковы зварот новага комплексу дакументаў па дадзенай тэме з'яўляецца дастаткова актуальным, што абумоўлена цікавасцю ўстаноў культуры, навукі, вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, грамадзян Беларусі да гісторыі свайго краю і недастатковасцю надрукаванай крынічнай базы па дадзенай праблематыцы. Акрамя гэтага, выяўленне, абагульненне, аналіз не разгледжаных раней гістарычных звестак можа стварыць перадумовы для новага погляду на прычыны і наступствы сучасных сацыяльных працэсаў у грамадстве.

У гістарычным плане розныя аспекты дзейнасці праваслаўнай царквы разглядаліся навукоўцамі і даследчыкамі, у тым ліку са спасылкамі на архіўныя дакументы, выяўленыя ў фондах Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Полацку (далей — ЗДА ў г. Полацку). Разам з тым, асобныя працы, прысвечаныя архіўным крыніцам, якія асвятлялі становішча праваслаўнай царквы на тэрыторыі Полаччыны, адсутнічаюць.

На сённяшні дзень ЗДА ў г. Полацку ўтрымлівае дакументы, якія, згодна з сучасным адміністрацыйна-тэрытарыяльным падзелам, належаць да Верхнядзвінскага (да 1962 г. Дрысенскі), Лепельскага, Полацкага, Расонскага і Ушачскага раёнаў Віцебскай вобласці [1].

Асноўнымі крыніцамі вывучэння дадзенай тэмы з'яўляюцца дакументы, што захоўваюцца ў рэспубліканскіх і абласных архіўных установах. Аднак не менш каштоўныя дакументы, якія дазваляюць прасачыць становішча праваслаўнай царквы на тэрыторыі паўночна-ўсходняй Беларусі, утрымліваюцца і ў ЗДА ў г. Полацку.

Па паходжанні ўвесь комплекс архіўных матэрыялаў можна ўмоўна падзяліць на дзве групы:

1) дзяржаўна-партыйныя;

2) царкоўныя.

У сваю чаргу **дзяржаўна-партыйную дакументацыю** можна падзяліць на падгрупы: пратакольную, распарадчую, справаздачна-інфармацыйную, улікова-кантралюючую і судзебна-следчую.

*Пратакольная дакументацыя* пасяджэнняў калегіяльных органаў утрымлівае кароткі канспект дакладаў і выступленняў, змяшчае запісы ходу абмеркавання пытанняў, што датычацца праваслаўнай канфесіі, і рашэнняў па іх. У ЗДА ў г. Полацку захоўваюцца пратаколы выканкамаў розных узроўняў



Полацкага павета і акругі, розных камісій (Полацкай павятовай камісіі па ахове помнікаў даўніны і мастацтва, Камісіі па ахове помнікаў мастацтва, старажытнасці і прыроды пры Інбелкульце, Камісіі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей і інш.).

У сваю чаргу, зыходзячы з пытанняў, змешчаных у пратаколах, што датычыліся праваслаўнай канфесіі, можна вылучыць пэўныя праблемныя блокі: стан [2, л. 6 адв., 26—26 адв.; 3, л. 42—42 адв., 44—47 адв.] і выкарыстанне будынкаў рэлігійных культаў [4, л. 168; 5, л. 369—369 адв., 377—377 адв.; 6, л. 4—4 адв., 29 адв., 38, 41], канфіскацыю царкоўных каштоўнасцей [7, л. 5—6 адв., 15—15 адв.], дзейнасць Саюза бязбожнікаў [8, л. 1 адв., 14] і інш.

*Распарадчая дакументацыя* прадстаўлена пастановамі, загадамі, цыркулярамі, інструкцыямі, актамі і г. д. Гэта падгрупа дакументаў найбольш шырокая і асвятляе самыя розныя аспекты ўзаемаадносін дзяржавы з царквой.

Так, фонд 28 «Асвейскі раённы аддзел Упраўлення НКУС БССР па Віцебскай вобласці» ахоплівае 1933—1941 гг. і змяшчае пастановы СНК БССР, загады і ўказанні НКУС БССР, загады раённага аддзела міліцыі і інш. У справе 167 дадзенага фонду змяшчаецца перапіска з раённымі органамі НКУС па выяўленні «несавецкіх» элементаў, да якіх адносілася і духавенства. У дакументах дадзенай справы сустракаюцца біяграфічныя звесткі аб царкоўных дзеячах і іх сем'ях [9, л. 363, 485].

Пэўны пласт распарадчай дакументацыі звязаны з дзейнасцю розных камісій. Так, 23 чэрвеня 1920 г. была створана Полацкая павятовая камісія па ахове помнікаў даўніны і мастацтва. Камісія займалася даследаваннем, апісаннем і кансервацыяй захаваўшыхся помнікаў, сярод якіх прысутнічалі праваслаўныя культавыя пабудовы, якія да сённяшняга часу не захаваліся: Пакроўская, Іаана-Багаслоўская, могілкавая Міхайлаўская, Экіманская цэрквы, рэшткі Барыса-Глебскага манастыра, праваслаўнай царквы ў в. Струнне Полацкага павета і інш. Становішча гэтых храмаў знайшло адлюстраванне ў актах дадзенай камісіі [10, л. 28—29 адв., 37—38 адв., 41, 48—49 адв.].

Падобная інфармацыя захавалася і ў дакументах Камісіі па ахове помнікаў мастацтва, старажытнасці і прыроды пры Інбелкульце [37].

Становішча і выгляд цэркваў у гады калектывізацыі, якія знаходзіліся на тэрыторыі Полацкай акругі, знайшлі сваё адлюстраванне ў актах мясцовых камісій. Так, захаваліся акты аб аглядзе становішча храмаў у в. Луначарскае, м. Валынцы Боркавіцкага раёна [11, л. 28; 12, л. 23].

Шырокі пласт распарадчых дакументаў захаваўся ў выніку правядзення кампаніі па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей у сувязі з голадам на Паволжы і паўднёвых раёнах РСФСР у 1924 г. Дадзеныя дакументы, у асноўным, захоўваюцца ў фондзе 51 «Полацкі павятовы Савет рабочых, сялянскіх і чырвонаармейскіх дэпутатаў і яго выканаўчы камітэт» [7, л. 8 адв., 11, 34, 101—104 адв., 106, 107].

На тэрыторыі Полаччыны праводзілася работа па ўкараненні розных метадаў барацьбы з рэлігіяй, якія ўключалі нацыяналізацыю і канфіскацыю царкоўнай уласнасці, асабістай маёмасці духавенства; ускрыццё мошчаў прападобнай Еўфрасінні Полацкай, правядзенне антырэлігійных кампаній [13, л. 2—14 адв.; 14, л. 5; 36, л. 66—66 адв.].

З 1925 г. у СССР пачала дзейнічаць грамадская арганізацыя «Саюз ваяўнічых бязбожнікаў» (да 1929 г. «Саюз бязбожнікаў»), стварэнне якой было ініцыявана камуністычнай партыяй. На арганізацыю ўскладаліся вялікія надзеі ў справе барацьбы з рэлігіяй, што знайшло адлюстраванне ў дакументах Полацкага акружкама КП(б)Б [8, л. 14].

Сярод распарадчай дакументацыі можна вылучыць такі від дакументаў як шыфраграмы і тэлеграмы (у большасці з формай «сакрэтна» ці «зусім сакрэтна»). Па іх сродках перадавалася тэрміновая інфармацыя аб метадах далейшай працы ці вырашаліся тэрміновыя пытанні. Так, у фондах ЗДА ў г. Полацку захоўваецца шыфраграма старшыні губернскай Камісіі канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей упаўнаважанаму Віцебскага губернскага аддзела ДПУ аб парадку канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей па Полацкім павеце [7, л. 14]. Дапаўняе інфармацыю па правядзенні кампаніі канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей тэлеграма ДПУ аб недапушчэнні перагібаў падчас выняцця царкоўнай маёмасці [7, л. 16].

Трэцяя падгрупа дзяржаўна-партыйнай дакументацыі — *справаздачна-інфармацыйная* (даклады, дакладныя запіскі, зводкі). У гэтай падгрупе абагульняюцца і інтэрпрэтуюцца даныя па арганізацыі за канкрэтны перыяд (месяц, квартал, год, пяцігодку), вызначаюцца перспектывы на наступны тэрмін. Мэтай справаздачнай дакументацыі з'яўлялася ажыццяўленне зваротнай сувязі паміж ніжэй- і вышэйстаячымі арганізацыямі.

Цікавым дакументам дадзенай падгрупы па гісторыі праваслаўнай царквы з'яўляецца дакладная запіска старшыні Дрысенскага РВК у Адміністрацыйны аддзел Полацкага акрвыканкама аб рэлігійных абшчынах і служачых рэлігійных культаў раёна [15, л. 1]. У дакуменце пералічваюцца як зарэгістраваныя, так і незарэгістраваныя даныя з указаннем колькасці веруючых. Сярод дакументаў ЗДА ў г. Полацку ёсць і даклад упаўнаважанага члена Праверачнай камісіі па правядзенню прац па канфіскацыі царкоўных каштоўнасцей па Полацкім павеце [7, л. 100].

Царкоўнае жыццё ў 1920—1930-х гг. было пад пільным наглядам кантралюючых дзяржаўных органаў (ДПУ, НКУС), якія мелі пэўныя адрозненні ад іншых дзяржаўных і партыйных устаноў. У выніку, матэрыялы дадзеных устаноў можна ўмоўна вылучыць у асобную падгрупу — *аператыўных матэрыялаў* (агентурныя данясенні, мемарандумы), якія складаліся на падставе звестак, што атрымліваліся ад інфарматараў, агентаў, сакрэтных супрацоўнікаў шляхам сакрэтнага назірання за людзьмі і выяўлення патрэбных звестак, прымянення перлюстрацыі карэспандэнцыі.



Сярод матэрыялаў дзяржаўных органаў захаваліся дакументы, што сведчаць аб падтрымцы органамі ДПУ прадстаўнікоў абнаўленства [16, л. 240].

Асаблівую цікавасць прадстаўляюць агентурныя данясенні інфарматараў НКУС БССР, у якіх акцэнтуецца ўвага на прыналежнасці да царквы і адносінах да яе мясцовых жыхароў. Змяшчаецца інфармацыя аб выкананні рэлігійных абрадаў на тэрыторыі Асвейскага раёна ў 1937—1939 гг., калі дзеючых цэркваў не засталося, і рэлігійнае жыццё працягвалася праз таемнае здзяйсненне набажэнстваў і абрадаў [17, л. 1, 10, 11, 14, 19, 27, 47; 18, л. 70, 137, 206, 234; 19, л. 61—64].

Адмысловая ўвага надавалася Усесаюзнаму перапісу насельніцтва 1937 г. Захаваліся і дайшлі да нас матэрыялы аб адносінах насельніцтва Асвейскага раёна да пытання перапіснога ліста, аб рэлігійных або атэістычных пераканаavнях рэспандэнта [17, л. 133; 19, л. 100].

Падобнага роду матэрыялы маюць вялікае значэнне для разумення атмасферы ў асяроддзі веруючага насельніцтва ў ходзе правядзення антырэлігійнай палітыкі. Менавіта ў іх мы назіраем непасрэдныя адносіны веруючых да тых ці іншых дзеянняў дзяржаўных органаў. Аднак варта прызнаць, што ва ўмовах таго часу многія праблемы этнаканфесійнай штодзённасці заставаліся за межамі дадзеных дакументаў.

Да *ўлікова-кантралюючай* дакументацыі адносяцца спісы, анкеты, ведамасці, табліцы, вопісы. Вартыя ўвазе кнігі ўліку малітоўных дамоў за 1925 г., якія прадстаўляліся ў Полацкі акрвыканкам райвыканкамамі раёнаў акругі. Так, захаваліся кнігі Полацкага [16, л. 258—263], Ветрынскага [16, л. 265—268], Ушачскага [16, л. 270 адв.—279], Вульскага [16, л. 282 адв.—285], Краснапольскага [16, л. 287—289], Дрысенскага [16, л. 292—295], Асвейскага [16, 298—301], Валынецкага [16, л. 302—303] і Расонскага [16, л. 305—308] раёнаў. На іх аснове ствараўся агульны спіс рэлігійных культавых устаноў, што знаходзіліся на тэрыторыі Полацкай акругі [16, л. 67—78]. Дадзеныя дакументы змяшчаюць інфармацыю пра назву рэлігійнага будынка, іх тып (прыходскія, прыпісныя, манастырскія і інш.), колькасць веруючых і святароў па кожнай царкве, кароткую характарыстыку святара (узрост, да якой царкоўнай арыентацыі ён належыць, адносіны да савецкай улады і інш.). Калі царква была закрыта, то адзначалася калі, кім і па якой прычыне. Акрамя агульнай інфармацыі па Полацкай акрузе, такая інфармацыя была падзелена і па раёнах Полаччыны. Згодна дадзеных дакументаў, на 1925 г. на тэрыторыі Полацкай акругі дзейнічала 81 царква. Трэба звярнуць увагу на тое, што некаторыя графы ў адносінах да прыналежнасці таго ці іншага святара да пэўнай царкоўнай групоўкі (ціханаўцы, абнаўленцы) заставаліся пустыя, што не дазваляе ў поўнай меры казаць пра суадносіны сіл царкоўных груп на тэрыторыі акругі.

Згодна з дэкрэтам ад 3 жніўня 1922 г. аб арганізацыі рэлігійных таварыстваў, веруючыя любой канфесіі маглі стварыць сваё рэлігійнае аб'яднанне (абшчыну). Для гэтага было неабходна прайсці рэгістрацыю ў мясцовых орга-

нах выканаўчай улады, каб заключыць дагавор на атрыманне ў карыстанне культавых будынкаў і інвентара для набажэнства. Заключэнне дагавора было абавязковым. Калі на працягу месяца абшчына не заключала яго, улады пазбаўлялі вернікаў права карыстання будынкам і інвентаром [20].

Згодна з умовамі дагавора, у храмах не дапускаліся палітычныя сходы, варожыя Савецкай уладзе, а таксама продаж і распаўсюджванне кніг, улётак, накіраваных супраць улады. У храмах павінны быць інвентарныя вопісы маёмасці. Дзякуючы гэтым вопісам да нашых дзён у архіўных дакументах захаваліся звесткі аб шматлікіх сельскіх цэрквах паўночна-ўсходняй частцы Беларусі. Дадзеныя дакументы мелі пэўную структуру: 1) апісанне вонкавага і ўнутранага выгляду храма; 2) указанне прадметаў і іх колькасці; 3) подпісы членаў царкоўнапрыходскага савета [21, л. 10—12; 22, л. 46—48; 23, л. 4—7].

Заключэнне дагавораў суправаджалася рэгістрацыяй усіх членаў абшчыны. Такім чынам, улада атрымлівала падрабязныя спісы прыхаджан, што дапамагала ёй ажыццяўляць кантроль над рэлігійнай дзейнасцю народа [22, л. 42—43; 23, л. 8—9 адв.].

Пэўны пласт улікова-кантралюючай дакументацыі прадстаўлены «Анкетамі служкаў рэлігійных культаў» [24, л. 6; 11, л. 11, 12 адв.—13; 12, л. 12; 25, л. 14; 26, л. 18; 27, л. 13—24]. У іх зафіксаваны біяграфічныя даныя асобы, звесткі аб выкананні ёй культавых абавязкаў і палітычнай лаяльнасці. У залежнасці ад прыналежнасці да тых ці іншых рэлігійных культаў, звесткі маглі вар’іравацца. Яны запаўняліся самой асобай і змяшчалі: прозвішча, імя і імя па бацьку, сан, месца службы і жыхарства, адукацыю, год і месца нараджэння, сацыяльнае і маёмаснае становішча, час паступлення ў духоўнае званне, звесткі аб месцы службы і займаемых пасадах з 1914 г. па цяперашні час.

Захаваўся і спіс служкаў розных рэлігійных культаў і манахаў г. Полацка за 1925 г. [16, л. 244].

У фондзе 28 «Асвейскае раённае аддзяленне Упраўлення Народнага Камісарыята ўнутраных спраў БССР» змяшчаюцца анкеты, запоўненыя супрацоўнікамі НКУС на аснове агентурных і афіцыйных матэрыялаў на главу сям’і [17, л. 12—13 адв., 15—16 адв.; 28, л. 78—79 адв.]. Анкета складаецца з 5 раздзелаў: агульныя звесткі; склад сям’і; што рабіў і чым займаўся як сам, так і асобныя члены сям’і (да рэвалюцыі і пасля); іншыя даныя; заўвага. Першы раздзел змяшчае асабістыя даныя (прозвішча, імя, імя па бацьку, год і месца нараджэння і інш.). У другім раздзеле змяшчаецца інфармацыя аб ступені сваяцтва, узросце, роду заняткаў і дакладным адрасе пражывання. Прысутнічаюць даныя аб маёмасным становішчы як да рэвалюцыі, так і пасля, даныя аб судзімасці, а таксама аб пазбаўленні сям’і выбарчых правоў.

У трэцім раздзеле акцэнтуецца ўвага да асобы духоўнага звання: калі зняў сан, то патрабавалася адзначыць прычыну зняцця і чым гэта было выклікана. Акрамя святароў, у дадзенай графе рабілася пазнака аб прыналежнасці рэпрэсаванага да царкоўнага, касцёльнага ці іншага рэлігійнага саветаў. Згодна дадзеных звестак можна аднавіць страчаныя імёны святароў цэркваў ці іншых рэлігійных дзеячаў 1920—1930-х гг.



Чацвёрты раздзел прысвечаны пытанням аб удзеле ў бандытызме, кантрабанднай дзейнасці, сувязях з замежнымі краінамі, а таксама аб прыналежнасці сваякоў да антысавецкіх элементаў.

У пятым раздзеле рабіліся пазнакі аб важных момантах жыцця анкетаванага, якія не ўвайшлі ў папярэднія раздзелы, але заслугоўвалі ўвагі з боку супрацоўнікаў НКУС.

*Судзебна-следчыя дакументы*, што датычацца праваслаўнай канфесіі ў 1920—1930-х гг., у фондах ЗДА ў г. Полацку прадстаўлены матэрыяламі ў адносінах да святароў в. Прудзінкі Боркавіцкага раёна (зараз Верхнядзвінскі раён) Кірыла Бяляцкага і Сакалішчанскай царквы Уладзіміра Забелы. Гэтыя справы былі ўзбуджаны ў сувязі з нявыплатай падаткаў святарамі. Сярод матэрыялаў спраў утрымліваюцца наступныя дакументы: скарга К. Бяляцкага аб няправільным абкладанні падаткам, картка падліку даходаў гаспадаркі за 1929 г., а таксама прысуд Боркавіцкага народнага суда Полацкай акругі ў адносінах святара. Справа У. Забелы захавалася ў больш дрэнным стане: прысутнічае толькі выпіска з пратаколу Боркавіцкага РВК аб пакіданні без змяненняў велічыні падатку ў адносінах да святара Сакалішчанскай царквы, а таксама картка падліку даходаў гаспадаркі апошняга за 1929 г. [29, л. 1—15, а1—а3].

У дадзеную падгрупу ўваходзіць і пратакол допыту былога старшыні царкоўнага савета Начскай царквы Полацкага павета па справе святара Н. Ананьчэнкі [30, л. 106—106 адв.].

Для характарыстыкі царкоўных працэсаў асаблівую каштоўнасць мае непасрэдна **царкоўная дакументацыя**. Крыніцы царкоўных інстытутаў і ўстаноў даюць магчымасць не толькі ўзнавіць унутранае жыццё царквы, але і адлюстроўваюць яе погляд на праблему адносін з дзяржавай. Сярод дадзеных дакументаў вылучаюцца: пратакольныя, арганізацыйныя і перапіска.

*Пратакольная царкоўная дакументацыя* прадстаўлена пратаколамі прыходскіх сходаў і пасяджэнняў царкоўных саветаў. Захаваліся пратаколы Сафійскага [31, л. 33, 38, 136—136 адв.] і Мікалаеўскага [31, л. 64—64 адв.] сабораў, Богаяўленскай [31, л. 53—53 адв., 60—60 адв., 79; 33, л. 572—573], Іаана-Багаслоўскай [31, л. 41—42], Дзёрнавічскай [32, л. 19] і іншых цэркваў. Дадзеныя пратаколы, у большасці, датуюцца 1922—1923 гг.

Асаблівую цікавасць па гісторыі праваслаўнай царквы прадстаўляе пратакол агульнага сходу веруючых праваслаўнага веравызнання г. Полацка ў храме Адзінаверчага прыхода 14 студзеня 1923 г. пры ўдзеле больш за 500 міран. Дадзены сход павінен быў вызначыць пазіцыю веруючых г. Полацка да абнаўленчага руху і, у прыватнасці, да абнаўленчых органаў [30, л. 36—36 адв.].

Другая падгрупа царкоўнай дакументацыі — *арганізацыйная* — уключае статуты і розныя палажэнні царкоўнай арганізацыі. Большую частку дакументаў падгрупы складаюць статуты прыходскіх абшчын, што заключаліся

падчас рэгістрацыі абшчыны. У іх агаворваліся мэты і задачы таварыства, склад, правілы прыёму новых членаў і выключэння з іх шэрагу, крыніцы паступлення сродкаў, кіраўніцтва ўнутранымі справамі, парадак змен статута ці яго палажэнняў і ліквідацыя арганізацыі ў асобных выпадках [34, л. 2—3; 35, л. 18—18 адв.; 22, л. 13—14].

У фондах архіва захавалася і копія Палажэння аб арганізацыі рупліўцаў царкоўнага абнаўлення [31, л. 99—100].

*Перапіску* царкоўнага паходжання ўмоўна можна падзяліць на: 1) унутрыцаркоўную (Ліст Благачыннага да веруючых Начскай воласці [30, л. 108—108 адв.], заява старшыні царкоўнага савета Богаяўленскай царквы г. Полацка аб немагчымасці выканання ўскладзеных на яго абавязкаў [31, л. 58] і інш.) і 2) карэспандэнцыю, якая была адрасавана ў грамадзянскія ўстановы, галоўным чынам — прасільнага характару (Прашэнне ўпаўнаважанага ВЦУ па Віцебскай епархіі ў Полацкі павятовы выканкам аб узяцці рэчаў з закрытага Богаяўленскага манастыра [30, л. 80—80 адв.], заявы на дазвол крыжовых ходаў [30, л. 81], заявы аб рэгістрацыі рэлігійных абшчын [31, л. 88] і інш.). Захаваліся заявы ад святароў, якія адмаўляліся ад святарскіх абавязкаў і сану [16, л. 94].

Такім чынам, у фондах ЗДА ў г. Полацку захоўваецца пэўны комплекс дакументаў, што змяшчаюць інфармацыю па гісторыі Рускай праваслаўнай царквы і яе ўзаемаадносінах з дзяржавай у 1920—1930-я гг. на тэрыторыі Полаччыны.

Гэтыя матэрыялы ўяўляюць вялікую даследчую цікавасць перш за ўсё таму, што дазваляюць прасачыць асноўныя напрамкі дзейнасці мясцовых выканаўчых органаў у адносінах да царквы, вызначыць этапы яе развіцця. Большасць дакументаў з'яўляецца ўнікальнай і дае магчымасць дэталёва рэканструяваць карціну згортвання царкоўна-адміністрацыйных структур у першыя дзесяцігоддзі савецкай улады. Унікальнасць і разнастайнасць змешчанай інфармацыі дазваляе аднесці іх у разрад каштоўных крыніц для вывучэння рэлігійнага жыцця як Полацкага рэгіёна, так і Беларусі ў цэлым.

Крыніцы


1. Характеристика фондов учреждения «Зональный государственный архив в г. Полоцке» [Электронный ресурс] // Архивы Беларуси. — Режим доступа: http://archives.gov.by/index.php?id=866571. — Дата доступа: 14.12.2014.
2. ЗГА в г. Полоцке. — Ф. 54. — Оп. 1. — Д. 342. — Л. 6—6 адв., 26—26 адв.
3. Там жа. — Д. 343. — Л. 42—42 адв., 44—47 адв.
4. Там жа. — Ф. 104. — Оп. 1. — Д. 62а. — Л. 168—168 адв.
5. Там жа. — Ф. 51. — Оп. 1. — Д. 154. — Л. 369—369 адв., 377—377 адв.
6. Там жа. — Д. 152. — Л. 4—4 адв., 29—30, 38—38 адв., 41—41 адв.
7. Там жа. — Д. 108. — Л. 5—6 адв., 8 об, 11, 14—16, 34, 100—104 адв., 106, 107
8. Там жа. — Ф. 143. — Оп. 1. — Д. 47. — Л. 1—1 адв., 10—15.
9. Там жа. — Ф. 28. — Оп. 1. — Д. 167. — Л. 363, 485.
10. Там жа. — Ф. 54. — Оп. 1. — Д. 343. — Л. 28—29 адв., 37—38 адв., 41, 48—49 адв.
11. Там жа. — Ф. 122. — Оп. 1. — Д. 5. — Л. 12 адв.—13, 28.





12. Там жа. — Д. 6. — Л. 12, 23.
13. Там жа. — Д. 120. — Л. 2—14 адв.
14. Там жа. — Ф. 150. — Оп. 1. — Д. 172. — Л. 5.
15. Там жа. — Ф. 129. — Оп. 1. — Д. 106. — Л. 1.
16. Там жа. — Ф. 104. — Оп. 1. — Д. 42а. — Л. 67—78, 94, 240, 244, 258—263, 265—268, 270 адв.—279, 282 адв.—285, 287—289, 292—295, 298—301, 302—303, 305—308.
17. Там жа. — Ф. 28. — Оп. 1. — Д. 163. — Л. 1, 10—16 адв., 19, 27, 47,133.
18. Там жа. — Д. 172. — Л. 70, 137, 206, 234.
19. Там жа. — Д. 173. — Л. 61—64, 100.
20. Декрет ВЦИК, СНК РСФСР от 3 августа 1922 г. «О порядке утверждения и регистрации обществ и союзов, не преследующих цели извлечения прибыли, и порядке надзора за ними» [Электронный ресурс] // КонсультантПлюс. — Режим доступа: http://base.consultant.ru/cons/cgi/online.cgi?req=doc;base=ESU;n=18203;fld=134;from=18261-6;rnd=0.9949088452849537. — Дата доступа: 26.12.2014.
21. ЗГА в г. Полоцке. — Ф. 122. — Оп. 1. — Д. 4. — Л. 10—12.
22. Там жа. — Ф. 129. — Оп. 1. — Д. 20. — Л. 13—14, 42—43, 46—48.
23. Там жа. — Д. 21. — Л. 4—9 адв.
24. Там жа. — Ф. 122. — Оп. 1. — Д. 2. — Л. 6.
25. Там жа. — Д. 8. — Л. 14.
26. Там жа. — Д. 9. — Л. 18.
27. Там жа. — Ф. 143. — Оп. 1. — Д. 87. — Л. 13—24.
28. Там жа. — Ф. 28. — Оп. 1. — Д. 159. — Л. 78—79 адв.
29. Там жа. — Ф. 129. — Оп. 1. — Д. 1045. — Л. 1—15, а1—а3.
30. Там жа. — Ф. 51. — Оп. 1. — Д. 116. — Л. 36—36 адв., 80—81, 106—106 адв., 108—108 адв.
31. Там жа. — Д. 115. — Л. 33, 38, 41—42, 53—53 адв., 58, 60—60 адв., 64—64 адв., 79, 88, 99—100, 136—136 адв..
32. Там жа. — Ф. 122. — Оп. 1. — Д. 12. — Л. 19.
33. Там жа. — Ф. 51. — Оп. 1. — Д. 28. — Л. 572—573.
34. Там жа. — Ф. 129. — Оп. 1. — Д. 15. — Л. 2—3.
35. Там жа. — Д. 19. — Л. 18—18 адв.
36. Там жа. — Ф. 51. — Оп. 1. — Д. 91. — Л. 66—66 адв.
37. Там жа. — Ф. 104. — Оп. 1. — Д. 81.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 18.02.2015*

***І. П. Клімаў,***
*дацэнт кафедры беларускай філалогіі і сусветнай літаратуры*
*Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў,*
*кандыдат філалагічных навук;*
e-mail: klimau@mail.ru

# СПЕЦЫФІКА РЭЛІГІЙНАЙ КАМУНІКАЦЫІ Ў СФЕРЫ ПІСЬМЕНСТВА (НА АСНОВЕ ТЭКСТАЎ ХРЫСЦІЯНСТВА)

Пад камунікацыяй разумеецца працэс па абмену інфармацыяй з дапамогай пэўных сродкаў (сігналаў ці знакаў) паміж істотамі (ці істотай і створанай ёю машынай). Такі працэс абавязкова прадугледжвае наяўнасць пэўных кампанентаў (дзеянняў і прыстасаванняў): крыніцу і перадатчык інфармацыі, канал сувязі, у якім адбываецца ўласна перадача інфармацыі, а таксама яе носьбіт (сігнал, знак) і код (правілы за- і расшыфроўкі інфармацыі), нарэшце, прыёмнік з атрымальнікам інфармацыі. У гэтым працэсе абавязкова прысутнічае кантэкст (атачэнне, фон, умовы — напрыклад, час, месца, лік атрымальнікаў і інш.) і шум (розныя перашкоды), можа ажыццяўляцца зваротная сувязь (пацвярджэнне прыёму інфармацыі і праверка яе асноўных параметраў). Існаванне ўсіх падобных кампанентаў абумоўлена немагчымасцю ў аб'ектыўнай рэальнасці непасрэднага кантакту паміж крыніцай і атрымальнікам інфармацыі апрача як праз органы пачуццяў, што прымушае абодвух звяртацца да тых або іншых пасрэднікаў (сігнальных або знакавых сістэм, натуральных ці штучных).

У выпадку рэлігіі сітуацыя апрыёрна мусіць быць крыху інакшай, паколькі адзін з удзельнікаў камунікацыі надзелены незвычайнымі, звышнатуральнымі здольнасцямі — гэта сакральнае, прадстаўленае нейкім суб'ектам (Бог ці богі, дэман, дух і да т. п.), часта персаніфікаваным, або сілай (магічнай), звычайна ніяк не персаніфікаванай [4, с. 42—44, 158—163]*. Рэлігійная свядомасць, ідэалістычная па сваёй сутнасці, зыходзіць з пастулата, што сакральнае існуе рэальна — такая вера называецца фідэізмам — і дапускае непасрэдны кантакт з ім. Менавіта ў такой сітуацыі і даводзіцца казаць пра сакральную камунікацыю — абмен інфармацыяй з сакральным суб'ектам ці сілай. Паводле фідэістычных уяўленняў сакральнае валодае звышрэальнымі здольнасцямі, таму кантакт з ім можа праходзіць ментальна — непасрэдна ў свядомасці чалавека («голас гучыць прама ў душы», «Бог чытае думкі» і да т. п.). У такім выпадку перадатчык і прыёмнік, канал сувязі і знакавыя пасрэднікі (у т. л. і код) становяцца непатрэбнымі (хаця захоўваюць сваю моц кантэкст і шум). Чалавек (яго свядомасць) тады з'яўляецца прамым адпраўшчыкам ці атрымальнікам інфармацыі і не патрабуе сабе ніякіх пасрэднікаў ці сродкаў у камунікацыі.

* Выпадак, калі ўсе ўдзельнікі камунікацыі сакральныя істоты, не разглядаецца, паколькі з'яўляецца вельмі няясным, а інфармацыі наконт такой сітуацыі недастаткова. Пры камунікацыі з сакральным могуць адрозніваца легітымныя і нелегітымныя атрымальнікі інфармацыі (першыя — тыя, каму яна прызначалася, апошнія — фактычна выпадковыя прысутныя), а таксама яўныя і фіктыўныя атрымальнікі: першаму якраз і прызначаецца паведамленне, тады як апошні толькі замяшчае яго з-за няздольнасці таго фізічна прысутнічаць у момант камунікацыі [4, с. 187—189].



Аднак у аб'ектыўнай рэальнасці падобныя зносіны практычна немагчымыя па шэрагу відавочных прычын. З аднаго боку, у свядомасці чалавека няма сродкаў (апрача самаўнушэння ці аўтасугестыі), якія б дазволілі яму аб'ектыўна адрозніць уласныя вобразы, ідэі ці думкі ад тых, што «даслаў» сакральны суб'ект (сіла)*. Пры «атрыманні» інфармацыі ад такога суб'екта (сілы) непасрэдна ў свядомасці чалавека той не зможа пераканацца, што «паведамленне» сапраўды належыць нейкаму звышрэальнаму адпраўшчыку, а не самому чалавеку (хаця многія вернікі часта і сцвярджаюць адваротнае, аб'ектыўна пацвердзіць гэта немагчыма). З другога боку, у такіх «зносінах» адсутнічае зваротная сувязь: чалавек не мае іншых сродкаў апрача самаўнушэння, што найвышэйшы адрасат (і менавіта ён) атрымаў яго паведамленне, вярбальнае ці сфармуляванае ў чалавечай свядомасці. У выніку, пры ажыццяўленні сакральнай камунікацыі чалавеку фактычна даводзіцца займацца аўтакамунікацыяй [5, с. 255] — прыпісваць атрыманым «паведамленням» адвольныя семантыкі ці проста самому фармуляваць такія «паведамленні». Такім чынам, сакральная камунікацыя для назіральніка ўяўляе сабой або фікцыю, або цалкам суб'ектыўны феномен, які аб'ектыўна ніяк не можа быць зафіксаваны. Таму ў рэлігіях, нягледзячы на ўсе канстатацыі і апісанні такой камунікацыі, заўжды і непазбежна побач з ёй (а фактычна замест яе) выкарыстоўваецца апасродкаваны шлях абмену інфармацыяй. Менавіта ў гэтым выпадку трэба казаць пра рэлігійную камунікацыю.

У такой камунікацыі пасрэднікам найчасцей выступае натуральная знакавая сістэма — мова (у т. л. пісьмовы тэкст). Сапраўды, ва ўсіх рэлігіях сакральны суб'ект (сіла) звяртаецца да чалавека праз мову (звычайна — зразумелую таму), а таксама ўспрымае менавіта яе. Пры гэтым часта ў рэлігіях сцвярджаецца ці маецца на ўвазе, што чалавечая мова прынцыпова недасканалая ці толькі прыблізная для апісання сакральнага, для зносін з ім. На гэтай падставе ў філасофіі нават узнікла т. зв. праблема рэлігійнай мовы, калі з дапамогай чалавечай мовы цяжка ці зусім немагчыма апісаць Бога і яго ўласцівасці (пры гэтым такі Бог, згодна з уяўленнямі т. зв. аўрамічных рэлігій, разумеецца як поўны абсалют: бясконцы і ўсемагутны, непазнавальны і ўсяведны і г. д.). У такой сітуацыі для апісання Бога людзі мусяць звяртацца толькі да нейкіх недакладных і прыблізных замен — негацый (чым Бог не з'яўляецца), аналогій, сімвалаў, міфаў і да т. п. [9]. Пры падобным падыходзе, адпаведна, і разуменне такога Бога (у т. л. і яго паведамленняў) фактычна немагчымае, таму Богу (багам), у сваю чаргу, не застаецца нічога іншага, як зыходзіць да абмежаванасцей людзей і выкарыстоўваць дасяжны тым код ці сродкі зносін.

* Нават само паняцце аб'ектыўнасці пры гэтым губляецца, паколькі аб'ектыўна ў такім выпадку нічога не можа быць дасяжна назіранню ці фіксацыі.

Большасць і рэлігій, і вернікаў дапускае, што сакральнае па сваёй ініцыятыве можа выкарыстоўваць не толькі ўласцівую яму сакральную камунікацыю, але і апасродкаваную — чалавечую ці зразумелую чалавеку: вербальную. Найчасцей гэта з'явы акустычнай прыроды: галасы, прамовы, прароцтвы, гласалаліі і да т. п., а таксама адкравенні / аб'яўленні — прамая мова непасрэдна самога Бога (багоў), пачутая ці натхнёная. Але сакральнае можа выкарыстоўваць таксама і невербальныя сродкі: відзежы (у т. л. антрапамарфізмы) і сны, іншыя візуальныя вобразы (вясёлка, міраж, хмары і да т. п.), пахавыя і смакавыя вобразы, а таксама іх камбінацыі, у т. л. у спалучэнні з вербальнымі адзінкамі*. У якасці даволі простых сігналаў могуць служыць і стыхіі — землетрасенне, патоп, мор, голад, зацямненне сонца або месяца, навальніца, гром, дым, агонь і да т. п., якія тлумачацца людзьмі як тое ці іншае пасланне Бога ці багоў (напрыклад, «Бог злуецца», «Бог у гневе»). Рэлігійная свядомасць можа інтэрпрэтаваць як такія сігналы ці паведамленні не толькі з'явы прыроды, але таксама і падзеі асабістага жыцця, успрынятыя як субежнасці, паўтарэнні, супадзенні, тэндэнцыі і г. д. («Бог папярэджвае», «Бог пасылае знак»).

У сваю чаргу, у большасці рэлігій (калі не ва ўсіх) чалавек здольны камунікаваць з сакральным, стала ці аказіянальна. Тэарэтычна такая камунікацыя магчымая праз тры каналы: а) пэўныя вербальныя акты (просьбы, малітвы, глярыфікацыі, праклёны і г. д.), б) пэўныя стэрэатыпізаваныя дзеянні: рытуалы (у т. л. ахвярапрынашэнні, рухі, танцы) і спецыфічныя паводзіны (напрыклад, пост ці табу), а таксама невербальныя сімвалы (нямоўныя знакі, малюнкі (у т. л. татуіроўкі і арнаменты), пластычныя аб'екты і да т. п.), в) суб'ектыўнае інтэлектуальнае (інсайт, унутраная ўпэўненасць, унутранае «веданне») або пачуццёвае насланнё (натхненне) і/ці ўспрыманне (эмоцыі, якія аналізаваў Р. Ота [8], — нуміноз, галюцынацыі (відзежы, галасы), сны, мроі і інш.). Менавіта апошні канал трэба разглядаць як асноўную сферу сакральнай камунікацыі. Тут эмоцыі перадаюць тое, што semiятычным шляхам для верніка перададзена быць не можа (ці можа толькі са значнымі стратамі) — містычныя аспекты сакральнага, якія паводле свай сутнасці з'яўляюцца невыразнымі, непазнавальнымі. Аднак з прычыны суб'ектыўнасці такой камунікацыі толькі першыя два каналы з'яўляюцца асноўным аб'ектам рэлігійнай камунікацыі, і гэта знакавыя зносіны, вербальныя ці невербальныя. Тут вядучым сродкам зносін служаць вербальныя сімвалы — з-за сваёй устойлівасці і дак-

* Некаторыя даследчыкі лічаць, што ў сферы рэлігіі трэба адрозніваць два шляхі зносін у адным канале камунікацыі: вербальны (з дапамогай мовы) і сенсарны (праз органы пачуццяў: відзежы, галасы, дотык, смак), апошні нібыта і выкарыстоўвае Бог [2]. На самой справе гэта памылка: з аднаго боку, маўленне само з'яўляецца сенсарным працэсам, а з другога, у розных рэлігіях (напрыклад, у іудаізме і хрысціянстве) Бог часта выкарыстоўвае чалавечае маўленне, каб размаўляць са сваім народам, прарокамі ці іх ворагамі. Апрача таго, можа мець месца і камбінацыя вербальных ды невербальных сродкаў, што часта назіраецца ў рытуале.



ладнасці, што робіць чалавечую мову фактычна галоўным выразнікам рэлігіі. Добра вядома, што чым больш містычныя рэлігійныя веды, тым менш яны камунікабельныя [11, s. 330]. Адпаведна, чым больш вербалізавана інфармацыя той ці іншай рэлігіі, тым больш яна дасяжная для чалавека. Аднак роля мовы ў рэлігійнай камунікацыі таксама выключна важная яшчэ і таму, што мова незамяняльная пры зносінах вернікаў паміж сабой і астатнім светам.

Але вельмі значнай застаецца ў рэлігійнай камунікацыі і роля рытуалаў ды рытуалізаваных паводзін — невербальных семіётык (хаця часта ў камбінацыі з вербальнымі [4, с. 53—57]). У многіх выпадках менавіта яны дазваляюць уздзейнічаць на свет багоў, нават прымушаць іх да выканання нейкіх дзеянняў [7, p. 51]. У некаторых рэлігіях праз рытуал можна здабыць нават залежнасць багоў (духаў) ад чалавека — пры ўмове, што апошні правільна выконвае рытуал [7, p. 52—53; 11, s. 257—258; 4, с. 46—47, 136—138]. Такім чынам, сакральнае можна аўтаматычна вынікаць з дзеянняў людзей у рытуале, абы той быў правільна выкананы [7, p. 48]. Такая моц рытуалу заснавана на рэлігійным фармалізме — строгім прытрымліванні першапачатковага ўзору, які прынёс поспех [7, p. 49]. У рэлігіі рытуалы і эмоцыі ў некаторых аспектах маюць перавагу перад паняццямі і дэфініцыямі — як таму, што лягчэй успрымаюцца і не патрабуюць лагічнага аналізу, інтэлектуальнай працы, так і з-за самой прыроды рэлігіі, заснаванай на веры ці даверы.

Вернікі тэарэтычна могуць выкарыстоўваць усе тры вышэйакрэсленыя каналы для камунікацыі паміж чалавекам і сакральным, аднак на практыцы ў многіх рэлігіях такая камунікацыя, вербальная і невербальная, штучна ўскладнена, абмежавана, а то і наогул зведзена да нейкіх выключных сітуацый. Напрыклад, яна можа адбывацца толькі ў спецыяльных сітуацыях ці станах — у час рытуалу, малітвы, хваласпеву, экстазу і інш.; у снах, мроях, трансе, эйфарыі, пры галюцынацыях і інш.; пры дасягненні пэўнай кампетэнцыі, кваліфікацыі, фізіялагічнага і/ці сацыяльнага стану і да т. п. На думку некаторых даследчыкаў, камунікацыя з сакральным наогул а) адбываецца ў выключных ці памежных сітуацыях, у якіх апынаецца чалавек, і б) набывае драматызм ды напружанасць, паколькі накіравана да найвышэйшых сіл [5, с. 77—78]. Іншымі словамі, рэлігійная камунікацыя патрабуе: а) спецыяльнай сітуацыі (напрыклад, рытуалу, экстазу, фрустрацыі), б) эмацыйнай узбуджанасці (экспрэсіі, афекту) кшталту трымцення, страху ці замілавання перад сакральным, што ў дэталях было апісана Р. Ота [8].

Любая рэлігія так ці інакш дапускае ці прадугледжвае магчымасць двунакіраванага кантакту з сакральным — ад чалавека да сакральнага і наадварот (хаця ініцыятыва пачынаць такі кантакт з боку чалавека можа быць штучна абмежавана). Нават калі сакральны суб'ект ці сіла і не рэагуе адразу, у дадзены момант, на звяртанне верніка ці ахвярніка (святара), такая рэакцыя носьбітамі рэлігійнай свядомасці мяркуецца пазней або дапускаецца праз іншыя каналы. Вернікі інтуіцыйна прымаюць пастулат, што звышнатуральнае здоль-

на ўплываць на матэрыяльны свет (у т. л. чалавека), кантраляваць яго падзеі [10, p. 426]. Э. Дзюркгейм наогул лічыў, што мэта рэлігіі — рэгуляванне чалавечых адносін з сакральным (суб'ектам ці сілай), якое здольнае ўздзейнічаць на чалавека і яго жыццё [7, p. 41]. У такім выпадку рэлігійная камунікацыя мае за мэту здабыццё або спажыванне чалавекам прыхільнасці ці міласці такога суб'екта (сілы). Таму камунікацыя, у тым ці іншым выглядзе, непазбежна выконвае найважнейшую ролю ў любой рэлігіі.

Некаторыя даследчыкі спрабуюць пералічыць магчымыя жанры ці модусы вербальных зносін чалавека і Бога (калі «паведамленне» апошняга наогул можна выразіць з дапамогай чалавечай мовы). Так, Н. Мячкоўская паспрабавала падаць жанрава-камунікатыўную тыпалогію рэлігійных тэкстаў паводле пераважнай у іх мадальнасці [5, с. 79—81], фактычна ж — паводле мэтанакіраванасці маўленчага акта ў час рэлігійнай камунікацыі. Даследчыца вылучыла наступныя тыпы (далей жанры ў кожным тыпе прыводзяцца з некаторымі зменамі і ўдакладненнямі): 1) просьбы-пажаданні (замовы, заклёны і праклёны, анафемы, экзарсізмы, інвакацыі (выкліканні духаў, памерлых), добраславенні, некаторыя віды малітваў); 2) абяцанні (клятвы, абетніцы (прамісіі), прысягі); 3) гларыфікацыя (даксалогія), куды адносяцца фактычна толькі фрагменты хвалебных малітваў і гімнаў, дзе ўсхваляецца Бог і іншыя сакральныя істоты; 4) прадказанні (гаданні, прароцтвы, прадбачанні, відзежы); 5) запаветы, адрасаваныя чалавеку імператыўнага характару забароны або прадпісанні (наконт паводзін, поглядаў, рытуалаў і інш.); 6) Боскае адкравенне / аб'яўленне — непасрэдная мова самога Бога ці багоў. Як бачна, у такім пераліку прадстаўлены звяртанні да сакральнага (1—3), тады звяртанні з боку сакральнага да чалавека прадугледжваюць менш жанраў ці модусаў (5—6), а жанры (4) тут займаюць нейкае пасрэднае становішча, дапускаючы выкарыстоўваць сябе абодвум бакам.

Даволі часта ў многіх рэлігіях свету існуюць тыя або іншыя абмежаванні ці нават прамыя забароны на рэлігійную камунікацыю — і на пасланне паведамлення да сакральнага суб'екта (сілы), і на прыём сакральнай інфармацыі ад яго (яе). Сама такая інфармацыя лічыцца дасяжнай (зразумелай) далёка не ўсім вернікам, не ў любой сітуацыі і да т. п. Таму ў многіх рэлігіях для зносін з сакральным вылучаюцца спецыяльныя пасрэднікі (асобы ці аб'екты) — кантакцёры. Яны звычайна спецыялізуюцца на рэлігійнай камунікацыі і забяспечваюць яе паспяховасць. Такія пасрэднікі часта адзіныя здольныя адпраўляць і/ці прымаць сакральную інфармацыю, адпаведна, належным чынам (дэ)кадуючы яе. Хаця кантакцёрамі могуць служыць і прадметы (у т. л. амулеты, талісманы), большую ролю адыгрываюць усё ж персаніфікаваныя постаці. Гэта могуць быць як звышнатуральныя асобы (архіанёлы, анёлы, херувімы, серафімы і інш.; дэманы, д'яблы, бесы і інш., мерцвякі, прывіды, душы памерлых ці жывых людзей, жывёл, раслін і г. д.), так і чалавечыя асобы. У ліку апошніх можна вылучыць два асноўныя тыпы кантакцёраў: а) прарокі, шаманы — асобы, што ўваходзяць у кантакт у час сну ці бадзёрасці або ў час нейкага спантаннага рытуалу (сюды таксама можна аднесці ведуноў (медыўмаў, знахараў), натуральна, за выняткам іх лекавальнай, тэрапеўтычнай дзейнасці) [11, s. 246—247]*; б) жрацы, ці ахвярнікі (святары) — спецыялізаваныя ўдзельнікі сталага рэлігійнага культу (і часта галоўныя яго выканаўцы)**. Апошнія дзейнічаюць у складзе пэўнага культу, які і служыць кантэкстам іх дзейнасці, і часта існуюць за кошт такога культу. Яны нярэдка паходзяць са жрэчаскіх сем'яў (напрыклад: брахманы, левіты) і спецыяльна падрыхтаваныя для выканання рытуалаў і цырымоній, звычайна, звязаных з прынясеннем ахвяры (часта сімвалічнай) ці пакланеннем звышнатуральнаму суб'екту. Само выкананне такіх дзеянняў ужо азначае для вернікаў пэўны кантакт з сакральным, спробу паўздзейнічаць на яго. У гэтым працэсе ахвярнікі (жрацы) інстытуалізуюць зносіны з суб'ектам, ператвараючы такі кантакт з акта індывідуальнага вопыту (як у пракаў) у сацыяльны інстытут (карпаратыўную акцыю). Калі кантакт прарока, шамана абавязаны яго асабістаму натхненню (сувязю з сакральным) і характару, то кантакт ахвярніка (жраца) залежыць ад яго ролі ў рытуале і досягу да карпаратыўных ведаў і уменняў (звычайна набытых шляхам пераймання, навучання). Святар (ахвярнік, жрэц) дае дабрадаць ці выратаванне з-за сваёй пасады, тады як прарок — праз асабістую харызму [11, s. 268], якая, на думку М. Вебера, на самой справе азначае нейкі кшталт магіі [11, s. 269], чараўніцтва [11, s. 285]. Фактычна прарок з'яўляецца самавольным дэмагогам (звычайна з ліку ляікаў), які імкнецца замяніць традыцыйны рытуал этыкай пераканання [11, s. 285]. З больш рэдкіх тыпаў кантакцёраў можна назваць калектыўны кантакт, калі калектыў вернікаў разам выконвае рытуал ці звяртаецца з просьбай да Бога (багоў) [4, с. 180—182].

Рэлігійныя ўяўленні ці вучэнні ў больш-менш сістэматызаваным выглядзе, а таксама рытуальныя формулы і апісанні, этычныя вучэнні розных рэлігій фармулююцца і існуюць адпачатку ў вуснай форме. Аднак з развіццём і рэлігіі, і цывілізацыі яны часта выкладаюцца і замацоўваюцца ў пісьмовых тэкстах (такія веравызнанні называюць рэлігіямі Пісьма, ці кніжнымі рэлігіямі — «Buchreligion»)***. Пісьмовая форма надае такім рэлігіям стабільнасць



* Відаць, сюды нельга адносіць прадказальнікаў, якія фармальна не звяртаюцца да духаў, а толькі ведаюць правілы іх дзеяння, што дазваляе на падставе назірання сімптомаў прадказваць намеры і паводзіны духаў [11, s. 260]. Але аракул, які звяртаецца з пытаннем да боства, будзе адрозніваецца ад прадказальніка.

** Да іх ліку можна аднесці таксама містагогаў — настаўнікаў ці прапагандыстаў містычных вучэнняў. Звычайна гэта кіраўнікі грамады вучняў ці паслядоўнікаў, для якіх містагог ажыццяўляе містэрыі (патаемныя рытуалы — свайго роду магічныя дзеянні), прызначаныя для пасвечаных і закрытыя для астатніх, звычайна без апірышча на нейкую дактрыну [11, s. 272—273, 307]. Такая грамада звычайна нерэгулярная ў сваім складзе [11, s. 276].

*** Лік такіх рэлігій даволі значны, з найбольш масавых і шырока вядомых можна назваць: індуізм, зараастрызм, канфуцыянства, будызм, даасізм, іудаізм, хрысціянства,

(праз дакладнасць сэнсаў, упарадкаванасць і сістэматызаванасць вучэння) і ўплывовасць (дасяжнасць шырокаму колу атрымальнікаў), што спрыяе павелічэнню колькасці вернікаў і змяншэнню праціўнікаў ці апанентаў. Гэта вядзе да распаўсюджання самой рэлігіі ў свеце, за межы пэўнага племя, этнасу, дзяржавы — так узнікаюць сусветныя рэлігіі.

Сярод усіх рэлігійных тэкстаў вылучаюцца тэксты з максімальнай аўтарытэтнасцю ці з асаблівым статусам, які прынцыпова адрознівае іх ад любых тэкстаў прафаннага свету. Такія тэксты называюцца сакральнымі, паколькі ім (а часам і іх лінгвістычным элементам — літарам, словам, фразам і г. д.)* прыпісваецца сакральнасць — тыя або іншыя ненатуральныя, незвычайныя ўласцівасці [5, с. 77], якіх пазбаўлены ўсе астатнія тэксты свету, рэлігійныя і прафанныя. Да ліку такіх уласцівасцей сакральных тэкстаў адносяць: а) экстрарэальнае паходжанне (нібыта іх стварыў ці паслаў Бог, або ён натхніў на іх напісанне і да т. п. [4, с. 35—37]), б) магічнасць (здольнасць надаваць нейкія незвычайныя сілы ці дазваляць авалодваць імі, каб уплываць на рэчаіснасць), в) святасць (прысутнасць чысціні, беззаганнасць, безграхоўнасць, фактычна — этычнае вымярэнне), г) зразумеласць транцэндэнтным сілам [5, с. 77—79; 4, с. 33—34]. Паводле фідэістычных уяўленняў сакральнае слова ці тэкст валодае асаблівай сілай, магутнасцю і незвычайнымі ўласцівасцямі (напрыклад, дапамагае ўсталёўваць кантакт з Богам ці трансцэндэнтнай рэальнасцю), а таму часта з’яўляецца кампанентам культу. Таму словам і выразам (а часам таксама і літарам / знакам пісьма), усім або толькі частцы, прыпісваецца ў сакральным тэксце дадатковы змест — магічны (сакральны), які не вычэрпваецца звычайнай семантыкай такой адзінкі [4, с. 135—136]. Аднак пераходным рэлігіям (будызму, даасізму, канфуцыянству) фідэістычныя адносіны да слова і рэлігійнага тэксту не ўласцівыя, таму там фактычна няма сакральных тэкстаў [5, с. 141—144], хаця маюцца рэлігійныя і існуе пэўны аўтарытарны дыскурс (напрыклад, загады, указанні і павучэнні настаўнікаў, мудрацоў).

іслам [5, с. 146]. Свае тэксты мелі таксама рэлігіі, якія ўжо не існуюць, напрыклад, старажытнаегіпецкі і старажытнагрэчаскі політэізмы, сінтэтычныя мандэ(а)ізм і маніхейства. На ўзор буйных рэлігій Пісьма некаторыя пазнейшыя рэлігіі, сінкрэтычныя паводле свайго генезісу (былыя секты ці плыні буйных рэлігій), таксама набылі ўласныя тэксты (напрыклад, сікхі, язіды).

* Вернікі могуць прыпісваць сакральнасць не толькі тэксту, але і яго форме ці атрыбутам (літарам, іх элементам, матэрыялам пісьма, на якім ён змяшчаецца, і г. д.) ці выкарыстоўваць тэкст як сакральны аб’ект, талісман, амулет. Валоданне такім артэфактам ці дотык да яго здольны рабіць цудадзейны эфект — вылечваць, ратаваць ад бяды, праганяць дэманаў ці злых духаў і да т. п. Такая сакралізацыя можа быць абмежавана індывідуальнай схільнасцю, а можа інстытуалізоўвацца, замацоўвацца ў догмах і практыцы рэлігіі ці рэлігійнай групы. Нават у хрысціянстве сакральныя тэксты могуць выкарыстоўвацца ў якасці рэліквіі (параўн.: напрастольныя Евангеллі ці Апосталы ў час набажэнства).



Трэба разумець, што сакральнасць толькі прыпісана тэкстам, але не вынікае аб’ектыўна з якіх бы то ні было іх якасцей. Такім чынам, аўтарытэт, высокі статус сакральных тэкстаў грунтуецца толькі на ўяўленнях і ідэях людзей, якія вераць у святасць такіх тэкстаў (ці іх адзінак) — на чалавечым фідэізме. Сакральныя тэксты дэманструюць свае звышнатуральныя ўласцівасці і выяўляюць сваю сувязь з сакральным, як правіла, толькі для прыхільнікаў дадзенай рэлігіі, тады як для астатніх людзей (нават з рэлігійнай свядомасцю) падобнай каштоўнасці не маюць. За межамі групы вернікаў сакральныя ўласцівасці яе рэлігійных тэкстаў могуць не прызнавацца і адхіляцца, разглядацца як звычайныя тэксты — проста рэлігійныя ці нават прафанныя. Патрабаванні і пастулаты пэўнай рэлігіі маюць катэгарычную моц толькі для яе прыхільнікаў. Такім чынам, сакральнасць тэкстаў мае адносны характар, гэта фактычна статус, што самавольна прыпісваецца тэкстам пэўнай рэлігійнай супольнасцю [5, с. 77; 4, с. 13, 31—32]. Адзіная прыкмета сакральнасці тэкстаў палягае толькі ў тым, што іх нехта з пэўнага моманту прызнаў сакральнымі [4, с. 37]. Спецыфіку сакральных тэкстаў вывучае спецыяльная навука — іералогія.

У запісаных сакральных тэкстах змяшчаецца важная для рэлігіі інфармацыя: рытуальныя апісанні і формулы, культавыя прадпісанні, парады і развažанні жрацоў (ахвярнікаў) ці мудрацоў, паведамленне самога Бога ці багоў (т. зв. адкравенне / аб’яўленне), уласна рэлігійнае вучэнне, больш-менш звязнае: пра Бога і яго праявы, свет, веру і выратаванне, пазбаўленне цяжкасцей, пакутаў (у гэтым жыцці ці ў нейкім трансцэндэнтным існаванні пасля смерці), нормы паводзін і да т. п. Гэтая інфармацыя падаецца як выкладзеная прарокамі, жрацамі, мудрацамі ці наогул ананімнымі аўтарамі (чый статус нявызначаны або невядомы), нарэшце, непасрэдна самім Богам ці яго звышнатуральнымі прадстаўнікамі (анёламі, арханёламі і г. д.). Некаторыя даследчыкі падзяляюць галоўныя тэксты рэлігіі на наратыўныя і прэскрыптыўныя, дзелячы першыя яшчэ на гістарычныя і міфалагічныя, а другія — на маральныя і рытуальныя [1, с. 12]. У наратыўных пераважаюць метафары, якія апісваюць перажыванне сакральнага аўтарам, у прэскрыптыўных дамінуюць сімвалы, якія ўказваюць на пэўныя дзеянні і аб’екты, праз якія чытач (слухач) сам можа перажыць сакральнае [1, с. 12—13]. Натуральна, што строгі падзел рэлігійных тэкстаў на такія дыхатаміі даволі ўмоўны [1, с. 13]. Любым больш-менш буйным тэкстам уласцівы даволі разнастайны змест, таму больш падстаў казаць пра такі падзел не саміх тэкстаў, а іх тэматыкі. Суадносіны ў сакральных тэкстах наратыву і прэскрыпцыі, як і рытуалаў ды вераванняў, рэальнасці ды прыдумкі абумоўлены гістарычнымі ўмовамі развіцця той ці іншай рэлігіі. Гэтым таксама абумоўлена і жанравая форма такіх тэкстаў, і іх моўнае выражэнне — мова рэлігійнага тэксту можа быць часткова, а то і цалкам незразумелая (ці нават бессэнсоўная) для вернікаў або для большасці людзей, дасяжнай толькі для кантакцёраў, якія выступаюць інтэрпрэтатарамі такіх сакральных тэкстаў. Тым не менш, гэта ані не ўплывае на высокую аўтарытэтнасць гэтых тэкстаў.

У вачах вернікаў сакральныя тэксты набываюць асаблівы, высокі статус і ўяўляюцца нязменнымі ды шанаванымі [5, с. 131]. Н. Мячкоўская акрэслівае агульную лінгвістычную спецыфіку сакральных тэкстаў: ім уласціва ўзнёслая стылістыка і ўскладненая паэтыка, архаічная мова, супрацьпастаўленая мове штодзённай, а таксама, у пэўных выпадках, — клішаванасць, узнаўляльнасць [5, с. 78]. Я. Верашчагін сярод іншых рыс адзначае цьмянасць, незразумеласць сакральнага тэксту — ён называе гэта тэнэбрознасцю [3, с. 69, 72]. Яна не заўжды дасягаецца архаічнай мовай — у гэтых мэтах могуць выкарыстоўвацца і спецыфічныя літаратурныя прыёмы, такія, як ітэратыўнасць (паўтаральнасць) [3, с. 72]. З-за падобных прыёмаў часам і прафанныя тэксты магчыма зблытаць з сакральнымі (ці замаскіраваць пад апошнія). Відавочна, што падобныя рысы звязаны са спробамі перадаць нумінозн вербальнымі сродкамі, часта ўжо апрабаванымі ў іншых (прафанных) жанрах і тэкстах.

Замацаванне ў пісьмовай форме сакральнай традыцыі звычайна адбываецца ў пэўны момант гісторыі, але не заўжды праходзіць як нейкі аднамаментавы акт — часам ён расцягнуты нават на стагоддзі. Такі акт называецца пісьмовай фіксацыяй, сутнасць яго — афармленне папярэдняй вуснай традыцыі, нярэдка — даволі значнай і працяглай [5, с. 225—226]. Пры гэтым тэксты такой традыцыі звычайна зазнаюць істотныя трансфармацыі, звязаныя з пераходам ад вуснай формы да пісьмовай. Так, змяняюцца спосабы падачы зместу (а часам нават і сам змест) — напрыклад, губляецца значэнне тэмпу, інтанацыі, рытму, з'яўляецца магчымасць уводзіць розныя дэйксісы і канектары, выкарыстоўваць значныя пералікі, згадваць мноства імёнаў, дэталізаваць сюжэт, развіваць кампазіцыю і да т. п.; значэнне набываюць іншыя сродкі: асаблівасці графікі і арфаграфіі (колер і выгляд знакаў пісьма), матэрыялу пісьма, унутраныя адсылкі, кампазіцыйныя асаблівасці, падзел тэксту на часткі (рубрыкацыя) — эрганоміка тэксту і да т. п.

Пераход да пісьмовай стадыі вядзе і да значных сацыяльных наступстваў: пісьмовая фіксацыя парушае эзатэрызм, магічнасць ранейшай вуснай традыцыі — цяпер патаемныя веды ў выглядзе пісьмовых тэкстаў могуць станавіцца здабыткам нават ляікаў [11, s. 279—280]; страчваецца роля вусных захавальнікаў ці выканаўцаў традыцыі, а іх значэнне пераймаюць пісары і архівісты (бібліятэкары) — спецыялісты, што працуюць з тэкстамі. Далейшае функцыянаванне рэлігіі як «кніжнай» цягне за сабой і істотныя сацыяльныя змены. Патрэба правільна карыстацца, разумець і інтэрпрэтаваць сакральныя тэксты ператварае духавенства ў нейкі кшталт літаратараў [11, s. 304] ці дэкламатараў. Адпаведна, яго падрыхтоўка пераходзіць ад нейкага харызматычнага стану да літаратурнай адукацыі [11, s. 280, 366], так, што само духавенства пачынае нават замяшчаць канцылярыстаў [11, s. 280—281] не толькі фігуральна, але і фізічна (параўн. назву канцылярыстаў у Масковіі — дзякі, пад'ячыя).

Пры пісьмовай фіксацыі ранейшай вуснай традыцыі нярэдка ўзнікае некалькі, а то і шмат варыянтаў ці версій сакральнага тэксту (ад крыху неідэнтычных да вельмі адрозных), паколькі такі тэкст можа фіксавацца ў розных рэлігійных цэнтрах і/ці прымаць у свой склад розныя ўплывы і дадаткі [5, с. 134—137], перш за ўсё з боку вуснай традыцыі, якая адразу не адмірае са з'яўленнем пісьмовай перадачы. Гэтыя варыянты ці версіі могуць вольна цыркуляваць або наадварот неяк абмяжоўвацца ў сваім распаўсюджанні, а то і цалкам забараняцца і знішчацца (у пэўным цэнтры, рэгіёне)*. Яны могуць разглядацца як папярэднія, падрыхтоўчыя або скажоныя, ці наогул як няправільныя, шкодныя. Часам варыянты пераходзяць у апакрыфічную літаратуру або нават становяцца сакральнымі тэкстамі ў пэўнай секце, плыні, канфесіі, якая адколваецца ад ранейшай традыцыі, паколькі прапануе яе нейкае інакшае тлумачэнне.

З мэтай абмежавання ўжытку, цыркуляцыі і ўплыву іншых варыянтаў ці версій сакральнага тэксту можа адбывацца яго кадыфікацыя, калі ўсталёўваецца правільнасць (паслядоўнасць) як самога сакральнага тэксту (сюжэту, кампазіцыі, лексіка-сінтаксічнай структуры), так і склад яго частак, кніг [5, с. 132—134]. Пасля гэтага такі сакральны тэкст, як правіла, не ўлягае перагляду або зменам ці дадаткам — ён ахоўваецца і абараняецца ад пашкоджання ці дыверсій [5, с. 131, 231—234], паводле выразу М. Вебера — стэрэатыпізуецца [11, s. 348—350]. Больш таго, такі тэкст часам пачынае разглядацца як існы ад веку [11, s. 348]. Сама кадыфікацыя становіцца актуальнай ва ўмовах пашырэння рэлігіі ці яе канкурэнцыі з іншымі рэлігіямі або вучэннямі [4, с. 34]. Такія працэсы непазбежна суправаджаюцца супярэчнасцямі і спрэчкамі, рознымі тлумачэннямі і інтэрпрэтацыямі. Падобныя кантраверсіі і заклікана пераадолець кансервацыя традыцыі шляхам яе кадыфікацыі; калі такой патрэбы няма, то кадыфікацыя адбываецца вельмі марудна [11, s. 280]. Таму не дзіва, што кадыфікацыя праходзіць менавіта ў крызісныя моманты існавання той ці іншай рэлігіі.

Калі традыцыя фіксуецца і кадыфікуецца ў складзе некалькіх тэкстаў, то можа ўсталёўвацца канон — набор тэкстаў (ці склад яго частак, кампанентаў, сказаў, слоў) пэўнага, фіксаванага зместу і/або пэўнага статусу, якія не падлягаюць адвольным зменам. Канон узнікае або па традыцыі, або вызначаецца

* Гэтак адбылося ва іудаізме і ісламе, дзе практычна цалкам не захавалася ранейшых варыянтаў, ці версій, сакральных тэкстаў, хаця вучоным з розных крыніц вядома, што яны існавалі (напрыклад, у яўрэйскім Св. Пісьме згадваюцца «Кніга войнаў Яхвэ» (Лічбаў 21:14) ці «Кніга Праведнага», Навін 10:13; 2 Царстваў 1:18). Такі неаднолькавы лёс гэтых варыянтаў у розных рэлігіях абумоўлены рознай ступенню сакралізацыі ў іх пісьма (гэта, на думку М. Вебера, азначае захаванне ў рэлігіі элементаў магічнасці [11, s. 280]). Для іудаізму і іслама сакральнымі з'яўляюцца нават сама графіка, літары (паколькі іх сакральныя тэксты — боганатхнёныя, а ў ісламе — нават створаныя Богам і толькі прадыктаваныя анёлам прароку), тады як у хрысціянстве сакралізуецца звычайна толькі змест, а яго знешняя абалонка (літары і словы), якія фактычна належаць прафаннаму свету [4, с. 65]. Хаця час ад часу ў хрысціянстве з'яўляліся вучэнні і секты, што абсалютызавалі графіку і мову (параўн.: Вульгату ў эпоху Сярэднявечча, царкоўнаславянскі тэкст даніканаўскай версіі ў расійскіх стараабрадцаў), іх пазіцыі ніколі не былі татальнымі і звычайна пераадольваліся.

пэўным рэлігійным інстытутам (напрыклад, вярхоўнім святаром (ахвярнікам, жрацом) ці калектывам кампетэнтных асоб) шляхам выдання пэўнага распараджэння ці акта (дакумента) або ўвядзення пэўнага правіла, нормы. Канон можа быць закрытым, калі даданне новых тэкстаў не дапушчаецца, і адкрытым, калі новыя тэксты з цягам часу могуць дадавацца (гэтак, напрыклад, у індуізме). Аднак на працягу шматлікіх стагоддзяў перапіскі ў розных мясцінах нават у кананічных і недатыкальных тэкстах непазбежна назапашваюцца памылкі і адхіленні (іх мінімальная колькасць у Торы і ў Каране), якія так або інакш выдаляюцца і касуюцца, што патрабуе абачлівай рэдактуры і больш-менш пільнага ды сталага кантролю.

У розных рэлігіях назіраецца рознае стаўленне ў справе досягу яе прыхільнікаў да сакральнага тэксту і яго выкарыстання ў рытуале. Часам досяг да сакральных тэкстаў (напрыклад, іх чытанне і публічнае абмеркаванне або тлумачэнне) штучна абмежаваны (а то і забаронены зусім, як для ніжэйшых шыхтоў і кастаў у індуізме) і магчымы толькі для пасвечаных ці абраннікаў (імі звычайна з'яўляюцца ахвярнікі (жрацы), пракрокі, шаманы або нават пэўныя групы насельніцтва, як, напрыклад, вышэйшыя касты ў індуізме ці хрысціянскае духавенства ў эпоху Сярэднявечча) або толькі пасля выканання пэўных абрадаў ці здабыцця пэўнай адукацыі, кампетэнцыі, узросту, сацыяльнага статусу і да т. п. Гэта робіцца з мэтай пазбегнуць «няправільнага» разумення ці выкарыстання такіх тэкстаў [4, с. 33]. Зрэдку яны могуць захоўвацца ў патаемнасці, але ўсё ж часцей прапагандуюцца. У іншых рэлігіях досяг да сакральных тэкстаў больш ці зусім вольны, але і там можа патрабавацца піетэт ці пэўны псіхалагічны настрой (ад канцэнтрацыі ўвагі да экстазу) нават пры асабістым чытанні ці цытаванні (звычайна ў рэлігійным асяроддзі). Нашмат складаней абыходжанне з сакральным тэкстам пры выкарыстанні яго ў рытуале. Тут можа існаваць мноства акрэсленых і шчыльна кантраляваных патрабаванняў да зачытвання ці вымаўлення або цытацыі, да голасу, гучнасці, інтанацыі, тэмбру, рытму і г. д., да якасці і памеру матэрыялу пісьма, колеру і выгляду пісьмовых знакаў, да ўзяцця ў рукі ці ўручэння іншым асобам і г. д., выкананне розных спецыфічных маніпуляцый з сакральным тэкстам (перапіска, пераклад, тлумачэнне, рэдагаванне і да т. п.). Прычыны такой ізаляцыі сакральных тэкстаў у асноўным абумоўлены прафесійнымі мэтамі [11, s. 279]. Нярэдка парушэнне існуючых правілаў досягу да сакральнага тэксту ці яго выкарыстання ў рытуале можа акрэслівацца як яго прафанацыя (разбурэнне сакральнасці тэксту і/ці рытуалу, у якім ён выкарыстоўваецца), зграшэнне ці грэх або злачынства, што можа цягнуць няшчасці і пакаранні (у розным маштабе — толькі для асобы, што дапусціла падобную прафанацыю, ці для ўсёй сацыяльнай або этнічнай групы, якую такая асоба прадстаўляе, і г. д.).

На з'яўленні сакральнага тэксту працэс тварэння далейшай рэлігійнай літаратуры ў рэлігіях Пісьма, як правіла, не спыняецца. Існаванне пэўнага культу і яго функцыянераў (ахвярнікаў, ці жрацоў) і тым больш усталяванне рэлігійнай



арганізацыі — царквы — звычайна цягне за сабой развіццё разнастайнай рэлігійнай літаратуры (асабліва значных памераў яна дасягнула ў хрысціянстве і будызме). Пад уплывам культавай ці царкоўнай практыкі вакол зафіксаваных на пісьме сакральных тэкстаў паступова ўтвараецца далейшая рэлігійная літаратура, якая складаецца з тлумачальных, культавых, дапаможных і пераходных тэкстаў [6, с. 17—23, 78—79]. Параўнальна з сакральнымі, яны маюць ужо ніжэйшы статус і аўтарытэт, успрымаюцца як перыферыйныя, факультатыўныя, менш аўтарытэтныя ды абавязковыя і дапускаюць змены, пераробкі, рэдактуры і да т. п. [5, с. 134, 148—149, 159]. У выніку ўзнікае цэлы комплекс рэлігійных тэкстаў, вельмі разнастайных паводле сваёй формы і жанру, аб'ёму, паходжання і функцыі, а таксама ступені сакральнасці і аўтарытэтнасці. Такім чынам, далёка не ўсе рэлігійныя тэксты з'яўляюцца сакральнымі [4, с. 31—32]. У сувязі з гэтым некаторыя даследчыкі гавораць пра іерархію рэлігійных тэкстаў, вылучаючы сярод іх першасныя і другасныя (у генетычным і зместавым плане) [5, с. 148—149, 158—159]. На практыцы падобны падзел правесці даволі складана, паколькі статусы многіх тэкстаў і жанраў не аднолькавыя ў розных кантэкстах (у сферах ужытку, канфесіях / сектах, рэгіёнах / культурах, эпохах і да т. п.), што прыводзіць да разыходжання паміж рэальнай функцыяй такіх твораў (жанраў) у дадзенай рэлігіі (царкве, канфесіі, секце), у дадзеную канкрэтную эпоху і тым значэннем, што прыпісваецца тэкстам тэалогіяй ці догмай*. (Прыкладам можа служыць Апакаліпсіс у каталіцтве і ў грэка-візантыйскім праваслаўі: у першай канфесіі ён выкарыстоўваецца ў набажэнстве, у апошняй — не, адпаведна і рэальная распаўсюджанасць такога тэксту ў пісьменстве будзе ў гэтых канфесіях эпохі Сярэднявечча рознай).

У складзе далейшай рэлігійнай літаратуры вылучаюць комплекс асабліва аўтарытэтных тэкстаў — т. зв. Св. Паданне (уласціва хрысціянству і іудаізму), якое перадае (першапачаткова — у вуснай форме) догму, дух і сутнасць рэлігійнага вучэння (ад найбольш аўтарытэтных настаўнікаў ці іншых крыніц) [6, с. 8]. У хрысціянстве да Падання адносяцца творы вучняў Хрыста — апосталаў і яго паслядоўнікаў як бліжэйшых у часе (евангелістаў), так і духоўных (якія зносіліся трансцэндэнтна) — т. зв. Айцоў і Дактароў Царквы, святых і блаславёных,

* Догма — гэта, уласна, вучэнне святароў пра сэнс Адкравення (Аб'яўлення) і рэлігійнай традыцыі, якія якраз і тлумачацца з дапамогай дагматаў [11, s. 279]. Такім чынам, догма (і дагмат) — гэта не тое, што прадстаўлена ў Св. Пісьме (па меншай ступені, эксплiцытна), а тое, што выводзіцца з яго: нейкае цэласнае вучэнне (царквы ці духавенства). Дагматы адрозніваюць рэлігію ці прароцтва ад магіі [11, s. 340—341], аднак уласцівыя толькім некаторым рэлігіям (хрысціянству, іудаізму, ісламу, зараастрызму), хаця развітая і разнастайная дагматыка (веданне якой часткова нават абавязкова для нецаркоўнікаў) склалася толькі ў хрысціянстве [11, s. 281—282, 341]. У іншых рэлігіях (напрыклад, ведыйскай, канфуцыянстве) афіцыйная дагматыка адсутнічае (яе замяняюць больш-менш артадаксальныя меркаванні філосафаў), а святары ці выканаўцы культу з'яўляюцца і носьбітамі, і перадатчыкамі сакральных ведаў [11, s. 341].

тэолагаў, царкоўных пісьменнікаў і правазнаўцаў і інш. [5, с. 161—166]. Іх часта называюць яшчэ патрыстычнымі творамі, ці патрыстыкай [6, с. 2—4], у жанравых адносінах яны вельмі разнастайныя. «Корпус патрыстычных твораў практычна неабсяжны», у плане ж зместу яны характарызуюцца павышанай увагай да логіка-тэарэтычных і дактрынальных аспектаў тэалогіі [5, с. 163]. Аднак мяжа тэкстаў Св. Падання з астатнімі рэлігійнымі, але несакральнымі тэкстамі ў хрысціянстве не вельмі выразная і не заўжды можа быць праведзена дакладна, а калі і праведзена, то застанецца ў значнай ступені ўмоўнай ці прыблізнай. У выніку гістарычнага развіцця Св. Паданне набывае вельмі важнае значэнне ў вачах традыцыяналістаў і кансерватараў. Яго нават пачынаюць супрацьстаўляць Св. Пісьму, сцвярджаючы, што ў асобных выпадках і пытаннях Св. Паданне яму роўнае ці нават пераўзыходзіць: Св. Пісьмо няпоўнае ці не да канца зразумелае без Св. Падання [5, с. 164—165]. У пэўны момант абсалютызацыя гэтай пазіцыі ў каталіцызме прывяла, напрыклад, да выбуху Рэфармацыі ў XVI ст., калі пратэстанты адхілілі значэнне Св. Падання (яго сталі лічыць толькі калекцыяй дакументаў царкоўнага жыцця, помнікамі царкоўнай гісторыі, уключаючы туды нават ерэтычныя творы [6, с. 12, 15, 16]) і абвясцілі прымат Св. Пісьма.

Пад уплывам сакральных і аўтарытэтных (Св. Падання) тэкстаў, але часткова разам, паралельна з імі ўзнікае і развіваецца апакрыфічная літаратура [5, с. 138—139]. Яна ўяўляе сабой своеасаблівую (часта — больш мастацкую ці займальную) сюжэтную і тэматычную (а часта і жанравую ды функцыянальную) паралель да кананічнай, афіцыйнай рэлігійнай літаратуры (у асноўным Св. Пісьма і часткова Св. Падання — з апошняга вядомыя апакрыфічныя жыцці, фіктыўныя казанні, псеўдасвятыя і да т. п.). Адны апокрыфы паходзяць з ранніх часоў і з'яўляюцца больш-менш блізкімі сучаснікамі кананічных тэкстаў (проста з розных прычын не былі ўключаны ў канон або былі выключаны з яго), іх перайманнямі або стылізацыямі, іншыя маюць позняе паходжанне і фактычна з'яўляюцца другаснымі (і часта літаратурнымі) творамі, якія ўзніклі ў мэтах развіцця ці дэталізацыі ўжо існуючых кананічных ці афіцыйных твораў, у якасці стылізацыі ці рэплікі на іх і да т. п. Таму не ўсе апокрыфы маюць аднолькавы статус, некаторыя з іх прызнаюцца фальшыўкамі (падробкамі) ці прыдумкамі (стылізацыямі, ці перайманнямі), іншыя — ерэтычнымі творамі, вартымі знішчэння; гэта ўплывае на захаванасць апокрыфа і яго распаўсюджанасць*.

Як бачна, рэлігійнае пісьменства далёка неаднароднае, у ім можна вылучыць пэўныя часткі, ці складнікі, адрозныя паводле ступені сваёй сакральнасці і аўтарытэтнасці: а) сакральныя тэксты (Св. Пісьмо), б) высокааўтарытэтныя рэлігійныя тэксты, блізкія ці нават тоесныя сакральным (Св. Паданне), в) іншыя рэлігійныя тэксты (за выключэннем апакрыфічных), г) апакрыфічныя тэксты,

* У пазнейшыя часы да апакрыфічных у хрысціянстве адносілі таксама тэксты паўпаганскага зместу — астралагічныя, гадальныя, чараўнічыя, соннікі, зборнікі прыкмет, закляццяў і да т. п. Фігуральна апокрыфамі ў антыклерыкальнай літаратуры маглі называцца таксама забароненыя царкоўнымі творы ці кнігі, нават не звязаныя з рэлігіяй.



д) паліятыўныя, ці паўканфесіянальныя тэксты (пераходныя да свецкіх). У цэнтры рэлігійнага пісьменства заўжды знаходзяцца сакральныя тэксты, якія фактычна арганізуюць яго вакол сябе. Яны карыстаюцца найвышэйшай пашанай унутры супольнаці прыхільнікаў дадзенай рэлігіі, якія разглядаюць такія тэксты як (паў)магічныя і звышнатуральныя. Але сакральныя тэксты — гэта тэксты з меркаванай, прыпісанай сакральнасцю, якая актуальная толькі ў межах дадзенай рэлігійнай супольнасці. Яе члены лічаць і вераць, што такія тэксты ажыццяўляюць ці дапамагаюць ажыццяўляць рэлігійную камунікацыю, якая палягае ў зносінах паміж людзьмі і звышрэальным(і) сакральным(і) суб'ектам(і) ці сілай. Такія зносіны заснаваныя на чалавечым фідэізме і адбываюцца па розных каналах як вербальных, так і невербальных. Аднак у сваім развіцці сакральныя тэксты выяўляюць тыя ж тэндэнцыі, што і любыя іншыя аўтарытэтныя, прэцэдэнтныя тэксты: яны маюць вусную традыцыю і здабываюць у пэўны момант пісьмовую фіксацыю, праходзяць праз стадыі кадыфікацыі і кананізацыі, могуць канкураваць са сваімі варыянтамі. Пры гэтым мяжа паміж сакральнымі тэкстамі і бліжэйшымі да іх іншымі рэлігійнымі тэкстамі не заўжды выразная.

Літаратура


1. Арапов, А. В. Герменевтика сакрального текста [автореф. дисс. на соиск. уч. степ. доктора философ. наук] / А. В. Арапов. — Тула, 2007.
2. Варзонин, Ю. Специфика сакральной коммуникации / Ю. Варзонин, А. Ковтун // Коммуникативное пространство: измерения, пределы, возможности: Материалы выступлений на V Международной конференции РКА «Коммуникация-2010» / под ред. М. Б. Бергельсон, М. К. Раскладкиной. — М., 2010. — С. 132—137.
3. Верещагин, Е. М. К постижению природы сакрального текста: бытование Псалтыри на Руси, в России / Е. М. Верещагин // Язык Библии: лингвотекстологические исследования. — М.; СПб., 2012. — С. 63—74.
4. Гриненко, Г. В. Сакральные тексты и сакральная коммуникация: Логико-семиотический анализ вербальной магии / Г. В. Гриненко. — М., 2000.
5. Мечковская, Н. Б. Язык и религия: Лекции по филологии и истории религий: учебн. пособ. / Н. Б. Мечковская — М., 1998.
6. Сидоров, А. И. Курс патрологии: Возникновение церковной письменности / А. И. Сидоров. — М., 1996.
7. Durkheim, E. Les formes élémentaires de la vie religieuse: Le système totémique en Australie / E. Durkheim. — [2-me éd. revue]. — Paris, 1925. (Travaux de l'année sociologique).
8. Otto, R. Das Heilige: Über das Irrationale in der Idee des Göttlichen und sein Verhältnis zum Rationalen / R. Otto. — München, 1963.
9. Striver, D. R. The Philosophy of Religious Language: Sign, Symbol, and Story / D. R. Striver. — Cambridge / Mass., 1996.
10. Tylor, E. B. Primitive Culture: Researches into the Development of Mythology, Philosophy, Religion, Language, Art, and Custom: in 2 vols. / E. B. Tylor. — London, 1871. — Vol. 2.
11. Weber, M. Kapitel V. Religionssoziologie (Typen religiöser Vergemeinschaftung) / M. Weber // Weber M. Wirtschaft und Gesellschaft: Grundriß der verstehenden Soziologie / Besorgt J. Winckelmann. — [5. Aufl.] — Tübingen, 1980. — S. 245—381.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 22.06.2015*

**И. Н. Вибе,**
*научный сотрудник Российской национальной библиотеки,*
*кандидат исторических наук;*
e-mail: irinavibe@yandex.ru

**А. И. Раздорский,**
*заведующий группой исторической библиографии*
*Российской национальной библиотеки,*
*кандидат исторических наук;*
e-mail: razdorv@ner.ru

# «СВЕДЕНИЯ ИЛИ ОПИСАНИЯ ЦЕРКВЕЙ МОГИЛЕВСКОЙ ЕПАРХИИ» 1832 ГОДА (ИСТОЧНИКОВЕДЧЕСКАЯ ХАРАКТЕРИСТИКА)

Описания отдельных епархий Русской православной церкви, составленные в период с конца XVIII в. до 1917 г., являются исключительно ценными источниками по отечественной региональной истории, причем не только церковной. Особую значимость епархиальным описаниям придает то обстоятельство, что в большинстве из них содержатся собранные и обработанные по единой программе разнообразные сведения (порой весьма подробные) о самых мелких церковно-административных территориальных единицах Российской империи — приходах*.

Систематическое составление историко-статистических описаний епархий началось после принятия особого определения Синода на этот счет от 19 мая — 6 октября 1850 г. [1]. На основе таких описаний, которые должны были готовить преподаватели местных духовных академий и семинарий или другие лица духовного ведомства, имеющие интерес к историческим исследованиям, планировалось создать общий курс истории Российской церкви. Однако попытки составления епархиальных описаний неоднократно предпринимались задолго до синодального определения 1850 г.

Наиболее ранняя из известных в настоящее время работ подобного рода относится еще к концу XVIII в. Это «Подробное историческое описание Архангельской епархии», составленное, предположительно, студентом Московского университета Л. М. Максимовичем по благословению архангельского епископа Вениамина (Румовского-Краснопевкова). Впервые оно было опубликовано на страницах «Любопытного месяцеслова» в 1795 г. [2].

Несколько раз к составлению описаний отдельных епархий приступали в 1830-е гг.

* Подробнее об епархиальных описаниях см.: Раздорский, А. И. Историко-статистические описания епархий Русской православной церкви (1848—1916): Свод. кат. и указ. содерж. — СПб., 2007. — 960 с. Всего с 1795 по 1917 г. было опубликовано 61 историко-статистическое описание по 42 епархиям (на 1917 г. в Российской церкви насчитывалось 68 епархий и 1 экзархат).



В самом начале 1830-х гг. олонецкий епископ (с 1835 г. — архиепископ) Игнатий (Семенов) решил собрать исторические сведения обо всех приходских церквах Олонецкой епархии. В 1832 г. архиерей получил от причтов материалы по 135 приходам, оставшиеся неопубликованными [3].

В 1836 г. курский губернатор М. Н. Муравьев предложил местному епископу Илиодору (Чистякову) собрать историко-статистические сведения о Курской епархии. Губернатор просил архиерея, в частности, дать распоряжение о собирании в церковных и монастырских архивах различных «летописей и старинных описаний». Особое значение придавалось составлению описаний отдельных церквей и монастырей. Для сбора сведений была разработана специальная программа. Результаты ее реализации неизвестны. Скорее всего, запрошенные сведения в полном объеме так и не были собраны, а после того, как Муравьев в 1839 г. покинул Курск, работа по составлению описания была свернута [4].

В том же 1836 г. член Оренбургского губернского статистического комитета и присутствующий член Оренбургской духовной консистории протоиерей Иоанн Бреев представил в местную духовную консисторию подробную «Программу главнейших статистических вопросов, относящихся до описания состояния церквей Оренбургской епархии и их духовенства». По указу Оренбургской духовной консистории, утвержденному епископом Иоанникием (Образцовым), копии с этой программы были разосланы в духовные правления и благочинным. В течение 1837—1839 гг. с мест были получены сведения по отдельным приходам. Однако завершить работу над описанием Оренбургской епархии и напечатать его тогда так и не удалось [5].

Более удачно сложилась судьба описания Могилевской епархии, составленного в 1832 г. В отличие от описаний Олонецкой, Курской и Оренбургской епархий, по которым в 1830-е гг. велся только сбор материалов, могилевское описание было полностью завершено. Публикация его, впрочем, так и не состоялась и, надо полагать, изначально не предусматривалась составителями.

Эта рукопись имеет заглавие «Сведения или Описания церквей Могилевской епархии, учиненные Калужского кафедрального собора протоиереем Симеоном Зверевым». В настоящее время она хранится в Российском государственном историческом архиве (РГИА) в Санкт-Петербурге в фонде 834 (Рукописи Синода) [6], в состав которого входят самые разные (в основном неизданные) материалы, относящиеся преимущественно к истории Православной церкви [7].

Помимо могилевского описания 1832 г. в фонде 834 находятся еще 25 рукописей, представляющих собой полные епархиальные описания или их отдельные составные части, относящиеся к 13 епархиям. Все они датируются

(прямым образом или по косвенным признакам) 1850-ми гг., т. е. были составлены во исполнение синодального определения 1850 г.*

Описание Могилевской епархии не имеет точной даты составления. Время завершения работы над ним может быть определено по датам составления описаний отдельных благочиний. Первое из них, описание Могилевского кафедрального собора, датировано 11 июля 1832 г., последнее — 11 декабря того же года.

Рукопись «Сведений» помещена в переплет из плотного картона (размер 36×22,5 см), оклеенный листами тонкой темно-коричневой бумаги. Углы переплета дополнительно оклеены более плотной бумагой песочного цвета. Корешок рукописи сделан из такой же бумаги песочного цвета. По всему корешку присутствуют небольшие пятна, внизу мелкие дырочки, по верхнему и нижнему краям множественные разрывы. Края верхней и нижней крышек переплета со стороны обреза (в особенности углы) сильно деформированы: картон расслоился, бумага обтрепалась. По центру верхней крышки переплета наклеен лист желтоватой бумаги прямоугольной формы (размер 19×17,5 см), со срезанными углами. На нем коричневыми чернилами, местами стершимися, крупным писарским почерком написано заглавие рукописи. Над заглавием в верхнем правом углу листа сделана карандашная отметка: »I». В верхнем левом углу верхней крышки переплета наклеен листок бумаги квадратной формы (размер 5,8×5,8 см) с надписью: «Рукопись № 1798 Архива Святейшаго Синода», в нижнем левом углу — листок бумаги прямоугольной формы (размер 7,5×5,2 см) с архивным шифром. На корешке внизу напечатано: «Библиотеки при Святейшем Правительствующем Синоде. Отд. I (рукописи). Шк. № 32. Пол. №». По центру корешка чернилами проставлено число 45, а в верхней части карандашом — число 18.

В рукописи 392 пронумерованных листа, фолиация сквозная, номера листов проставлены на лицевой стороне, в верхнем правом углу, арабскими цифрами, коричневыми чернилами. Кроме того, в рукописи присутствуют пять незаполненных литерных листов (11а, 78а, 201а, 242а, 305а), их фолиация проставлена карандашом, а затем перечеркнута чернилами. В начале и в конце рукописи находится по одному незаполненному и непронумерованному листу. На обороте листа 392 присутствуют подпись («Калужского кафедрального собора протоиерей Симеон Зверев») и скрепа («В сей книге перенумерованных триста девяноста два листа. Титулярный советник Нестеров»).

* В их число входят полные описания епархий Владимирской (в 2-х ч.), Могилевской (1852 г.), Оренбургской, Подольской, Полоцкой, Смоленской и отдельные составные части епархий Вятской, Кавказской, Кишиневской (4 рукописи), Пензенской (8 рукописей), Рязанской (2 рукописи), Санкт-Петербургской и Симбирской. О рукописных описаниях Могилевской и Полоцкой епархий подробнее см.: Раздорский, А. И. 1) Рукописные описания Могилевской епархии XIX в. в РГИА // Белорусский сборник: Статьи и материалы по истории и культуре Белоруссии. — СПб., 2005. — Вып. 3. — С. 152—155; 2) Историко-статистическое описание Полоцкой епархии Ксенофонта Говорского и судьба древнего Полоцкого архива // Археографический ежегодник за 2002 г. —М., 2004. — С. 117—126.



Текст рукописи написан на листах желтоватой бумаги. Их размеры неодинаковы, колеблются между 35—35,5 см в длину и 22—22,5 см в ширину. Листы сшиты в 35 тетрадей, от 2 до 24 листов в каждой. Некоторые листы рукописи имеют дефекты: частично оторваны от прошивки, продырявлены, протерты, испачканы желтоватыми и темными пятнами. При создании рукописи использовалась бумага двух видов. Бумага первого вида (листы рукописи с 1 по 201 и с 389 по 392) — плотная, имеет водяные знаки: филигрань «колокол с крестом», литеры KL, цифры года выпуска бумаги (на листах 1—11, 64—69 — 1828, на листах 12—63, 70—110, 389—392 — 1830, на листах 111—201 — 1831; в последнем случае под номером года помещено еще число 12). Бумага второго вида (листы рукописи с 202 по 388) имеет водяные знаки: литеры АИБ и цифры года выпуска (на листах с 367 по 388 — 1831, на листах с 202 по 366 — 1832). Бумага этого вида, выпущенная в 1832 г., — тонкая, в 1831 г. — плотнее, но менее плотная, чем бумага первого вида.

Текст рукописи написан темно-коричневыми чернилами, разными почерками, аккуратно и в основном разборчиво, с немногочисленными исправлениями, иногда с грамматическими и орфографическими ошибками. Трудно разобрать только отдельные подписи членов причтов и церковных старост, лично или с помощью доверенного лица (по причине неграмотности или болезни) скреплявших сведения по церквам. Дополнения, пояснения, вставки в основном тексте и на полях всегда сделаны тем же почерком (т. е. теми же лицами, позднее). На некоторых листах заметны стертые записи, взамен которых сделаны другие. По всем листам рукописи имеются скрепы чернилами: «Читал епископ Могилевский и Витебский Гавриил», «Калужский кафедральный Троицкого собора протоиерей Симеон Зверев», «Могилевский благочинный Могилевского кафедрального Иосифовского собора протоиерей Иаков Гладкой». На листах описаний каждого благочиния имеются скрепы благочинных.

Кроме того, рукопись содержит пометы и тексты, свидетельствующие о редакторской работе. Во-первых, над номером описания каждой церкви поставлен крестик, означающий, по-видимому, прочтение редактором. Во-вторых, по двум благочиниям рукою Зверева вписано: «Сколько римско-католических костелов, униатских церквей и часовен находится в ведомстве сего благочиния, ведомости благочинным и по предписанию из консистории не доставлено. Между тем, мною лично усмотрено, что Православная церковь в сем благочинии и во всей Витебской губернии находится среди многих римско-католических костелов, униатских церквей и каплиц. Калужского кафедрального собора протоиерей Симеон Зверев» (л. 329; схожий текст вписан на л. 349).

«Сведения» содержат информацию о 380 православных церквях Могилевской епархии. Весь текст единообразно оформлен. Данные по каждому бла-

гочинию, как правило, начинаются с нового листа, с соответствующим заглавием, отделенным от дальнейшего текста горизонтальной линией. В заглавие входят сведения о центре прихода: название, территориальная принадлежность, имя и фамилия благочинного, дата составления донесения («Могилевского уезда ведомства благочиния Могилевской Николаевской церкви протоиерея Иоанна Вонсевича 16 июля 1832 года» или «Копыского уезда ведомства благочиния Святодуховской, что в селе Русаках, церкви священника Василия Славецкого июля 25 числа 1832 года»). После заглавия следуют три колонки. В первой пронумерованы церкви, во второй помещены их описания, в третьей внесены заверяющие скрепы. Представление о структуре рукописи дает роспись ее содержания, помещенная в приложении к настоящей статье.

Описания приходов составлялись по единому формуляру, включавшему следующие разделы: 1) о церкви — название, местоположение (город, село, иногда протекающая река), теплая или холодная, материал постройки (каменная, деревянная, часто с указанием еще и материала крыши), физическое состояние фундамента, колокольни, иконостаса и икон, с указанием их количества и качества, обеспеченность церковной утварью (в некоторых описаниях с подробным перечнем наличного), ризницей, богослужебными книгами (иногда с указанием их состояния), с перечнем недостающих (церковный устав, месячные минеи, нотный октоих, ирмологий и др.), имеющаяся земля (отдельно количество пашенной, сенокосной, усадебной) и ее качество, расстояние до нее от церкви, способ использования (например, «священноцерковнослужители владеют и обрабатывают сами»), иногда с отметкой о ведущихся по ней судебных тяжбах, наличная церковная кошельковая сумма (иногда ее назначение); 2) о приходе — число дворов и душ мужского пола, сословный состав, материальное положение и владельческая принадлежность прихожан (во владении помещиков, католического ордена, казны и др.), фамилии и имена помещиков (с указанием их материального положения, часто вероисповедной принадлежности), имеющихся земельных владениях, производящихся в судах спорных делах между землевладельцами и приходом; 3) о причте — штатный и наличный состав, условия и место проживания (иногда с пояснением причин отсутствия жилья или его плохого состояния), наличие или отсутствие вспомогательного денежного оклада (с указанием причин назначения, иногда времени, с которого выделен). Описания по каждому благочинию завершаются таблицей, в которой указаны местоположение и количество каплиц, костелов, униатских церквей и католических монастырей (кляшторов).

Форма и порядок изложения сведений по церквям, как представляется, были заранее определены организаторами описания Могилевской епархии — лицами, чьи скрепы присутствуют на листах рукописи. Какие-либо инструктивные документы на этот счет выявить пока не удалось. Но судя по оформлению и структуре текстов, данная рукопись — это сводный беловой вариант, подготовленный в консистории по подлинным рапортам и донесениям из благочиний. Основным источником информации для непосредственных составителей были, по-видимому, клировые ведомости, содержавшие различные сведения о церковно-приходской жизни — о церковных сооружениях (с указанием времени постройки, случившихся пожаров, произведенных ремонтов и выделенных на них денежных средств), составе причта (с биографическими сведениями и послужными списками), приходе и многое другое. Информация в «Сведениях» дана более сжато и не персонифицирована. Такая обобщенная форма описания была продиктована, вероятно, политическими потребностями момента. После Польского восстания 1830—1831 гг. территория Западного края была взята под особый контроль российской администрации. Для планирования преобразований в регионе, в частности, унификации религиозной жизни (все это обсуждалось тогда в Комитете по делам Западных губерний), важно было быстро собрать данные обо всех православных церквях.



Поэтому, несмотря на заданную единую форму, присланные с мест описания отличались по информационной насыщенности, которая зависела от возможности представить данные по той или иной церкви в установленные сроки, личного интереса и добросовестности составителей. В «Сведениях» немало описаний, включавших, помимо односложных ответов на вопросы формуляра, пространные пояснения и дополнения — размышления об улучшении материального положения приходов, о повышении статуса православия в Западном крае и о многом другом. Для сравнения приведем несколько вариантов описаний.

Краткое, формальное описание выглядит так: «Петропавловская, что в селе Черных, церковь деревянная, холодная, с такою же колокольнею, иконостас в ней довольно тверд, иконы благоприличны, утварью, ризницею и книгами для служения достаточна. Земли при сей церкви усадебной, пашенной и сенокосной 36 десятин и 54 сажени, которая к плодородию не вся удобна, ибо зарощена во многих местах лесом. Сею землею священноцерковнослужители владеют и обрабатывают сами. Церковной суммы на лице 2 р[убля] 31 к[опейка]. Приходских дворов 97, в них мужеска пола душ 391. Домы у священноцерковнослужителей собственные, деревянные, на церковной земле устроенные, у священника весьма благоприлично и хозяйственным образом, священник, находящийся на дьяческой вакансии, Иоанн Демьянов Карножицкий имеет ветхий дом, а пономарь по недавнему определению к сей церкви не имеет таковаго, а проживает в богадельне, впрочем, для построения ему дома церковная земля имеется. По штату при сей церкви положено быть одному священнику, дьячку и пономарю, кои и состоят на лице. Причту сей церкви по малому количеству удобной к плодородию земли и бедности прихода назначен вспомогательный 300 р[ублевый] оклад, который и имеет быть получаем с 1832 года» (л. 15 об.).

Однако встречаются в «Сведениях» и значительно более подробные описания. Например: «Архангельская, что в селе Мокрядках, церковь деревянная,

холодная, выстроена в 1825 году из домовой княгини Стурдзы церкви, вместо сожженной в 1816 году, но как сия церковь построена из домовой ветхой, то и сия вновь выстроенная имеет в стенах ветхости до того, что в углах есть скважины, чрез кои проходит дождь, и сия церковь имеет вид похожий на амбар, поелику нет ни купола, ни главы, ни паперти, покрыта дранью, в стенах на место сгнивших бревен вставлены тонкие осиновые; пол намощен из мелких неровных досок; колокольня старая, ветхая, покачнувшаяся на одну сторону, поддерживается многими подпорками. Внутри иконостас написан самым худым искусством на холсте, на престоле одежда ситцовая, на жертвеннике набойчатая простого холста; сосуды медные, трое риз, одни белокосовые, другие полуштофные голубые, третьи шалоновые*, но и сии пожертвованы в Москве бывшему там с просительною книгою прихожанину. Книг служебных недостает Устава церковного, Апостола месячных миней, Октоиха на восемь главов, нотных Ирмология и Октоиха. Суммы церковной кошельковой, собранной с просительною книгою 439 рублей 59 к[опеек]. Выстроить новую церковь прихожане помещики по бедности не в состоянии и при том вероисповедания католического, а потому и не думают о сооружении приличного храма. Каммер-герша Варвара Николаевна Нарышкина, содержащая вероисповедание грекороссийское, имеющая в сем приходе 275 душ, с 1816 года не может решиться приступить к построению церкви, в селе ли Мокрядках на прежнем месте, или в сельце Павловке в своем имении, хотя многократно к сему убеждаема была и предложениями духовного начальства, и прошением священника. Ныне сего 1832 года августа 13 дня означенная помещица каммер-герша Варвара Нарышкина данною подпискою обязалась, вместо ветхой деревянной Архангельской церкви, состоящей в оном селе, выстроить в сельце Павловке, где находится дом ее с принадлежащим заведением, новую деревянную же церковь, о чем по приготовлении материала имеет особо просить епархиальное начальство, с приложением плана и фасада на предполагаемую церковь. Ежели же что попрепятствует ей исполнить сие ее желание, в таком случае принимает на себя обязанность оказать пособие в устройстве на сем же месте настоящей Мокрядской церкви. Существование сей церкви в сем приходе необходимо потому, что сей приход окружен униатами, которыми прихожане, не имея церкви и священника, могут быть совращены из православия в католическое вероисповедание. На содержание нового благоприличного храма и на устроение утвари церковной к поступающему от просительной книги доходу потребно наличной суммы до 3000 рублей. Земли при сей церкви усадебной, пашенной и сенокосной 36 десятин, которою владеют священноцерковнослужители сами, а обрабатывают им сию землю прихожане. Приходских дворов 104, в них мужеска пола душ 425. По штату положено при сей церкви священник и два причетника, а на лице

* Перечисляются виды тканей облачения духовных лиц: белокосовая — шелковая ткань с травами и разводами; полуштофная — плотная полушерстяная или полушелковая с крупным тканным рисунком; шалоновая — тонкая шерстяная саржевого плетения.



один священник. Дом священника на церковной земле собственный, устроен хозяйственно. По малому числу прихожан бедных крестьян положен сему причту вспомогательный 300 рублевый оклад, который имеет быть получаем с 1832 года» (л. 99 об.—100 об.).

Различие представленных с мест донесений заключалось не только в степени подробности описания местных церковных реалий. Некоторые православные священники сочли необходимым высказать и свои соображения о желательных общих мероприятиях правительства в религиозной сфере. По-видимому, такой подход местных священнослужителей к поставленной задаче вполне одобрялся и церковными властями региона.

В этой связи показательны многочисленные сюжеты о католических монастырях, костелах и их прихожанах, по собственной инициативе включавшиеся в донесения представителями местных причтов. Помимо фактических сведений о быте католических приходов, православные священники давали и рекомендации на их счет, исходя из интересов православия в крае. Так, например, причт Успенской церкви в селе Радомле сообщал, что по соседству с церковью находится «огромный деревянный католический кармелитанский* монастырь на казенной земле, на которой помещены домы трех ксендзов с садом и со всеми домашними принадлежностями; все сие строение занимает собою земли более десяти десятин. Сим римско-католическим монастырем обижается и церковь православная, и служители ее; церковь потому, что ксендзы чрез помещиков, содержащих католическое вероисповедание, совращают православных в свое вероисповедание», а «звук органа заглушает в церкви пение одного причетника»; тот же монастырь принудил священника построить свой дом на расстоянии целых пяти верст от церкви, от чего священник и прихожане терпели «изнурение». Внушительный список претензий к католическому монастырю завершался предложением православного священника: «Не благоугодно ли вместо того, чтобы на казенный щет устроять сию церковь, стоящую в казенном имении, сей монастырь обратить в православную церковь и крестьян, состоящих при сем монастыре числом до 11 душ, обратить и с землею в казенное ведомство по примеру грекороссийских монастырей, чрез что всякий соблазн, вредный святой Православной церкви и чадов ее, истребится» (л. 114—115).

Часты в «Сведениях» и предложения передать униатские церкви православным прихожанам, сетования на ведущуюся среди них ксендзами пропаганду, имеющую результатом переход их в католичество (т. н. «совращения»), на отсутствие материальной и иной помощи от населения из-за принадлежности его к католическому вероисповеданию.

Нередко затрагивались в донесениях с мест и вопросы об участии православных помещиков в благоустройстве церковных сооружений, о материальной помощи с их стороны, о спорных земельных угодьях между церковью и

* Имеется в виду кармелитский.

помещиками и, в целом, о заинтересованности землевладельцев в укреплении православия в крае. Так, в описаниях по Перероставскому благочинию Белицкого уезда священники отмечали, что в их приходах имеют место трудности с ремонтом церквей и земельные тяжбы, связанные с графом Сергеем Петровичем Румянцевым, на землях которого выстроены православные церкви: «Архистратиго-Михайловская, что в селе Марковичах… В сем селе есть церковь каменная, весьма великолепная, выстроена с позволения епархиального начальства, покрыта железом, внутри и снаружи выщекатурена, пол, двери и железные решетки сделаны на щет покойного канцлера графа Николая Петровича Румянцева, но смертию сего графа прекратилась окончательная достройка сей церкви; настоящий же граф Сергей Петрович Румянцев, получа в 1826 году все имение покойного в свое владение, доселе не приступает к устроению иконостаса, отчего и устроенное в церкви приходит в разрушение» (л. 284, 285). «Рождество-Богородицкая, что в селе Прибытках, церковь настоящая, холодная, деревянная, очень огромная, в углах, стенах, крыше и крыльце ветха. Внутри церкви над трапезою свод ветх и поддерживается деревянными подставками. Колокольня отдельная деревянная в стенах крепка, но крыша на ней ветха, о понуждении к возобновлению сей церкви помещика графа Сергея Петровича Румянцева производится с 1830-го года дело по духовному и гражданскому высшим начальствам, и по сему понуждению от графа Румянцева прислано на поправление церкви 200 р[ублей], которые и хранятся в церкви с запискою в приходную книгу; но сия сумма так малозначительна, что она недостаточна для сделания подмостков, нужных при починке церкви» (л. 286 об.—287). «Покровская, что в селе Красной Буде, церковь настоящая, холодная, деревянная в стенах крепка, но крыша ветха… Земли при сей церкви усадебной менее одной десятины, и сия состоит по разным местам, пашенной по Генеральному межеванию 36 десятин значится, на сию землю планов и межевых книг нет. Но сия земля отнята помещиком графом Сергеем Петровичем Румянцевым и отдана во владение крестьян, в 1826-м году за отмером на место отнятой по Генеральному размежеванию принадлежащей причту отведена другая крестьянская неудобная болотистая и пещаная. В 1828-м году по указу Правительствующего Сената предписано по жалобе священноцерковнослужителей отдать во владение причта ту самую землю, которая принадлежит церкви по Генеральному размежеванию, но доселе сей указ Правительствующего Сената остается без надлежащего исполнения» (л. 291 об.—292).

«Сведения» являются уникальным источником для освещения малоизвестных страниц истории православия в Могилевской губернии в николаевскую эпоху. Помимо общеисторических фактов, рукопись содержит информацию, отражающую колорит повседневной приходской жизни того времени — сведения о способах и материалах реставрации обветшалых церковных зданий, быте духовных лиц и многое другое. Крайне ценны статистические материалы с указанием наличного церковного имущества и земель. Особого



внимания заслуживают данные о взаимоотношениях православных причтов с землевладельцами и католическим духовенством. Подписи представителей причтов, составленные с полным воспроизведением имени и фамилии, могут дать существенную генеалогическую и биографическую информацию. В свете сказанного научное издание «Сведений» представляется актуальным и полезным для исследователей, которые смогут использовать данный источник при изучении самых разных тем по истории Беларуси*. В настоящее время И. Н. Вибе завершает подготовку текста «Сведений» к публикации.

*Приложение*

**Роспись содержания рукописи**
**«Сведения или Описания церквей Могилевской епархии»**

Осмотр могилевскому кафедральному Иосифскому собору и прочим градским церквам 1832 года июля 11 дня, на основании указа из Святейшего Правительствующего Синода во исполнение имянного его императорского величества высочайшего повеления от 14 марта 1832 года за № 2433 калужского кафедрального собора протоиереем Симеоном Зверевым при местных благочинном, священноцерковнослужителях и церковном старосте учиненный, по коему осмотру оказалось следующее (л. 1—6 об.).

Могилевского уезда [сельские церкви Могилевского градского благочиния] (л. 7—11 об.).

Могилевского уезда ведомства благочиния могилевской Николаевской церкви протоиерея Иоанна Вонсевича 16-го июля 1832 года (л. 12—22).

Копыского уезда ведомства благочиния копыской Преображенской церкви священника Алексея Гловацкого июля 21 дня 1832 г. (л. 22 об.—33).

Копыского уезда ведомства благочиния Святодуховской, что в селе Русаках, церкви священника Василия Словецкого июля 25-го числа 1832 года (л. 33 об.—39).

Оршанского уезда ведомства благочиния Троицкой, что в местечке Дубровне, церкви протоиерея Петра Копоневича, июля 27 дня 1832 года (л. 39 об.—55 об.).

Города Орши по благочинию Оршанского собора священника Иоанна Лепешинского августа 8-го дня (л. 56—57 об.).

Бабиновицкого уезда по благочинию микулинского священника Александра Цитовича августа 1 дня (л. 58—66 об.).

По благочинию лядянского священника Алексея Адамовича августа 3 дня (л. 67—78 об.).

Оршанского уезда по благочинию сватошицкого священника Иоанна Забеллина августа 6-го дня (л. 79—90).

---

* О желательности введения «Сведений» в научный оборот П. С. Горючко писал еще в начале XX в. (см.: Прибавление к церковным ведомостям. 1906. № 17. С. 1028—1029).

Чаусовского уезда по благочинию гладковской Святодуховской церкви священника Александра Чоловского августа 10 дня 1832 года (л. 91—103 об.).

Чаусовского уезда по благочинию чаусовской Николаевской церкви протоиерея Феодора Савинича августа 14 дня (л. 104—118).

По благочинию мстиславльского Троицкого собора священника Потапия Твердого августа 18 дня 1832 года (л. 118 об.—128 об.).

Мстиславского уезда по благочинию хославицкой Екатерининской церкви священника Антония Подрудзского августа 21 дня 1832 года (л. 129—135).

По благочинию судиловской церкви священника Михаила Пальчевского августа 24 дня Климовицкого уезда (л. 135 об.—153).

По благочинию костюковицкого священника Иоанна Сущинского августа 29 дня 1832 года (л. 153 об.—162 об.).

По благочинию палужской Николаевской церкви священника Иоанна Кирножицкого сентября 1 дня 1832 года Чериковского уезда (л. 163—174 об.).

По благочинию чериковского протоиерея Григория Стратоновича сентября 5 дня 1832 года (л. 175—187 об.).

По благочинию полоницкого благочинного священника Григория Заркевича сентября 8 дня 1832 года Чериковского уезда (л. 188—201).

По благочинию Быховскому, могилевской Петропавловской церкви протоиерея Алексия Сущинского сентября 17-го 1832 года Быховского уезда (л. 202—214).

По благочинию гайшинского священника Даниила Пригоровского сентября 20 дня 1832 года (л. 214 об.—225 об.).

Рогачевского уезда по благочинию разсохской Николаевской церкви священника Иакова Паславского сентября 25-го дня (л. 226—242 об.).

По благочинию мерколовицкого протоиерея Иоанна Паславского октября 1 дня 1832 года Рогачевского уезда (л. 243—260 об.).

Белицкого уезда по благочинию уваровицкой Рождество-Богородицкой церкви священника Алексия Петрашня октября 5-го дня 1832 года (л. 261—268).

По благочинию гомельского протоиерея Иоанна Львовского октября 6 дня 1832 года (л. 268—283 об.).

По благочинию перероcтовского благочинного священника Филиппа Соколова октября 11 дня 1832 года Белицкого уезда (л. 284—301 об.).

[По круговецкому благочинию священника Луки Демьяновича] (л. 302—305 об.).

Витебской губернии ведомства благочиния витебского Успенского собора протоиерея Евфимия Ремезова ноября 11-го дня 1832 года (л. 306—317 об.).

Благочиния себежского священника Иоанна Белинского (л. 318—321, 329 об.—338 об.).

Благочиния синеозерского священника Акиндина Махаринского (л. 321—329).



Невельского уезда ведомства благочиния Покровской, что в погосте Топорах, церкви священника Ильи Розанова (л. 339—349 об.).

Невельского уезда по благочинию каратаевской Николаевской церкви священника Димитрия Забеллина декабря 4-го дня 1832 года (л. 349 об.—368 об.).

Велижского уезда ведомства благочиния Преображенской, что в местечке Усвятах, церкви протоиерея Герасима Пржигоровского (л. 369—372 об., 389—391 об.).

Велижского благочиния протоиерея Стефана Петрашня декабря 11-го дня (л. 373—389).

[Описание церкви, находящейся в здании присутственных мест в г. Городке] (л. 392—392 об.).

### Источники и литература


1. РГИА. — Ф. 796. — Оп. 131. — Д. 826. — Л. 7—8.
2. Подробное историческое описание Архангельской епархии // Любопытный месяцослов на лето от Рождества Христова 1795, заключающий в себе… подробное историческое описание Архангельской епархии и бывших в оной архиереев, до нынешних времен доведенное; также находящихся в оной монастырей в стате, вне оного состоящих и в приходские церкви обращенных, равным образом сколько всех в котором городе или уезде храмов приходских. — М., 1795. — С. 1—180. 2-й паг. — Переизд. см.: Описание Архангельской епархии 1795 года / [Изд. подгот. В. И. Иванов]. — Краснодар, 2009.
3. РГИА. — Ф. 802. — Оп. 16. — Д. 80. — Л. 2—11.
4. Раздорский, А. И. Программа по составлению историко-статистического описания церквей и монастырей Курской епархии в 1830-е гг. // Болховітіновський щорічник 2009. — Київ, 2010. — С. 114—119.
5. Чернавский, Н. М. Оренбургская епархия в прошлом ее и настоящем. — Вып. 2. — Оренбург, 1901/1902. — С. 471—473.
6. РГИА. — Ф. 834. — Оп. 2. — Д. 1798.
7. Описание рукописей, хранящихся в Архиве Святейшего Правительствующего Синода. — Т. 2. — Вып. 1. — СПб., 1906.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 01.12.2014*

**Г. М. Брэгер,**
*вядучы навуковы супрацоўнік*
*аддзела старажытных актаў НГАБ;*

**Л. А. Лінская,**
*старшы навуковы супрацоўнік НМГКБ*

# АРХІЎ СЛУЦКАГА ТРАЙЧАНСКАГА СВЯТА-ТРАЕЦКАГА МАНАСТЫРА (Т. 2: ДАКУМЕНТЫ 164—279 за 1762—1776 гг.)

Працягваем публікацыю апісання дакументаў Архіва Слуцкага Трайчанскага Св.-Траецкага манастыра, якія захоўваецца ў Нацыянальным музеі гісторыі і культуры Беларусі, распачатую ў мінулых выпусках «Беларускага археаграфічнага штогодніка».

Прадстаўлены 116 дакументаў за 1762—1776 гг. (№ 164—279 з 2-га тома калекцыі). Дакументы размешчаны па храналогіі яшчэ ў XIX ст. і аркушы пранумараваны. Аднак з-за няўважлівасці даўніх архівістаў сярод дакументаў трапляюцца не ўваходзячыя ў згаданы перыяд. Так, гэта дакументы за 1662 г. у выпісах XVIII ст. (№ 231), 1718 (№ 244а), 1726 (№ 278), 1747 (№ 201, 209), 1748 (№ 217), 1749 (№ 237), 1761 (№ 199) і 1778 (№ 242) гады. З апісваемых дакументаў у першую чаргу вылучаюцца дакументы як знешнепалітычнага характару, напрыклад, дэкларацыя расійскага пасла ў Рэчы Паспалітай да польскага караля з апраўданнем экспансіі Расіі ў Польшчу (№ 247), ліст польскага караля да французскага караля ў сувязі з экспансіяй суседніх дзяржаў у Рэч Паспалітую (№ 250б), Указ расійскай імператрыцы Кацярыны II аб заручынах яе сына цэсарэвіча Паўла (№ 279), так і асвятляючыя ўнутраную палітыку дзяржавы, гэта — інструкцыя ад шляхты паслам Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ да караля (№ 202) і ўніверсал маршалка Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ (№ 212). Таксама маюцца дакументы, асвятляючыя складаную ваенна-палітычную сітуацыю ў дзяржаве — загады і ахоўныя лісты вайсковых кіраўнікоў аб забароне расійскім вайскам рабаваць маёнткі і вёскі Слуцкай архімандрыі. Шэраг дакументаў асвятляе судовы працэс паміж кіраўніцтвам Слуцкай архімандрыі і ўласнікамі Слуцка Радзівіламі аб правах на фундушавыя маёнткі, у тым ліку рэестр дакументаў на нерухомую маёмасць цэркваў і манастыроў архімандрыіі за 1504—1768 гг. (№ 223). Шмат прадстаўлена ўказаў духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі аб здзяйсненні духоўных судоў па розных справах, накіраванні святароў, вырашэнні адміністрацыйных і гаспадарчых пытанняў і інш. Акрамя шматлікіх судовых і натарыяльных дакументаў па маёмасці цэркваў, манастыроў і іх святароў, можна вылучыць наступныя цікавыя дакументы: апісанне Грозаўскага Свята-Мікольскага кляштара (№ 183), рэестры прыхаджан цэркваў Мазырскай і Петрыкаўскай пратапопій (№ 198), рэскрыпт аб накіраванні з Кіева майстра ў Дзяцелавіцкі манастыр для будаўнічых і рамонтных прац (№ 276), прэзенты духоўных і свецкіх асоб на пасады святароў цэркваў, а таксама прыватная перапіска між тымі ж асобамі.



164. Ліст кіева-пячэрскага архімандрыта Засіма да ігумена Дзятлавіцкага манастыра, прыпісанага да Кіева-Пячэрскай лаўры, айца Дарафея з паведамленнем аб пасылцы ў манастыр тэкстаў маніфеста і прысягі ў сувязі са смерцю расійскай імператрыцы Елісаветы Пятроўны і ўступленнем на прастол Пятра Фёдаравіча. Без месца, 15.02.1762.

Подпіс: Кіева-Пячэрскай лаўры архімандрыт старац Засім.

Арыгінал. Рус. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 327).

165. Рэляцыйны абдукцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Станіслава Васілеўскага агляду па просьбе слуцкага архімандрыта Дасітэуша Галяхоўскага ран на намесніку Морацкага манастыра Тэадозію Сухені і падданых манастырскай в. Морач, збітых Антоніем Акінчыцам, падлоўчым віленскага ваяводы, вялікага гетмана ВКЛ кн. Міхала Радзівіла. Морач, 21.03.1762.

Подпіс: Станіслаў Васілеўскі, енерал ЯКМ в[аяводства] Н[авагрудскага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 21. 2 арк. (арк. 328—329; арк. 329 чысты; з затылкам).

166. Указ духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі слуцкаму архімандрыту Дасіфею Галяхоўскаму, каб прыехаў у Кіеў для судовага следства па пэўнай духоўнай справе, а замест яго на час следства ў Слуцкую архімандрыю пасылаецца ігумен Палтаўскага Крыжаўзвіжанскага манастыра іераманах Антоні. Без месца, 2.05.1762.

Подпісы: Мадэст, архімандрыт залатаверха-міхайлаўскі; Кіева-Выдубіцкага манастыра начальнік архімандрыт Мітрафан; Кіева-Петрапаўлаўскага манастыра ігумен Іосіф; мітраполіі Кіеўскай архідыякан Самсон; кансісторскі судовы пісар іераманах Венядыкт; канцылярыст іераманах Пётр.

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 976 (зыходзячы кансісторыі, на палях). 2 арк. (арк. 330—331).

167. Указ духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі Слуцкаму Св.-Траецкаму манастыру, што ў сувязі з вызавам былога слуцкага архімандрыта Дасіфея Галяхоўскага ў Кіеў на судовае следства па духоўнай справе кіеўскі мітрапаліт паслаў ліст да вялікага гетмана ВКЛ кн. Радзівіла з просьбай выдаць ліст-прэзенту на пасаду слуцкага архімандрыта ігумену Палтаўскага Крыжаўзвіжанскага манастыра іераманаху Антонію. Без месца, 13.05.1762.

Подпісы: Мадэст, архімандрыт залатаверха-міхайлаўскі; кіева-кірылаўскі ігумен Павел; намеснік кіева-падольскі іярэй Іакаў; кансісторыі судовы пісар іераманах Венядыкт; канцылярыст іераманах Пётр.

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 1044 (зыходзячы кансісторыі, на палях). 2 арк. (арк. 332—333).

168. Данясенне духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі, што прызначаны ў Слуцкі Траецкі манастыр ірадыяканам манах Кіева-Кірылаўскага манастыра Іаіль рукапаложаны кіеўскім мітрапалітам, аб чым у Слуцкую архімандрыю пасылаецца адпаведная грамата. Без месца, 18.03.1764.

Подпісы: катэдральны пісар іераманах Іакаў; мітраполіі Кіеўскай архідыякан Іларыён; крыжовы іераманах Арэст (?).

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 131 (зыходзячы кансісторыі). 2 арк. (арк. 334—335; арк. 335 чысты).

169. Указ духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі ў Мазырскую праваслаўную пратапопію з загадам абраць сярод святароў старшага (пратапопа) і зацвердзіць у Слуцкай архімандрыі ў сувязі з паступіўшымі праз брацлаўскага падстолія, мазырскага генеральнага камісара Міхала Лаўцэвіча скаргамі мазыран аб непрыстойных паводзінах мазырскіх святароў. Без месца, 20.03.1764.

Копіі подпісаў: архімандрыт Іларыён; катэдральны намеснік, ігумен Іосіф; кансісторскі пісар іераманах Ірадыён; канцылярыст Грыгоры Каралеўскі.

Подпісы: іярэй Дэміян Сакуновіч, н[амеснік?] м[азырскі]; Гаўрыіл Кунцэвіч, святар мазырскі; с[вя]та-праабражэнскі святар мазырскі Грыгоры Каранеўскі; святар Філіп Каранеўскі.

Тагачасная копія (пісана ў Мазырскай пратапопіі). Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 222 (зыходзячы кансісторыі). 2 арк. (арк. 336—337).

170. Дароўны ліст удавы Параскі Янчыхі Слуцкаму Свята-Траецкаму манастыру на два моргі зямлі ва ўрочышчы да Слаўнага. Без месца, 9.05.1764.

Подпісы: Параска Янчыха, удава (крыжыкам); кс. Герасім Сваткоўскі, пракуратар а[рхімандрыі] Слуцкай; ксёндз Андрыян Корбут.

Арыгінал. Стб. м. Без філіграней. 2 арк. (арк. 338—339; арк. 339 чысты, з затылкам).

171. Рэверсальны ліст-кантракт слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай генеральнай праваслаўнай мітраполіі кс. Паўла Ваўчанскага, дадзены навагрудскаму кашталянічу Тэадору Незабытоўскаму на распрацоўку дрэва на віціны і іншыя патрэбы ў фундушавых пушчах манастыроў Слуцкай архімандрыі, якія знаходзяцца ў Капыльскім княстве за ракой Лошай паміж Старыцкай пушчай, за пэўную плату. Грозаўскі манастыр св. Мікалая, 20.05.1764. (Рэверсальны (адваротны) экзэмпляр, дадзены Т. Незабытоўскім кс. архімандрыту).

Подпіс: Тэадор Незабытоўскі, кашталян навагр[удскі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 9. 2 арк. (арк. 340—341; арк. 341 чысты, з затылкам).

172. Данясенне скрыгалаўскага прэзбітара Іаана Каранеўскага да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі аб гвалтах, здзяйсняемых дворнай адміністрацыяй маёнтка Скрыгалава Казіміра Аскеркі: гвалтоўным прымушэнні праваслаўных парафіян хадзіць да новай уніяцкай царквы або касцёла, збіцці і рабаванні сялян за непадпарадкаванне і інш. Скрыга[ла]ў, 20.06.1764.

Подпіс: свя[тар] Іаан Каранеўскі, пра[з]б[і]тар скрыгалаўскі.

Арыгінал. Стб. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 342—342; арк. 343 чысты).

173. Прыватны ліст (пісьмо) петрыкаўскага пратапопа Яна Будовіча да [слуцкага архімандрыта] з паведамленнем аб прадстаўленні святарам Петрыкаўскай пратапопіі ліста духоўнай кансісторыі Слуцкай архімандрыі, прычым айцец Карп Загароўскі не жадаў без асабістага ліста кс. архімандрыта ехаць да Слуцка адпраўляць (атрымаць) святы антымінс, а таксама аб паездцы ў Слуцк айца Яна Скрыгалаўскага. Петрыкаў, 22.06.1764.



Подпіс: Ян Будовіч, пратапоп петрыкаўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 346—347; арк. 347 чысты).

174. Прыватны ліст (пісьмо) свята-мікалаеўскага святара Карпа Загароўскага да слуцкага архімандрыта аб немагчымасці з-за галечы паехаць у Слуцк для адпраўлення (атрымання) святога антымінса. Без месца, 21.06.1764.

Пячатка (на арк. 345 адв.) на чырвоным сургучу К. Загароўскага (разламаная напалам).

Подпіс: іярэй Карпій Загароўскі, паро[х] с[вята]-мікала[еўскі].

Арыгінал. Стб. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 344—345; арк. 345 чысты, з адрасам).

175. [Выпіс з кніг суда Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ]. Дэкрэт у інстанцыі інстыгатара ВКЛ па справе з віленскім ваяводам кн. Каралем Радзівілам, які ў 1755 г., будучы маршалкам Галоўнага Трыбунала ВКЛ, у сваім палацы ў Вільні спрабаваў забіць навагрудскага падчашага Яна Равінскага, нападаў на стацыі іншых трыбунальскіх дэпутатаў, а таксама перашкаджаў праўнаму працэсу ў справах шляхты на кадэнцыі Трыбунала ў Мінску і іншыя гвалты рабіў. Гродна, 16.08.1764.

Пячатка кустадыйная Міхала Бжастоўскага, вялікага канюшага ВКЛ, маршалка Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ.

Подпісы: Ігнаці Стравінскі, войскі стар[адубскі], сакратар канфедэрацыі генеральнай ВКЛ; карыгаваў Шукевіч, стражнік і канцылярыст п[аве]та Слонім[скага], рэгент канфедэрацыі генеральнай ВКЛ.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 45 (алоўкам). 8 арк. (арк. 348—355; арк. 348 пашкоджаны).

176. а) [Выпіс з кніг суда Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ]. Дэкрэт у справе слуцкага архімандрыта кс. Паўла Ваўчанскага і ўсяго праваслаўнага духавенства з кн. Каралем Радзівілам і п. Станіславам Жэвускім аб нявыплаце фундушавага воска з 1735 г. і іншых фундушаў Саборнай Катэдральнай царкве ў Слуцку на Замкавай гары, а таксама невытрыманні дамовы, заключанай яшчэ з нябожчыкам кн. Геранімам Радзівілам аб абмене пляцамі для адбудовы новай царквы пасля пажару. Брэст, 16.10.1764.

Пячатка кустадыйная і подпіс: М[іхал] Бжастоўскі, к[анюшы] в[ялікі] і маршалак генеральны Канфедэрацыі ВКЛ.

Подпісы: Ігнаці Стравінскі, войскі стар[адубскі], сакратар канфедэр[ацыі] генеральнай ВКЛ; карыгаваў Шукевіч, стражнік і канцылярыст п[аве]та Слон[імскага], рэгент канфедэрацыі генеральнай ВКЛ.

б) (на арк. 356, на палях). Нататка аб актыкацыі гэтага дакумента камісарам Слуцкай архімандрыі Якубам Леваноўскім у Мінскім гродскім судзе. Без месца, 21.05.1765.

Подпіс: выпіс згодны з актамі: Кубліцкі-Пятрух, р[э]г[ен]т гр[одскі] в[аяводств]а Мін[скага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 74. 8 арк. (арк. 356—363).

177. [Выпіс з кніг Метрыкі ВКЛ] караля Станіслава Аўгуста, 12.12.1767. Дэкрэт суда Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ (гл. № 176-а). Брэст, 16.10.1764.

Копіі подпісаў: М[іхал] князь Чартарыскі, канцлер вялікі Вялікага княства Літоўскага; Юзаф Міклашэвіч, метрык[ант] ВКЛ.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: «Копія сего документа снята и поставлена въ С. Троицкомъ монастыре» (1-я пал. 19 ст.) 10 арк. (арк. 364—373; арк. 373 чысты, з затылкам).

178. Аблігацыйны квіт намесніка Заблудаўскага кляштара іераманаха Макарыя, дадзены Юзафу Роберсону на пазычаныя ў яго 12 злотых для паездкі ў Варшаву для аплаты выпісу дэкрэта ў справе Слуцкай архімандрыі, з тэрмінам вяртання пазыкі 24.06.1765 (стары стыль). У Германове (?), 12.12.1764.

Подпісы: іераманах Макары, н[амеснік] кляштара Заблуд[аўскага]; Якуб Леаноўскі, ка[місар] а[рхімандрыі] С[луцкай].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 374).

179. Прыватны ліст (пісьмо) невядомага ад імя слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі кс. Дасітэуша Галяхоўскага да [віленскага ваяводы кн. Караля Радзівіла] з просьбай духавенства Слуцкай архімандрыі аб пацвярджэнні ім даўніх прывілеяў на вольнасці і правы і фундушаў на маёнткі, землі і даходы, а таксама аб вяртанні пэўным манастырам і цэрквам архімандрыі захопленых адміністрацыяй Слуцкага княства фундушавых вёсак і зямель. Без месца і даты (перад 1764 г.).

Дзве пячаткі (на арк. 375 адв.) на чырвоным сургучу невядомых асоб.

Подпісаў няма.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 375—376).

180. Указ духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі ігумену Пінскага Багаяўленскага манастыра іераманаху Феафану Яворскаму з адказам на яго скаргу кіеўскаму мітрапаліту аб забароне чашнікам ВКЛ Аскеркай праваслаўнаму духавенству пабудаваць новую царкву замест спарахнелай старой царквы ў сяле Скрыгалава Мазырскага пав. і прымушэнні ім жа праваслаўных прыхаджан да ўніяцтва. Без месца, 18.03.1765.

Копіі подпісаў: Мадэст, архімандрыт залатаверха-міхайлаўскі; Самуіл, архімандрыт кіева-брацкі і сак[ра]тар; Епіфаній, архімандрыт нежынскі; ігумен Сіф (?) Гамалея; за судовага пісара манах Яікіф (?); канцылярыст Грыгоры Каралеўскі.

Тагачасная копія. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 513 (зыходзячы кансісторыі). 2 арк. (арк. 377—378; арк. 378 чысты).



181. Прыватны ліст (пісьмо) мазырскага спаскага празбітара Грыгорыя Каранеўскага да петрыкаўскага пратапопа (пратапразбітара) Іаана Будовіча з паведамленнем аб паездцы ў Скрыгалаў для служэння літургіі, аднак ніводзін прыхаджанін не прыйшоў у царкву і на споведзь, так як адміністрацыя мясцовага двара прымусіла пад страхам пакарання наведваць новую ўніяцкую царкву. Скрыгалаў, 20.03.1765.

Пячатка на кустодыі (арк. 381 адв.) і подпіс: Грыгоры Каранеўскі, празбітар спаскі мазыр[скі].

Арыгінал. Стб. м. (асноўны ліст) і пол. м. (пастскрыптум). Філігрань. 2 арк. (арк. 380—381).

182. Рэестр прэтэнзій Міхала Мелянтовіча па арэндзе фальварка Грозаўскага Св.-Мікольскага кляштара, прадстаўлены слуцкаму архімандрыту Паўлу Ваўчанскаму. Без месца, 19.04.1765.

Подпіс: Міхал Мелянтовіч, [...] (абрэвіятура пасады не расшыфравана).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 379, 382; арк. 382 чысты).

183. Апісанне царквы, фальварка і іншых пабудоў Грозаўскага Св.-Мікольскага кляштара па сканчэнні трохгадовай арэнды кляшторнага фальварка Міхалам Мелянтовічам, складзенае пры перадачы кляштара грозаўскаму намесніку кс. Герасіму Сваткоўскаму. Без месца, 21.04.1765.

Подпіс: ксёндз Герасім Сваткоўскі, намеснік кляштара Грозаўскага.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 383—384; арк. 384 чысты).

184. Данясенне скрыгалаўскіх паповічаў Васіля і Данілы Каранеўскіх слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі з просьбай узяць іх пад сваю абарону, так як па смерці іх бацькі скрыгалаўскага празбітара Іаана Каранеўскага 26.07.1764 уласнік маёнтка Скрыгалаў Казімір Аскерка забараніў рамантаваць старую праваслаўную царкву ў Скрыгалаве, загадаў прыхаджанам хадзіць у новую ўніяцкую царкву, а саміх паповічаў жадае зрабіць сваімі падданымі. Скрыгалаў, 26.04.1765.

Подпісы: Васілій Каранеўскі, паповіч скрыгалаўскі; Данііл Каранеўскі, паповіч скрыгалаўскі.

Арыгінал. Стб. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 385—386; арк. 386 чысты).

185. а) Позва слуцкаму архімандрыту, намесніку кіеўскай мітраполіі Паўлу Ваўчанскаму, устаўніку Слуцкай саборнай царквы Дэметрыю Акінчыцу і падскарбію брацтва Слуцкай Спаскай царквы Лявону Лапіцкаму ў суд Скарбавай камісіі ВКЛ у 1765 г. у справе Слуцкага жыдоўскага кагалу аб прадастаўленні легацыйных дакументаў. Без месца, 28.05.1765.

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Юзафа Лянтkоўскага аб падачы вышэйзгаданай позвы ў двары Слуцкай архімандрыі. Без месца, 28.05.1765.

Копія подпісу: Юзаф Лянткоўскі, енерал ЯКМ в[аяводства] Н[авагрудскаг]а.

Копія тагачасная. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 21. 1 арк. (арк. 387).

186. Прыватны ліст (пісьмо) ігумена Пінскага манастыра Тэафана Яворскага да [слуцкага архімандрыта] з паведамленнем, што калі ён быў у мінулым годзе ў Пецярбургу, падаў у Замежную калегію супліку аб забароне панам Аскіркай будаваць новую Скрыгалаўскую царкву замест старой і прымушэнні праваслаўных парафіян да ўніяцтва і каталіцтва, на што атрымаў з калегіі ўказ. Пінск, 10.06.1765.

Копія подпісу: кс. Тэафан Яворскі, ігумен м[анастыра] Пін[скага].

Копія тагачасная. Пол. і рус. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 388—389; арк. 389 чысты).

187. а) Позва слуцкім абываталям і старшым Слуцкага кагалу Янкелю Азіковічу, Лейбе Ідэлёвічу, Іцку Янкелёвічу і іншым у суд Скарбавай камісіі ВКЛ у 1765 г. у справе слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага, устаўніка Слуцкай саборнай царквы Дэметрыя Акінчыца і падскарбія брацтва Слуцкай Спаскай царквы Лявона Лапіцкага аб невяртанні ў тэрмін пазычаных на обліг грошаў і нявыплаце працэнтаў з той сумы. Без месца, 22.06.1765.

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Юзафа Вечара аб падачы вышэйзгаданай позвы ў двары Янкеля Азіковіча ў Слуцку. Без месца, 22.06.1765.

Копія подпісу: Юзаф Вечар, енерал Я. К. М. в[аяводс]тва Нав[агрудскага].

Копія тагачасная. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 29. 2 арк. (арк. 390—391; арк. 391 чысты, з затылкам).

188. Пленіпатэнцыйны ліст слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага, устаўніка Слуцкай Успенскай саборнай царквы Дэметрыя Акіншыца, падскарбія Лявона Лапіцкага і іншых братчыкаў брацтва пры Слуцкай царкве Праабражэння Гасподня, дадзены братчыку таго ж брацтва Базылю Хрысціничу на вядзенне іх справы з жыдамі Слуцкага кагалу аб выдэркафавых сумах паводле обліга ў судзе Скарбавай каміссіі ВКЛ. Слуцк, 22.06.1765.

Без пячатак і подпісаў.

Чарнавы варыянт. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 392—393).

189. Дакумент таго ж зместу, як № 188. Архімандрыя Слуцкая, 22.06.1765.

Подпісы: Павел Ваўчанскі, архімандрыт слуцкі, намеснік праваслаўнай мітраполіі Кіеўскай; Дымітры Акіншыц, устаўнік царквы саборнай Свята-Успенскай; Лявон Лапіцкі, падскарбі брацтва Праабражэння Гасподня; Міхал Мелянтовіч, б[ратчык] Пр[аабражэння] Гаспод[ня]; Стэфан Бяйкоўскі, б[ратчык] Пр[аабражэння] Гас[подня].

Арыгінал (з праўкамі ў тэксце рукой архімандрыта). Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 394—395).

190. Апісанне справы слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага, устаўніка Саборнай царквы Дэметрыя Акінчыца і брацтва Слуцкіх Спаскай і Саборнай цэркваў з Слуцкім кагалам аб грашовых даўгах з пералікам прэтэнзій і дакументаў за 1710—1765 гг. Без месца і даты [1765 г.].

Пячатак і подпісаў няма.



Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 20. 2 арк. (арк. 396—397).

191. Квітацыйны ліст слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага ад імя ўсяго духавенства Слуцкай архімандрыі, дадзены аканому Слуцкага княства Маляўскаму аб атрыманні ад яго 987 зл. і 9,5 гр., г. зн. працэнтаў на першую рату з агульнай сумы 56 418 зл. і 20 гр., прысуджанай Слуцкай архімандрыі на кн. Карале Радзівіле дэкрэтам Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ у Брэсце ад 16.10.1764. Без месца, 16.11.1765.

Подпісы: Павел Ваўчанскі, архімандрыт слуцкі і праваслаўнай мітраполіі Кіеўскай намеснік; ксёндз Іларыён Мінкевіч, з усёй брацiей.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 8. 2 арк. (арк. 398—399; арк. 399 чысты).

192. Рэестр грошаў, атрыманых Свята-Траецкім кляштарам Слуцкай архімандрыі ад розных асоб на працягу чэрвеня — верасня 1766 г., а таксама рэестр расходу гэтых грошаў за гэты ж перыяд на розныя царкоўныя і гаспадарчыя патрэбы. Без месца і даты.

Без пячатак і подпісаў.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 10 арк. (арк. 400—409; арк. 407—409 чыстыя).

193. Рэестр облігаў на грашовыя пазыкі, выдадзеных Слуцкім магістратам і асобнымі мяшчанамі брацтву пры Слуцкім манастыры Праабражэння Гасподня. Без месца і даты [пасля 1767 г.].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 410).

194. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда ад 18.09.1766, выдадзены 22.01.1770. Квітацыйны ліст слуцкага архімандрыта кс. Паўла Ваўчанскага ад імя ігуменаў і святароў кляштараў і цэркваў Слуцкай архімандрыі, дадзены віленскім ваяводзічам Каралю і Геранiму Радзівілам і іх апекунам, а таксама іх генеральнаму пленіпотэнту слонімскаму старосце Ігнацію Стравінскаму, у сувязі з атрыманнем 56 418 зл. і 20 гр., прысуджаных архімандрыі дэкрэтам Генеральнай канфедэрацыі ад 16.10.1764 за пэўныя шкоды і нявыплаты фундушавых і легацыйных сум. Без месца, 1766 г. (без числа і месяца).

Пячатка кустадыйная мінскага старосты Ігнацыя Іваноўскага (Мінскага гродскага суда) (пашкоджана).

Подпіс: карыгаваў Фелікс Кубліцкі-Пятух, р[э]г[е]нт гр[одскі] мін[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 41. 6 арк. (арк. 411—416).

195. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда ад 18.09.1766, выдадзены 15.04.1768. Дакумент таго ж зместу, як № 194.

Пячатка кустадыйная мінскага старосты Ігнацыя Іваноўскага (Мінскага гродскага суда).

Подпіс: згодна з актамі — Фелікс Кубліцкі-Пятух, р[э]г[е]нт гр[одскі] в[аяводс]тва Мін[скага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 9; № 8. 6 арк. (арк. 417—422).

196. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда, 18.09.1766. Дакумент таго ж зместу, як № 194 (1-ы экзэмпляр).

Пячатка кустадыйная мінскага старосты Ігнація Іваноўскага (Мінскага гродскага суда).

Подпіс: карыгаваў Д. Кубліцкі-Пятух, р[э]г[е]нт грод[скі] в[аяво]дства Мінскага.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 63; № 76 (абедзве закрэслены); № 41-й. 6 арк. (арк. 423—428).

197. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда ад 18.09.1766, выдадзены 15.04.1768. Рэверсальны кантрактны ліст жыда Лейбы Меяровіча, генеральнага слуцкага арандатара, дадзены слуцкаму архімандрыту Паўлу Ваўчанскаму, з абавязкам у прызначаныя тэрміны выплачваць грошы за арэнду гарэлачнага шынка ў Трайчанах, які належыць Слуцкай архімандрыі. Без месца, 24.06.1766.

Пячатка кустадыйная мінскага старосты Ігнація Іваноўскага (Мінскага гродскага суда).

Подпіс: згодна з актамі — Фелікс Кубліцкі-Пятух, р[э]г[е]нт гр[одскі] в[аяводства] Мін[скага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 19. 4 арк. (арк. 429—432).

198. а) Рэестры прыхаджан (гаспадароў) Мазырскай і Петрыкаўскай пратапопій з пазначэннем колькасці мужчын і жанчын у кожнай сям'і па цэрквах Архістратыга Міхаіла, Вялікамучаніцы Параскевы, Праабражэнскай і Мікольскай у месцы Мазыры, Праабражэнскай у сяле Якімавічы, Вялікамучаніцы Параскевы ў сяле Аўцюцевічы, Мікалаеўскай у месцы Петрыкаве, Нараджэння Багародзіцы ў сяле Валасовічы, Апосталаў Пятра і Паўла ў сяле Сякерычы (прыпісной да Валасовіцкай), Вялікамучаніка Георгія ў сяле Загалле, Мікалаеўскай у сяле Лясковічы, Нараджэння Багародзіцы ў месцы Мазыры, Уваскрасенскай у месцы Петрыкаве, Апосталаў Пятра і Паўла ў сяле Навасёлкі. Без месца, 24 і 25.01., 14 і 15.02., 10.03.1767.

Подпісы святароў пад кожным рэестрам: Філіп Каранеўскі, святар храма с[вя]тога Архістратыга Міхаіла; С[вя]той Вялікамучаніцы Параскевы ц[а]р[к]вы святар Лука Кітуновіч; С[вя]та-Праабражэнскай ц[а]рквы мазырскай святар Грыгоры Каранеўскі; Дземіян Сакуновіч, іярэй м[ікольскі] М[азырскі]; іярэй Кеопцій (?) Сакуновіч, ц[а]рквы С[вя]той Вялікамучаніцы Параскевы; іярэй Карп Загароўскі; іярэі Герман і Ігнацій Пігулеўскія; іярэй Раман Смоліч; іярэй Дзімітры Смоліч; Гаўрыіл Кунцэвіч, святар царквы Нараджэння Пр[а]с[вя]той Б[агародзі]цы Мазырскай; іярэй Раман Сеняшэвіч, царквы С[вя]тых Першавярхоўных Апосталаў Пятра і Паўла.

б) Агульны рэестр цэркваў і іх святароў Мазырскай пратапопіі з пазначэннем колькасці двароў у кожнай парафіі. Без месца і даты (арк. 452).

Подпіс: Грыгоры Каранеўскі, адміністратар пратапопіі Мазырскай (пол. м.).



в) Нататка з пазначэннем, што вышэйзгаданыя рэестры знаходзяцца ў архіве Слуцкага Траецкага манастыра. Без месца, 29.01.1845 (арк. 464 адв.).

Подпіс: старшы чыноўнік асобых даручэнняў надворны саветнік К. Галдамовіч.

Арыгінал. Стб. м. (а, б), рус. м. (в). Філіграні. Стар. сігн.: № 41. 33 арк. (арк. 433—465; арк. 439, 455, 463, 465 чыстыя).

199. Ліст-консенс (дазвол) чашніка ВКЛ Гервазія Людвіка Аскеркі, выдадзены скрыгалаўскаму паповічу Філіпу Каранеўскаму на святарства ў парафіі і царкве Свята-Міхайлаўскай у Мазыры, з паведамленнем аб гэтым кіеўскаму мітрапаліту і арцыбіскупу кс. Арсенію Магілянскаму. Замак Мазырскі, 15.02.1761.

Пячатка на чырвоным сургучу і подпіс: Г[ервазі] Л[юдвік] Аскерка, ч[ашнік] ВКЛ.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 5. 2 арк. (арк. з тэкстам без нумарацыі, арк. 467 чысты, з затылкам).

200. Ліст Ігнація Казлоўскага, міжрэцкага ўрадніка вялікага харужага ВКЛ [Станіслава Фердынанда] Жавускага, дадзены варабіёўскаму адміністратару таго ж Жавускага Юзафу Міраловічу, з паведамленнем і просьбай да ўсіх мытныхураднікаў, каб не затрымлівалі Міраловіча, пасланага суправаджаць вазы з сельскагаспадарчай прадукцыяй з украінскага маёнтка Міжрэчча ў літоўскі маёнтак Старчыцы, якія належаць Жавускаму. Замак Міжрэцкі, 17.03.1767.

Пячатка на чырвоным сургучу і подпіс: Ігнацы Казло[ў]скі.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. з тэкстам без нумарацыі, арк. 466 чысты, з матэматычнымі разлікамі на адвароце).

201. Выпіс з паточных кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ. Скарга пленіпатэнта Самуэля Грынявецкага, вольнаўскага старосты, ад імя інстыгатара ВКЛ Станіслава Бужынскага ў справе слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Юзафа Аранскага з рэктарам Слуцкага езуіцкага калегіума Францішкам Бучынскім, брэсцкім афіцыялам, гнезненскім канонікам, бяльскім пробашчам, слуцкім і капыльскім плябанам Янам Людвікам Рэакурам, навагрудскай кашталянавай Марыянай з Ажахоўскіх Незабытоўскай і іншымі аб захопе езуітамі земляў маёнтка Малы Ямінск або Трайчаны, які належыць Слуцкай Свята-Траецкай архімандрыі, і іншых гвалтах і шкодах цэрквам і манастырам Слуцкай архімандрыі. Вільня, 26.04.1747.

Пячатка на кустодыі Галоўнага Трыбунала ВКЛ.

Подпісы: Антоні Салагуб, ген[ера]л артыл[ерыі] ВКЛ, Трыбунала Гал[оўнага] маршалак; Міхал Гарадэнскі, войскі, суддзя гродскі, дэпутат в[аяводства] Віленскага; Юзафат Гутаровіч, ст[арос]та нарвойскі, дэпутат павета Ашмянскага; Марцін Скарбек Важынскі, дэпутат п[аве]та Лідскага; Адам Юзаф Богуш, абозны, пісар гродскі і дэпутат п[аве]та Вількамірскага; [Ануфры Антоні] Дусяцкі-Рудоміна, [староста дамашэўскі], дэпутат п[аве]та Бра[слаўскаг]а; Матэуш Таньскі, ротм[істр] і дэпутат в[ая]в[о]дства Троцкага;

Юзафа Антоні Качаноўскі, дэпут[ат] п[аве]та Ваўкавыскага; Людвік Богуш, суддзя грод[скі] і дэпут[ат] п[аве]та Мазырскага, падскарбі Тр[ы]б[уна]ла Гал[оўнага] ВКЛ; Дамінік Абуховіч, скар[бнік] і дэпутат п[аве]та Мазырскага; Ян Ігнацы Мінкевіч, чаш[нік і] дэп[ута]т в[аяв]д[ств]а Вілен[скага], пісар Трыб[унала] Гал[оўнага] ВКЛ; карыгаваў Класовіч, р[эгент] п. (?) Т[рыбунала] Гал[оўнаг]а ВКЛ, кр[айчы] п[аве]та Стар[адубскага].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 9; № 83-й. 4 арк. (арк. 468—471).

202. Інструкцыя паслам Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ да караля Станіслава Аўгуста Шымону Касакоўскаму, ковенскаму падчашаму і канцылярысту, і Францішку Гедройцю, ваўкавыскаму падчашаму і канцылярысту, з пэўнымі патрабаваннямі ад шляхты. Без месца, 13.06.1767.

Без пячатак і подпісаў.

Тагачасная копія. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 472).

203. Ліст-адказ манахаў-ураднікаў канцылярыі Кіеўскай мітраполіі ад імя кіеўскага мітрапаліта архіяпіскапа Арсенія слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі на яго данясенне аб рукапалажэнні ва іярэя і зацвярджэнні святаром паловы парафіі царквы Нараджэння Багародзіцы ў сяле Валасовічы Мазырскай пратапопіі паводле ліста-прэзенты ўласніка гэтага сяла мазырскага падкаморыя Міхала Яленскага. Без месца [Кіеў], 19.06.1767.

Подпісы: кафедральны пісар іераманах Іеремія; мітраполіі Кіеўскай архідыякан Іларыён; крыжовы іераманах Арэст.

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 457 (зыходзячы канцылярыі). 2 арк. (арк. 473—474; арк. 474 чысты).

204. Прыватны ліст (пісьмо) [слуцкага архімандрыта] да віленскага ваяводы, генеральнага маршалка Каронная канфедэрацыі Караля Радзівіла, а таксама да яго генеральнага пленіпатэнта N. Язерскага, каморніка ВКЛ, з просьбай прыпыніць працэс па іх справе, які ідзе ў судзе Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ. Без месца і даты [пасля 8.07.1767].

Без подпісу.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 475—476).

205. Ліст-адказ святароў мазырскіх цэркваў слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Паўлу Ваўчанскаму на яго ўніверсал аб немагчымасці прыбыцця ўлетку святароў Мазырскай пратапопіі з царкоўнымі і фундушавымі дакументамі ў Слуцк з-за пагрозы нападу на Мазырскае староства кн. Радзівіла з войскам, а таксама на яго ж указ аб выездзе святароў да Слуцка 27.08.1767 акрамя некаторых, якія не мелі магчымасці выехаць. Без месца і даты [пасля 27.08.1767].

Подпісы: Дземіян Сакуновіч, іярэй м[ікольскі] м[азырскі]; Гаўрыіл Кунцэвіч, святар прачыс[ценс]кі мазырскі; с[вя]та-праабражэнскі мазырскі святар Грыгоры Каранеўскі; Лука Кітуновіч, святар с[вя]та-параскеўскі; Філіп Каранеўскі, святар міхайлаўскі мазырскі; Лявонці Сакуновіч, святар С[вя]той Вялікам[у]ч[а]ніцы Параскевы.



Арыгінал. Стб./стукр. м. Без філіграні. 2 арк. (арк. 477—478; арк. 478 чысты).

206. Ліст-супліка святара Мазырскай царквы Св. Вялікамучаніцы Параскевы Лукі Кітуновіча да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага аб захопе пласкавіцкім дэніфітарам, старшым Мазырскага бернардынскага кляштара кс. Феліксам вострава (участка зямлі), які належыць царкве, і высяканні лесу на дровы для палення цэглы, прызначанай на будаўніцтва касцёла. Без месца, 3.08.1767.

Подпіс: святар Лука Кітуновіч.

Арыгінал. Стб./стукр. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 479—480; арк. 480 чысты).

207. Ліст-данясенне святара Мазырскай Спаса-Праабражэнскай царквы Грыгорыя Каранеўскага да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага аб незаконным ужыванні мазырскім мешчанінам Насовічам царкоўнага вострава Сухаверск, а таксама аб адняцці былым мазырскім старостам, рэферэндарам ВКЛ Антоніем Аскеркай дакументаў на сычэнне кануна на Спаскую царкву і перадачы іх уніяцкім цэрквам. Без месца, 3.08.1767.

Подпіс: с[вя]та-праабражэнскі мазырскі святар Грыгоры Каранеўскі.

Арыгінал. Стб./стукр. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 481—482; арк. 482 чысты).

208. Ліст-прашэнне мазырскага прачысценскага святара Гаўрыіла Кунцэвіча да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага аб падачы яго скаргі да расійскага міністра аб тым, што ў 1757 г. муж сястры святара Еўдакіі Самуіл Карноклееў мазырскі бурмістр ЯКМ, быў забіты і былі абрабаваны яго чаўны з мёдам, што вёз на продаж у Кіева-Пячэрскую лаўру, падданымі сёл Навозы і Мнева двара Пакольскага на расійскім беразе, аб чым адбываўся працэс у Чарнігаўскім гродскім судзе, але да скутку не прыйшло. Без месца, 3.09.1767.

Подпіс: Гаўрыіл Кунцэвіч, святар прачыс[ценс]кі мазырскі.

Арыгінал. Стб./стукр. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 483—484).

209. Выпіс з кніг Мазырскага гродскага суда, 18.09.1747. Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Андрэя Паўловіча аб падачы позвы ў Камісарскі суд у Варшаве 6.11.1747 петрыкаўскаму плябану кс. Томашу Яленскаму ў яго Петрыкаўскай плябаніі ў справе слуцкага архімандрыта кс. Юзафа Аранскага. Без месца, 16.09.1747.

Пячатка на кустодыі Мазырскага гродскага суда (мазырскага падстаросты Віктара Яленскага).

Подпіс: карыгаваў Рудзінскі, рэгент мазыр[скі] і лянт[войт] м[еста] ЯКМ Мазыр[скага].

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: 19. 1 арк. (арк. 485).

210. Прыватны ліст (пісьмо) маршалка Кароннай канфедэрацыі і соймавага кн. Караля Радзівіла да кіеўскага мітрапаліта кс. Арсенія Магілянскага з паведамленнем аб атрыманні ліста ад слуцкага архімандрыта кс. Паўла Ваўчанскага і абяцаннямі зрабіць пэўныя захады па абароне праваслаўнай царквы ў сваіх маёнтках, атрыманых у спадчыну. Варшава, 18.11.1767.

Копія подпісу: Караль князь Радзівіл, марш[алак] Канф[едэрацыі] Кар[оннай] і соймавы.

Тагачасная копія. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 486—487; арк. 487 чысты, з затылкам).

211. Ардынанс старосты княства Слуцкага і Капыльскага Барталамея Непакойчыцкага кагалу Слуцкай сінагогі з патрабаваннем неадкладна выплаціць намесніку Кіеўскай мітраполіі, слуцкаму архімандрыту кс. Ваўчанскаму грошы з працэнтамі паводле ардынанса маршалка Кароннай канфедэрацыі і соймовага кс. Радзівіла. Слуцк, 21.12.1767.

Пячатка на чырвоным сургучу (захавалася часткова) і подпіс: Барталамей Непакойчыцкі, староста княства Слуцкага і Капыльскага.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 489 з тэкстам; чысты аркуш без нумарацыі).

212. Універсал быстрыцкага старосты, маршалка Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ Станіслава Бжастоўскага да ўсіх сенатараў, ураднікаў і шляхты ВКЛ з прызывам падтрымаць на павятовых перадсоймавых сойміках 24.08.1767 патрабаванні Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ да караля, у тым ліку наконт праваслаўнай царквы ў ВКЛ, і выступіць з гэтымі патрабаваннямі на экстраардынарыйным сойме ў Варшаве 5.10.1767. Без месца, 08.1767 (число прапушчана).

Копія подпісу: Станіслаў Бжастоўскі, маршалак Генеральнай канфедэрацыі ВКЛ.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. 1 арк. вялікага фармата («in folio»), перакладзены напалам (арк. 488).

213. а) Прыватны ліст (пісьмо) княгіні В. Друцкай-Любецкай да ігумена Дзяцелавіцкага манастыра кс. Руфа Дунаеўскага з абяцаннем даслаць свайго лунінскага аканома на вырашэнне ўзаемных прэтэнзій аб зямлі паміж яе воленскімі падданымі і лунінецкімі падданымі манастыра.

Пагост, 16.07.1767.

Подпіс: В. Друцкая-Любецкая, С. О. (абрэвіятура не расшыфравана).

б) Канверт, у якім знаходзіўся вышэйзгаданы ліст, з пазначэннем адраса і з апісаннем зместу ліста, зробленым у 19 ст.

Пячатка на чорным сургучу княгіні В. Друцкай-Любецкай.

Арыгінал. Пол. м. Фрагмент філіграні (на лісце). Стар. сігн. (на канверце): F. 10, № 10 (фасцыкул 10, дакумент № 10). 2 арк. (адзін з тэкстам ліста, другі складзены канвертам, абодва не нумараваныя).

214. Універсал слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага да ўсіх святароў цэркваў і манастыроў Слуцкай архімандрыі з загадам аб дастойным прыманні і абслугоўванні намесніка Слуцкай архімандрыі Герасіма Сваткоўскага, пасланага для выканання пэўнай царкоўнай справы. Без месца, 24.12.1767.



Пячатка на чырвоным сургучу і подпіс: Павел, архімандрыт слуцкі.

Арыгінал. Рус. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 489).

215. Ліст-кантракт слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага на арэнду на два гады выдадзены карчмы Трайчанскага манастыра св. Тройцы за 3 000 зл. у год адміністрацыі скарбу маршалка Генеральнай каронней канфедэрацыі і соймавага кн. Караля Радзівіла. Архімандрыя Слуцкая, 25.12.1767.

Пячатка на чырвоным сургучу і подпіс: Павел Ваўчанскі, архімандрыт слуцкі і мітраполіі Кіеўскай намеснік.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 5. 2 арк. (арк. 490—491; арк. 491 чысты).

216. Ліст-кантракт слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Дасітэуша Галяхоўскага на арэнду на адзін год карчмы Трайчанскага манастыра слуцкім жыдам Лейзеру Абрамовічу і Азіку Міх[….] (канчатак прозвішча не захаваўся, абарваны край аркуша) за 430 талераў. Архімандрыя Слуцкая, 1.01.1762.

Без пячаткі і подпісу.

Тагачасная копія. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 492).

217. Дэкрэт войтаўскага суда Мазырскага магістрата аб пазбаўленні Тэадора Савіцкага Цэлепуна пасады мазырскага пратапопа паводле скаргаў мазырскіх святароў і мяшчан на яго крымінальныя ўчынкі, а таксама аб прызначэнні пратапопам і святаром царквы св. Міхала да канчатковага выраку з боку Кіеўскай мітраполіі спаскага празбітара Тэадора Мітукевіча. Мазырская ратуша, 7.02.1748.

Копія подпісаў: Гервазі Людвік Аскерка, староста судовы і войт мазырскі; Канстанты Кандратовіч, пісар магдэбурскі мазырскі.

Тагачасная копія. Пол. м. Філігрань. Старая фаліяцыя: арк. 35 (18 ст.) 1 арк. (арк. 493).

218. Тэстыманіяльны ліст старасцінскага ўрада Слуцкага замка, выдадзены слуцкаму архімандрыту [Паўлу] Ваўчанскаму паводле яго скаргі на глускага купца і абывателя Шлёму, які няслушна падаў супліку сваёй пані княжне навагрудскай ваяводзінай на архімандрыта наконт пэўнай пазыкі грошаў праз слуцкіх жыдоў. Слуцк, 4.03.1768.

Пячатка кустадыйная ўрада Слуцкага замка (кепскай якасці).

Подпіс: Ян Хрысціціч, намеснік стар[о]сты кн[яст]ва Слуцкага.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 3. 2 арк., змацаваныя пячаткай (арк. 494—495; арк. 495 чысты).

219. Ліст-паведамленне ражанскага падкаморыя, ротмістра Кароннага войска, маршалка канфедэрацыі графа Міхала Корвін-Красінскага да ўсіх расійскіх вайсковых афіцэраў і абываталяў аб падтрымцы палітыкі расійскага ўрада па абароне жыхароў ВКЛ праваслаўнага веравызнання і просьбай да расійскіх войскаў не чыніць гвалтаў і разбурэнняў у Рэчы Паспалітай. Бар, 7.03.1768.

Копія подпісу (аб згоднасці з арыгіналам): Яцэк Антоні Рагаля Каха[н]скі, канфедэрацыі канцылярыст, сакратар і пісар войска.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 496—497).

220. а) Позва старшаму Слуцкага праваслаўнага манастыра Паўлу Ваўчанскаму ў камісарскі суд, прызначаны Варшаўскім экстраардынарным соймам, які адбудзецца ў Вільні ў 1768 г., па справе апекуноў кн. Радзівілаў аб пераглядзе пунктаў дэкрэта Генеральнай канфедэрацыі, якім Слуцкай архімандрыі прысуджана выплата Радзівіламі сумы 56 418 зл. і 20 гр. Без месца, 12.03.1768.

Копія подпісу: Фелікс Зміёўскі, пісар зем[скі] в[аяводств]а Вілен[скага].

б) Рэляцыйны квіт енерала ЯКМ Навагрудскага ваяводства Базыля Лукомскага аб падачы згаданай позвы П. Ваўчанскаму ў Слуцку ў манастыры. Без месца, 12.04.1768.

Подпіс: Базылі Лукомскі, енерал ЯКМ в[аяводства] Н[авагрудскаг]а.

Арыгінал (енеральская копія). Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 9-по. 1 арк. (арк. 498).

221. Ліст-пленіпатэнцыя слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага і ўсяго слуцкага духавенства, дадзены намесніку Слуцкай архімандрыі Герасіму Сваткоўскаму на прадстаўленне інтарэсаў архімандрыі ў камісарскім судзе ў Вільні, прызначаным Варшаўскім экстраардынарным соймам, у справе апекуноў кн. Радзівілаў аб пераглядзе сумы 56 418 зл. і 20 гр., выплачваемай Радзівіламі Слуцкай архімандрыі. Архімандрыя Слуцкая, 25.04.1768.

Подпісы: Павел Ваўчанскі, архімандрыт слуцкі, з усім манашаствам і духавенствам; сведка Людвік Гардзяевіч, стр[ажнік] смале[нскі]; сведка Марцін Магільніцкі, капітан ЯКМ.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: «Сей листъ пленипотенцыальній не есть нужной». 2 арк. (арк. 499—500; арк. 500 чысты, з затылкам).

222. Прыватны ліст (пісьмо) М. Араноўскага да кутынскага старосты, аканома Слуцкага княства пана Пястжэцкага з паведамленнем, што ў справе памежнай між в. Цярушкі [Слуцкай архімандрыі] і маёнткамі кн. [Радзівілаў] духоўнікі маюць дакументы на дазвол карыстацца пушчай. Пагост, 24.05.1762.

Пячатка на чырвоным сургучу (на адвароце арк. 802, пашкоджаная) і подпіс: М. Араноўскі, П. С. (абрэвіятура не расшыфравана).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 801—802; арк. 802 чысты, з адрасам).

223. Рэестр дакументаў за 1504—1768 гг. на фундушы і іншыя запісы ад розных асоб, якія належаць манастыру св. Тройцы і іншым манастырам і цэрквам Слуцкай архімандрыі, перададзеных браслаўскаму падстаросце Яну Мірскаму для вядзення справы слуцкага духавенства з кн. Радзівілам у камісарскім судзе. Без месца, 28.05.1768.

Подпіс: Ян Мірскі, падстар[оста] судовы бр[аслаўскі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 39. 2 арк. (арк. 503—504; арк. 504 чысты, з затылкам).



224. а) Пункты мемарыяла Слуцкага праваслаўнага духавенства, пісанага да свайго калятара, маршалка Канфедэрацыі Рэчы Паспалітай кн. [Караля Радзівіла], з пажаданнямі аб пацвярджэнні сваіх правоў з боку калятара. Без месца і даты. (Тагачасная копія).

Без подпісу.

б) Нататка аб прадстаўленні да актыкацыі згаданай копіі мемарыяла ў кнігах Галоўнага Трыбунала ВКЛ віцебскім каморнікам Янам Вольфам. Без месца, 16.06.1768.

Подпісы: Юзаф Мікалай Радзівіл, пісар в[ялікі], маршалак Тр[ыбунала] Гал[оўнага] ВКЛ; Антоні Яновіч, CPW (чашнік павета Вількамірскага), пісар Тр[ыбунала] Г[алоўнага] ВКЛ; згодна з актамі — Уладыслаў Кімбар, зем[скі] вілен[скі] і Т[рыбуна]ла Гал[оўнага] ВКЛ рэгент.

Тагачасная копія, прадстаўленая да актыкацыі. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 805).

225. Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Вільні, 16.06.1768. Прыватны ліст (пісьмо) маршалка Генеральнай кароннай канфедэрацыі і соймавага кн. Караля Радзівіла да старосты Слуцкага княства пана Непакойчыцкага з просьбай вырашыць скаргу слуцкага архімандрыта аб неатрыманні замены за ўзяты да Бажантарні кавалак архімандрыцкай зямлі, а таксама аформіць ад імя княжацкага скарбу арэнду архімандрыцкай карчмы на два гады, і па іншых пытаннях. Варшава, 17.11.1767.

Пячатка кустадыйная Галоўнага Трыбунала ВКЛ.

Подпісы: Юзаф Мікалай Радзівіл, пісар в[ялікі], маршалак Тр[ыбунала] Гал[оўнага] ВКЛ; Ян Гечэвіч, ротм[істр] і дэпутат в[аяводств]а Вілен[скага]; Фульгенты Каменскі, ротмістр і дэпутат п[аве]та Лідс[ка]га; Фелікс Клёт, р[отмістр?] і дэпутат павета Браслаўскага; Антоні Савіцкі, стражнік п[аве]та Старад[убскага], суддзя Тр[ыбуна]ла Гал[оўнаг]а ВКЛ; Міхал Таньскі, S. P. (абрэвіятура не расшыфравана, паводле даведнікаў — стражнік смаленскі), дэпутат з в[аяводства] Троцкага; Антоні Яновіч, CPW (чашнік павета Вількамірскага), пісар Тр[ыбунала] Г[алоўнага] ВКЛ; карыгаваў Уладыслаў Кімбар, зем[скі] вілен[скі] і Т[рыбуна]ла Гал[оўнаг]а ВКЛ рэгент; зверана з актамі — Кульповіч, нам[еснік] Кан[цылярыі] Тр[ыбу]н[аль]скай (на адвароце арк. 509).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 81 (спраўлена з № 80-й); «Къ дѣлам Архімандріи Слуцкой не нужное». 4 арк. (арк. 806—809).

226. Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Вільні, 16.06.1768. Падаўчы ліст старосты Слуцкага і Капыльскага княства Барталамея Непакойчыцка-

га паводле ардынанса маршалка Кароннай канфедэрацыі і соймавага кн. [Караля] Радзівіла аб уступцы слуцкаму архімандрыту кс. [Паўлу] Ваўчанскаму да манастыра Слуцкай архімандрыі ўчастка зямлі, некалі ўзятага ў манастыра да княскай Бажантарні, і юрыздыкі да Слуцкага кляштара Св. Геляша, некалі яму належачай. Слуцк, 15.12.1767.

Пячатка кустадыйная Галоўнага Трыбунала ВКЛ.

Подпісы: гл. № 225.

Арыгінал: Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 81; «Сіе дѣло приложит[ь] къ дѣламъ Архімандріи Слуцкой». 4 арк. (арк. 510—513; арк. 513 чысты, з затылкам).

227. Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Вільні, 16.06.1768. Ліст-асігнацыя маршалка Кароннай канфедэрацыі і соймавага кн. Караля Радзівіла да лоўчага пушч Слуцкага княства, каб не забараняў на працягу года праваслаўнаму духавенству Слуцкага княства карыстацца палеглым дрэвам у княжацкіх лясах на дровы паводле даўніх фундушаў. Варшава, 17.11.1767.

Пячатка кустадыйная Галоўнага Трыбунала ВКЛ.

Подпісы: гл. № 225.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 514—515).

228. Выпіс з кніг Галоўнага Трыбунала ВКЛ у Вільні, 16.06.1768. Ліст-загад маршалка Кароннай канфедэрацыі і соймавага кн. Караля Радзівіла сваім слуцкім арандатарам, каб дазвалялі кс. слуцкаму архімандрыту на патрэбу свайго манастыра малоць у слуцкіх млынах задарма 80 карцоў жыта штогод паводле старажытнай канвенцыі за знішчаны манастырскі млын на рацэ Лакнеі. Варшава, 17.11.1767.

Пячатка кустадыйная Галоўнага Трыбунала ВКЛ.

Подпісы: гл. № 225.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 82-й (спраўлена з № 99-й); «Сіе дѣло приложить къ дѣламъ Архімандріи Слуцкой». 2 арк. (арк. 516—517).

229. Ліст-данясенне пінскага ігумена Уладзіміра Журакоўскага і грозаўскага ігумена Варлаама Уладычкі праваслаўнаму архіяпіскапу, мітрапаліту кіеўскаму, галіцкаму і Малой Расіі Арсенію Магілянскаму аб выніках следства, праведзенага імі ў Слуцку, у справе па ўзаемных скаргах слуцкага архімандрыта, а Слуцкага брацтва і Слуцкай пратапопіі аб грашовых і іншых прэтэнзіях. Без месца, 07.1768 (без чысла, у кансісторыі Кіеўскай мітрополіі атрымана 2.08.1768).

Копіі подпісаў: Уладзімір Журакоўскі, ігумен пінскі; Варлаам Уладычка, ігумен грозаўскі.

Тагачасная копія. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 2384 (уваходзячы кансісторыі Кіеўскай мітраполіі). 3 арк. (арк. 518—520).

230. Ліст-данясенне намесніка Слуцкай архімандрыі Іларыёна Мінкевіча і іераманаха Лукі Барановіча кіеўскаму мітрапаліту Арсенію Магілянскаму, што дасланыя скаргі былога намесніка Слуцкай архімандрыі Герасіма, які



збег, быццам слуцкі архімандрыт [Павел] Ваўчанскі спустошыў фундушы Слуцкага архімандрыцкага манастыра, не ёсць слушныя, а наадварот — архімандрыт гэтыя фундушы памнажае. Без месца, 11.08.1768.

Копіі подпісаў: ксёндз Іларыён Мінкевіч, НАС (намеснік архімандрыі Слуцкай); іераманах Лука Барановіч, САС (скарбнік? архімандрыі Слуцкай) (абодва падпісаліся па-польску).

Тагачасная копія. Рус. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 2601 (уваходзячы кансісторыі Кіеўскай мітраполіі). 1 арк. (арк. 521).

231. Выпіс з кніг Мінскага гродскага суда ад 18.09.1766, выдадзены 15.04.1768. Выпіс з кніг урада замка Слуцкага, 20.09.1720.

а) Ліст канюшага ВКЛ, генеральнага губернатара княства Прускага кн. Багуслава Радзівіла да сваёго іваньскага падстаросты Яна Лазарэвіча, каб штогод выдаваў папам і дэканам Саборнай царквы на замку Слуцкім па чатыры бочкі жыта кожнаму паводле даўніх фундушаў кн. Слуцкіх. Слуцк, 8.02.1662.

б) Ліст таго ж кн. Б. Радзівіла да свайго пагосцкага падстаросты Рафала Буйніцкага, каб штогод выдаваў папам і дэканам Саборнай царквы на замку Слуцкім дванаццаць вёдраў мёду з двара Пагосцкага і восем коп грошаў з арэнды пагосцкай паводле даўніх фундушаў кн. Слуцкіх. Слуцк, 8.02.1662.

Заўвага: абодва дакументы служаць брацтву пры Слуцкай Саборнай царкве Успення Багародзіцы (1720, 1766 гг.).

Пячатка кустадыйная мінскага старосты Ігнація Іваноўскага (Мінскага гродскага суда).

Подпіс: згодна з актамі — Фелікс Ян Кубліцкі-Пятух, р[э]г[е]нт гр[одскі] мін[скі].

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 47. 6 арк. (арк. 522—527).

232. Ліст-ордэр Слуцкай архімандрыі намесніку Заблудаўскага Успенскага манастыра іераманаху Макарыю Марціновічу з загадам неадкладна ехаць у Варшаву, каб падаць прыкладзены пакет паўнамоцнаму паслу Расійскага двара кн. Мікалаю Васільевічу Рэпніну і атрымаць ад яго рэзалюцыю, якую па вяртанні ў Заблудаў неадкладна пераслаць у Слуцк да архімандрыта. Без месца, 22.09.1768.

Подпіс (або копія?): Павел Ваўчанскі, архімандрыт слуцкі і мітраполіі Кіеўскай намеснік.

Арыгінал (або тагачасная копія?). Рус. м. Фрагмент філіграні. 1 арк. (арк. 528).

233. Ліст-прэзента (прадстаўленне) віленскага ваяводы кн. Караля Станіслава Радзівіла з просьбай да архіяпіскапа, кіеўскага мітрапаліта Арсенія Магілянскага аб зацвярджэнні прызначанага празбітарам царквы Праабражэння Гасподня ў мястэчку Любань у Слуцкім княстве айца Яна Загароўскага пасля былога празбітара Мікалая Загароўскага. Нясвіж, 23.09.1768.

Копія подпісу: Караль князь Радзівіл.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. з тэкстам без нумарацыі; арк. 529 чысты, з затылкам).

234. Ліст-данясенне петрыкаўскага пратапопа Яна Будовіча слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі [Паўлу Ваўчанскаму] з просьбай аб неадкладным прысланні ў Петрыкаўскую пратапопію ў Загальскую царкву Святога мучаніка Юрыя і ў Сякерыцкую царкву Святых апосталаў Пятра і Паўла святых антымінсаў, без якіх немагчыма адпраўляць богаслужэнні. Петрыкаў, 5.11.1768.

Подпіс: Ян Будовіч, пратапоп петрыкаўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 530).

235. Пункты тлумачэння довадаў праваслаўных Грозаўскіх манастыроў Св. Яна і Св. Мікалая для падачы апеляцыі на дэкрэт эксдывізарска-таксатарскага суда ў Грозаве ў справе з уласнікамі маёнтка Грозаў наконт фундушавых земляў. Без месца і даты.

Без пячатак і подпісаў.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 48. 1 арк. (арк. 531).

236. а) Супліка Апанаса Высоцкага да [слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага] са скаргай на айца [слуцкага] пратапопа аб недазваленні выдаць замуж пляменніцу жонкі скаржніка і іншыя перашкоды. Без месца і даты.

Копія подпісу: Апанас Высоцкі.

б) Скрыпт сватоў Афанасія Высоцкага і іншых, дадзены кляштару Слуцкай архімандрыі, з запэўніваннем, што жаніх і нявеста, Базыль Есіповіч і Ефрасімія Леваноўна, абывацелі места Слуцка, не з'яўляюцца крэўнымі сваякамі. Архімандрыя [Слуцкая], 10.01.1769.

Подпісы: Афанасі Высоцкі; Ёсіф Мілеевіч; Марка Мілеевіч; Антоні Камінскі.

в) Скрыпт сватоў Яна Пышніча і іншых, дадзены кляштару Слуцкай архімандрыі, з запэўніваннем, што жаніх бязверхавіцкі абывацель Барыс Маглыш і нявеста агародніцкая абывацелька Феадосія Круглікоўна не з'яўляюцца крэўнымі сваякамі. Архімандрыя [Слуцкая], 11.01.1769 (стары стыль).

Подпісы (крыжыкамі): Ян Пышніч; Керый Роўны; Паўлюк Пышніц; Іван Круглік.

Арыгінал (тэкст (а) капійны, а тэксты (б і в) арыгінальныя). Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 532—533).

237. Асекурацыйны ліст арганіста Слуцкай езуіцкай капэлы Якуба Лаўрыновіча, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Міхалу Казачынскаму, з абяцаннем апрацоўваць кавалак сенажаці за ракой Случ, атрыманы ад Слуцкай архімандрыі на тры гады, побач са сваёй зямлёй, і вярнуць гэтую сенажаць архімандрыі ў абумоўлены тэрмін. Без месца, 18.06.1749 (новы стыль).

Подпіс: Якуб Лаўрыновіч, арганіст капэлы Слуцкай О[рдэна] Е[зуітаў].



Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 534—535; арк. 535 чысты, з затылкам).

238. Ліст-прашэнне манаха Мінскага манастыра [св. Пятра і Паўла] Марка Федарэвіча, ураджэнца горада Масквы, да [слуцкага] архімандрыта [Паўла Ваўчанскага] прыняць яго да якога-небудзь манастыра ў сувязі з тым, што з-за беднасці Мінскага манастыра ён быў адпушчаны з пашпартам і з-за цяжкіх часоў у краіне не мае дзе спыніцца (манах апісвае ў лісце сваю біяграфію). Без месца, 25.07.1769.

Подпіс: Марка Федарэвіч.

Арыгінал. Рус. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 536—537; арк. 537 чысты).

239. Указ духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі ігумену Ануфрыеўскага замежнага манастыра Кіеўскай япархіі Яфрэму ўчыніць следства, ці жыў раней у яго манастыры іераманах Ісаія, і ці пастрыгаў ён у манахіні Аляксандру, у манашстве якой мае сумненне ігумення Муцінскага манастыра Мінадора. Без месца, 30.10.1769.

Подпісы: катэдральны намеснік іераманах Феафілакт; за кансісторскага пісара іераманах Кірыл; падканцылярыст Сава Паўлоўскі.

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 1837 (зыходзячы кансісторыі). 2 арк. (арк. 538—539).

240. а) Выпіс з кніг Латычаўскага гродскага суда, 5-ы дзень па свяце Св. Тройцы, 1770 г. Скарга праваслаўных канельскага правіцеля кс. Сымяона Перароўскага і белацаркоўскага правіцеля кс. Базыля Заржэўскага ад імя ўсіх праваслаўных святароў Пераяслаўскай япархіі ў Кіеўскім і Брацлаўскім ваяводствах на Радамысльскую ўніяцкую кансісторыю і яе духавенства аб гвалтоўных наездах на двары праваслаўных святароў, збіцці іх жонак, захопах і спусташэннях праваслаўных цэркваў і іншых шкодах. Без месца [Латычаў], 5-ы дзень па свяце св. Тройцы, 1770 г.

Копіі подпісаў: карыгаваў Чайкоўскі; згодна з актамі — Асташэўскі.

б) Нататка аб звера цы гэтай копіі з арыгіналам. Без месца і даты.

Пячатка на чырвоным сургучу Пераяслаўскай катэдры.

Подпіс: катэдральны канцылярыст і паддыякан Дзімітры Сіманоўскі (рус. м.).

Тагачасная копія, завераная пячаткай і подпісам. Лацін. і пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 540—541; арк. 541 чысты, з затылкам).

241. Ліст-данясенне петрыкаўскага пратапопа Яна Будовіча да [слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага], што цэрквам св. Юрыя ў в. Загалле і св. апосталаў Пятра і Паўла ў в. Сякерычы патрэбныя новыя антымінсы, а згарэўшай Валасовіцкай царкве патрэбны два антымінса ў галоўны алтар Нараджэння панны Марыі і ў прыдзел Сыходжання Св. Духа. Петрыкаў, 12.02.1770.

Подпіс: Ян Будовіч, петрыкаўскі пратапоп.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 542—543; арк. 543 чысты, з затылкам).

242. а) Позва ігумену праваслаўнага Дзяцелавіцкага манастыра Мялеціу-шу Бувайлу і яго манахам у Навагрудскі гродскі суд па справе смаленскай кашталянічавай Людовікі з Пацаў Шчытавай. Без месца, 12.02.1778.

Без подпісу.

б) Рэляцыйны квіт енерала Я. К. М. Пінскага пав. Антонія Мыскевіча (?) аб падачы згаданай позвы ігумену манастыра ў Дзяцелавічах. Без месца, 17.02.1778.

Подпіс: Антоні Мыскевіч (?), енерал Я. К. М. п[аве]та Пінскага.

Арыгінал (енеральская копія). Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: F. 13, № 5. 1 арк. (арк. 544).

243. Ліст-паведамленне духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі [Паўлу Ваўчанскаму], што манах Слуцкага Свята-Траецкага манастыра Лаўрэнці рукапаложаны ва іерадыякана ў храме Свяціцеля Мікалая ў Кіева-пустынна-мікалаеўскім манастыры, на што выдадзена грамата кіеўскім мітрапалітам Арсеніем. Без месца [Кіеў], 19.02.1770.

Подпісы: катэдральны пісар іераманах Іерэмія; мітраполіі Кіеўскай архідыякан Іларыён; крыжовы іераманах Арэст.

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 204 (зыходзячы кансісторыі); «сія бумага не нужна» (на адвароце арк. 546). 2 арк. (арк. 545—546; арк. 546 чысты, з затылкам).

244. а) Ліст мешчаніна Трайчанскага прадмесця Астапа Лесуновіча продажу трайчанскаму мешчаніну Кіпрыяну Яскевічу свайго морга зямлі за 10 злотых. Слуцк, 3.06.1718 (стары стыль) (на адвароце арк. 547).

Подпісы: крыжык (Астапа Лесуновіча); Максім Кіселік (сведка).

б) Супліка брацііі неакрэсленага манастыра да [слуцкага архімандрыта] з просьбай аб дапамозе (сэнс не акрэслены дакладна). Без месца, 27.06.1770 (на арк. 547).

Без подпісаў.

Заўвага: адваротны бок дакумента (а) выкарыстаны для напісання чарнавога варыянта дакумента (б).

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 547).

245. а) Скрыпт Тадэуша Багдановіча, дадзены капыльскаму празбітару кс. Антонію Ярашэвічу з запэўніваннем аб неўзнаўленні ў будучым судовай справы, якую яны мелі між сабой і скончылі дамовай. Дактаровічы, 6.03.1771.

Копія подпісу: Тадэуш Багдановіч, АК (адміністратар капыльскі?).

б) Ліст Т. Багдановіча, дадзены капыльскаму празбітару [А. Ярашэвічу], што падданыя не будуць празбітару чыніць ніякіх прыкрасцяў па сканчэнні судовай справы. Дактаровічы, 10.03.1771.

Копія подпісу: Тадэуш Багдановіч.

Тагачасная копія. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 550 з тэкстамі дакументаў; чысты арк. не пагінаваны).



246. Квітанцыя Антмейстэрскай камісіі Санкт-Пецярбургскага легіёна аб забароне камандам згаданага легіёна браць правіянт і фураж з вёсак слуцкіх праваслаўных манастыроў, так як камісія ўжо атрымала ад манастыроў патрэбную квоту. Без месца, 10.03.1771.

Подпіс: правіянтмейстар Іван Давыдаў.

Арыгінал. Рус. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 548—549; арк. 549 чысты).

247. Дэкларацыя вялікага пасла Расійскай імперыі ў Рэчы Паспалітай К. дэ Сальдэрна, пададзеная польскаму каралю [Станіславу Аўгусту], са сведчаннямі жадання расійскай імператрыцы ўзяць пад апеку абяздоленыя народы Рэчы Паспалітай пад час дзеючых там узрушэнняў з мэтай уз'яднання народаў абедвюх дзяржаў. Варшава, 14/25.05.1771 (стары і новы стылі).

Копія подпісу К. дэ Сальдэрн.

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 551—552).

248. Указ Маларасійскай калегіі Правячага Сената Расійскай імперыі з пацвярджэннем свайго ранейшага выраку аб звальненні з пасад з выдачай атэстатаў былых канцылярыстаў калегіі Дзмітрыя Зубрыцкага і Герасіма Адамовіча, якія паходзяць са святарскіх сыноў, паводле іх прашэнняў, так як Указ Сената аб забароне дзяржаўным установам звальняць асоб ніжніх чыноў датычыць вялікарасійскіх устаноў, але не датычыць асоб вольных саслоўяў з Маларосіі. Без месца, 30.12.1771.

Копіі подпісаў: оберсакратар Сяргей Анчурын; сакратар Сяргей Бельскі; канцылярыст Андрэй Бераў.

Тагачасная копія. Рус./стукр. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 351 (зыходзячы канцылярыі калегіі). 1 арк. (арк. 553).

249. Ахоўны ліст генерала-парутчыка Аўрама Раманава (?) паводле ўказа расійскай імператрыцы Кацярыны Аляксееўны, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Паўлу Ваўчанскаму, аб забароне корпусу генерала і іншым расійскім войскам рабаваць вёскі манастыроў Слуцкай архімандрыі Цярэшкі, Шыпілавічы, Ямінск, Пасека, Сінягова, Пухавічы, Грозаў, Аксаметы, Кузмічы, Трайчаны, Морач, Ананьчычы і Убібацк. Мястэчка Каполе, 9.01.1772.

Пячатка на чырвоным сургучу і подпіс: генерал-паручнік Аўрам Раманаў (?).

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 51 (зыходзячы канцылярыі корпуса). 2 арк. (арк. 554—555; арк. 555 чысты).

250. а) Рэспонс прускага караля Фрыдрыха да кіраўнікоў Канфедэрацыі Рэчы Паспалітай наконт аховы граніцы паміж Прусіяй і Рэччу Паспалітай і прыгранічных прускіх падданых, аб правах каталікаў і пратэстантаў і інш. Без месца і даты.

Копія подпісу: Фрыдрых, кароль.

б) Ліст польскага караля [Станіслава Аўгуста] да французскага караля, як гаранта польскай дзяржаўнасці, аб дапамозе Рэчы Паспалітай у сувязі з

пагрозай акупацыі і падзелу краіны паміж суседнімі дзяржавамі [Расіяй, Прусіяй і Аўстрыяй]. Без месца, 1772 г. (без числа і месяца).

Без подпісу.

Тагачасная копія. Пол. м. (пераклад з французскай мовы). Філіграні. 2 арк. (арк. 556—557).

251. а) Ліст петрыкаўскага пратапопа Яна Будовіча да [слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага] з просьбай выдаць святое міра для патрэб цэркваў Петрыкаўскай пратапопіі. Без месца і даты.

Подпіс: Ян Будовіч, пратапоп петрыка[ўскі].

б) Ліст-паведамленне слуцкага архімандрыта Паўла [Ваўчанскага] да петрыкаўскага пратапопа аб выданні 10.12.1769 духоўнай кансісторыяй Кіеўскай мітраполіі ўказа аб аплаце грашыма пратапопіямі за дасылаемае міра, таму і петрыкаўскі пратапоп павінен аплаціць кошт міра, дасланага пасля даты ўказа, каб атрымліваць міра і надалей. Без месца, 28.02.1773.

Подпіс (або копія подпісу?): Павел, архімандрыт слуцкі.

Арыгінал. Пол. м. (а); рус. м. (б). Філіграні. 2 арк. (арк. 558—559; арк. 559 чысты, з затылкам).

252. Сальвагвардыя (ахоўны ліст) генерал-паручніка Аврама Раманава (?), дадзенае манастыру Слуцкай архімандрыі, аб забароне расійскім войскам спаганяць без дазвольных дакументаў правіянт і фураж з маёнткаў Слуцкай архімандрыі. Гродна, 29.03.1773.

Копія подпісу: ад кавалерыі генерал-паручнік і ордэна Святой Ганны кавалер Аўрам Раманаў (?).

Тагачасная копія. Рус. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 269 (зыходзячы ваеннай канцылярыі генерала). 1 арк. (арк. 560).

253. Другі экзэмпляр дакумента № 252.

Тагачасная копія. 1 арк. (арк. 561).

254. Супліка іераманаха (?) Ігнація Вечара, які прызначаны дыспазітарам у Грозаўскі манастыр, да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага, што прысланы да яго памочнікам айцец Антоні захапіў уладу і гаспадарку манастыра, забараніў падданым паслушэнства скаржніку і здзяйсняе розныя перашкоды ў кіраўніцтве манастыром. Грозаў, 28.03.1773.

Подпіс: і[ераманах?] Ігнаці Вечар.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 562—563).

255. а) Супліка іярэя Кандрація Пігулеўскага да [слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага] аб тым, што двое маскоўскіх жаўнераў прымусілі яго і яго бакалаўра напісаць білет на падводы, якія яны пыталіся спагнаць у панскім двары, а ўласнік двара паскардзіўся аб гэтым камандзірам маскоўскага войска. Без месца, 25.04.1773.

Подпіс: іярэй Кандраці Пугулеўскі (!, памылкова, трэба — Пігулеўскі) (стб. м.).



б) Рэзалюцыя слуцкага архімандрыта Паўла [Ваўчанскага] аб неадкладным правядзенні следства па гэтай супліцы. Без месца, 6.05.1773.

Подпіс: Павел, АС (архімандрыт слуцкі).

Арыгінал. Пол. м. (а), рус. м. (б). Філіграні. 2 арк. (арк. 564—565).

256. Указ Кіеўскай духоўнай кансісторыі архімандрыту Слуцкага Траецкага манастыра Паўлу [Ваўчанскаму] з загадам даслаць у Кіеўскую кансісторыю ведамасць з пералікам манастыроў, пратапопій і прыходскіх цэркваў, якія належаць да Слуцкай архімандрыі, з паказаннем імёнаў ігуменаў манастыроў і пратапопаў, а таксама колькасць манахаў у манастырах і святароў і дыяканаў пры цэрквах. Без месца, 5.06.1773.

Подпісы: катэдральнага а[д]м[іністра]т[а]ра (?) намеснік ігумен Мельхіседэк; канцылярыст Іван Вігідансі (?).

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 566—567; арк. 567 чысты, з затылкам).

257. а) Універсал слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага да іярэяў Слуцкай архімандрыі аб скліканні на 6.07.1773 сабора Слуцкай архімандрыі, на які яны павінны з'ехацца. Без месца, 13.06.1773.

Подпіс: Павел, архімандрыт слуцкі.

б) Нататка аб атрыманні гэтага ўніверсала з Слуцкай архімандрыі ва Урэцкай плябаніі і перасылцы яго да Языльскай плябаніі. Без месца, 18.06.1773.

Подпіс: Емяллян Страховіч, празбітар ца[ркві] урэ[цкай].

в) Нататка аб атрыманні гэтага ўніверсала з Языля ў плябаніі Амговіцкай царквы і перасылцы яго ў Парэчча. Без месца, 22.06. [1773].

Подпіс: Парфені Звярковіч (?), ц[а]ркві А[мговіцкай].

г) Нататка аб атрыманні гэтага ўніверсала ў Жыцінскай плябаніі і адпраўцы яго ў Крынскую плябанію. Без месца, 26.06. [1773].

Без подпісу.

Арыгінал. Рус. м. (а); стб. м. (б); пол. м. (в, г). Філіграні. 2 арк. (арк. 568—569; арк. 569 чысты).

258. Ордэр Слуцкай архімандрыі іераманахам Іосіфу Абрамовічу, намесніку Слуцкага Свята-Траецкага манастыра, Іларыёну Манкевічу і Мельхіседэку Круцяльніцкаму з загадам прыбыць і ўдзельнічаць у пасяджэннях духоўнай кансісторыі Слуцкай архімандрыі, якія былі перад тым прыпыненыя ў неспакойныя для краіны часы. Без месца, 12.07.1773.

Подпіс: Павел, архімандрыт слуцкі і мітраполіі Кіеўскай намеснік.

Арыгінал. Рус. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 570—571; арк. 571 чысты).

259. Рапарт петрыкаўскага пратапопа Яна Будовіча [слуцкаму архімандрыту Паўлу Ваўчанскаму], што не з усіх цэркваў Петрыкаўскай і Мазырскай пратапопій удалося сабраць грошы на міра, з якімі паслаў у Слуцк празбітара Карпа Загароўскага. Петрыкаў, 2.07.1773.

Подпіс: Ян Будовіч, пратапоп петрыкаўскі.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 2 арк. (арк. 572—573; арк. 573 чысты).

260. а) Прашэнне іераманаха Слуцкага Траецкага манастыра Ясона Андрэеўскага, былога святара паловы парафіі Слуцкай Мікалеўскай царквы, да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага аб выдачы распараджэння другому святару той жа Мікалаеўскай царквы Філіпу Багуцкаму, каб утрымліваў няпоўнагадовую дачку Андрэеўскага Таццяну з даходаў яго былой паловы парафіі паводле дэкрэта былога архімандрыта Дасітэя Ляхоўскага ад 1762 г. Без месца, 21.07.1773.

Подпіс: іераманах Ясон Андрэеўскі (пол. м.).

б) Распараджэнне слуцкага архімандрыта аб станоўчым разглядзе згаданага прашэння. Без месца, 21.07.1773 (на адвароце арк. 575).

Без подпісу.

Арыгінал. Стб./рус. м. (а); рус. м. (б). Філіграні. 2 арк. (арк. 574—575; арк. 575 пашкоджаны).

261. а) Данясенне іераманаха Ясона Андрыеўскага слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Паўлу Ваўчанскаму аб невыкананні айцом Багуцкім выраку архімандрыта аб утрыманні дачкі Андрыеўскага з яго паловы парафіі, а таксама аб нежаданні дзяліцца мёдам, які атрымлівае царква паводле фундуша з княжацкай каморы. Без месца і даты.

Подпіс: іераманах Ясон Андрыеўскі.

б) Рэзалюцыя слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага з загадам іярэю Філіпу Багуцкаму ўтрымліваць дачку Ясона Андрыеўскага з даходаў паловы парафіі. Без месца, 17.11.1773.

Подпіс: Павел, архімандрыт слуцкі.

Арыгінал. Стб. м. (а), рус. м. (б). Філігрань. 1 арк. (арк. 576).

262. а) Супліка падданага з вёскі Папоўцы Івана Шолама да [слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага] аб нападзе айца Філіпа Багуцкага на яго хату і разрабаванні яго гаспадаркі, а таксама аб згвалтаванні яго жонкі сынам святара Лявонам Багуцкім. Без месца і даты.

Подпіс: Іван Шолам.

б) Чарнавы запіс дэкрэта духоўнага суда кансісторыі Слуцкай архімандрыі па вышэйзгаданай скарзе. Без месца, 1773 г. (без чысла і месяца).

Без подпісаў.

в) Нататка аб вынесеным па гэтай справе дэкрэце. Без месца, 20.11.1773.

Без подпісу.

Арыгінал. Пол. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 577).

263. Ліст абываталяў Трайчанскай юрыздыкі Дзям’яна, Яна і Янкі Каленікаў, дадзены Слуцкаму Траецкаму манастыру, аб узяцці на парукі свайго малодшага брата Кузьмы Каленіка, абвінавачанага манастыром у пераходзе з манастырскага падданства ў места Слуцк, а таксама з абавязкам заплаціць доўг брата ў 64 злотых, пазычаных у Петрака Карабейніка. Архімандрыя [Слуцкая], 21.12.1773.



Подпісы (крыжыкамі): Дзям’ян Каленік; Іван Каленік; Янка Каленік; Кузьма Каленік.

Арыгінал. Пол. м. Фрагмент філіграні. 1 арк. (арк. 578).

264. Рэестр грашовых ахвяраванняў ад розных асоб Слуцкаму Праабражэнскаму манастыру і брацтву, а таксама даўгоў яму ж Слуцкага жыдоўскага кагалу і асобных мяшчан. Без месца і даты [1773 г.].

Подпіс: Ягор Рубцоў (пасада не зразумелая).

Арыгінал. рус. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 579—580; арк. 580 з чарнавымі нататкамі і затылкам).

265. Ордэр Слуцкай архімандрыі, выдадзены намесніку Слуцкай архімандрыі іераманаху Іосіфу Абрамовічу і ўсяму праўленню Слуцкай архімандрыі, з паведамленнем аб атрыманні ўказа духоўнай кансісторыі Кіеўскай мітраполіі і загадам адсочваць выкананне пунктаў указа. Без месца, 24.02.1774.

Подпіс: Павел, архімандрыт слуцкі і мітраполіі Кіеўскай намеснік.

Арыгінал. Рус. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 581—582; арк. 582 чысты).

266. Квіт (распіска) астроўскага вікарыя іярэя Пятра Скулоўскага аб атрыманні ўніверсала слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага і з абавязацельствамі выконваць яго пункты. Без месца, 27.03.1774.

Подпіс: іярэй Пётр Скулоўскі, вікары астроўскі.

Арыгінал. Рус. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 584).

267. Скрыпт вікарыя [Слуцкай?] Варварынскай царквы Мялеція Слаутовіча аб атрыманні ўніверсала слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі Паўла Ваўчанскага і з абавязацельствамі выконваць яго пункты. Без месца, 27.03.1774.

Подпіс: Мялеці Слаутовіч, вікары царквы Варварынскай.

Арыгінал. Пол. м. Без філіграні. 1 арк. (арк. 583).

268. а) Супліка празбітара Жыдаазёрскай царквы Яна Гаховіча да слуцкага архімандрыта, намесніка Кіеўскай мітраполіі [Паўла Ваўчанскага] з просьбай разглядзець яго спрэчку з падданымі [сяла Жыд-Возера] аб паншчыне і іншых павіннасцях, якія падданыя павінны выконваць для яго царквы. Без месца і даты.

Подпіс: Ян Гаховіч, празбітар ц[арквы] Жыдаазёрскай.

б) Рэскрыпт слуцкага архімандрыта Паўла [Ваўчанскага] з загадам разглядзець гэтую супліку на Саборы Слуцкай архімандрыі. Без месца, 11.04.1774 (на адвароце арк. 586).

Подпіс: Павел, АС (архімандрыт слуцкі).

Арыгінал. Пол. м. (а); рус. м. (б). Філіграні. 2 арк. (арк. 585—586).

269. Рэверсальны (адваротны) скрыпт Яна Яновіча, дадзены слуцкаму архімандрыту, намесніку Кіеўскай мітраполіі Паўлу Ваўчанскаму і ўсёй Слуцкай архімандрыі, з абавязкамі аб аплаце, апрацоўцы і іншым валокі зямлі

з сенажацямі за ракой Лакнеяй, атрыманай ім з фундушавых земляў Слуцкага Траецкага манастыра на пэўных умовах. Без месца, 23.04.1774 (стары стыль).

Подпіс: Ян Яновіч (крыжыкам).

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: «Не нужное». 2 арк. (арк. 587—588; арк. 588 чысты, з затылкам).

270. а) Рэестр прыходу царкоўных грошаў з продажу свечак і з скарбонкавых ахвяраванняў [Слуцкага Траецкага манастыра?] за 1773/1774 гг. Без месца, 10.07.1774.

б) Рэестр расходу грошаў на розныя царкоўныя патрэбы [Слуцкага Траецкага манастыра за 1773/1774 гг.]. Без месца, [10.07.1774].

Без подпісаў.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 589—590).

271. а) Дэкрэт Мазырскага гродскага суда па ўзаемных скаргах між магістратам места Мазыра і намеснікам пярэдняй стражы вялікай булавы войска ВКЛ Казімірам Апокай аб праве ўласнасці на востраў (участак зямлі) Мазырскай Мікольскай царквы. Без месца і даты (пасля 6.09.1774). (Дакумент без пачатку).

Копія подпісу: карыгаваў Стэфан Кульпоіць (? памылковая форма напісання), зем[скі] і грод[скі] п[аве]та Мазыр[скага] рэгент.

б) Асекурацыйны ліст Яна Апокі, дадзены навагрудскаму кашталянічу, мазырскаму войту Яну Яленскаму і ўсяму месту Мазыру, з абавязкам пасля выздараўлення жонкі выселіцца з месцкай зямлі востраў Мікольскі, якую атрымаў паводле каралеўскага прывілея па няслушнай заяўцы, паводле дэкрэта Мазырскага гродскага суда. Камаровічы, 10.11.1774.

Копіі подпісаў: Ян Апока; Анзельм Ант[оні] Корсак, суд[дзя] зем[скі] мазыр[скі]; Ян Кулеша, су[ддзя] зем[скі] смал[енскі].

Тагачасная копія. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 591—592).

272. Разлік грошаў, атрыманых Слуцкай архімандрыяй ад цэркваў і кляштараў за розныя царкоўныя патрэбы. Без месца, 4.05.1775.

Без подпісу.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 2 арк. (арк. 593—594; арк. 594 чысты).

273. а) Позва ў Навагрудскі гродскі суд навагрудскаму абознаму Міхалу Бярновічу ў скарзе старшага Грозаўскага манастыра айца Яцынта Пультынскага аб захопе сенажаці манастырскага фальварка Слабодка грозаўскім ураднікам М. Бярновіча Антоніем Блоцкім. Без месца, 22.05.1775.

Без подпісу і пячаткі.

б) (на палях) Нататка аб актыкацыі гэтай позвы ў кнігах Навагрудскага гродскага суда. Без месца, 11.09.1775.

Подпіс: Юзаф Абуховіч, н[аместнік] гродскі в[аяводства] Н[авагрудскага].

в) Рэляцыйны квіт енерала Я. К. М. Навагрудскага ваяводства Рафала Паўловіча аб падачы згаданай позвы М. Бярновічу ў яго маёнтку Грозаў Навагрудскага ваяводства. Без месца, 22.05.1775.



Подпіс: Рафал Паўловіч, енерал Я. К. М. в[аяводства] Н[авагрудскага].

г) Нататка аб актыкацыі гэтага квіта ў кнігах Навагрудскага гродскага суда. Без месца, 24.05.1775.

Подпіс: Абуховіч, р[эгент] гр[одскі] в[аяводства] На[вагрудска]га.

Арыгінал (енеральская копія). Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: № 35; 77-й (абедзве закрэсленыя); 75. 2 арк. (арк. 595—596; арк. 596 чысты, з затылкам).

274. Рэестры выдаткаў [Слуцкага Траецкага манастыра] на царкоўныя, гаспадарчыя, будаўнічыя і іншыя патрэбы за май — жнівень 1775 г. Без месца і даты [1775 г.].

Без подпісаў.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 7 арк. (арк. 597—603).

275. Рэестры выдаткаў [Слуцкага Траецкага манастыра] на царкоўныя, гаспадарчыя, будаўнічыя і іншыя патрэбы за верасень 1775 г. — люты 1776 г. (працяг дакумента № 274). Без месца і даты [1776 г.].

Без подпісаў.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. 6 арк. (арк. 604—609; арк. 609 чысты).

276. а) Паведамленне архімандрыта Кіева-Пячэрскай лаўры Засімы ігумену прыпіснога замежнага Дзяцелавіцкага Праабражэнскага манастыра Мялецію аб пасылцы ў манастыр майстра Івана Пільніка для адрамантавання ў манастыры старой царквы, перабудовы будынка келляў у трапезную і пабудовы новай прыходскай царквы. Без месца, 15.12.1775.

Подпіс: архімандрыт Засіма.

б) Рапарт [ігумена Дзяцелавіцкага манастыра Мялеція ў Кіева-Пячэрскую лаўру] аб смерці 19.07.1776 прысланага майстра Івана Пільніка, які паспеў пачаць працы толькі на трапезнай. Без месца, 13.08.1776.

Подпіс: М[ялецій].

Арыгінал. Рус. м. Фрагмент філіграні. Стар. сігн.: № 3126 (зыходзячы канцылярыі Кіева-Пячэрскай лаўры). 1 арк. (арк. 610).

277. а) Квітацыйны ліст слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага, дадзены віленскім ваяводзічам Каралю і Гераніму Радзівілам і іх апекунам, аб атрыманні ад слонімскага старосты Ігнацыя Стравінскага, генеральнага пленіпатэнта Радзівілаў, паловы сумы грошаў, прысуджанай Слуцкай архімандрыі на Радзівілах дэкрэтам суда Генеральнай канфедэрацыі ў Брэсце 16.10.1764. Без месца, 27.06.1766.

Подпіс: Павел Ваўчанскі, архімандрыт слуцкі і праваслаўнай мітраполіі Кіеўскай намеснік.

б) Квітацыйны і асекурацыйны запіс слуцкага архімандрыта Паўла Ваўчанскага, дадзены тым жа К. і Г. Радзівілам і іх апекунам, аб атрыманні ад слуцкага аканома Гілярыя Дашкевіча другой паловы сумы грошай, прысуджанай дэкрэтам Генеральнай канфедэрацыі, а таксама з абяцаннем выдаць асобны квітацыйны ліст наконт гэтага. У Слуцкай архімандрыі, 23.07.1766.

Подпіс: Павел Ваўчанскі, слуцкі архімандрыт і праваслаўнай мітраполіі Кіеўскай намеснік.

Арыгінал. Пол. м. Філіграні. Стар. сігн.: 3; № 800. 2 арк. (арк. 611—612).

278. Прыватны ліст (пісьмо) ігумена Грозаўскага Свята-Янскага кляштара віленскага канвента Антонія Дзёрткі да пана прапойскага старосты (імя не пазначана), калятара гэтага кляштара, з просьбай выршыць з князем Радзівілам пытанне аб захопах кляшторных земляў нясвіжскімі падданымі князя Радзівіла з в. Пятрылаўцы. З кляштара [Грозаўскага], 28.06.1726 (стары стыль).

Подпіс: Антоні Дзёртка, ігумен кляштара С[вя]та-Янск[ага] Грозаў[скага] канв[ента] Вілен[скага].

Арыгінал (?). Пол. м. Філігрань. Стар. сігн.: № 26. 2 арк. (арк. 613—614).

279. Указ расійскай імператрыцы Кацярыны II з аб'явай аб заручынах 14.09.1776 яе сына цэсарэвіча і вялікага князя Паўла Пятровіча з прынцэсай Віртэнберг-Штутгардскай, якой пры мірапамазанні дадзена імя Марыі Фёдараўны і тытул Яе Імператарскай Вялікасці вялікай княжны, па смерці яго першай жонкі вялікай княгіні Наталлі Аляксееўны. Санктпецярбург, 15.09.1776.

Подпісы: з друкаваным чытаў канцылярыст Аляксандр Федаровіч; з подліннай копіяй счытаў Герасім Славуцевіч, святар царквы Іванскай Слуцкай.

Тагачасная копія, завераная подпісамі канцылярыста і святара. Рус. м. Філігрань. 1 арк. (арк. 615).

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 24.08.2015*



**Ю. М. Лаўрык,**
*вядучы навуковы супрацоўнік навукова-фондавага аддзела пісьмовых і выяўленчых крыніц Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь;*
e-mail: lawryk@tut.by

## КРЫНІЦЫ ТРАКТАТА СІЛЬВЕСТРА КОСАВА «ДІДАСКАЛІЯ АЛЬБО НАУКА О СЕДМИ САКРАМЕНТАХ»

Першы друкаваны айчынны праваслаўны трактат па сакрамenталогіі «Дідаскалія альбо Наука о седми Сакраментах» выйшаў у Куцейне ў 1638 г. (пад пазначэннем 1637 г.) [13; 17, № 127], а пасля неаднойчы перавыдаваўся: у 1653 г. ён зноў выйшаў з варштата Богаяўленскага манастыра [14; 17, № 163] і да пачатку XVIII ст. яшчэ, прынамсі, 5 разоў выдаваўся рознымі ўкраінскімі друкарнямі [9, № 297, 390, 445 і інш.]. Тым не менш, дагэтуль «Дыдаскалія» не выклікала цікавасці ў даследчыкаў, якія найчасцей абыходзіліся толькі згадваннем яе сярод іншых твораў пісьменніка. Нават Іван Саверчанка, які даволі ўважліва прыглядаўся да літаратурнай спадчыны мітрапаліта, пра трактат узгадвае, хутчэй, між іншым [16]. Да больш падрабязнага разгляду «Дыдаскаліі» звяртаўся толькі Ігар Войніч, які прапанаваў аналіз тэкставага складу куцеінскіх выданняў трактата [8]. Тэкст «Дыдаскаліі» (паводле выдання 1653 г.) у наш час быў перавыдадзены І. Саверчанкам як дадатак у манаграфіі «Aurea Mediocritas» [15, с. 261—271].

Перадгісторыя з'яўлення трактата дастаткова вядомая. У 1635 г. Сільвестр Косаў быў пасвячоны на епіскапа мсціслаўскага, аршанскага і магілёўскага. Выконваючы на гэтай пасадзе свае пастырскія абавязкі, Косаў сутыкнуўся з вельмі слабай абазнанасцю падначаленага духавенства ў асновах веры, што прымусіла яго публічна выступіць на памесным саборы ў кастрычніку 1637 г. з пастырскім навучаннем у галіне праваслаўнай сакраменталогіі. Сваю прамову ён апублікаваў пад назвай «Дідаскалія альбо Наука … о седми Сакраментах алболи Тайнах».

Сільвестр Косаў пабудаваў трактат строга сістэматычна — у духу заходняй сакраменталогіі — але матэрыял выклаў максімальна коратка і ў лёгкай для ўспрымання форме пытанняў і адказаў. Ён карыстаўся лацінскай тэрміналогіяй, але прадубліраваў ужытыя тэрміны перакладам на звыклую для праваслаўных чытачоў мову.

Такі падыход выклікаў павагу да кнігі нават у такога заўзятага крытыка праваслаўя, як Кассян Саковіч, які ў прадмове да аднаго са сваіх перакладаў [2] прыраўнаў трактат да каталіцкіх прац і лічыў гэты дапаможнік прыдатным для навучання («przynamniey z Książki o 7. Sakramentach … po katholicku napisaney, mogliście nauczyć» [3, с. 2 нн]).

Сапраўды, будова «Дыдаскаліі» вытрымана ў духу схаластычнай тэалогіі. Уласна трактат падзяляецца на дзве часткі: у першай даюцца агульныя палажэнні («О Сакраментах или Тайнах в посполитости»), а ў другой паасоб-

ку разглядаецца кожная з гэтых таямніц («О Сакраментах зособна»). Сэнсавыя пасажы ў абедзвюх частках распачынаюцца з адпаведных дэфініцый. Таямніцы разглядаюцца ў традыцыйным для заходніх прац парадку: Хрост, Мірапамазанне, Еўхарыстыя, Пакута, Алеясвячэнне (Намашчэнне хворых), Святарства і Сужэнства; трактуюцца яны ў духу тамізму (які базуецца на арыстоцелевай метафізіцы) як сукупнасць матэрыі і формы.

Не чужая схаластычнай тэалогіі і падача матэрыялу ў выглядзе пытанняў і адказаў. Між іншым, яшчэ на пераломе XVI—XVII стст. у такой форме выкладаліся нават універсітэцкія курсы, прыкладам чаго з'яўляецца скрыпт выкладаў у 1594/1595 навучальным годзе прафесара тэалогіі Віленскай акадэміі Адама Брока. Гэты рукапіс, які сёння захоўваецца ў бібліятэцы Расійскай акадэміі навук, змяшчае два трактаты: першы з іх прысвечаны ўласна сакраменталогіі [6].

Варта прыглядзецца і да крыніц, на якія спасылаўся Косаў. На першы погляд, гэта тыповы для праваслаўнай працы падбор твораў грэчаскіх аўтараў, пераважна, патрыстычнага перыяду: Ян Златавусны, Васіль Вялікі, Рыгор з Нісы… Аднак уважлівы чытач знойдзе сярод іх і лацінскіх пісьменнікаў (св. Амвросій), а таксама творы хоць і грэчаскага паходжання, але больш вядомыя на Захадзе, чым на Усходзе. Так, напрыклад, ужо першая спасылка скіроўвае нас да зборніка гамілій Яна Златавуснага на Евангелле паводле св. Мацея — да кнігі, якую св. Тамаш з Аквіну цаніў «вышэй за Парыж» [5, с. 118], але якая на славянскім Усходзе была малавядомая*.

Бадай, ніхто з даследчыкаў не цікавіўся адмыслова крыніцамі, якімі Косаў карыстаўся пры напісанні трактата. Толькі Г. Фляроўскі ў размове пра творчасць пісьменніка адзначае, што «в отделе о таинствах Коссов пользовался известной книгой П. Аркудия»**. Аднак уся аргументацыя расійскага багаслова базуецца на выкарыстанні пісьменнікам лацінізмаў [18, с. 51], а пададзеныя прыклады (матэрыя і форма, транссубстанцыя) занадта агульныя, каб сведчыць пра запазычанне з нейкага канкрэтнага трактата — таму меркаванне Фляроўскага ўяўляецца недастаткова абгрунтаваным.

Праведзены намі аналіз тэалагічнай літаратуры XVI — 1-й трэці XVII ст. паказаў, што асноўнай крыніцай, на якую абапіраўся Сільвестр Косаў пры падрыхтоўцы пісьмовага тэксту сваёй «Науки … о седми Сакраментах», з'яўляюцца «Казанні пра сем Сакрамантаў Каталіцкай царквы» Пятра Скаргі [4]. Косаў выкарыстаў тэкст Скаргі для стварэння структурнага «шкілета» свайго трактата, шмат чаго скараціў, але штосьці і дадаў, а запазычаныя месцы перапрацаваў у рэчышчы праваслаўнага багаслоўя.

* Напрыклад, гэты зборнік нават не згадваецца ў працы А. Віктарава, якая ахоплівае фонды бібліятэк найбуйнейшых манастыроў Паўночнай Русі (прысутнае на с. 274 «Толковое Евангелие Златоуста» мы атаясамліваем з т. зв. «Евангеллем навучальным») [7].

** Відаць, маецца на ўвазе праца «Libri 7 de Concordia Ecclesiae Orientalis e Occidentalis, in septem Sacramentorum administratione» [1].



Абедзве кнігі дэманструюць шмат у якіх месцах не толькі аднолькавы ход разважанняў, але таксама і паралелізм ужытых выразаў і цытат. Падабенства ж загалоўкаў у «Дыдаскаліі» з кнігай Скаргі можна заўважыць не толькі ў тытуле, але, напрыклад, і ў першым паводле парадку казанні, назва якога «O Sakramentach w pospolitości Kazanie iedno» [4, с. 1] — блізкая паводле гучання да загалоўка 1-й часткі трактата Косава.

Разгледзім адзін з уступных пасажаў са згаданага казання Скаргі, які Косаў выкарыстаў двойчы: у прадмове да «Дыдаскаліі» і ў 1-й частцы трактата (тут і далей цытаты мы даём паводле арфаграфіі арыгінала; маргінальныя спасылкі ўзяты ў круглыя дужкі).

| **Skarga, P. O Sakramentach w pospolitości, Kazanie iedno… — S. 1—2.** | **Автор до чительника // Косов, С. Дидаскалия. — С. 3 нн.** | **О сакраментех или тайнах в посполитости // Там жа. — С. 1.** |
|---|---|---|
| Te Sakramenta wobec i w pospolitości tak się opisują: Znaki są powierzchne smysłom naszym podległe, Od Pana Boga ustawione, które usprawiedliwienie y poświęcenie nasze, nie tylko oznaczają, ale je też czynią i sprawują. A do lepszego zrozumienia uważyć się ma, co jeden S. Doktor napisał, iż Pan Bog z głębokiey mądrości swoiey, człowiekowi, który iest widomym ciałem obłożony, pod widomemi też y cielesnemi znaki, niewidome dary swoie niebieskie daie. (Chrisost: homil: 83, in Matth.) | Тайны або вем, алболи Сакрамента, будучи знакам видомыми — суть инструментами и сродками | Сакрамента алболи тайны — суть видомые знаки и причины инструментальные ласки Божой. Абовем през оные невидимо на душу нашу ласку свою Всемогучый Бог вливает. Потверждает то Златоуст святый, тыми словами мовячи: «Господь Бог з глубокои мудрости своей, чловекови, который видомым телом ест обложоный, под видомыми теж и телесными знаки невидомые дары свое небесные дает». (З҃ла на Ма[ф]: в Го/ми[л]: н҃г) |
| … przez ktore nas Pan Bóg w Sakramentach poświęca y usprawiedliwia, y łaską swoią napełnia. | през которые Бог невидимо ласкою Своею души наши оздабляеть и усправедливяеть, а до спасения | |

вечного
приспособляеть.

Як бачым, запазычанні ў «Дыдаскаліі» не з'яўляюцца літаральнымі — Косаў не проста паўтарае чужыя словы, але, следуючы за думкай арыгінала, творча перапрацоўвае матэрыял да такой ступені, што толькі пазбавіўшы працытаваныя дэфініцыі раскошных барочных шатаў, можна заўважыць, што і Скарга, і Косаў трактуюць пра адно і тое ж*.

Уласна кажучы, калі б размова ішла толькі пра падабенства дэфініцый і аднолькавы ход разважанняў, тады мы, памятаючы пра вучобу Косава ў замежных універсітэтах, маглі б дашуквацца супольнай крыніцы для гэтых двух тэкстаў сярод заходнееўрапейскіх тэалагічных трактатаў — апублікаваных або выкладаных ва ўніверсітэтах. Аднак супадзенні ўжытай лексікі і працытаваных слоў пераконваюць нас у тым, што прататыпам для «Дыдаскаліі» Косава паслужылі менавіта казанні Скаргі.

На цытаце з гамілії Яна Златавуснага яшчэ хацелася б крыху затрымацца. У сваёй працы Скарга памыліўся з нумарам гамілії, зірнуўшы на загаловак наступнага па цытаце тэксту, а не папярэдняга: на самой справе цытаваныя словы знаходзяцца не ў 83-й гамілії, а ў 82-й (такога роду памылкі не з'яўляюцца рэдкімі ў творах са спасылкамі на зборнікі).

Ніжэй прапануюцца адпаведныя словы Яна Златавуснага ў рускім перакладзе паводле выдання Маскоўскага патрыярхата: «Христос не предал нам ничего чувственного, но все духовное, только в чувственных вещах. Так и в крещении: чрез чувственную вещь, воду, сообщается дар, а духовное действие состоит в рождении и обновлении. Если бы ты был бестелесен, то Христос сообщил бы тебе эти дары бестелесно; но так как душа твоя соединена с телом, то духовное тебе сообщает через чувственное» [10, с. 826].

На той час зборнік гамілій Яна Златавуснага на Евангелле Мацея не друкаваўся ні па-польску, ні па-царкоўнаславянску, ні па-старабеларуску. Скарга карыстаўся лацінскім выданнем, з якога і ўзяў патрэбны матэрыял, перастварыўшы яго па-польску. Але, як бачым, ён не цытуе Яна Златавуснага даслоўна, а пераказвае фрагмент дастаткова вольна — дакладней, падсумоўвае цэлы пасаж у адным сказе. Менавіта таму гэты сказ Скарга ўводзіць праз злучнік «Iż» і не бярэ ў двукоссі (або, дакладней, у квадратныя дужкі, якімі простая мова вылучалася ў кракаўскіх выданнях).

* Аднак звернем увагу, што ніжэй, пры вызначэнні паасобных сакрамантаў, Скарга і сам актыўна карыстаецца паняццямі «znak widomy», «śrzodek» і «instrument» — з той толькі розніцай, што калі «instrument» у яго з'яўляецца сінонімам сакраманту, то выразы «śrzodek» і «znak widomy» звычайна азначаюць «матэрыю» апошняга. Так, напрыклад, у казанні «O Bierzmowaniu» ён гаворыць: «To tu iasna barzo prawda, iż śrzodek y znak widomy do przyimowania Ducha ś. było ono ręku kładzienie Apostołow» [4, с. 26—27], а ў казанні «O Trzecim Sakramencie, ktory się zowie Eucharistia»: «Widome y zwierzchnie znaki w tym Sakramencie są chleb i wino» [4, с. 38].



Косаў жа ў «Дыдаскаліі» цытуе менавіта Скаргавы словы, а не Яна Златавуснага, прычым у амаль нязменным выглядзе: толькі крыху іх абеларусіўшы. Больш таго, думаючы, што гэта дакладная цытата, Косаў бярэ яе ў двукоссе. Дарэчы, менавіта запазычаннем у Скаргі і тлумачыцца дзіўная памылка ў «Дыдаскаліі» пры спасылцы на крыніцу цытаты: «в Го/ми$^{\text{л}}$: н҃г» (выд. 1637 г.) [13, с. 2] і «в¬ Ѡми: н҃г» (выд. 1653 г.) [14, с. 2] — гэта значыць «у Гамілії 53»*. Відаць, у рукапісе Косава, як і ў Скаргі, стаяў нумар: 83 (паводле кірылічнай нумарацыі: п҃г), але наборшчык «Дыдаскаліі» 1637 г. зблытаў «п» з «н» (што, пагодзімся, зрабіць нескладана, асабліва пры даволі дробным шрыфце), а яго наступнік у 1653 г. паўтарыў памылку.

Паралелі з тэкстамі Скаргі мы знаходзім і ў іншых месцах «Дыдаскаліі». Напрыклад, згаданае намі вышэй тамістычнае ўспрыманне сакраманту як сукупнасці матэрыі і формы таксама прысутнічае ў цытаваным вышэй казанні «O Sakramentach w pospolitości»: «(…) każdego Sakramentu złożenie y uczynienie jest, z rzeczy tych widomych, y uczutych, ktore są jako materya: a z słow wymowionych, ktore są jako forma abo tworzenie» [4, с. 3].

У Косава думка пра матэрыю і форму не вельмі дарэчна злучана ў адным пункце з ідэяй пра неабходнасць волі святара да ажыццяўлення сакраманту («Чого потреба до каждого сакраменту? — Потреба матеріи, формы и воли священнической до посвященья» [14, с. 2]). Апошняя ідэя таксама ўзята з кнігі Скаргі — з пасажу, які месціцца старонкай ніжэй: «Bo acz słowa Boskie samy przez się mocne y dzielne są, na sprawienie Sakramentu, y mocą się ich wszystko dzieje: jednak skutek ich y wykonanie, na przykładaniu od osoby na to obraney zawisło. Tak iż jesli kapłan … myśli swey y serca, y woley do tego nie przyłoży: skutku nie mają.» [4, с. 4]. У Скаргі пераход да неабходнасці святарскай волі ад размовы пра матэрыю і форму (якой і з'яўляюцца прамоўленыя святаром падчас сакраманту словы) лагічна абумоўлены ходам разважанняў. Косаў жа апускае злучальныя звёны, і праз гэта ў яго змешваюцца паняцці рознага парадку.

Наследаванне Скаргу мы назіраем і ў 2-й частцы «Дыдаскаліі» — аналагічны ход разважанняў, такія ж прыклады і цытаты:

| **O Chrzćie świętym, Kazanie Pierwsze, w liczbie Wtore. — S. 8.** | **О сакраментех зособна // Косов, С. Дидаскалия. — С. 6.** |
|---|---|
| Naprzod, co iest Chrzest ś. iako się staie, ktora iego materya … Materya Chrztu ś. y znak widomy a cielesny jest, woda szczera y prosta, tak morska iako y rzeczna, studzenna y iezioma, iakakolwiek byle przyrodzona, choć ciepła choć zimna choć | Которая есть матерія сакраменту Крещенія? — Ест вода прирожоная, а не приправная. Мает еднак тая вода прирожоная посветитеся для чести сакраменту и постановеня церковнаго. А если ба нужда и гвалт вытягал, |

* Ва ўзнаўленні тэксту «Дыдаскаліі» І. Саверчанкам памылкова паказана: 52. На самой справе, у абодвух выданнях трактата стаіць: «н҃г», гэта значыць «53».

| | |
|---|---|
| błotna. Przetoż w wodkach czynionych, Chrzest być nie może. Bo sam Pan przyrodzoną wodę mianował. y w Dzieiach Apostolskich nad rzeczkę iednę przyjechawszy, Eunucha wodą prostą Filip ochrzcił (Acto: 8). | может и непосвященою водою окрестити кого священник. Яко Филип святый крестил евнуха в реце одной. (Читай о том Василия святого «О тайнах» в главе 17 и «Деяніях апостольских»). |

Гэтая частка ўжо больш самастойная. Нават з пададзенага вышэй фрагмента відаць, што хоць Косаў і працягвае ў значнай ступені абапірацца на казанні Скаргі, але дапаўняе іх сваімі меркаваннямі са спасылкамі на аўтарытэты (у дадзеным выпадку на Васіля Вялікага). Таксама ён, услед за праваслаўнай традыцыяй, настойвае на пасвячэнні хрысцільнай вады, у той час як Скарга ў сваім тэксце абзацам ніжэй лічыць гэта неабавязковым: «ono poswięcenie nie iest z potrzeby, ale tylko z przystoyności y czci sakramentu « [4, с. 8]. І гэта, натуральна, не адзінае месца ў «Дыдаскаліі», дзе Косаў не згаджаецца з аўтарам «Казанняў».

У гэтым кантэксце нам цікава прасачыць, якімі яшчэ матэрыяламі карыстаўся праваслаўны епіскап пры падрыхтоўцы свайго трактата. Прыгледземся да спасылак, што прысутнічаюць у «Дыдаскаліі» і параўнаем цытаты, якія за імі хаваюцца, з цытатамі ў «Казаннях» Скаргі.

Для выданняў XVII ст. характэрна мяшанае ўжыванне маргінальных і ўнутрытэкставых спасылак. Сярод крыніц, якія пазначаны ў маргінальных спасылках «Дыдаскаліі», пералічаны наступныя творы Айцоў Царквы: «О тайнах» Васіля Вялікага; «Слово погребне о Валентыніяне» св. Амвросія; «О міропомазаніи» св. Кіпрыяна; «Катэхизіс мистакгомскій» св. Кірылы Іерусалімскага; «О іерействе» Яна Златавуснага.

Дзякуючы ўнутрытэкставым спасылкам мы можам дадаць да іх наступныя тэксты: пастановы 6-га Сусветнага сабору; 69-я гамілія «до люду» Яна Златавуснага; «Эксамен, албо Шестодневник» Васіля Вялікага; 3-ці ліст 2-й кнігі з неўказанага бліжэй твору св. Кіпрыяна; гамілія «О Воскресеніи» Рыгора Ніскага; «Молитва до Маслоосвященія»; «Каноны Апостольския» 17, 18; непазначаны твор Васіля Вялікага; 36-я пастанова Карфагенскага Сабора.

Значная частка пералічаных вышэй спасылак мае адпаведнікі ў тэксце «Казанняў» Скаргі. Фактычна нам не ўдалося адшукаць там тры спасылкі з фрагмента пра сужэнства святароў (што цалкам натуральна з увагі на цэлібат лацінскага духавенства): «Читай о том в Канонах Апостольских 17, 18; и в Василія Великаго, и 36 Собору Картагинского» [14, с. 30]; таксама не знайшлося дзвюх спасылак на творы Васіля Вялікага («О тайнах» [14, с. 6] і «Эксамен, албо Шестодневник» [14, с. 22]) і па адной — на пастановы 6-га Сусветнага сабору [14, с. 10], гамілію «О Воскресеніи» Рыгора Ніскага [14, с. 23] і «Молитву до Маслоосвященія» [14, с. 27]. Можна дапусціць, што згадкі гэтых тэкстаў уведзены непасрэдна самім Сільвестрам Косавым. Аднак пошук тэкстаў непасрэдных крыніц трактата ўяўляецца справай малаперспектыўнай з той, прынамсі, прычыны, што ні ў водным з адзначаных выпадкаў



пісьменнік не падае дакладнай цытаты, а толькі абмяжоўваецца звычайнай адсылкай або ў лепшым выпадку пераказам.

34. Центральный государственный архив высших органов власти и управления Украины (далее — ЦГАВО Украины). — Ф. 14. — Оп. 1. — Д. 14.
35. ЦГАВО Украины. — Ф. 14. — Оп. 1. — Д. 9.
36. Там же. — Д. 18.
37. Государственный архив Винницкой области. — Ф. Р-2625. — Оп. 3. — Л. 1.
38. Государственный архив Николаевской области. — Ф. Р-97. — Оп. 1. — Д. 3.
39. Государственный архив Полтавской области. — Ф. Р-1871. — Оп. 1. — Д. 7.
40. Государственный архив Херсонской области. — Ф. Р-1887. — Оп. 3. — Д. 188.
41. Известия Николаевского губисполкома и губкома КП(б)У. — 1920. — 16 сентября.
42. Известия Подольского губисполкома, губкома КП(б)У и губпрофсовета. — 1921. — 30 октября.
43. Государственный архив Черниговской области. — Ф. Р-647. — Оп. 1. — Д. 1.
44. Известия Всеукраинского Центрального Исполнительного Комитета и Харьковского губревкома. — 1920. — 29 апреля.
45. Государственный архив Сумской области. — Ф. Р-5699. — Оп. 1. — Д. 114.
46. Государственный архив Запорожской области. — Ф. Р-12. — Оп. 1. — Д. 6.
47. Государственный архив Одесской области. — Ф. Р-100. — Оп. 1. — Д. 40.
48. Государственный архив Харьковской области. — Ф. Р-4366. — Оп. 1. — Д. 3.
49. Сельченкова, С. З історії експертизи цінності документів та укладання переліків докуентів в Україні у 1920—1930-ті роки / С. Сельченкова // Студії з архівної справи та документознавства. — Київ, 2004. — Т. 12. — С. 23—33.
50. Багалій, Д. Автобіографія: П'ятдесят літ на сторожі української науки та культури / Д. Багалій. — Київ, 1927. — 163 с.
51. Государственный архив Харьковской области. —Ф. Р-4366. — Оп. 1. — Д. 10.
52. Государственный архив Винницкой области. — Ф. Р-925. — Оп. 2. — Д. 304.
53. ЦГАВО Украины. — Ф. 14. — Оп. 1. — Д. 17.
54. Государственный архив Полтавской области. — Ф. Р-3872. — Оп. 1. — Д. 155.
55. Про ліквідацію діяльності ОВАК, губерніальних комісій і архівних секцій Губвиконкомів // Збірник постанов та розпоряджень робітничо-селянського уряду України. — Харків, 1922. — Ч. 1. — С. 21.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 10.04.2015*



***Д. С. Самахвалаў,***
*дацэнт кафедры крыніцазнаўства БДУ,*
*кандыдат гістарычных навук*

## АРХІВЫ «ВУСНАЙ» ГІСТОРЫІ Ў ЗША

Для таго каб зразумець значнасць і важнасць захавання крыніц «вуснай» гісторыі ў ЗША, трэба перш за ўсё звярнуцца да мінулага гэтага напрамку. У сучаснай гістарыяграфіі прыняты розныя тэрміны вызначэння пачатку вусных гістарычных даследаванняў. Некаторыя адносяць іх да часоў глыбокай старажытнасці, першых спроб фіксацыі галасоў вядомых людзей на фанографе або да вынаходніцтва партатыўных прылад фоназапісу. Відавочна, што прагрэс тэхнічных сродкаў меў прамое дачыненне да папулярызацыі збору вусных крыніц, аднак цікавасць да іх навуковай апрацоўкі і пільнага захавання звязаны з развіццём сацыяльнай гісторыі.

У 1948 г., калі Алан Нэвінс, прафесар Калумбійскага ўніверсітэта, заснаваў першы ў ЗША даследчы цэнтр «вуснай» гісторыі для вывучэння біяграфій палітыкаў, то ён абапіраўся не столькі на свой вопыт вучонага, колькі журналіста [5, с. 3]. Інтэрв'ю як метад збору інфармацыі пакуль не быў распаўсюджаны сярод гісторыкаў. Ён выкарыстоўваўся культурнымі антраполагамі і сацыёлагамі. Праца гісторыкаў была сканцэнтравана пераважна вакол пісьмовых крыніц. Вусныя крыніцы ўспрымаліся як надзвычай суб'ектыўныя і нават ужо ў першыя дзесяцігоддзі існавання «вуснай» гісторыі не пералічваліся акадэмічнымі даследчыкамі ў якасці надзейных [2, с. 262].

Змены ў станоўчым стаўленні былі паступовымі, суправаджаліся вострай палемікай і дыскусіямі. «Вусная» гісторыя з'явілася ў ЗША ў пасляваенны час дзякуючы панаванню інструменталісцкага гледжання на гісторыю не як на навуку, а як на мастацтва, што адкрывала магчымасць для занятку сур'ёзнымі гістарычнымі даследаваннямі прадстаўнікам іншых прафесій — ваенным, журналістам, эканамістам і г. д. Такая сітуацыя была даволі спецыфічнай, бо ў еўрапейскіх краінах і СССР статус гісторыі як складанай сацыяльна-гуманітарнай навукі не выклікаў сумневаў, а таму гістарычныя працы непрафесійных гісторыкаў не атрымлівалі скрупулёзнага абмеркавання. У ЗША яны не толькі абмяркоўваліся, але часцяком ставіліся ў прыклад прафесійным гісторыкам. Дзякуючы гэтаму «вусная» гісторыя паспяхова прайшла першы этап сваёй інстытуалізацыі.

Даследаванні А. Нэвінса і яго паслядоўнікаў былі накіраваны на збор успамінаў і прамоў выбітных асоб. Фактычна гэты напрамак «вуснай» гісторыі заставаўся найбольш папулярным да сярэдзіны 1970-х гг. З 1950-х гг. пад уплывам культурнай антрапалогіі «вусная» гісторыя таксама ўжывалася для вывучэння невялікіх этнічных груп, што доўгі час не мелі пісьмовасці, аднак зберагалі багатую вусную традыцыю. У абодвух выпадках колькасць рэспандэнтаў была абмежаванай, праблемы з захаваннем і каталагізацыяй фоназапісаў вырашаліся традыцыйным шляхам. Звычайна цэнтрамі захоўвання з'я-

ляліся бібліятэкі, таму носьбіты інфармацыі апрацоўваліся і каталагізаваліся згодна з нормамі, прынятымі ў бібліятэчнай справе.

З 1960-х гг. сітуацыя ў далейшым развіцці «вуснай» гісторыі істотна змянялася пад уздзеяннем ідэй так званай новай гісторыі, якая ўзнікла як спроба рэфармавання традыцыйных поглядаў на сутнасць і мэты гістарычнага даследавання. Амерыканскі гістарыёграф Роберт Дж. Ліфтан вызначае наступныя рысы новай гісторыі: радыкалізм думак, што часам вёў да поўнага адмаўлення папярэдніх здабыткаў; інтэграцыю гісторыі з іншымі навуковымі накірункамі; скіраванасць на інтэрпрэтацыю замест факталогіі [7, с. 337]. У рэчаіснасці гэта выявілася не столькі ў стварэнні радыкальна новых напрамкаў накшталт кліяметрыі або псіхагісторыі, што ставілі за мэту цалкам рэарганізаваць гістарычную навуку, а ў пераглядзе ўжо існуючых метадаў працы. У дачыненні да «вуснай» гісторыі рэфармаванне азначала магчымасць пашырэння тэматыкі і паглыблення праблематыкі. «Вусная» гісторыя пакуль яшчэ не разглядалася як нейкі асобны метадалагічны напрамак. У ёй бачылі толькі крыніцу атрымання дадатковай карыснай інфармацыі. Метадамі «вуснай» гісторыі пачалі карыстацца прадстаўнікі новай сацыяльнай гісторыі — тыя, хто імкнуўся з блізкіх да аб'екта вывучэння пазіцый даследаваць штодзённае жыццё, сацыяльныя і гендарныя адносіны, рабочы рух, міграцыйныя працэсы і г. д.

Імпульс з боку новай сацыяльнай гісторыі спарадзіў хвалю публікацый, аўтары якіх ігнаравалі папярэдні вопыт недаверу да вусных крыніц, а часам нават ставілі іх значнасць вышэй за пісьмовыя. У англамоўнай навуковай літаратуры 1970-х гг. дамінаваў пункт гледжання брытанскіх прыхільнікаў «вуснай» гісторыі. Адзін з іх, гісторык-марксіст Пол Томпсан адкрыта абвяшчаў раўназначнасць вусных і пісьмовых крыніц і дэмакратычны характар «вуснай» гісторыі як самастойнага напрамку, які вывучае так званую «маўклівую большасць» [1]. Адваротным меркаваннем было тое, што вусныя крыніцы суб'ектыўныя, прычым гэтая суб'ектыўнасць вынікае як з боку рэспандэнта, так і з боку даследчыка [10, с. 66]. Асабіста амерыканская гістарыяграфія «вуснай» гісторыі таго часу не ўтрымлівала значных дыскусій, але станоўча рэагавала на довады брытанскіх калег. У ЗША дзейнічалі асобныя спецыялісты — прыхільнікі «вуснай» гісторыі, а таксама ствараліся супольныя праекты, якія абмяркоўваліся ў спецыялізаваных выданнях. У 1966 г. сфарміравалася Асацыяцыя «вуснай» гісторыі (Oral History Association), якая з 1973 г. выдае часопіс «Вусны гістарычны агляд» (The Oral History Review), а ў нашы дні таксама мае асабісты фінансавы фонд для заахвочвання навуковых праектаў і шэраг штогадовых узнагарод для даследчыкаў.

Гісторыкі Дэвід Данэвэй і Віла Баўм вылучаюць самастойнае маладое пакаленне «вусных» гісторыкаў, што пачалі працу ўжо ў 1980-х гг. [8, с. 59—61]. Яны карысталіся новым абсталяваннем, у тым ліку здымалі відэа, акрамя таго, па-новаму разглядалі сутнасць свайго занятку. «Вусная» гісторыя стала для іх не проста пошукам даступных крыніц інфармацыі, але адлюстраваннем



таго, як успрымаецца мінулае рэспандэнтамі. У такой інтэрпрэтацыі суб'ектыўнасць не падавалася абмежаваннем, наадварот — стварала падставу для лепшага разумення аб'екта даследавання праз яго індывідуальныя пачуцці і перажыванні. Менавіта ў гэты перыяд «вусная» гісторыя як асобны напрамак і спосаб вывучэння гісторыі канчаткова атрымлівае прызнанне і пашырэнне.

У нашы дні збор вусных крыніц гістарычнай інфармацыі ў ЗША — даволі пашыраная з'ява. Прычым, ім займаюцца не толькі гісторыкі, а і прадстаўнікі розных прафесій, у тым ліку ў межах сваёй галіны дзейнасці. Так, у некаторых медыцынскіх установах рэспандэнтамі становяцца пацыенты, а апытанне праводзяць урачы [9]. Мэта такіх даследаванняў мае дваісты характар — вывучэнне гісторыі ўстановы праз успаміны тых, хто звяртаўся ў яе, і назапашванне досведу зносін з пацыентамі для саміх урачоў. «Вусная» гісторыя разглядаецца як эфектыўны спосаб заахвочвання да вывучэння гісторыі школьнікаў, студэнтаў, аматараў краязнаўства, членаў добраахвотных аб'яднанняў, дзяржаўных чыноўнікаў, прыхільнікаў пэўных палітычных партый і г. д. У дадзенай сітуацыі назіраецца відавочная неаднастайнасць у метадалогіі збору інфармацыі, вызначэння каштоўнасці інтэрв'ю, выкарыстання тых ці іншых тэхнічных прылад, а таксама магчымасцей іх захавання і публікацыі.

Асноўную функцыю арганізацыі навуковых вусных гістарычных даследаванняў і захавання вуснай гістарычнай інфармацыі ў ЗША ажыццяўляюць прафесійныя цэнтры, якія самастойна рыхтуюць інтэрв'юераў (прычым, значная частка супрацоўнічае з такімі цэнтрамі на аматарскіх пачатках), наймаюць тэхнічны персанал, клапоцяцца пра захаванне і распаўсюджванне сабраных матэрыялаў. На сайце Асацыяцыі «вуснай» гісторыі пералічваецца больш за пяцьдзясят буйных цэнтраў [3]. Дваццаць пяць з іх працуюць пры ўніверсітэтах, пяць — пры музеях, пяць — пры архівах.

У мінулым асноўным дакументам, прызначаным для захавання, лічыўся запіс інтэрв'ю на паперы, часта старанна адрэдагаваны даследчыкам. Фоназапіс мог не захоўвацца або захоўваўся часткова і ў любым выпадку лічыўся дадаткам да папяровага. Сітуацыя пачала змяняцца з 1950-х гг. з пашырэннем выкарыстання партатыўных магнітафонаў і набыццём навыкаў доўгатэрміновага захавання фоназапісаў у бібліятэках і архівах. Аднак папяровы адрэдагаваны запіс заставаўся важным да пачатку эры лічбавых тэхналогій, якія дапамаглі адмовіцца ад захавання інфармацыі «вуснай» гісторыі як на паперы, так і непасрэдна на арыгінальным носьбіце, накшталт магнітнай плёнкі. Фоназапіс інтэрв'ю можа суправаджацца тэкставай расшыфроўкай, але абодва захоўваюцца ў лічбавым фармаце. Гэта дазваляе эканоміць плошчу памяшкання, адведзенага для ўладкавання архіва, ажыццяўляць хуткі пошук патрэбных звестак, уносіць праўкі ў тэкст і рыхтаваць публікацыі. Зніжэнне коштаў на тэхнічныя прылады, распаўсюджанне розных фарматаў захавання лічбавай інфармацыі і спосабаў іх канвертацыі зрабілі даступным захоўванне вялікай колькасці інтэрв'ю не толькі для буйных, але і малых цэнтраў, а таксама для

асобных даследчыкаў. Аднак ва ўніверсітэцкіх архівах «вусная» гісторыя ўсё яшчэ захоўваецца пераважна на паперы.

Пераход да лічбавых тэхналогій зрабіў актуальным праблему ўніфікацыі захавання матэрыялаў «вуснай» гісторыі. Дэвід Лэнс, прадстаўнік Міжнароднай асацыяцыі гукавых і аўдыёвізуальных архіваў (International Association of Sound and Audiovisual Archives), прапануе праводзіць яе праз падзел працы вуснага гістарычнага архіва на этапы. На яго думку першы арганізацыйны этап павінен грунтавацца на стварэнні праграмы вуснага гістарычнага даследавання, пастаноўкі мэты і задач, разумення, што будзе з'яўляцца канкрэтным вынікам даследавання. На аснове праекта праграмы фарміруецца першасная структура архіва. На другім этапе адбываецца падрыхтоўка праектаў запісаў інтэрв'ю, а ўнутраная пабудова архіва набывае складаныя часткі, што засноўваюцца па прынцыпах тэматыкі, але павінны ўлічваць асобныя выпадкі, калі інтэрв'ю аднаго рэспандэнта можа тычыцца некалькіх тэм. Першыя два этапы важныя асабліва таму, што накіраваны не толькі на забеспячэнне захавання ўжо атрыманай інфармацыі, але і дазваляюць загадзя планаваць яе аб'ём, ухіляюць магчымасць памылак інтэрв'юераў на наступным этапе — зборы інтэрв'ю. Апошні этап уключае тэхнічную апрацоўку і працэс зберагання [6, с. 104—108].

Прапанаваны Д. Лэнсам варыянт уніфікацыі тычыцца толькі зместу працы і адлюстроўвае вопыт менавіта амерыканскіх архіваў «вуснай» гісторыі, паколькі большасць з іх маюць рэгіянальную або вузка накіраваную спецыялізацыю. Фактычна ён разлічаны на прынцып «адна навуковая праграма — адзін архіў», не прадугледжвае ўзаемадзеянне паміж рознымі архівамі і ўлік доўгатэрміновых абставін, калі заканчэнне фінансавання праекта можа стаць канцом дзейнасці архіва, а перадача яго матэрыялаў у іншыя архіўныя ўстановы будзе ўскладняцца адсутнасцю адзінай для ўсіх структуры і фармату запісаў. Такім чынам, назапашаныя матэрыялы павінны будуць зноў перапрацоўвацца або размяркоўвацца па розных архівах згодна з адпаведнай тэматыкай.

Стабільнае фінансаванне, якое атрымліваюць буйныя цэнтры, вызначае іх перавагу ў падрыхтоўцы і выкарыстанні прафесійных кадраў. Тэхнічны персанал архіва павінен разумець сутнасць праекта, працы інтэрв'юераў, праводзіць перапісванне, індэксацыю, каталагізацыю і цытаванне перададзенай для зберагання інфармацыі. Такая праца даволі складаная і можа запатрабаваць каля чатырох гадзін для апрацоўкі аднаго інтэрв'ю. Д. Лэнс лічыць, што ў сярэднім адзін работнік апрацоўвае каля шасцісот гадзін інтэрв'ю ў год [6, с. 110]. Да гэтага трэба дадаць патрэбу ў перанавучанні ў сувязі са сталымі зменамі тэхнічнага абсталявання. Падрыхтоўка тэхнічнага персаналу і інтэрв'юераў вядзецца цэнтрамі самастойна і, калі ўлічваць іх вузкую спецыялізацыю, не заўсёды прадугледжвае магчымасць працы ў іншых падобных установах. Цякучасць кадраў разбурае стабільную працу малых цэнтраў.

Яшчэ адной праблемай з'яўляецца даступнасць захоўваемых матэрыялаў. Тры дзесяцігоддзі таму «вусныя» гісторыкі сцвярджалі, што іх высілкі



накіраваны на дэмакратызацыю ў атрыманні інфармацыі. Але з 2004 г. у амерыканскіх навуковых часопісах вядзецца дыскусія, наколькі спраўдзіліся іх чаканні [4, с. 246]. Знешне сітуацыя выглядае прыстойна. Усе архівы «вуснай» гісторыі дэкларуюць сваю адкрытасць. Многія з іх прадстаўляюць запісы для карыстання ў Інтэрнэце, але, як правіла, толькі абраныя ўрыўкі. Прадставіць сапраўды свабодны доступ праз Інтэрнэт пакуль не здольны ніводны з іх. Універсітэцкія цэнтры «вуснай» гісторыі часцей працуюць пры бібліятэках, а таму адчынены для вучоных і студэнтаў, а не для кожнага. Прыватныя архівы наогул не арыентаваны для супрацоўніцтва з даследчыкамі звонку, прадстаўляюць толькі частку матэрыялаў і кантралююць іх публікацыю.

Вопыт развіцця «вуснай» гісторыі ў ЗША дэманструе пэўную своеасаблівасць. З аднаго боку, «вусная» гісторыя як напрамак даследаванняў лічыцца важнай і стабільна развіваецца. З другога, гэта спараджае вялікі аб'ём новых матэрыялаў і праблему іх перапрацоўкі і захавання. Апошняя вырашаецца з дапамогай стварэння архіваў пры спецыялізаваных цэнтрах. Спецыялізацыя адбываецца згодна з тэматыкай і праблематыкай асобных праектаў, у працы многіх цэнтраў заўважны рэгіянальны ўхіл, што накладае пэўныя абмежаванні. Пераадоленне выяўленых праблем пакуль вырашаецца шляхам адкрыцця новых цэнтраў, а не рэфармавання ўнутранай працы ўжо існуючых. Рэформы, калі і адбываюцца, то звязаны з тэхнічнымі зменамі і не закранаюць узаемадзеянне цэнтраў. Поўная адкрытасць архіваў «вуснай» гісторыі пакуль застаецца дэкларацыяй, што супярэчыць чаканням з боку даследчыкаў і грамадства. Падобныя тэндэнцыі ў будучым могуць прывесці да стагнацыі, згубы папулярнасці «вуснай» гісторыі і пераарыентацыі гісторыкаў да традыцыйных пісьмовых крыніц або пошукаў нечага новага.

Літаратура


1. Томпсон, П. Голос прошлого. Устная история / Пер. с англ. — М.: Изд-во «Весь мир», 2003.
2. Тош, Д. Стремление к истине. Как овладеть мастерством историка / Пер. с англ. — М: Изд-во «Весь Мир», 2000.
3. Centers and Collections [Электронны рэсурс]. — Рэжым доступу: http://www.oralhistory.org/centers-and-collections. — Дата доступу: 15.03.2015.
4. Charlton, T., Myers, L., Sharpless, R. History of Oral History: Foundations and Methodology. — AltaMira Press, 2007.
5. Columbia University Center for Oral History Ten-Year Report. — Columbia Center for Oral History, 2011.
6. Lance, D. Oral history // Audiovisual archives: A practical reader / Ed. by Helen Harrison. — Paris: General Information Programme and UNISIST, United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization, 1997. — P. 103—112.
7. Lifton, R. J. History and Human Survival / R. J. Lifton. — New York: Random Hause, 1970.
8. Mariner, N. Oral History: From Fact Finding to History Shaping // Historia. A Journal of the Epsilon Mu Chapter, Phi Alpha Theta and Eastern Illinois University History Department. — Vol. 14, 2005. — P. 59—69.

9. Smith, G., Winslow, M. Ethical challenges in the oral history of medicine // The Handbook of Oral History / Ritchie, D. A. (ed.). — New York: Oxford University Press, 2011. — P. 372—392.
10. Summerfield, P. Culture and Composure: Creating Narratives of the Gendered Self in Oral History Interviews // Cultural and Social History. — № 1, 2004. — P. 65—93.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 04.06.2015*



***С. С. Злобин,***
*аспирант исторического факультета БГУ;*
e-mail: zlobinssss@mail.ru

## ПОНЯТИЕ «ГРАНИЦА» КАК ОСНОВА ПОСТКОЛОНИАЛЬНОГО ПОВОРОТА В ИНДОЛОГИИ

В современной исторической науке неоспоримым является утверждение о том, что историография, история исторической мысли, методология истории отражают не только внутреннюю логику развития исторической дисциплины. Появление новых подходов обусловлено также факторами общественно-политической, социокультурной жизни. Именно так происходит адаптация современного исследовательского инструментария в рамках индологии. Сама жизнь заставляет менять точку зрения на основные проблемы истории и культуры Индии.

Например, пришедший к власти в результате победы Бхаратия Джаната парти (БДП) на всеобщих парламентских выборах в 2014 г. нынешний премьер-министр Индии Нарендра Моди использует идеологию, основанную на призыве отказаться от различий в обществе и сконцентрироваться на самом важном элементе современности — развитии. Развитии всех сфер жизни человека и общества, но в первую очередь, конечно же, на развитии экономики. Не важно, кто ты — мусульманин, парс, христианин или индус, мужчина или женщина, брахман или далит, бенгалец или телугу. Главное — прими участие в развитии своей страны, и это принесет пользу и тебе самому. Казалось бы, такая идеология очень миролюбива, она примиряет различные общественные группы для какой-то большой цели — благо страны и личное благо. Однако, когда Нарендра Моди говорит о великой стране, кого он имеет в виду? Кто эта великая индийская цивилизация, кто входит в ее границы? Не остаются ли за ее рамками те, кто не индус, не мужчина, не брахман, т. е. мусульманин, парс, христианин, женщина и далит?

То, что именно так может произойти, иллюстрирует обсуждение темы «Должна ли бы быть Гита национальной книгой?» в рамках программы «Лево, право и центр», вышедшей 8 декабря 2014 г. на телеканале NDTV 24×7 [21]. Дискуссия развернулась вокруг противоречивого утверждения министра иностранных дел Индии Сушмы Сварадж о том, что Бхагавадгита, священная книга индуизма, должна быть национальной книгой Индии. Защищал позицию Сварадж представитель БДП Самбит Патра. Оппонировал ему известный театральный режиссер и актер Аамир Раза Хусейн, указывавший на то, что в такой стране как Индия, стране многих религий и верований, нельзя сделать одну книгу священнее другой (Гита не может быть священнее Корана). С. Патра же пытался связать Бхагавадгиту не с индуизмом, а с индийской цивилизацией и говорил, что именно в Гите заложены наиболее ее существенные основы. В этой дискуссии особенно интересно то, что цивилизация представлена как некое над-целое индийской культуры и истории,

обладающее четкими границами и ясной сутью, что и выражено, собственно, в Гите. Пусть ты и другой веры, но согласись, что Гита — самая священная книга, и будешь допущен в рамки великой цивилизации. Нет — останешься вне ее границ и, следовательно, вне концепции развития.

Оказывается, «индийская великая и удивительная цивилизация» может обладать слишком жесткими границами. Оригинальную критику такой жесткости границ предлагает постколониализм.

Постколониализм [1; 5; 10; 26] — это направление в гуманитаристике, истоки которого связаны с выходом в 1978 г. книги «Ориентализм» работавшего в США арабского ученого Эдварда Саида. В рамках этого направления развитие гуманитарного дискурса рассматривается исключительно как часть колониальной системы знания, основу которой составляет описание Востока, как находящегося на более низкой ступени развития, чем Запад [1, p. 40—41]. Принижение Востока осуществлялось и осуществляется за счет монополии Западом на репрезентационные средства, что позволяет порождать мифы, конструирующие единственно возможную реальность. В рамках постколониализма источник практически всех идей о Востоке (в данном случае, об Индии) рассматривается как порождение колониализма, поэтому причины жесткости границ, в которые вписывается какое-либо цивилизационное целое стоит искать в механизме функционирования колониальной системы знания. С точки зрения постколониализма даже такой ярый сторонник сильной и независимой Индии как Нарендра Моди — наследник колониализма. Для того, чтобы понять, как подобное может быть, нужно ответить на следующие вопросы: каким образом в рамках постколониального поворота осуществляется критика такой жесткой интерпретации границы как у Моди, какой другой подход к границам объектов истории и культуры Индии в современном их понимании предлагается постколониализмом, и возможно ли на основе этого подхода создать некую альтернативную версию описания истории и культуры Индии?

Основой для ответа на поставленные вопросы является тезис о том, что колониализм при помощи непереходимой, жесткой границы описываемых категорий истории и культуры Индии утверждал Индию как угнетаемого Другого для Запада. Индия была всего лишь объектом для анализа в той системе знаний, которую обозначал для нее Колонизатор. Для Индии устанавливалась какая-то ее суть как некоего целого, к которой можно было свести причины всех происходящих событий в рамках этого целого. Сутью могло быть варварство, отсталость, неисторичность, духовность и, конечно же, религия. Речь не идет о том, что исследования велись как-то неправильно. Речь идет о том, что перспектива, открывавшаяся на историю и культуру того региона, который сегодня называется Южной Азией, оказывалась чрезмерно зауженной.

Например, Ромила Тхапар, один из наиболее выдающихся историков Древней Индии [23; 24], обращаясь к проблеме влияния колониализма на интерпретацию индийской истории, указывает на то, как британские колониальные исследователи, отказывая Индии в «чувстве истории», принимали на себя тяжкое бремя по описанию ее прошлого. Они брались за ведические тексты как за неоспоримую основу интерпретации индийской цивилизации и, основываясь только на них, объясняли любое явление в индийской истории, в том числе и ее настоящее. Р. Тхапар задает следующие вопросы: где богатая традиция интерпретации этих текстов, споры о которых принимают самые причудливые формы вплоть до наших дней, где история индийских мусульман, джайнов, буддистов, парсов? [19].



Колониализм наполнил дискурс об Индии категориями, обладающими очень жесткими границами и не позволяющими описать маргинальные элементы, которые просто замалчиваются. Граница представляет собой реализацию властных стремлений того, кто ее установил, — Колонизатора. Именно он создал такой дискурс религиозных различий, который вылился в непримиримую вражду Индии и Пакистана, именно он таким образом сконструировал пространство гуманитарных наук, что даже такое широкое понятие — как «человек» — оказывается слишком узким, не давая голоса женщине Индии, далиту, рабочему и т. д. В связи с подобной критикой механизма колониальной власти в рамках постколониального поворота предлагается по-иному взглянуть на границы объектов истории и культуры Индии в современном их понимании.

В первую очередь, это касается того, где проходит граница. Для постколониализма граница — это не просто то, что размежевывает две категории, например, индус — мусульманин, мужчина — женщина, развитый — отсталый. Скорее это то, что обозначает необходимость соотнести объект с его колониальным контекстом. Непроходимая граница делает объекты абсолютно самостоятельными, не требующими дальнейших пояснений, т. е. не требующими никакого контекста. Но для постколониализма эта самостоятельность объекта является только тем, генеалогию чего следует связать с колониализмом.

Примером того, как не учитывается контекст, а объект описывается как рожденный уникальной индийской цивилизацией, могут служить взгляды на кастовую систему назначенного в июле 2014 г. главой входящего в состав Министерства развития человеческих ресурсов Индийского Совета исторических исследований Йеллапрагада Сударшана Рао. Он утверждает, что кастовая система была отлично действовавшей основой общественных отношений в Древней Индии, но оказалась совершенно непонятой в мире современном, в мире модерна, что есть главная причина ее сегодняшней критики [18]. Т. е. касты — это то, что надо для Индии, просто европейцы запутали индийцев. Самое главное в этом дискурсе — это четкие оппозиции: каста — европейцы, индийская уникальность — европейская уникальность.

Однако в рамках постколониального поворота при учете контекста ясность понятия «каста» исчезает. Ключевые моменты дискурса о касте переносятся на те колониальные феномены, которые сделали возможным конструирование понятия «каста» во всем богатстве его смыслов. Это не значит, что до

колониализма касты не было, а во время колониализма ее просто придумали. Это значит, что наиболее яркими проявлениями кастовая система в современном своем понимании обязана именно колониализму. Теми проявлениями, которые позволяют говорить о феномене касты как о некой системе координат общественно-политической идентичности в Индии. Например, исследующая отношения между кастовой системой, территориальностью и колониализмом Мриду Раи, работавшая в Йельском университете, Тринити-колледже в Дублине и Калькуттском университете, предлагает оставить в стороне вопрос о сути кастовой системы, источнике ее происхождения, и остановиться на проблеме того, как кастовая система существует в сегодняшнем мире, и, в частности, почему она настолько наполнена насилием. Ответом, который дает М. Раи, служит указание на пространство, среду существования каст, которое было фрагментировано британской властью, создавшей разрыв в локальных реципрокальных связях между различными кастами, согласно которым каждая каста должна была выполнять свои обязанности. Кастовая система была выведена из локального состояния на уровень некой новой общности, некой «Индии», на котором высшие касты при помощи насилия стали стараться найти себе место в заново рождаемой системе кастовых отношений [15].

Объект исследования высвобождается из оков жестких границ, упор на контекст как бы приводит его в движение. Развивая рассуждения по поводу контекстуализации каст обратимся к исследованиям кастового вопроса профессором Колумбийского университета Анупамой Рао [17]. А. Рао противопоставляет традиционному взгляду на касту, как некую совокупность наследуемых прав и обязанностей, свою трактовку кастовой системы как рамок борьбы за права человека. А. Рао говорит, что каста, в первую очередь, характеризуется не как четко выделенная социокультурная группа, а как элемент сложного становления модернистской общественно-политической идентичности в Индии, начало чему было положено, безусловно, в период колониализма [3].

Специфическое положение границы в историко-культурном дискурсе Индии определяет специфическое состояние объектов истории и культуры Индии. Самой главной их характеристикой становится то, что при рассмотрении в колониальном контексте они лишаются своей «естественности». Именно как отражение естественного порядка вещей объяснял кастовый строй безымянный брахман в документальном фильме «Индия неприкасаемая», посвященном проблеме низших каст в Индии. Ради примера он обращается к сравнению человеческого тела и кастового строя. Например, говорит он, шудра, который в его примере обозначает ногу, поранился. Тогда брахман (рот) кричит. Кшатрий (руки) сразу же начинает ощупывать ногу. В этом и есть красота кастовой системы, заключает брахман. Все на своем месте [13].

Постколониализм ведет войну против такой естественности. Будь то мысль или тело, все получает социокультурное измерение и ставится в зависимость от колониального контекста. «Живопись», «танец», «гхаты» и т. д. —



это не просто этнографические объекты, которые должны вызывать восхищение у влюбленных в Индию туристов. «Тело», «пол», «секс» — это не только категории, возникающие в разговоре об экзотичной Камасутре, это также зона осуществления колониальной власти. На данный момент в рамках англоязычной историографии (Новая имперская история [7; 9; 25], школа «Исследование угнетения» [8; 11; 12]) трактовка британского колониализма в первую очередь как проекта культурного, а не политического или экономического все более и более становится преобладающей. Это значит, что для понимания того, как осуществлялась колониальная власть в Южной Азии, требуется рассматривать детали, мелочи повседневной жизни угнетавшихся индийцев и правивших британцев, их представления, мечты, фантазии, стратегии осознания себя в этом мире, а не действия политических партий и баланс экономических интересов. Когда мы смотрим на женщину Индии, то должны видеть не только загадочный мир Востока, но попытаться предположить, как сложилась давящая на нее маскулинность жизненного пространства, какова связь между индийским модерном и ее сексуальностью, какое место дискурс об ее освобождении занимает в феминистских теориях, сложившихся в контексте европоцентричной мысли [2; 6; 7; 16; 22].

Итак, постколониализм критикует жесткость связанных с колониализмом категорий истории и культуры Индии, раскрывает их колониальные контексты. Казалось бы, следующим шагом должно быть создание альтернативы европоцентричной традиции изучения Индии. Но последователи постколониализма вовсе не пытаются противопоставить колониальным категориям свой понятийный аппарат и писать настоящую историю Индии, потому что это будет новое приписывание жестких рамок идентичности. Здесь надо помнить, что постколониальный поворот тесно связан с таким явлением как постмодернизм. В рамках постколониализма идут жаркие споры по поводу того, является ли постколониализм частью постмодернизма, или они противопоставлены друг другу, или просто делят общий фундамент [10, p. 23—41; 26, p. 115—147]. Однако признать необходимо: господство в постколониализме отрицания абсолютной истины и возможности построения связного, четкого рассказа. Можно работать только уже с тем языком, который и есть язык колониальный, но только работать так, чтобы говорить не о сути, а о пограничье. Надо не принимать объекты в жестких границах, как будто это естественно, так и должно быть. Надо, отталкиваясь от этой границы, встраивать объект в его колониальный контекст, рассматривать его генеалогию от колониализма до современного понимания его природы. Дискурс об Индии может родиться только на границе рассказа об Индии, которая есть его начало, но никак не конец. В этом плане любой нарратив об Индии — это нарратив о тех феноменах, которые рождаются на границе.

Женщина, религия, вера, нация, межобщинные конфликты такие, как между мусульманами и индусами, — деконструируя, критикуя колониальную

природу этих феноменов, постколониальный поворот дает возможность исследователям развивать их, основываясь на рассуждениях о колониальном контексте их происхождения. И первое, что стоит критиковать, это стремление оформить культурно-исторический дискурс в цивилизационные рамки. Например, всю вторую половину 1990-х гг. в индологии шло активное обсуждение книги Джеффри Крипала «Дитя Кали: мистическое и эротическое в жизни и учении Рамакришны» (Рамакришна — учитель Свами Вивеканды, религиозного деятеля, важнейшей фигуры в реформировании индуизма в XIX в.) [14]. Дж. Крипал высказался в пользу гомоэротической природы мистического опыта Рамакришны. Это вызвало бурю негодования. Были сделаны две попытки запретить книгу для распространения в Индии, впрочем, обе неудачные. Во всей волне критики большинство исследователей, так или иначе, указывало на то, что Дж. Крипал проигнорировал всю сложность индийской цивилизации, не понял ее границ [4; 20; 27]. С точки зрения постколониализма, главным вопросом является не то, какую сторону принять в этом споре, а то, почему такой спор возможен, почему возможна такая истерика и почему формула «Запад есть Запад, Восток есть Восток, и вместе им не сойтись друг с другом» все еще актуальна? Почему существует такое узкое понимание культурных различий Индии и Запада, при котором между ними так мало точек соприкосновения, что остается только страх перед загадочной природой друг друга?

В рамках постколониального поворота именно британский колониализм обвиняется в конструировании узкой трактовки важнейших категорий дискурса об истории и культуре Индии. Главным следствием колониального правления являются трудности понимания индийцами мусульман, высшими кастами каст низших, мужчинами женщин, преодоление чего является первостепенной задачей для современной Индии. Без этого велик риск социальных кризисов, религиозного фундаментализма, поэтому и существует необходимость критиковать, деконструировать природу самых естественных явлений таких, как духовность, вневременность индийской культуры или джихад у мусульман через раскрытие колониального контекста их генеалогии и не рассматривать как совершенно чужие, недоступные пониманию феномены другой цивилизации.

### Литература и источники


1. Саид, Э. Ориентализм. Западные концепции Востока / Э. Саид. — СПб.: «Русский міръ», 2006. — 640 с.
2. Alexander, M. J., Mohanty, C. T. Feminist Genealogies, Colonial Legacies, Democratic Futures / M. J. Alexander, C. T. Mohanty. — Psychology Press, 1997. — 422 p.
3. Anupama Rao. The Caste Question / Interview with A. Rao // The Agenda with Steve Paikin [Electronic resource]. — TVOntario. — 23 June 2011. — Mode of access: https://www.youtube.com/watch?v=Q7_zmUghLmw. — Date of access: 22.09.2014.
4. Banerjee, A., De Nicolas, A., Ramaswamy, K. Invading the Sacred / A. Banerjee, A. De Nicolas, K. Ramaswamy. — Rupa & Co, 2007. — 545 p.
5. Bhabha, H. K. The Location of Culture / H. K. Bhabha. — Routledge, 1994. — 307 p.





6. Burton, A., Ramusack, B. N. Feminism, Imperialism and Race: A Dialogue Between India and Britain / A. Burton, B. N. Ramusack // Women's History Review [Electronic resource]. — 1994. — Vol. 3. — Iss. 4. — P. 469—481. — Mode of access: http://www.tandfonline.com/doi/pdf/10.1080/09612029400200065. — Date of access: 08.02.2015.
7. Burton, A. M. Burdens of History: British Feminists, Indian Women, and Imperial Culture, 1865—1915 / A. M. Burton. — University of North Carolina Press, 1994. — 301 p.
8. Chakrabarty, D. Subaltern Studies and Postcolonial Historiography / D. Chakrabarty // Nepantla: Views from South [Electronic resource]. — 2000. — Vol. 1. — Iss. 1. — P. 9—32. — Mode of access: https://libcom.org/files/subaltern.pdf. — Date of access: 11.12.2012.
9. Dirks, N. B. The Scandal of Empire: India and The Creation of Imperial Britain / N. B. Dirks. — Harvard University Press, 2006. — 416 p.
10. Gandhi, L. Postcolonial Theory: A Critical Introduction / L. Gandhi. — New York: Columbia University Press, 1998. — 196 p.
11. Guha, R. Dominance without Hegemony: History and Power in Colonial India / R. Guha. — Harvard University Press, 1998. — 134 p.
12. Guha, R., Spivak G. C. Selected Subaltern Studies / R. Guha, G. C. Spivak. — Oxford University Press, 1988. — 434 p.
13. India Untouched: Stories of People Apart: Part II / India Untouched: Stories of People Apart: Documentary // Directed by Stalin K [Electronic resource]. — Drishti: Media, Arts and Human Rights. — 2007. — Mode of access: https://www.youtube.com/watch?v=dKXB5YClUt8. — Date of access: 20.10.2013.
14. Kripal, J. J. Kali's Child: The Mystical and the Erotic in the Life and Teachings of Ramakrishna / J. J. Kripal. — University of Chicago Press, 1995. — 386 p.
15. Prof. Mridu Rai: Caste System In India / Interview with M. Rai // The MacMillan Report [Electronic resource]. — Yale University. — 31 March 2009. — Mode of access: https://www.youtube.com/watch?v=Q7_zmUghLmw. — Date of access: 22.09.2014.
16. Puri, J. Concerning «Kamasutras»: Challenging Narratives of History and Sexuality / J. Puri // Signs [Electronic resource]. — 2002. — Vol. 27. — No. 3. — P. 603—639. — Mode of access: http://www.asia-europe.uni-heidelberg.de/fileadmin/Documents/Research_Areas/Research_Project_B/B8_Rethinking_Gender/Puri_Concerning_Kamasutras.pdf. — Date of access: 25.01.2015.
17. Rao, A. The Caste Question: Dalits and the Politics of Modern India / A. Rao. — University of California Press, 2009. — 392 p.
18. Rao, Y. S. Indian Caste System: A Reappraisal / Y. S. Rao // Yellapragada Sudershan Rao Blog [Electronic resource]. — September 26, 2007. — Mode of access: http://ysudershanrao.blogspot.in/2007/09/indian-caste-system.html. — Date of access: 21.06.2014.
19. Romila Thapar. India's Past and Present: How History Informs Contemporary Narrative / Interview with R. Thapar // In conversation with International Development Research Centre (IDRC, Canada) President David M. Malone [Electronic resource]. — IDRC. — 29 June 2010. — Mode of access: https://www.youtube.com/watch?v=J8HhLJzpx3Y. — Date of access: 15.09.2014.
20. Sharma, A. Hindus and Scholars / A. Sharma // Religion in the news [Electronic resource]. — 2004. — Vol. 7, No. 1. — Mode of access: http://www.trincoll.edu/depts/csrpl/RINVol7No1/Hindus%20and%20Scholars.htm. — Date of access: 20.01.2015.
21. Should Gita be the National Book? / «Left, Right and Centre» Show [Electronic resource]. — NDTV. — December 8, 2014. — Mode of access: http://www.ndtv.com/video/player/left-right-centre/should-gita-be-the-national-book/347775. — Date of access: 09.12.2014.

22. Sinha, M. Colonial Masculinity: The «Manly Englishman» and The «Effeminate Bengali» in The Late Nineteenth Century / M. Sinha. — Manchester University Press, 1995. — 191 p.
23. Thapar, R. Asoka and the Decline of the Mauryas / R. Thapar. — Oxford University Press, 1997. — 344 p.
24. Thapar, R. Early India: From Origins to AD 1300 / R. Thapar. — The Penguin Group, 2002. — 556 p.
25. The New Imperial Histories Reader / ed. by S. Howe. — Routledge, 2009. — 470 p.
26. The Postcolonial Studies Reader / ed. by B. Ashcroft, G. Griffiths, H. Tiffin. — Routledge, 1995. — 526 p.
27. Tyagananda, S., Vrajaprana, P. Kali's Child Revisited or Didn't Anyone Check the Documentation? / S. Tyagananda, P. Vrajaprana // Evam: Forum on Indian Representations [Electronic resource]. — 2002. — Vol. 1, Iss. 1—2. — Mode of access: http://www.infinityfoundation.com/mandala/s_rv/s_rv_tyaga_kali1_frameset.htm. — Date of access: 20.01.2015.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 29.04.2015*



# ПУБЛІКАЦЫІ ДАКУМЕНТАЎ

***А. М. Латушкін,***
*дацэнт кафедры крыніцазнаўства*
*гістарычнага факультэта БДУ,*
*кандыдат гістарычных навук;*
e-mail: archives@tut.by

## АБ ГІСТОРЫІ ЎКЛЮЧЭННЯ ГРАМАТ І АКТАЎ ДЗЯРЖАЎНАГА АРХІВА ВЯЛІКАГА КНЯСТВА ЛІТОЎСКАГА Ў СКЛАД АРХІВА НЯСВІЖСКАЙ АРДЫНАЦЫІ КНЯЗЁЎ РАДЗІВІЛАЎ У ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII ст.

Пад «граматамі і актамі дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага» ў тэксце трэба разумець комплекс арыгінальных, пераважна пергаментных, дакументаў 1387—1644 гг. і іх копій, сучасных арыгіналам, якія належаў да складу дзяржаўнага архіва ВКЛ і ўключаў 4 асноўныя групы актаў: 1) агульназемскія прывілеі ВКЛ; 2) акты уній ВКЛ і Кароны Польскай; 3) пагадненні аб міры паміж ВКЛ і гаспадарамі малдаўскімі, вялікімі князямі маскоўскімі; 4) булы (брэвэ) і лісты рымскіх пап, адрасаваныя вялікім князям літоўскім. Самастойнасць і цэласнасць дадзенага комплексу актаў з архівазнаўчага пункту гледжання, а таксама яго прыналежнасць да т. зв. дзяржаўнага архіва ВКЛ пацвярджаецца архіўнай уліковай дакументацыяй, у прыватнасці, актамі прыёму-перадачы дакументаў найвышэйшага канцлера Льва Сапегі новаму канцлеру Альбрыхту Станіславу Радзівілу ў 1623 г. [8; 19; 20].

У польскай гістарыяграфіі для наймення арыгіналаў прывілеяў на пергаміне часта ўжываецца слова лацінскага паходжання «dyplom», адпаведна адносна дадзенай часткі архіва ВКЛ можна сустрэць паняцце «część dyplomatyczna». Адпаведнікам у айчыннай гістарыяграфіі можа выступаць паняцце «граматы», або «частка архіва, якая складаецца з арыгінальных актаў і грамат». Дадзенае паняцце выразна адрознівае азначаную частку архіва ВКЛ ад іншай, напрыклад, метрыкальнай у выглядзе сшыткаў і кніг (кодэксаў), якая намі не разглядаецца.

Гісторыя распрацоўкі і стан даследавання праблемы на кан. 1990-х гг. асвятляўся аўтарам раней [21]. Вынікі даследаванняў тэмы ў пытаннях часу і абставін уключэння часткі дзяржаўнага архіва ВКЛ у склад прыватнага збору Радзівілаў у другой палове XVII ст. сцісла можна прадставіць наступным чынам.

Галоўны ўклад у распрацоўку тэмы захоўвання дзяржаўных актаў ВКЛ у складзе Нясвіжскага архіва роду кн. Радзівілаў зрабілі польскія навукоўцы С. Пташыцкі, Я. Якубоўскі, С. Кутшэба, У. Сямковіч, В. Мікульскі. Час уваходжання дакументаў архіва ВКЛ у склад архіва Радзівілаў у даследаваннях акрэсліваецца перыядам ад 1651 г. або пачатку другой паловы XVII ст. (пазнейшыя

даты — 1653 г., 1656 г.) да 1688 г. (ранейшыя даты — 1667 г., 1685 г.)[1]. Адносна шляху і прававых падстаў такой акцыі фігуруе версія «прысваення» архіва пасля смерці канцлера ВКЛ Альбрыхта Станіслава Радзівіла ў 1656 г. яго спадкаемцамі, прадстаўнікамі нясвіжскай лініі роду Радзівілаў. Больш падрабязна эвалюцыя поглядаў навукоўцаў на гісторыю дадзенага пытання выглядае так.

Упершыню 2-ю пал. XVII ст. як час уваходжання дакументаў архіва ВКЛ у склад Нясвіжскага архіва і адпаведна патрэбу верыфікацыі гіпотэзы Станіслава Пташыцкага аб 1551 г. і прававых асновах далучэння дзяржаўных актаў ВКЛ да архіва Радзівілаў паставіў пад сумненне прафесар Уладыслаў Сямковіч на пасяджэнні Гістарычнага таварыства 22.02.1913 г. Пазней ён развіў свае погляды ў рэфераце, выкладзеным 23.10.1921 г. у віленскім Таварystве аматараў навук [27, s. XXII]. Яго паплечнік Станіслаў Кутшэба ў сваёй працы «Historia źródeł dawnego prawa polskiego» (1926 г.) сцвярджаў, што да сярэдзіны XVII ст. архіў захоўваўся ў асноўным пры скарбе земскім ВКЛ пад апекай падскарбія. Час жа далучэння яго да архіва Радзівілаў па С. Кутшэбе — 2-я пал. XVII ст. [26, s. 389—392, 447].

Ян Якубоўскі сцвярджаў, што прывілей 1551 г. з'яўляецца фальсіфікатам 2-й пал. XVII ст. і без спасылак на крыніцы ўказваў факт вывазу з Вільні «дыпламатычнай часткі архіва ВКЛ» (значэнне паняцця — гл. вышэй) у 1655 г. канцлерам ВКЛ, ардынатам альцкім князем Альбрыхтам Станіславам Радзівілам [25, s. 6, załaczniki A, B].

С. Кутшэба і У. Сямковіч (у супрацоўніцтве з С. Пташыцкім) у прадмове да працы «Akta unii Polski z Litwą 1385—1791» канкрэтызавалі верагодныя храналагічныя межы часу ўваходжання дзяржаўных дакументаў ВКЛ у архіў Радзівілаў з Нясвіжа — 1653—1667 гг., а таксама зрабілі абгрунтаваныя высновы аб фальсіфікацыі Радзівіламі прывілея Жыгімонта II Аўгуста ад 03.11.1551 г. у перыяд 1721—1743 гг. [27, s. XIX—XXII]. Аднак даследчыкі так і не адказалі на пытанні, хто ўратаваў архіў ВКЛ пры маскоўскай акупацыі Вільні ў 1655 г., дзе ён захоўваўся пасля і якім чынам ён трапіў у архіў Радзівілаў.

Праблему гісторыі архіва ВКЛ у перыяд XVI—XVII стст. закранаў і апошні архівіст нясвіжскіх ардынатаў Б. Туган-Таўрагінькі ў працы «Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej» (Варшава, 1955—1969), аднак пры гэтым ён цалкам абапіраўся на напрацоўкі папярэднікаў, пераважна С. Кутшэбы і У. Сямковіча [11].

Больш дэталёва дадзены аспект асвятліў В. Мікульскі ў 1997 г. у артыкуле «Dokumenty z archiwum WXL w archiwum warszawskim Radziwiłłów». Для адказу на пытанне аб часе і ўмовах уваходжання актаў з архіва ВКЛ у архіў Радзівілаў ён дадаў наступныя палажэнні: 1) канцлер Альбрыхт Станіслаў Радзівіл,

[1] Тут мы не разглядаем ранейшы перыяд і выпадкі, калі канцлеры ВКЛ — прадстаўнікі роду Радзівілаў захоўвалі дзяржаўныя акты ВКЛ, а таксама версію С. Пташыцкага адносна даты 1551 г. як пачатку гісторыі захоўвання Радзівіламі нясвіжскай лініі дзяржаўных актаў ВКЛ, што варта асобнага даследавання [29; 30].



выязджаючы ў канцы 1654 г. да Тухолі на Памор'і, забраў з сабой і частку архіва ВКЛ — граматы (менавіта гэтыя акты названы ў пазнейшых інвентарах архіва 1685 г., 1688 г.), за выключэннем кніг Метрыкі; 2) астатняя частка архіва ВКЛ (кнігі Метрыкі, скарбовыя акты) захоўвалася ў Альцы, дзе і загінула разам з прыватным архівам Радзівілаў альцкай лініі падчас нападу казакоў на Альцкі замак 30 жніўня 1648 г.; 3) найбольшая частка дакументаў, якія захоўваліся ў канцлера ВКЛ Альбрыхта Станіслава Радзівіла, трапілі ў валоданне да нясвіжскай лініі роду Радзівілаў пасля смерці канцлера ў 1656 г. шляхам пераходу яго ўладанняў і іншай маёмасці ў спадчыну падканцлеру, ардынату нясвіжскаму Міхалу Казіміру Радзівілу (1635—1680) [28, s. 74—75].

За апошні час аб істотных зрухах у аб'ёме ведаў па праблеме пакуль сказаць нельга. Сярод найбольш грунтоўных айчынных прац, прысвечаных тэме, трэба адзначыць публікацыю «Помнікі права Беларусі XIV — XVI стст.: агульназемскія прывілеі і акты дзяржаўных уній. Крыніцазнаўчы дапаможнік» (Мінск: БелНДІДАС, 2015). Гэта выданне — важны крок у распрацоўцы тэмы беларускімі гісторыкамі. Яно ўпершыню ў айчыннай гістарыяграфіі комплексна і на адпаведным навуковым узроўні, некалькі пераўзыходзячым заяўлены статус крыніцазнаўчага дапаможніка, прадстаўляе два асноўныя віды дзяржаўна-прававых актаў ВКЛ — земскія прывілеі і акты уній ВКЛ з Каралеўствам Польскім. Аднак праца амаль не раскрывае гісторыю захоўвання дакументаў, што натуральна з улікам мэты і характару выдання [22][2].

Такім чынам, час і абставіны, пры якіх Радзівілы завалодалі найкаштоўнейшай часткай дзяржаўнага архіва, застаюцца пакуль недастаткова высвечанымі. Сучасныя польскія даследаванні перыяду другой паловы XVII ст. у гісторыі ВКЛ і аналіз выяўленых намі крыніц па тэме дазваляюць наступным чынам рэканструяваць гісторыю падзей.

1. Нягледзячы на гісторыю захоўвання прадстаўнікамі роду Радзівілаў дзяржаўных актаў у XVI ст., фактам застаецца тое, што ў канцы XVI — пачатку XVII ст. дзяржаўны архіў, у тым ліку яго «дыпламатычная частка», або граматы

[2] Ацэнка значэння працы для беларускай гістарыяграфіі заслугоўвае асобнай рэцэнзіі або артыкула, тут жа хацелася б пазначыць каштоўнасць працы ў кантэксце праводзімага намі даследавання, як добры выпадак, што дазваляе падкрэсліць пэўную розніцу аб'екта даследавання. Спіс прадстаўленых у выданні актаў дастаткова поўна адлюстроўвае склад толькі дзвюх з чатырох груп дакументаў той часткі дзяржаўнага архіва, якая вывучаецца намі — агульназемскіх прывілеяў ВКЛ і актаў уній з Каронай Польскай (змешчаны тэксты дзяржаўна-прававых актаў указаных відаў, пазначана месца захоўвання арыгіналаў, копій і іншыя звесткі). Гэта натуральна, бо выданне носіць выразную археаграфічна-крыніцазнаўчую скіраванасць і мела на мэце комплексна прадставіць акты, пакладзеныя ў аснову дзяржаўна-прававога ладу Вялікага Княства Літоўскага і Рэчы Паспалітай. Асаблівасць жа нашага даследавання ў яго *архівазнаўчым* характары, скіраванасці на вывучэнне гісторыі і рэканструкцыю поўнага складу вышэйапісанай часткі дзяржаўнага архіва ВКЛ — «актаў і грамат» — як цэласнага адасобленага комплексу, прадстаўленага арыгінальнымі дакументамі ўсіх чатырох груп, ацэнка паўнаты захаванасці комплексу.

ў форме арыгіналаў, знаходзіліся пад апекай канцлера Льва Сапегі. На 1623 г. яны захоўваліся ў «скарбовым склепе ў замку караля яго міласці Віленскім» [8, s. 1, 22]. У рукі наступнага канцлера Альбрыхта Станіслава Радзівіла ён трапляе не раней за 11 сакавіка 1623 г. Гэты факт фіксуе вопіс («акт прыёму-перадачы») дзяржаўных актаў ВКЛ, перададзеных ваяводам віленскім Львом Сапегай канцлеру Альбрыхту Станіславу Радзівілу пры заступленні апошняга на пасаду, які вядомы ў некалькіх экзэмплярах. Адзін з іх, што адлюстроўвае метрыкальную частку архіва і датуецца ўласна 11 сакавіка 1623 г., быў выяўлены Г. Я. Галенчанкам у фондах рукапіснага аддзела Дзяржаўнай публічнай бібліятэкі імя Салтыкова-Шчадрына ў зборы П. П. Дуброўскага (цяпер Расійская нацыянальная бібліятэка ў Санкт-Пецярбургу, аддзел рукапісаў, збор П. П. Дуброўскага, аўтограф 124, арк. 98—113) і апублікаваны [19; 20].

Другі, у выглядзе копіі, захоўваецца ў варшаўскай частцы Нясвіжскага архіва Радзівілаў у Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве і датуецца 26 лістапада 1623 г. [8]. Асаблівасць яго ў тым, што акрамя кніг метрыкі вопіс утрымлівае і спіс прывілеяў і арыгінальных актаў ВКЛ агульнадзяржаўнага значэння. Вопіс называе некалькі іх груп: 1) земскія прывілеі ВКЛ; 2) акты уній ВКЛ і Кароны Польскай; 3) двухбаковыя пагадненні аб міры паміж Вялікім Княствам Літоўскім і Маскоўскай дзяржавай, Малдавіяй; 4) лісты (граматы) рымскіх пап вялікім князям літоўскім. Вопіс ад 26 лістапада 1623 г. пакуль адзіны з вядомых поўных апісанняў архіва ВКЛ за перыяд 1623—1685 гг. Верхняй датай датуецца наступны вопіс азначаных дзяржаўных актаў у частцы актаў і грамат, што быў складзены па загадзе ўжо прадстаўнікоў роду Радзівілаў як іх захавальнікаў. Такім чынам, пазнейшая за 1623 г. амаль 60-гадовая гісторыя захоўвання неметрыкальнай часткі архіва застаецца недастаткова высвенай.

2. Версія захоўвання актаў у перыяд канцлерства альщкага ардыната Альбрыхта Станіслава Радзівіла (1623—1656) у Нясвіжскім палацы Радзівілаў не пацвярджаецца захаванымі вопісамі архіва. Найбольш поўны з іх, што дайшоў да нас, — вопіс архіварыуса і бібліятэкара Нясвіжскага замка Радзівілаў Яна Гановіча, складзены ў 1650 г. разам з вопісам замкавай бібліятэкі Радзівілаў. Арыгінал першага з іх захоўваецца ў складзе часткі архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў у AGAD [12]. Другі — у Бібліятэцы Польскай акадэміі навук у Курніку. Дадзеныя вопісы маюць першараднае значэнне ў якасці крыніц, што адлюстроўваюць склад дакументальных і кніжных збораў Нясвіжскага замка ў сярэдзіне XVII ст. Значную каштоўнасць яны ўяўляюць сабой нават з мастацкага пункту гледжання, паколькі шыкоўна афармленыя рукой аўтара, маюць скураную вокладку, аздобленую цісненнем і металічнымі накладкамі. Такім чынам, вопіс Нясвіжскага архіва 1650 г. яшчэ не згадвае ніводнага з указаных актаў архіва ВКЛ, што, зрэшты, канстатуецца і ранейшымі даследчыкамі [27, с. XIX].

Знакамітыя мемуары Альбрыхта Станіслава Радзівіла не праліваюць святло на азначанае пытанне [15; 16; 17; 18]. Карэспандэнцыя канцлера за перыяд 1612—1656 гг. таксама не пацвярджае фактаў перадачы дакументаў пад апеку прадстаўнікоў нясвіжскай або біржанскай галін роду [3; 4; 5; 6].



Малаверагодным з'яўляецца і тое, што канцлер захоўваў дадзеную частку архіва ВКЛ ва ўласным Альщкім замку, цэнтры Альщкай ардынацыі, як, напрыклад, кнігі метрыкі і акты скарбу ВКЛ (згодна са сцвярджэннем В. Мікульскага і яго папярднікаў) [28, s. 74—75]. Наўрад ці мог ён адважыцца на перамяшчэнне дзяржаўных архівалій у глыб краіны, фактычна ў эпіцэнтр небяспекі. Так, сам князь на час ваенных падзей у канцы 1654 г. выехаў да Тухолі на Памор'і, у 1655 г., жыў у Гданьску. З карэспандэнцыі вынікае, што бяспечным месцам ён лічыў таксама Мальбарк (жнівень 1655 г.) [5, s. 24—25]. Аднак нават калі дапусціць такую верагоднасць, то гэтыя акты пасля спалення Альщкага замка казакамі ў 1648 г. проста б не захаваліся. Аб чарговым выпадку знішчэння маёнткаў князя на Валыні татарамі сам канцлер паведамляў у лісце да ваяводы мальбаркскага ўжо напрыканцы жыцця: «Усе мае валынскія маёнткі пераўтвораны ў попел, акрамя двух найменшых фальваркаў. Падданых не меней за 4000 да Арды ўзята, амаль трэцюю частку Пінска тыя ж татары спалілі і падданых забралі» (без даты, 1655—1656 гг.) [6, s. 15].

Разам з тым само сцвярджэнне, што кнігі Метрыкі, скарбовыя акты захоўваліся менавіта ў Альщы, дзе і загінулі разам з прыватным архівам Радзівілаў альщкай лініі падчас нападу казакоў на Альщкі замак 30.08.1648 г., на наш погляд, таксама патрабуе пацвярджэння, асабліва ў частцы скарбовай. Бо «след» скарбовых актаў, як будзе адзначана ніжэй, вядзе да Януша (1612—1655) і Багуслава (1620—1669) Радзівілаў. Ды і неабходнасць вывазу метрыкальнай часткі архіва да Альщкі не зусім зразумелая, бо, як вядома, акрамя «скарбовага склепа» на Віленскім замку, у 1636 г. месца для захоўвання кніг метрыкі ў сталіцы было дадаткова забяспечана выдзяленнем асобных каменных будынкаў — камяніцы віленскага абывацеля Яна Ключаты каля гарадскога рынку, паблізу Уваскрасенскай царквы, і прыватнага дома немца Ланга на вул. Шкляной.

Так ці інакш, найбольш верагодным падаецца тое, што комплекс агульнадзяржаўных грамат знаходзіўся пры канцлеры. Адметна, што вопіс даследуемай часткі архіва за 1685 г. утрымлівае дакументы пазнейшыя за дату складання вопісу 1623 г., перыяду кіравання Уладзіслава IV («list od Krola Władysława od Cara Moskiewskie(g)o o Smierci Caciley Renaty») [дадатак А]. Гэта ўказвае на тое, што азначаны комплекс працягваў папаўняцца і пры Альбрыхце Станіславе Радзівіле, а значыць, знаходзіўся ў межах дасягальнасці для яго, верагодна, у сталіцы ВКЛ. Нагадаем, як сцвярджаў Ян Якубоўскі, канцлер у 1655 г. вывез «дыпламатычную частку архіва ВКЛ» менавіта з Вільні [25, s. 6].

3. Вялікі канцлер ВКЛ Альбрыхт Станіслаў Радзівіл, верагодна, не быў той асобай, непасрэдна ад якой, як сцвярджалася ў літаратуры, частка дзяржаўнага архіва ВКЛ разам з іншай рухомай, у тым ліку архівы, і нерухомай маёмасцю князя, напрыклад, Альщкай ардынацыяй, перайшла да нясвіжскай галіны роду Радзівілаў, і, у прыватнасці, да ардыната нясвіжскага Міхала Казі-

міра Радзівіла (1635—1680) шляхам пераходу ў спадчыну[3]. Найверагодней, першапачаткова дзяржаўны архіў ВКЛ, як мінімум яго частка, быў вывезены вялікім гетманам ВКЛ Янушам Радзівілам. Пасля ж яго смерці схаваны канюшым ВКЛ Багуславам Радзівілам, верагодна, у Караляўцы. На гэта ўказваюць наступныя дакументы і звесткі.

У варшаўскай частцы Нясвіжскага архіва захоўваецца дакумент, які адлюстроўвае падзеі 1669 г., звязаныя з рэалізацыяй сеймавай пастановы аб пошуку архіва скарбу ВКЛ [2]. Яшчэ сейм 1667 г. пастанавіў правесці пошукі і рэвізію архіва дзяржаўнага скарбу [13, с. 994]. Да 1669 г. гэта заданне, відаць, выканана не было. На 1669 г. у склад камісіі для рэалізацыі дадзенай пастановы ўваходзілі: біскуп жмудскі Казімір Пац, найвышэйшы гетман ВКЛ Міхал Казімір Пац, Крышпін Кіршэнштайн, А. Гелгуд. Камісія атрымала даручэнне: «каб мы сур'ёзнае правялі расследаванне — куды … падзеліся архівы скарбу, у якіх Рэч Паспалітая адчувае крайнюю патрэбу» [2, s. 1]. Прыбыўшы ў пач. 1669 г. у Вільню, камісіі ўдалося ўстанавіць, што архіў знаходзіцца ў скрабцы канюшага ВКЛ Багуслава Радзівіла «сярод рэліквій» скарбца былога вялікага гетмана ВКЛ Януша Радзівіла. У сувязі з гэтым камісары скіравалі да князя ліст з ветлівай просьбай даставіць скарбовы архіў у Вільню к 15 сакавіка 1669 г. і здаць дакументы згодна з вопісам, што мусіў знаходзіцца пры тым жа архіве. На гэты ж тэрмін прызначаўся чарговы збор камісіі і скліканіся іншыя ўпаўнаважаныя да справы ўраднікі і асобы. Канчатковую справаздачу аб справе камісары планавалі падрыхтаваць к элекцыйнаму сейму.

Такім чынам, дакумент пацвярджае, што пэўныя часткі дзяржаўных архіваў ВКЛ маглі быць вывезены вялікім гетманам Янушам Радзівілам. Пасля яго смерці іх, разам з іншымі каштоўнасцямі князя, прыняў на захоўванне канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл і да канца 1660-х гг. спакойна імі валодаў.

Дакладна невядома, дзе знаходзіліся дакументы пры жыцці Януша Радзівіла. Дакладна аднак тое, што князь Багуслаў шукаў рэчы і дакументы вялікага гетмана адразу пасля смерці Януша (31.12.1655 г.). Так, ім разам з князем Міхалам Казімірам Радзівілам была прадпрынята таемная спроба выратавання цела і маёмасці князя, у тым ліку дакументаў, з абложанага і ўрэшце спаленага войскамі ВКЛ Тыкоціна — апошняга прыжыццёвага месцазнаходжання апальнага гетмана. Ліст князя Міхала Казіміра Радзівіла да князя Багуслава так апісвае гэту акцыю і яе вынікі. Слугі Міхала Казіміра пранікі ў фартэцыю ўжо пасля яе падзення. На той момант большасць рэчаў князя і «спраў» была разрабавана або спалена. Пэўная іх частка, відаць, з архіва самога Януша ці Багуслава, была захоплена войскамі. Міхалу Казіміру Радзівілу ўдалося ўратаваць толькі рэшту папер. Ніякіх узгадак аб частцы архіва ВКЛ у Тыкоцінскім замку ў крыніцы таксама няма. Гэта ўказвае на тое, што дзяржаўныя акты ВКЛ у Тыкоціне на час

[3] Гэты факт нельга разглядаць як пераход спадчыннай уласнасці — дакументы былі ўласнасцю дзяржавы.



яго штурму, хутчэй за ўсё, адсутнічалі, у адваротным выпадку дадзены факт не мог бы застацца незаўважаным відавочцамі падзей, якія пераказвалі іх у вядомых успамінах, тым больш Міхалам Казімірам у паведамленні князю Багуславу. Вось найбольш істотныя выпрымкі з ліста: «Пасля атрымання лістом інфармацыі ад вашай княскай міласці аб рэчах вашай княскай міласці я запытваўся тут, але [знайсці і ўратаваць іх] амаль немагчыма, бо адны былі расцягнуты, а другія ў пажары згінулі. … *Справы вашай княскай міласці некаторыя знаходзяцца ў войску фасцыкуламі, іншыя будуць перададзены вашай княскай міласці, але наколькі я зразумеў, большасць іх знішчана* (выдзелена. — *А. Л.*). Калі б я сам быў на той час пад Тыкоцінам і, пры гэтым атрымаў бы ад вашай княскай міласці інфармацыю, удалося б мне болей урававаць, але па прычыне імклівага штурму і падзення фартэцыі ўсё выйшла іначай…» [7, с. 35—36].

4. У 1660-я гг. пытанне дзяржаўнага архіва і валодання ім уключаецца ў «павестку дня» ўнутрыпалітычнай барацьбы ў ВКЛ. Перыяд другой паловы 1660-х — пач. 1670-х гг. — гэта час жорсткага саперніцтва родаў Радзівілаў і Пацаў за вышэйшыя пасады ў дзяржаве і ўплыў на ўнутраную палітыку. Асноўнымі фігурантамі барацьбы сталі падканцлер ВКЛ, ардынат нясвіжскі Міхал Казімір Радзівіл (1635—1680), канюшы ВКЛ Багуслаў Радзівіл (1620—1669) з аднаго боку, і вялікі гетман ВКЛ Міхал Казімір Пац (1624—1682) і канцлер ВКЛ Крыштаф Пац (1621—1684) — з другога [23; 24].

Перадгісторыя пытання наступная. 30 чэрвеня 1668 г. Ян Казімір надаў Міхалу Казіміру Радзівілу прывілей на пасаду падканцлера ВКЛ. Гэта быў не згодны з заканадаўствам шлях прызначэння на пасады, так як намінацыю на пасаду падобнага рангу можна было атрымаць толькі падчас сейма. Больш таго, ужо пасля адрачэння караля польскага і вялікага князя літоўскага Яна Казіміра ад трона (16 верасня 1668 г.) на варшаўскім сейме 20 лістапада таго ж года Міхал Казімір Радзівіл абвясціў, што мае прывілей на пасаду польнага гетмана ВКЛ, нададзены яму яшчэ дзеючым манархам за дзень да адрачэння, 15 верасня 1668 г.[4] Такім чынам, сумяшчаліся ў руках адной асобы ваенная і канцлерская вышэйшая дзяржаўныя пасады, што зноў супярэчыла тагачасным канстытуцыйным нормам. Відавочна, атрыманне гэтай пасады ва ўмовах трымання саапернікамі Радзівілаў пасад вялікага канцлера ВКЛ (Крыштаф

[4] К. Бабятынскі і іншыя даследчыкі звяртаюць ўвагу на тое, што дата надання Міхалу Казіміру Радзівілу прывілея на гетманства польнае — не адпавядае рэчаіснасці і з'яўляецца вынікам фальсіфікацыі, прадпрынятай Міхалам Казімірам Радзівілам: 1) вестка аб смерці польнага гетмана Валовіча павінна была дасягнуць Варшавы за два дні, што магчыма толькі тэарэтычна; 2) падканцлер Міхал Казімір актыкаваў тэкст прывілея ў кнігу метрыкі, якая вялася ім, аднак дата яго надання тут не 15, а 16 верасня. Адметна, што дадзеная кніга метрыкі так і не была перададзена ні Міхалам Казімірам, ні яго нашчадкамі ў скарб дзяржавы. Факт разыходжання паміж арыгіналам і копіяй застаўся невядомым і быў адкрыты толькі ў цяперашні час, пасля выяўлення і вывучэння арыгінала азначанай кнігі метрыкі ў Бібліятэцы Літоўскай акадэміі навук [31].

Пац) і вялікага гетмана (Міхал Казімір Пац) і з такімі парушэннямі афіцыйных працэдур не магло не выклікаць канфлікту.

У працэсе барацьбы Пацы імкнуліся скарыстацца ўсімі магчымымі аргументамі супраць Радзівілаў. Пытанне дзяржаўнага архіва стала адным з ключавых пунктаў гэтых спрэчак. Вышэй ужо быў згаданы адзін з сюжэтаў спробы высвятлення на дзяржаўным узроўні лёсу скарбовага архіва ў пач. 1669 г. Важныя факты з гісторыі пытання раскрывае польскі даследчык Конрад Бабятынскі. Згодна з яго даследаваннямі найвастрэй пытанне архіва было пастаўлена падчас элекцыйнага сейма 1669 г. Так, 6 чэрвеня 1669 г. разам з чарговымі патрабаваннямі прыхільнікаў Пацаў да Міхала Казіміра Радзівіла аб адмаўленні ад польнага гетманства як незаконна захопленага вялікі гетман літоўскі Міхал Казімір Пац запатрабаваў ад Багуслава Радзівіла, каб той вярнуў усе схаваныя ім «справы і *прывілеі ВКЛ* (выдзелена. — *А. Л.*) і каб прасочана было тое, ці ўсе ёсць, бо паміж імі павінны быць некаторыя, што патрабавалі недапушчэння рэлігійных дэсідэнтаў да дзяржаўных пасад» [23, s. 231]. Такім чынам, у дадзеным выпадку, у адрозненне ад справы вяртання скарбовага архіва, мова ішла канкрэтна аб земскіх прывілеях ВКЛ.

Патрабаванне вяртання дзяржаўных актаў было скіравана ў Багуслава Радзівіла як пратэстанта і, відаць, у значнай ступені ўзнікла ў выніку выкарыстання партыяй Міхала Казіміра Паца антыдэсідэнцкага пытання ў сваіх палітычных мэтах. Гэта пацвярджаюць пазнейшыя падзеі 7 чэрвеня, калі гетман паўторна ўзняў перад Багуславам Радзівілам пытанне схаваных ім прывілеяў, у палеміку на яго баку ўключыўся біскуп жмудскі, які абвінавачваў «дысідэнтаў» у крыўдах, нанесеных вернікам і маёмасці рыма-каталіцкага касцёла. Так ці інакш, пытанне вяртання архіва стала адным з апошніх, на якім спынілася палеміка палітычная і пачалося ўзброенае супрацьстаянне дзвюх партый. Князь заявіў, што ён можа аддаць «меншую булаву» толькі з уласным жыццём. Паўстала пагроза зрыву элекцыйнага сейма. 19 чэрвеня, па сведчанні мемуарыста Багуслава Маскевіча, Радзівілы адважыліся на фізічную ліквідацыю Крыштафа і Міхала Казіміра Пацаў у выпадку, калі б дайшло да двайнога абрання «Латарынчыка» і «Нойбурга» [23, s. 232]. Як вядома, праблему супрацьстаяння магнатэрыі нечакана вырашыла шляхта, якая абрала каралём Міхала Карыбута Вішнявецкага. Гетман Пац хутка падтрымаў новага караля, быў уключаны ў камісію па распрацоўцы т. зв. «pacta conventa», дзе, між іншым, спрабаваў увесці пункт аб забароне сумяшчэння некалькіх дзяржаўных пасад, скіраваны супраць Радзівіла. Напружанне паміж Радзівіламі і Пацамі зменшылася. Апошнія нават пагадзіліся пакінуць гетманства польнае Радзівілу пры ўмове паразацвярджэння яго на пасадзе новым манархам, аднак у цэлым яны паслядоўна імкнуліся дасягнуць сваёй мэты па аслабленні Радзівілаў.

29 чэрвеня Пацамі быў прадстаўлены Радзівілам спіс умоў пагаднення пад назвай «Пункты [пагаднення], якія іх міласць паны Пацы прад'явілі князям Радзівілам» [1, с. 591—592][5]. Яго асноўныя ўмовы: 1) гетманства польнае перазацвярджаецца новым манархам са скасаваннем прывілея Яна Казіміра; 2) ад падканцлерства князь адмаўляецца; 3) узамен артымлівае кашталянства віленскае. Адметна, што разам з іншымі патрабаваннямі Пацы зноў вярнуліся да пытання архіва. Так, сярод 17 пунктаў умовы прымірэння быў змешчаны асобны пункт аб вяртанні Радзівіламі архіваў, прычым, відаць, не толькі скарбовых, а ўсіх дзяржаўных, якія павінны былі б захоўвацца ў скарбе дзяржавы: «14. Каб узятыя архівы да скарбу ВКЛ усе цалкам былі вернутыя» [1, с. 592]. Пагадненне павінна было быць падпісана, аднак Міхал Казімір Радзівіл не пагадзіўся аддаць ні адной пасады і абнародаваў тэкст умоў.



Для выхаду з тупіковай сітуацыі бакі абралі… дуэль. Яна павінна была адбыцца 2 ліпеня 1669 г. у 4 гадзіны раніцы пад Варшавай «паміж Грыбавым і Чэрняковым» на шпагах і пісталетах. Канюшы ВКЛ князь Багуслаў Радзівіл павінен быў сустрэцца з гетманам Міхалам Казімірам Пацам, а падканцлер ВКЛ Міхал Казімір Радзівіл — з канцлерам Крыштафам Пацам. Аднак за пасрэдніцтвам манарха і іншых высокапастаўленых асоб (Пражмоўскага, біскупа куяўскага К. Ф. Чартарыйскага) 2 ліпеня ў 6 гадзін вечара адбылося публічнае прымірэнне бакоў. У выніку Міхал Казімір Радзівіл заставаўся на абедзвюх пасадах, Міхалу Казіміру Пацу абяцалася ваяводства віленскае, а яго пратэжэ Антонію Гіларыю Палубінскаму — староства жмудскае. Пры ўмове ж, калі б вялікае гетмантсва зрабілася вакантным, яно даставалася Палубінскаму, а староства жмудскае — Багуславу Радзівілу [23, s. 234].

Невядома, што, аднак, было вырашана адносна архіва. Верагодна, гэта пытанне далей не будзіравалася. Як мінімум да сейма 1673 г. Тады была прынята чарговая канстытуцыя па тым жа пытанні [14, с. 156]. Аднак цалкам і яна не была выкананая. Далейшая гісторыя сведчыць, што Радзівілы не вярнулі дзяржаўныя акты. У сітуацыі вострай унутрыпалітычнай барацьбы за ўладу валоданне дзяржаўным архівам, і тым больш такой важнай яго часткай як земскія прывілеі і акты уній, давала дадатковую перавагу перад канкурэнтамі, павышала статус трымальніка такога роду актаў. Тым больш што з абраннем Яна III Сабескага Радзівілы аказаліся параднёныя з манаршай фаміліяй (праз шлюб ардыната нясвіжскага Міхала Казіміра Радзівіла і Кацярыны з Сабескіх, сястры манарха), што стала для іх пачаткам новага этапу ўзвышэння.

5. З 1680-х гг. пачынаецца пацверджаная крыніцамі гісторыя комплексу дзяржаўных актаў ВКЛ як часткі архіва Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў. Першым пацверджаннем гэтаму выступае вопіс дакументаў Кацярыны з Сабескіх Радзівіл (?— 1694), у першым шлюбе Заслаўскай, на той час удавы Міхала Казіміра Радзівіла (пам. у 1680 г.), ваяводы віленскага, падкаморага, гетмана польнага, VI ардыната нясвіжскага і IV алыцкага, складзены ў Варшаве 18 ліпеня 1685 г. [9] (дадатак А). Згодна з вопісам частка дзяржаўнага

[5] Дакумент не датаваны. К. Бабятынскі датуе 29 чэрвеня 1669 г.[23, s. 233].

архіва ВКЛ на той час знаходзілася ў Варшаве. Яна захоўвалася разам з комплексам іншых, найбольш каштоўных дакументаў роду Радзівілаў — прывілеяў на пасады, тытулы, землеўладанні. Дзяржаўныя акты ВКЛ былі змешчаны ў вялікай акаванай скрыні, у 12 шуфлядах і трох т. зв. «шкатулах»[6]. Шуфляды і шкатулы пазначаліся літарамі «A», «B», «C». Кожная з шуфляд дзялілася на 5 аддзелаў, пазначаных арабскімі літарамі ад 1 да 5. Шкатулы пазначаліся: A лічба 4, B лічба 5, C лічба 3. Унутры шуфляд і шкатул дакументы мелі літарныя абазначэнні згодна з літарамі лацінскага алфавіта. Колькасць дакументаў у шуфлядах/шкатулах была розная — ад 2 да 12 шт. Агульная колькасць названых актаў — 75, не ўлічваючы прывілеяў на т. зв. «рускай» мове (шуфляды: B лічба 2; C лічба 5), апісаных агульна як «прывілеі рускія, якія немагчыма прачытаць». Два дакументы былі прапушчаны: у шкатуле пад літарай A лічба 5 «Ruskie» не ўказаны дакумент D — вопіс пасля літары C называе адразу літару E; у шуфлядзе пад літарай C лічба 2 не ўказаны дакумент F — вопіс пасля літары E называе адразу літару G [9, с. 3, 5; дадатак А].

### Крыніцы і літаратура


1. Archiwum Główny Akt Dawnych (AGAD). — Zespół № 354 «Archiwum Radziwiłłów, t. zw. Warszawski» (AR). — DziałII. — ks. 22, 1094 k., 1665—1673.
2. AGAD. — AR. — DziałII. — sygn. 1565, k. 1—3, b. d. [не пазней 15 сакавіка 1669 г.].
3. AGAD. — AR. — DziałIV. — sygn. 8 (MF 90954) Лісты Альбрыхта Станіслава Радзівіла, 67 арк., 1612—1646 гг.
4. AGAD. — AR.— DziałIV. — sygn. 9 (MF 90955) Лісты Альбрыхта Станіслава Радзівіла, 69 арк., 1646—1652 гг.
5. AGAD. — AR. — DziałIV. — sygn. 10 (MF 90956) Лісты Альбрыхта Станіслава Радзівіла, 61 арк., 1652—1655 гг.
6. AGAD. — AR. — DziałIV. — sygn. 11 (MF 90957), 33 арк., 1655—1656 гг.
7. AGAD. — AR. — DziałIV. — sygn. 361 (MF 91306) Лісты Міхала Казіміра Радзівіла за 1649—1658 гг., 67 s.
8. AGAD. — AR. — DziałXXVII «Sumariusze i inwentarze archiwów radziwiłłowskich». — Sygnatura 11. Regestr przywilegiów W. X. Lit. oddanych do zamku Xiążąt Radziwiłłów 26.11.1623 r.
9. AGAD. — AR.— DziałXXVII «Sumariusze i inwentarze archiwów radziwiłłowskich». — Sygnatura 13 «Regestr spraw 1685 r.». B. a., b. d. [XVII w., po 1688 r.]. Cz. I «Regestr spraw Jaśnie Oświeconej X[ięż]nej Jmci Katarzyny z Sobieszyna Radziwiłłowej (zm. 1694 r. 1 v. Zasławskiej) podkanclerzynej i hetmanowej W. X. Lit. etc. etc. dnia 18 Julii roku 1685 sporządzony w Warszawie». S. 1—16; Cz. II «Regestr spraw przesłanych od X[ięż]nej Jej Mości, które odebrałem od Jego M[oś]ci P[an]a Taszkiewicza […] we Gdańsku dnia 19 Nowembra anno 1684», S. 17—24.
10. AGAD. — Czytelnia, Inwentarz działu XXVII, Archiwum Radziwiłłów, t. zw. Warszawskiego, oprac. R. Jankowski.


[6] У. Сямковіч і С. Кутшэба прыводзілі агульную лічбу ў 15 шкатул [27, с. XIX].




11. Biblioteka Narodowa w Warszawie.— Rps. 9067, część 2. — Tuhan-Taurogiński B. Z dziejów Archiwum Radziwiłłów oraz wartość zbiorów dla nauki polskiej. — Warszawa, 1969. — S. 8—10.
12. Zespół № 354 «Archiwum Radziwiłłów, t. zw. Warszawski». — Dział Rękopisy biblioteczne. — Sygn. VIII-16. Zebranie przywilejów, praw i spraw rożnych… J. Hanowicz, 1650 r.
13. Volumina legum: w 8 t. / oprac.: Xsięża Piary w Warszawie. — wyd. 3-e. —Warszawa: Wydawnictwa Artystyczne i Filmowe, 1980. — T. 4: 1641—1668. — 501 s., XVII.
14. Volumina legum: w 8 t. / oprac.: Xsięża Piary w Warszawie. — wyd. 3-e. — Warszawa: Wydawnictwa Artystyczne i Filmowe, 1980. — T. 5: 1669—1697. — 463 s.
15. Альбрыхт Станіслаў Радзівіл. Дыярыюш аб падзеях у Польшчы / Публ.: А. Сьвяжынскі // Спадчына. — 1995. — № 6. — С. 123—170.
16. Альбрыхт Станіслаў Радзівіл. Дыярыюш аб падзеях у Польшчы / Публ.: А. Сьвяжынскі // Спадчына. — 1996. — № 1. — С. 224—259.
17. Альбрыхт Станіслаў Радзівіл. Дыярыюш аб падзеях у Польшчы / Публ.: А. Сьвяжынскі // Спадчына. — 1996. — № 2. — С. 166—204.
18. Альбрыхт Станіслаў Радзівіл. Дыярыюш аб падзеях у Польшчы / Публ.: А. Сьвяжынскі // Спадчына. — 1996. — № 3. — С. 160—195.
19. Галенчанка, Г. Я. Метрыка Вялікага Княства Літоўскага: гісторыя, даследаванні, выданні (кароткі нарыс) / Г. Я. Галенчанка. — Мінск: БелНДІДАС, 2014. — 88 с.
20. Голенченко, Г. Я. Реестр книг Метрики Великого княжества Литовского 1623 г. / Г. Я. Голенченко // Исследования по истории Литовской Метрики: сб. науч. труд. / АН СССР, Инст. истории СССР; редкол.: В. Т. Пашуто [и др.]. — М., 1989. — С. 341—356.
21. Латушкін, А. М. Дзяржаўныя акты Вялікага княства Літоўскага ў складзе Нясвіжскага архіва князёў Радзівілаў: стан і накірункі даследавання праблемы / А. М. Латушкін // Мінулае і сучаснасць: архівы ў сістэме гуманітарных ведаў: Матэрыялы міжнароднай навуковай канферэнцыі, прысвеч. 100-годдзю Віцебскай вучонай архіўнай камісіі (Мінск, 20 мая 2009 года) / рэд. кал. Н. М. Дзятчык, С. У. Жумар, В. С. Пазднякоў [і інш.]. — Мінск: БелНДІДАС, 2010. — С. 31—37.
22. Помнікі права Беларусі XIV — XVI стст.: агульназемскія прывілеі і акты дзяржаўных уній: крыніцазнаўчы дапаможнік / склад.: Г. Я. Галенчанка, А. А. Жлутка, А. А. Мяцельскі [і інш.]. — Мінск: БелНДІДАС, 2015. — 388 с.
23. Bobiatyński, K. Michał Kazimierz Pac, wojewoda wileński, hetman wielki litewski: działalność polityczno-wojskowa / K. Bobiatyński. — Warszawa: [s. n.], 2006. — 412 k., [4] k. tabl. złoż.
24. Codello, A. Rywalizacja Paców i Radziwiłłów w latach 1666—1669 / A. Codello // Kwartalnik Historyczny. — 1964. — Rocznik 71, zeszyt 4. — S. 913—930.
25. Jakubowski, J. Archiwum Państwowe W. X. Litewskiego i jego losy / J. Jakubowski // Archeion. — 1931. — T. 9. — S. 1—18.
26. Kutrzeba, S. Historia źródeł dawniego prawa polskiego: w 2 t. / S. Kutrzeba. — Lwów: Wyd. zakł. narod. im. Ossolińskich, 1926. — T. 2. — Cz. 2: Źródła innych praw w Rzeczypospolitej Polskiej obowiązujących. — 462 s.
27. Kutrzeba, S. Akta unii Polski z Litwą 1385—1791 / S. Kutrzeba, W. Semkowicz. — Kraków: Druk. UJ, 1932. — 570 s.
28. Mikulski, W. Dokumenty z archiwum WXL w archiwum warszawskim Radziwiłłów / W. Mikulski// Miscellanea historico-archivistica. — 1997. — T. 7. — S. 71—83.

29. Ptaszycki, St. Gdzie się przechowywały i przechowują obecnie akta unii Litwy z Polską? / St. Ptaszycki // Kwartalnikhistoryczny. — 1902. — RocznikXVI.— Zeszyt 1. —S. 589—591.
30. Ptaszycki, S. Encyklopedia nauk pomocniczych historii i literatury polskiej: w 2 cz. / S. Ptaszycki. — 2-e wyd.— Lublin: nakładem U. Lubelskiego, 1922. — Cz. 1. — 283, V s.
31. Rachuba, A. Księga Metryki Litewskiej w zbiorze Litewskiej Akademii Nauk w Wilnie/ A. Rachuba // Lietuwos Didžiosios Kunigaikštystės istorijos šaltiniai. Faktas. Kontekstas. Interpretacija. — Vilnius, 2007. — S. 182—184.

*Дадатак А*

## Вопіс дакументаў княгіні Кацярыны з Сабескіх Радзівіл (?—1694) з апісаннем комплексу актаў і грамат з дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага. Варшава, 18 ліпеня 1685 г.

*Месца захоўвання і апісанне.* Archiwum Główny Akt Dawnych, Zespół № 354 «Archiwum Radziwiłłów, t. zw. Warszawski», Dział XXVII «Sumariusze i inwentarze archiwów radziwiłłowskich», sygn. 13. Regestr spraw 1685 r. Część I «Regestr spraw Jaśnie Oświeconej X[ięż]nej Jmci Katarzyny z Sobieszyna Radziwiłłowej (zm. 1694 r. 1 v. Zasławskiej) podkanclerzynej i hetmanowej W. X. Lit. etc. etc. dnia 18 Julii roku 1685 sporządzony w Warszawie». S. 1—6 (копія) [9].

Рукапіс, папера, in folio, польская, лацінская мова. Стан захавання здавальняючы. Правы край аркуша пашкоджаны, маюцца сляды ўздзеяння вільгаці, разрывы на тытульным аркушы.

Адзінка захоўвання № 13 уяўляе сабой сшытак in folio, які складаецца з дзвюх частак: 1) вопіс пад назвай «Regestr spraw Jaśnie Oświeconej X[ięż]nej Jmci Katarzyny z Sobieszyna Radziwiłłowej (zm. 1694 r. 1 v. Zasławskiej) podkanclerzynej i hetmanowej W. X. Lit. etc. etc. dnia 18 Julii roku 1685 sporządzony w Warszawie» з апісаннем складу дзвюх скрынь і дзвюх т. зв. шкатул з актамі дзяржаўнага архіва ВКЛ за перыяд канца XIV — першай паловы XVII ст. (першая скрыня, с. 1—6) і важнейшых сацыяльна- і маёмасна-прававых актаў роду Радзівілаў — прывілеяў на пасады, тытулы, землеўладанні (у т. л. староствы), фінансавых дакументаў за перыяд XVI ст. — 1683 г. (s. 6—16); 2) вопіс пад назвай «Regestr spraw przesłanych od X[ięż]nej Jej Mości, które odebrałem od Jego M[oś]ci P[an]a Taszkiewicza […] we Gdańsku dnia 19 Nowembra anno 1684»— вопіс розных, пераважна маёмасна-прававых, фінансавых спраў Кацярыны з Сабескіх Радзівіл (?—1694) за перыяд 1631—1664 гг. (s. 17—24).

Згодна з вопісам аддзела XXVII фонду «Архіў Радзівілаў, т. зв. Варшаўскі» адзінка захоўвання № 13 не мае дакладна вызначаных аўтара і часу стварэння. Вопісы былі створаны ў розны час — адпаведна 18 ліпеня 1685 г. і 19 лістапада 1684 г., маюць розны почырк, маюцца адрозненні ў паперы. Зведзены пад адну вокладку яны былі, верагодна, не раней 1688 г. Аўтар вопісу аддзела XXVII фонду «Архіў Радзівілаў, т. зв. Варшаўскі» Рафал Янкоўскі датуе дадзеную адзінку захоўвання дваякім чынам — XVII ст. і часам пазней 1688 г. [10, s. 44—45]. Другая дата, відавочна, вызначана на падставе запісу на апошняй старонцы рукапісу: «Regestr spraw różnych w szkatułach będących przepisane na nowy regestr przy zrewidowaniu jest tu i regestr osobny J. M. x[ię]dza [Jana Chryzostoma Benedykta Gnińskiego (zm. 1715)], biskupa kamienieckiego ręką pisany, takze insz przepisany na nowy 1688 anno» (с. 25).

Нумарацыя старонак — простым алоўкам у правым верхнім куце аркуша ад 1 да 6, адваротны бок аркуша не пранумараваны.

*Правілы перадачы тэксту.* Тэкст не мадэрнізуецца. Скарачэнні раскрываюцца ў круглых дужках згодна з сучаснымі правіламі арфаграфіі польскай мовы. Вынасныя літа-



ры перадаюцца курсівам. Цітлы не ўзнаўляюцца. Лігатура «ae» раскрываецца (адзіны выпадак ужывання — «Lituaniae», арк. 4). Вялікія літары, знакі пунктуацыі, кустоды захоўваюцца. Пры публікацыі не перадаюцца: 1) падкрэсліванне нумараў ад 1 да 5, якімі нумаруюцца шуфляды і шкатулы ў скрыні; 2) пазначэнне пераносаў слоў праз знак, падобны да «=«. Канец радка пазначаецца адной вертыкальнай рыскай, канец старонкі — дзвюма. Нумары старонак перадаюцца ў квадратных дужках курсівам. Парадкавая нумарацыя дакументаў нададзена пры публікацыі.

7-Reiest spvaw-7 [7]|
1685||*[2]*

**R**egestr **S**praw Iasnie Oswieconey X(ię)zney I(ej) m(oś)ci Katarzyny z| Sobieszyna Radziwiłłowey Podkanclerzyney y Hetmanowey W(ielkieg)*o*| X(ięstw)*a* L(i)tt(ewskieg)*a* etc(etera) etc(etera) d(nia) 18 Iulÿ Roku 1685 sporządzony W Warszawie|

Naprzod Przywileie rozne w skrzyni Wielkiey Okowaney.|

Pod Literą A Liczbą 1mum |

1. Przywiley pierwszy po Rusku pisany w ktorym Caucia Krolewska ze za wycho|dzenie z nim na Woynę Połock Przyłączyc do Litwy obiecuie |
2. Przywiley Drugi pod Literą B: na Vnią Woginiu przez Xięcia Mikołaia |Radziwiła W(ojewo)de Wilenskiego Kanclerza W(ielskieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskieg)*o* Wyprawiony |
3. Przywiley Trzeci pod Literą. C: O Wyprawienie pieszych na Woinę |
4. Przywiley Czwarty pod literą. D. Warunek Stanom Litewskim na Ziazd Trapa|ski,[8] ktory dla pilnych potrzeb złozony był Wolnosciom Ich szkodzic niema |
5. Przywiley Piąty pod Literą E: z Moskwą List do lat dwudziestu |
6. Przywiley pod Literą F: na Statut W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskieg)*o* ze ma bydz[9] Drukowany |
7. Przymierny List pod literą G: z Iwanem Carem Moskiewskim a Krole[m][10]| Zygmontem y Augustem Polskimi do Siedmi Lat. |
8. Przymierny List pod Literą H: Cara Moskiewskiego Fedorowicza z Krolem | I(ego) m(oś)cią Zygmontem pierwszym do lat dwunastu |
9. Przywiley pod Literą I: Zygmonta Trzeciego na potwierdzenie Statutu now[o][11]| poprawionego. |
10. Przywiley pod Literą K: poprywiaiący zamokłe niektore Przywileie | w Prawach W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskieg)*o* |

---

7 *Вялікімі літарамі; так у тэксце, трэба чытаць* spraw.
8 *Так у дакуменце, трэба чытаць* Trabski.
9 *Так у дакуменце, трэба чытаць* być.
10 *Аркуш пашкоджаны, сляды гніення паперы, адна літара ўзноўлена па сэнсу.*
11 *Аркуш пашкоджаны, сляды гніення паперы, адна літара ўзноўлена па сэнсу.*

11. Przywiley pod Literą L: na Statut y Insze Ziemskie Rzeczy po pierwszym | zmaczanym reassumowany |

12. Pod Literą M. List Przymierny Krolewicza Kazimierza z Wielkim | Nowogrodem. |

W szufladzie pod Literą A. Liczbą 2do |

13. Przywiley pierwszy pod Literą A. w ktorym Krol Iagielo[12] pakta Czy|ni z Bratem Swoim z Xiązęciem Litewskim Zygmuntem |

14. Pod Literą B. List Arcibiscupa Fryderyka do P. P(anow). Litewskich | względem Vnyey pisany ||*[3]*

15. Przywiley pod Literą C: w ktorym Vnią Czynią z Xięstwem Litewskim Arcy|biskup Fryderyk y Senatorowie Polscy Co potym Krol Alexander | swoym potwierdził przywileiem |

16. Przywiley pod Literą D: Stephana Krola Polskiego W ktorym nada|ie Wolnosci Wielkiemu Xięstwu Litewskiemu. |

W szufladzie pod Literą A. Liczbą Tertia |

17. Przywiley pod Literą A: list Strony Panow Litewskich na Vnią dany |

18. Przywiley pod literą B: potwierdzenie Praw danych W(ielkiego) X(ięstw)*a* L(i)tt(ewskieg)*o*[13] od Krola Zygmunta | pierwszego |

W szkatule pod Literą A. Liczbą 4tor[14]|

19. Przywiley pod Literą A. w ktorym potwierdzenie wszytkich praw y Wolnosci W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskieg)*o*przez| Krola Augusta. |

20. Przywiley pod Literą B: Deklaratia artykulow …[15] Strony Vniey uczynionych |

21. Przywiley pod Literą C: albo list na Vnią od Krola Augusta |

22. Przywiley pod Literą D: potwierdzenie wolnosci W(ielkiego):X(ięstwa): Litt(ewskiego): od Krola Alexandra.|

23. Przywiley pod literą E: W ktorym Zygmunta Trzeciego przysięga X(ięstwu): Litewskiemu na | wszytkie Wolnosci poniewaź na Electiey iego nie byli.|

24. List na Papierze pod Literą F: na stwierdzenie pokoiu z Moskwą na lat pietnascie od Krola Zygmonta |

25. Przywiley pod Literą G: na Drukowanie Statutu W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskieg)*o* Panu Sapiezie dany. |

26. Pod literą H: Extract z Listu Stanow Koronnych na Vnią. |

---

[12] *Так у дакуменце, трэба чытаць* Iagieło.

[13] *Так у дакуменце, трэба чытаць* W(ielkiemu) X(ięstw)*u* L(i)tt(ewskieg)*mu*.

[14] *Так у дакуменце.*

[15] *Неразборліва адна літара, верагодна,* z.



27. Przywiley pod Literą I: w ktorym Zygmont pierwszy Wolną Electią swoię oznaymuie y…|wa[16] y prawa takze Wolnosci W(ielkieg)*o* X(ięstwa) Litt(ewskiego) potwierdza. |

28. Przywiley pod Literą K: w ktorym Zygmont pierwszy potwierdza prawa y wolnosci X(ięstwa) | Litewskiego od Iagielona Alexandra Witolda Xiąząt Litewskich nadane. |

W szkatule pod literą A. liczbą 5to Ruskie |

29. Przymierny list pod Literą A. Kniazia Moskiewskiego z Zygmontem Augustem do | dwu Lat. |

30. Przywiley pod Literą B: na Sądy Powiatowe |

31. Przymierny list pod literą C. Krolewicza Kazimirza ze Pskowiany |

32. Przymierny list pod literą E[17]: Kniazia Moskiewskiego Iwana z Zygmontem Augustem do pię[ciu lat][18]|

33. Pod literą F: Symeon Xiąze Drucki zapisuie się Krolowi Polskiemu Iagielanowi | ze po Witoldzie inszego Pana nad niego miac niema. |

34. Pod literą. G. List Dimitra Worotynskiego zapisuiącego się z Zamkiem Kozielskim [słu]|zẙc[19] Kazimierzowi Iagielonowiczowi.|

35. Pod literą H. list od boiar dumnych Moskiewskich strony Esstoniey |

36. Pod literą I: Altarz …[20] od Mikołaia Papierza Krolowi Kazimierzowi Iagielonowiczowi |

Pod Literą K ||*[4]*

37. Pod literą K od Grzegorza Papierza breue z Consilium Bazyleyskiego od Władysława | Iagielona. |

38. Pod literą L. od tegoz Papierza tomuz Krolowi breue na odpust zupelny przysmierci |

39. Pod literą M: list od Krola Władysława od Cara Moskiewskie(g)*o* o Smierci Caciley Renaty |

W szufladzie pod literą B: liczbą 1mu(s) |

40. Przywiley pierwszy pod literą A. w ktorym Kredens dwoch Senatorow Li|tewskich do dwoch Senatorow Polskich od Krola na Conciliu(m) przed Seymem | przyiezdzaiących |

41. Przywiley drugi pod literą B. w ktorym Extrakt Vniey z Polską W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* L(i)tt(ewskiego).|

---

[16] *Неразборліва каля 3 літар, магчыма, паўтор слова* pra|wa.

[17] *Так у дакуменце, дакумент пад літарай* D *не ўказаны (прапушчаны?).*

[18] *Далей тэкст не праглядаецца — сыходзіць у месца развароту сшытка, каля 6 літар узноўлена па сэнсу.*

[19] *Тэкст не праглядаецца — сыходзіць у месца развароту сшытка, каля 3 літар узноўлена па сэнсу.*

[20] *Неразборліва каля 9 літар, верагодна,* pertutile.

42. Przywiley Trzeci pod literą C. w ktorym Senatorowie Polscy przypuszczaią do herbow Senatorow Litewskich |

43. Przywiley Czwarty pod literą D: na papirze[21] w ktorym umowa Senatorow Polskich |z Litewskimi o rozgraniczeniu Inflant. |

44. Przywieley Piąty pod literą E: w ktorym plenipotentia Alexandra X(ięcia). L(itewskiego). dana Posłom |

45. Przywiley szosty pod literą F: w ktorym Zygmont pierwszy nadaie Szlachcie Litew|skiey wolnosci w dobrach ich dziedzicznych naksztalt szlachty Polskiey |

46. Przywiley Siodmy pod literą. G: w ktorym Krol Zygmont Trzeci potwierdza postanowio|ny posah od Stephana Krola Krolowey Annie |

W szufladzie pod literą B. liczbą 2do|

Wszytkie Przywileie Ruskie ktorych przeczytac nie mozno |

W szufladzie pod literą B. liczbą 3tio |

47. Przywiley pierwszy pod literą A. w ktorym potwierdzenie praw PP(anom) Litewskim od Krola | Augusta. |

48. Przywiley wtory. pod literą B. to iest list Panow Koronnych na Seymie Lubelskim na Vnią dany. |

49. Przywiley Trzeci pod literą C. w ktorym Compromis Krola Augusta na potwier|dzenie wszytkich praw y wolnosci W(ielkiemu) X(ięstwu) Litewskiemu. |

W szufladzie Pod literą B. liczbą 4to |

50. Przywiley pierwszy Władysława Iagiellona Zygmuntowi Bratu na Wilno y Inne Litew|skie Miasta Sam tylko sobie tytuł Supremi Principis Lituaniae Za|chowuiąc y po iego Smierci ad filios Suos Vladysłaum et Cazimiru(m) | Eundem Ducatum Excepiendo na ktorym iest Litera A. |

51. Przywiley drugi pod literą B: w ktorym posłowie z Litwy na Piotrkowskim Seymie | na Electią Alexandra Krola Wysłani unią Vmawiaią |

W szufladzie pod literą B: liczbą 5to|

52. Przywiley pod literą A w ktorym Electia Krola Alexandra w Piotrkowie przy Po|słach W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* L(i)tt(ewskieg)*o*|

53. Przywiley pod literą B: Krola Augusta Stanowienie Vniey |

54. Przywiley pod literą C Krola Kazimierza Iagielona Syna na prawa W(ielkiemu) X(ięstwu) Litewskiemu[22]||*[5]*

55. Przywiley pod Literą D. W ktorym Krol Stefan waruie posag Zenie Swey Annie |

[21] *Так у дакуменце, трэба чытаць* papierze.

[22] *Слабакантрасна.*



W szufladzie pod literą C liczbą 1mum |

56. Przywiley pod literą A w ktorym Krol August ratificuie Vmowioną unią na Ziezdzie | Parczowskim |

57. Przywiley pod literą B. w ktorym Zygmont Xięstwa Litewskie(g)*o* Z Senatorami Polskiemi | ligę bierze przeciwko X(ię)ciu Swidrygiełowi w młodosci Władysława Iagie|lonowego Syna. |

58. Przywiley pod literą C. gdzie deputaci Polscy na ziezdzie z Deputatami Litewskie|mi zgadzaią się o rownym wydzieleniu Inflant |

59. Przywiley pod literą D. w ktorym rozni Panowie Polscy przyimuią roznych do | herbu Panow Litewskich |

60. Pakta pod literą E. w ktorym zawieraią się miedzy Władysławem Iagielonym y Zy|gmontem Bratem Xiązeciem Litewskim iakimi Sposobami Litwa do Po|lski nalezyc ma. |

W szufladzie pod literą C: liczbą 2do |

61. Przywiley pierwszy pod literą A. Krola Zygmonta pierwszego w ktorym dla obrania Zy|gmonta Augusta Syna za X(ię)cia Litewskiego wszytkie przywileie y Wolnosci | W(ielkiemu) Xięstwu Litewskiemu Confirmuie y approbuie.|

62. Przywiley Drugi pod literą B. intytułowany Extrakt Przywileiu Krola Augusta na Vnią |

63. Przywiley Trzeci pod literą C. krola Władysława Iagielonowicza w ktorym potwierdza | …[23] Swego Iagielona zawarł przymierza z Zygmontem Stryiem X(ięciem) Litewskim.|

64. Przywiley Czwarty pod literą D. w ktorym Zygmont pierwszy potwierdza Litewskie…[24]| Wolnosci wszytkie ktore mieli ich Antecessorowie. |

65. Oblig pod literą E. Władysława Iagielona Krola dany Alexandrowi Witoldowi | na pientsed Rublow. |

66. Przywiley pod Literą G[25]: w ktorym Krol Władysław za Consensem Zygmonta | X(ię)cia L(itewski)ego Kosciołom nadane y Szlachcie Wiary Katholickiey rozne Wolnosci |

67. Przywiley pod literą H. W ktorym wolnosci nadaie Krol Iagieło tym ktore y z Po|ganstwa wiarę Chrzescianską przyimowali |

W szkatule pod Literą C liczbą 3tio |

68. Przywiley pod literą A. Konfirmatia Krola Stephana praw wszytkich W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskiego) |

69. Przywiley pod literą B: tegoz Krola y Anny zony iego na prawa temuz Xięstwu |

[23] *Неразборліва каля 4 літар, тры апошнія …*ydz.

[24] *Слабакантрасна каля 2 літар, магчыма,* Litewskiemu.

[25] *Так у дакуменце, дакумент пад літарай* F *не ўказаны (прапушчаны?).*

70. Przywiley pod literą C. w ktorym Zygmąt pierszy synowi Augustowi zleca urzędy Litewskie | w Brzesciu |

71. Przywiley pod literą D. w ktorym Zygmąt Synowi Augustowi spuszcza urzędy W(ielkieg)*o* X(ięstw)*a* Litt(ewskiego) Ca…[26]|

72. Przywiley pod literą E: w ktorym stany Litewskie daią plenipotentią swoim Traktowa|nia na Seym o Vniey. |

Przywiley pod Literą F.[27]||*[6]*

73. Pryzwiley pod literą F. w ktorym Krol Zygmont przy Electiey Augusta Syna za X(ięcia) [Litewskiego] | potwierdza prawa roznym osobom partykularnym wlosci nadaie. |

74. Przywiley pod literą G: w ktorym się iednoczy Wladysłław Iagielo z Zygmontem | Bratem X(ięciem) L(itewskim). przeciwko wszelkim nieprzyiaciołom |

W szufladzie pod literą C. Liczbą 4to |

75. Sama Xięga Axamitna ze Srebrną puszką Grubą y z przykrywatkiem w tey | Xiędze wszytkie przywileie W(ielkieg)*o*X(ięstw)*a* L(i)tt(ewskieg)*o* ktore in particulari są, zawiera|ią się Generalnie od Krola Augusta. |

W szufladzie pod literą C: liczbą 5to |

Same tylko przywileie Ruskie ktorych przeczytac nie mozno.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 06.06.2015*

[26] *Неразборліва каля 3 літар.*
[27] *На ніжнім полі справа.*



***З. В. Антановіч,***
*дацэнт кафедры крыніцазнаўства гістарычнага факультэта БДУ,*
*кандыдат гістарычных навук;*
e-mail: zinantonowicz@gmail.com

## ІНВЕНТАР ЛАЗАВІЦКАГА РЫМСКА-КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА ЗА 1864 г.

У архіўных установах Беларусі на дадзеным этапе захоўваецца значны аб’ём матэрыялаў дзейнасці рымска-каталіцкай царквы. Найбольшым попытам даследчыкаў карыстаюцца інвентары і візіты кляштараў і касцёлаў, якія рознабакова характарызуюць стан маёмасцей каталіцкага духавенства і колькасць святароў. Азначаныя віды дакументаў адносяцца да спецыяльнай справаводнай дакументацыі рымска-каталіцкіх кансісторый, з якіх дзве — Магілёўская і Мінская, на чале з арцыбіскупам і біскупам адпаведна ажыццяўлялі адміністрацыйна-тэрытарыяльнае кіраўніцтва і духоўны суд на тэрыторыі, у тым ліку беларускіх губерняў Расійскай імперыі. Пры гэтым адным з напрамкаў дзейнасці царквы з’яўляўся фінансава-маёмасны ўлік, які праводзіўся шляхам інвентарызацыі або люстрацыі маёмасці, што набывала пераважна планавы характар згодна са структурным будаўніцтвам канфесіі і цэнтралізаванасцю сістэмы яе кіравання. У выніку яе правядзення ствараліся два віды дакументаў: інвентары і візіты. Галоўным адрозненнем паміж інвентарамі і візітамі вылучаецца акцэнтаванне ў першых — фінансава-маёмаснага стану кляштара або касцёла, а ў другіх — пастырскай дзейнасці святароў. Візіты падзяляюць на генеральныя (належалі кампетэнцыі візітатара) і пастырскія (дэканскія). Рэвізіі ў межах дэканатаў праводзіліся пробашчамі або дэканамі, хаця афіцыйна пастырская візіта ўваходзіла ў сферу кампетэнцыі біскупа, які праводзіў падчас яе абрад бежмавання. Яны адбываліся штогод цалкам або часткова па касцёлах дэканатаў, прычым пэўны прыход наведваўся біскупам не менш як адзін раз у пяць гадоў. Вынікі люстрацыі фарміраваліся ў асобныя справы аднаго касцёла або па дэканатах. Пры гэтым непасрэдна інвентары сустракаюцца радзей за візіты.

Нягледзячы на тое што азначаныя комплексы дакументаў запатрабаваны гісторыкамі, мастацтвазнаўцамі і даследчыкамі шэрагу спецыяльных гістарычных дысцыплін [2; 3; 9; 10], пераважна па-за іх увагай застаюцца справы аб рамонце, ліквідацыі касцёлаў і капліц, а яшчэ менш запатрабаванымі — справы аб перамяшчэннях святароў. Гэта звязана, у першую чаргу, з адсутнасцю тэматычнай распрацоўкі гэтых спраў для вылучэння і апісання ў іх складзе каштоўных відаў дакументаў, што садзейнічала б паспяховасці зваротаў карыстальнікаў да рэтраспектыўнай дакументнай інфармацыі.

Пераважна пры перамяшчэннях святароў складаліся вопісы маёмасцей, аднак, зыходзячы з мэты складання і структуры, інвентары з’яўляліся таксама прываблівым відам дакументаў для афармлення прыёму-перадачы маёмасцей прадстаўніцтваў царквы паміж духавенствам. У сярэднім яго асабісты склад змяняўся кожныя 6—7 год да паўстанняў 1830-х гг. і асабліва — 1863—

1864 гг., калі ратацыя адбылася ў выніку арыштаў і высылкі святароў амаль на $^{1}/_{3}$ [1]. Гэта таксама закранула Лазавіцкі касцёл Клімавіцка-Мсціслаўскага дэканата. Гэты касцёл быў пабудаваны з дрэва на каменным фундаменце ў 1752 г. на сродкі палкоўніка польскіх войск М. Кіркора. Парафія не вылучалася з іншых па колькасці прыхаджан, таму пры размеркаванні іх на класы ў 1844 г. была аднесена да 4-га (1030 прыхаджан і 275 руб. штогадовага ўтрымання з Чэрыкаўскага казначэйства) [4, арк. 177 адв.]. У 1854 г. з'яўляюцца звесткі аб прыналежных капліцах у м. Хацімск, фальв. Янава, маёнт. Забялышына і в. Свірэль, а колькасць прыхаджан за 10 год павялічылася да 1099. Пры гэтым у 1846 г. скончыўся разбор прыхаджан з праваслаўным духавенствам, што дазваляе меркаваць аб большым складзе парафіі ў прамежкавы перыяд. Акрамя таго, паводле пададзеных звестак у архіве Магілёўскай кансісторыі захоўвалася справа аб яго пабудове [6, арк. 28 адв.—29]. Нягледзячы на пэўнае развіццё парафіі, спробы пабудаваць каменны касцёл скончыліся няўдала. Найбольшы ўнёсак у яго падтрыманне належыць ксяндзу Францішку Луба (нар. каля 1818 г., шляхецкага паходжання), які атрымаў адукацыю ў Драгічынскім вучылішчы і Беластоцкай гімназіі. Пасля заканчэння апошняй у 1839 г. навучаўся ў Віленскай дыяцэзіяльнай семінарыі, а затым — духоўнай акадэміі ў Санкт-Пецярбургу. У 1846 г. заняў пасады настаўніка Закону Божага ў Магілёўскай губернскай гімназіі, павятовым вучылішчы і двух дзявочых пансіёнах, а таксама ў прытулку [7, арк. 60—61; 8, арк. 87—88]. З 1849 г. Ф. Луба стаў пробашчам Лазавіцкага касцёла. Сваю дзейнасць ён пачаў з прашэння да мітрапаліта І. Галавінскага аб перабудове касцёла, аднак дазволена было толькі яго адрамантаваць у 1852 г. У наступныя гады быў адрамантаваны і пафарбаваны фундамент і сцены, зроблены драўляныя амбон, два канфесіяналы і восем лаў, перароблены арган. Перабудова касцёла скончылася ў 1854 г., калі ён быў асвечаны мясцовым дэканам Феліксам Іваноўскім [5, арк. 23—24]. У наступным годзе, у тым ліку дзякуючы поспехам у кіраўніцтве касцёлам, Ф. Луба стаў клімавіцка-мсціслаўскім дэканам, а з прызначэннем у Талачынскі касцёл у 1860 г. заняў месца магілёва-капыскага, дзе пад яго кіраўніцтвам адбыўся шэраг адміністрацыйна-тэрытарыяльных рэарганізацый [6, арк. 10—13, 24 адв.—25, 50—58; 7, арк. 60—61; 8, арк. 87—88]. Пасаду Ф. Луба ў Лазавіцкім касцёле ў 1860-я гг. займаў Юзаф Тамашэўскі (нар. каля 1820 г., шляхецкага паходжання), лёс якога таксама склаўся цікава. Ён атрымаў адукацыю ў Трашкунскім дваранскім вучылішчы, Віленскай і Магілёўскай рымска-каталіцкіх семінарыях. Рукапакладзены ў 1844 г. і прызначаны вікарыем Аршанскага касцёла. У 1845 г. Ю. Тамашэўскі стаў настаўнікам лацінскай мовы ў Аршанскім дваранскім вучылішчы, адкуль перамешчаны на пасаду пробашча Севастопальскага ваеннага касцёла і капелана Чарнаморскага флоту. У 1854 г. пры аблозе Севастопаля атрымаў агнястрэльнае раненне галавы і быў кантужаны. Па стане здароўя да 1858 г. пражываў у г. Арол, а затым быў прызначаны ў Санкт-Пецярбургскі касцёл св. Кацярыны. У 1860 г. заняў пасаду эканома рымска-каталіцкай акадэміі, адкуль быў



перамешчаны ў Лазавіцкі касцёл [7, арк. 204—215; 8, арк. 143—146]. Тут ён працаваў падчас паўстання 1863—1864 гг. Таму менавіта Ф. Луба было даручана кантраляваць прыём-перадачу касцёла. Справа супраць Ю. Тамашэўскага была ініцыіравана ў студзені 1864 г., калі Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыяй з канцылярыі галоўнага кіраўніка Магілёўскай губерні М. М. Мураўёва было атрымана паведамленне, што згаданы святар, які займаў пасаду пробашча Лазавіцкага касцёла, быў прызнаны палітычна нядобранадзейным і «заўважаны ў варожых дзеяннях супраць праваслаўнай царквы», за што з яго належала спагнаць 100 руб. [5, арк. 1—1 адв.]. Гэта было распаўсюджанае абвінавачанне ў дачыненні рымска-каталіцкага святарства, якое каралася спагнаннем, высылкай у аддаленыя рэгіёны Расійскай імперыі і пазбаўленнем правоў ажыццяўлення душпастырскай дзейнасці. У дачыненні Ю. Тамашэўскага дзяржаўныя ўлады першапачаткова абмежаваліся спагнаннем. Яго планавалася перамясціць на пасаду вікарыя Мсціслаўскага касцёла, аднак у хуткім часе кіраўніцтвам губерні было прынята рашэнне таксама аб яго высылцы ў Пермскую губерню пад надзор паліцыі [5, арк. 6—7 адв.]. Цікавая рэакцыя святара на абвінавачанні. У сваім рапарце ў кансісторыю Ю. Тамашэўскі сведчыў сваю нявіннасць і абвінавачваў ваеннага кіраўніка Клімавіцкага пав. Батурына ў тым, што апошні помсціў асабіста святару. Нягледзячы на гэта, ён цалкам прымаў пакаранне і, улічваючы, што высылаўся без пазбаўлення правоў на правядзенне набажэнтва, Ю. Тамашэўскі прасіў дазвалення ўзяць з сабой адзін прыбор для літургіі з касцёла пад распіску ў сувязі з тым, што ў месцах высылкі адсутнічаюць магчымасці для правядзення набажэнстваў [5, арк. 9].

Пасля паведамлення Магілёўскай кансісторыі рашэння дзяржаўных улад клімавіцка-мсціслаўскаму дэкану Марціну Гарлеўскаму было прадпісана Магілёўскай рымска-каталіцкай кансісторыяй абавязаць перамяшчаемага святара скласці інвентар касцёла на падставе храналагічна апошняга і адлюстраваць у ім усе адбыўшыеся змены ў маёмасці касцёла [5, арк. 3, 7 адв.]. На месца Ю. Тамашэўскага адміністратарам быў прызначаны малады святар Ян Даўгяла. Ён паходзіў са шляхецкай сям'і (нар. каля 1831 г.). З 1847 г. навучаўся ў Расіенскім павятовым 5-класным вучылішчы Ковенскай губ., а ў 1852 г. паступіў у мінскую рымска-каталіцкую семінарыю. Пасля рукапалажэння ў 1857 г. прызначаны вікарыем Магілёўскага архікатэдральнага касцёла, у 1860 г. перамешчаны ў Чачэрскі касцёл, а ў 1861 г. — Мсціслаўскі [7, арк. 58—59; 8, арк. 159—160]. Менавіта ім была пастаўлена пад сумніў дакладнасць вядзення фінансавай праваздачнасці папярэднікам. Так, Я. Даўгяла настойваў, што М. Гарноўскай было адпісана на карысць касцёла 200 руб., а не 50, як сведчыў Ю. Тамашэўскі [5, арк. 12]. Высвятленне абставін і прыняцце рашэння было таксама ўскладзена на дэкана М. Гарлеўскага (нар. каля 1820 г., шляхецкага паходжання), хаця звычайна падобныя пытанні разглядаліся кансісторыяй [5, арк. 18—18 адв.]. Гэта было абумоўлена, па-першае, неабходнасцю хуткага выканання прадпісанняў органаў дзяржаўнай улады аб высылцы святара, а па-другое, ква-

ліфікаванасцю дэкана. Так, ён узначаліў дэканат з 1860 г. Навучаўся ў Гродзенскай губернскай гімназіі і Мінскай рымска-каталіцкай семінарыі, пасля заканчэння якой у 1845 г. паступіў у Санкт-Пецярбургскую акадэмію, дзе атрымаў званне кандыдата св. багаслоўя. У 1849 г. рукапакладзены з прызначэннем настаўнікам лацінскай і нямецкай моў пры Сестранцэвіцкім вучылішчы. У 1853 г. заняў месца настаўніка Закону Божага ў будаўнічым кадэцкім корпусе, адкуль быў пераведзены ў 1854 г. на аналагічную пасаду ў Мсціслаўскае дваранскае вучылішча і з 1855 г. М. Гарлеўскі прызначаны адміністратарам мясцовага касцёла [8, арк. 147—148]. Ім, на падставе прадстаўленых звестак, было высветлена, што не маючы даходу ад агарода, Ю. Тамашэўскі з атрыманых грошай аплаціў 1% урадавага збору (25 руб. 25 кап.), аб чым прадставіў адпаведны квіток, а таксама аплаціў выраб драўляных свечак на пружынах (24 руб.). З уласных даходаў ксяндзом было выдзелена 100 руб. у бягучым годзе на тры брамы па 20 руб. кожная [5, арк. 12—12 адв.]. Для прыпынення далейшых прэтэнзій дэканам было вырашана таксама дадаць да інвентару найбольш значныя дакументы: пасведчанне клімавіцка-мсціслаўскага дэкана Ф. Іваноўскага аб асвячэнні адрамантаванага Лазавіцкага касцёла ад 15 снежня 1854 г., а таксама суправаджальны ліст і копію рашэння Клімавіцкага павятовага суда ад 13 студзеня 1855 г. аб звароце касцёлу зямлі, занятай памешчыкам Балашовым ад 2 ліпеня 1856 г. [5, арк. 29—30].

Інвентар быў падрыхтаваны ў кастрычніку 1864 г. У мэтах аптымізацыі тэрмінаў ён афармлены на паперы без філіграней. Дакладнасць завяралася адбіткам пячаткі дэкана ў правым верхнім кутку аркушаў. У адпаведнасці з нарматыўнымі актамі Расійскай імперыі інвентар Лазавіцкага касцёла складзены на рускай мове са значнай колькасцю паланізмаў пры апісанні гаспадаркі і лацінізмаў у дачыненні літургічных прадметаў. Структура разглядаемага дакумента традыцыйна падзяляецца на тры часткі (уводная, асноўная і заключная). Пры гэтым маюцца пэўныя асаблівасці, абумоўленыя мэтамі складання і складальнікамі. Так, уводная частка абмежавана толькі звесткамі пра час яго складання, а месца знаходжання і кароткая гісторыя касцёла выкладзена ў першым раздзеле асноўнай часткі — «Касцёл». Тут жа акцэнтаваны шляхам нумарацыі кожнай паасобку змены, якія адбыліся пад кіраўніцтвам Ф. Луба, што падкрэслівае выдзяленне складальнікам інвентару яго асабістай ролі ў дзейнасці касцёла і нехарактэрна для звычайных інвентароў і візіт. Далей прадстаўлены ў выглядзе табліц пералікі кніг, штучных кветак, арнатаў, бялізны, дываноў, срэбра і золата, харугваў і катафала, якія знаходзіліся ў касцёле. Кожная з табліц складалася з трох граф, дзе пералічваліся нумар па парадку, найменне прадмета і колькасць. У адрозненне ад традыцыйных інвентароў адсутнічае пазначэнне колькасці алтароў у касцёле, а таксама апісанне прэзбітэрыума (хору). У трэцім раздзеле характарызуюцца гаспадарчыя пабудовы (будынкі плябані, прыналежных зямель, багадзельні і могілкі). Пры гэтым адзначана іх трухлявасць і адсутнасць фундушоў на ўтрыманне.



Падставай для чацвёртага раздзела, паводле пазначэння складальніка, выступіў інвентар 1849 г., на падставе якога прымаў рэчы Ф. Луба. Ён таксама складзены ў выглядзе аналагічных табліц: адзенне святара, бялізна, бляха, жалеза, драўляныя рэчы, шкло. Каштоўныя рэчы са срэбра, волава, медзі і бронзы апісаны ў больш падрабязных табліцах, уключаючы іх пробу, вагу ў фунтах і лоты. Імі карысталіся святары падчас набажэнстваў. Апісанне зроблена дэталізавана для адрознення кожнай з рэчаў. Усяго пазначана 324 прадметы, з якіх 129 (40%) належалі да каштоўных. Звесткі пра парафію, вылучаныя ў пяты раздзел, уключаюць памежныя парафіі, чатыры капліцы і матэрыял, з якога яны пабудаваны, наяўнасць іх фінансавага забеспячэння і колькасць прыхаджан (925 чалавек). У бібліятэцы (шосты раздзел) захоўваліся старажытныя кнігі на розных мовах у неразабраным выглядзе (80), а таксама архіў касцёла. Літаратура не апісана, а сярод архіўных дакументаў пазначаны без указання колькасці метрычныя кнігі аб народжаных (з 1768 г.), шлюбаваных (з 1770 г.) і памерлых (з 1764 г.) амаль з моманту заснавання касцёла, а таксама спісы прыхаджан. Па адной кнізе было з указамі, відавочна, Магілёўскай кансісторыі, а таксама ўліку добраахвотных ахвяраванняў прыхаджан. Тут таксама пазначана колькасць царкоўных кніг, якія не трапілі ў папярэдні пералік. Далей пазначаны званы, апісанне якіх традыцыйна змяшчаецца ў першым раздзеле, а таксама жывёла і хатнія птушкі, якія звычайна адлюстроўваюцца пры апісанні гаспадаркі. Рэчы плябані складаюць сёмы раздзел. Да іх ліку таксама складальнікам аднесены гумно, кацялок для таплення воску, казённая і касцёльная пячаткі. У заўвагах пазначаны струхлеўшыя з 1849 г. рэчы, а таксама адсутныя жывёлы.

Да інвентаруададзены распіска ў перадачы і прыманні касцёла ад 16 кастрычніка 1864 г., а таксама два завяральныя запісы. Першы з іх быў з пазначэннем колькасці аркушаў (восем) і завярэннем пячаткай дэкана, а другі — са спасылкай на ўказ Магілёўскай кансісторыі аб перадачы маёмасцей касцёла Я. Даўгяла і замацаванне подпісам дэкана факта перадачы.

Такім чынам, уласцівасці інвентару Лазавіцкага касцёла звязаны ў першую чаргу з абставінамі яго складання і незапланаванасцю рэвізіі, што абмяжоўвала складальніка ў тэрмінах. Так, мэтай інвентарызацыі было не рэвізаванне фінансава-маёмаснага стану прадстаўніцтва каталіцкай царквы, а перадача адказнасці за яго ад аднаго святара іншаму. Таму дадзены інвентар складзены святаром касцёла, а не ўпаўнаважанай асобай з ліку вышэйшага кліру. Пры гэтым кантроль правільнасці афармлення і дакладнасці пададзеных звестак ускладаліся на дэкана. Сярод знешніх прыкмет інвентару Лазавіцкага касцёла вылучаецца завярэнне паперы толькі адбіткам пячаткі дэкана. Непасрэдна ў структуры інвентару можна вылучыць некалькі ўласцівасцей. Так, у параўнанні з традыцыйнымі тут скарочаны ўводзіны. У асноўнай частцы прадстаўляецца магчымасць прасачыць змены ў маёмасным стане касцёла на працягу 20 год. Пры гэтым акцэнтуецца роля Ф. Луба ў яго развіцці. Акрамя таго, адсутнічае апісанне алтароў і хору, хаця ў касцёле меўся арган, а таксама фундушоў з-за іх

адсутнасці. Цікава, што парушана структура асноўнай часткі: разарваны звесткі аб гаспадарчых пабудовах (трэці раздзел) і непасрэдна гаспадарцы (пасля шостага раздзела), апісанне плябані (трэці раздзел) і рэчаў у ёй (сёмы раздзел). У заключнай частцы маюцца два завяральныя запісы і распіска новапрызначанага святара аб наяўнасці ўсіх пазначаных у інвентары рэчаў, што набліжае азначаны дакумент да акта прыёму-перадачы маёмасці. Таму інвентар Лазавіцкага касцёла цалкам дазваляе характарызаваць яго складаны фінансава-маёмасны стан і адлюстроўвае бясспрэчную каштоўнасць гэтага віду крыніц для шырокага кола даследчыкаў, нягледзячы на складанасці іх выяўлення.

Тэкст перадаецца па сучасных правілах арфаграфіі з захаваннем сінтаксічных, стылістычных і моўных асаблівасцей, а таксама структуры арыгіналу. Скарочаныя словы раскрываюцца ў квадратных дужках.

**Інвентар Лазавіцкага рымска-каталіцкага касцёла, 1864 г.** [5, арк. 23—29][*]

[Арк. 23] Инвентарь Лозовицкого римско-католического приходского костела равно плебании и принадлежащих к оному строений составлен 1864 года[**].

<u>Костел</u>[***]

Лозовицкий римско-католический приходской костел состоит в местечке Лозовице Могилевской губернии Климовицкого уезда, деревянный в 1752 году построенный полковником войск польских Киркором[****] на каменном фундаменте. Костел сей был поддержан в 1828 году заботливостью и издержками г[оспод] Станислава и Регины Комар, бывших предводителей дворянства Климовицкого уезда. Но после сего костел сей вновь пришел к ветхости, о чем было настоятелем ксендзом Лубо[*****] доносимо епархиальному начальству ныне покойному митрополиту Головинскому[******]. В следствие того, вместо предполагаемой настоятелем кс[ендзом] Лубо постройки нового каменного костела,

[*] Дакумент напісаны на белай паперы без філіграней, заверанай адбіткам пячаткі дэкана ў левым верхнім кутку аркушаў. У правай ніжняй чвэрці апошняга аркуша (арк. 30) змешчана сургучная пячатка дэкана чырвонага колеру, якой замацаваны белыя шнуры, сшываючыя аркушы дакумента. Дзве кроплі сургуча дыяметрам 0,8 і 0,6 см паслядоўна змешчаны на адвароце апошняга аркуша пад вуглом каля 30° у бок яго левай верхняй часткі ад сярэдзіны пячаткі. Справа пранумаравана валавым парадкам у верхнім правым кутку аркушаў, для замацавання пагінацыі выкарыстана напісанне ў цэнтры аркушаў фрагментаў (па дзве—тры літары) пасады і рангу асобы, адказнай за фарміраванне справы — загадчыка стала губернскага сакратара У. Елісевіча. Палі па 1—2 мм з усіх бакоў адзначаны простымі рыскамі атрамантам, аналагічным дакументу. Напісаны цёмна-карычневым атрамантам, адным почыркам на рускай мове.

[**] Аддзелена ад наступнага тэксту гарызантальнай рыскай.

[***] Тут і далей — падкрэслена ў тэксце дакумента тым жа атрамантам.

[****] Маецца на ўвазе М. Кіркор.

[*****] Тут і далей маецца на ўвазе былы пробашч касцёла Ф. Луба.

[******] Тут і далей маецца на ўвазе Магілёўскі арцыбіскуп, мітрапаліт Ігнаці Галавінскі.



при обстоятельствах тогдашних проект несостоялся, и митрополит Головинский при всех усилиях не успел испросить разрешения для построения нового каменного костела, но лишь только исходатайствовал починку оного, которая и последовала на основании высочайшагоповеления изъясненного в отношении к его высокопреосвященству г[осподина] министра внутренних дел от 24 октября 1852 года за № 2599. За сим же дозволением при пособии 500 рублей серебром из ремонтного капитала при помощи бывшего предводителя Климовицкого уезда помещика Александра Голынского, равно же помещицы того уезда Марьи Горновской и многих других лиц, костел во все упадающий приведен в следующее положение, а именно:

1. В 1853 и 1854 годах весь костел был подважен[*] и дан под ним равно и всем строением каменный фундамент
2. Стены костела взяты в клямры[**] железные
3[е].[***] Внутри и снаружи обшит шалевкой[****], которая так снаружи [Арк. 23 адв.], как и внутри покрыта маслинной краской[*****], т. е. снаружи под серый цвет, а внутри под белый, блейвасовой краской[******], исо шпаклевкой[*******]
4. Покрыт с берестою гонтом[********] и выкрашен олейной краской под цвет кирпичный, а в 1859 году в другой раз для прочности перекрашен издержками настоятеля кс[ендза] Лубо
5. Сделан новый амбон[*********] из ольхового дерева под политуру[**********]
6. Сделано 8 лавок и два конфессионала[***********] тоже с ольхового дерева, но покрыты лаком и вновь переделаны коштом настоятеля ксендза Лубо
7. Вновь переделан орган о трех мехах и десяти голосах органмейстером Иваном Богушевичем
8. В целом костеле дан новый пол на каменных штандарах[************] и выкрашен маслинной краской, а в 1859 году издержками настоятеля ксендза Лубо во второй раз перекрашен для прочности и чистоты

[*] Падважыць — прыпадняць.

[**] Клямра (дужка) — жалезная пласціна, якой замацоўваюцца жалезныя лісты падчас будаўніцтва.

[***] Так у тэксце.

[****] Шалёўка — тонкая дошка (не больш 1 см таўшчынёй), якая выкарыстоўвалася для абшыўкі будынка.

[*****] Маецца на ўвазе — масленая (алейная) фарба.

[******] Блейвасавая фарба (блейвейс) — свінцовыя бялілы.

[*******] Шпатлёўка (шпаклёўка) — пастападобная замазка, прыгатаваная на алеі або клеі.

[********] Гонт — кароткія тонкія дошкі для пакрыўкі дахаў.

[*********] Амбон — узвышэнне каля алтара ў касцёле для чытання Евангелля і прамовы казанняў.

[**********] Палітура — лак, які выкарыстоўваецца для паліравання прадметаў.

[***********] Канфесіянал — спавядальня ў касцёле.

[************] Штандара (штандар) — адна з дубовых свай, загнаных у зямлю пад зрубам замест падмурка.

| | | |
|---|---|---|
| 9. | Цымбориум[*] на Великом престоле бывшее прежде крашено только простой краской, ныне сделано под мат золотом на белом тле[**], равно тоже и восемь реликвиар[***] отделаны в подобный способ заботливостью и издержками ксендза Лубо | |
| 10. | Вокруг костела целого дана деревянная ограда в штахет[****] и выкрашена маслинной краской, а в 1859 году оная ограда заботливостью настоятеля кс[ендза] Лубо вновь перекрашена для прочности | |
| 11. | Костел Лозовицкий после переделки, освящен был под прежним наименованием Пресвятой Троицы чрез Климовицко-Мстиславского декана Феликса Ивановского /utidelegatus[*****]/ в 1854 году месяца декабря 15$^{o}$ дня в присутствии духовенства и народа | |
| 12. | Костел сей состоит в середине местечка Лозовицы. С фронта имеет он две башни с крестами и железными цепями. Сзади сего костела находится маленькая башня с крестом железным. Фасад Лозовицкого костела и вся наружность оного в ничем не изменилась, и потому имеет он длины 32½ арш[ина]. Ширины 17½ аршин. Иконы в костеле [Арк. 24] сем теже самые, но только к четырем иконам, а именно: к Пресвятой Богородице, к Распятию Иисуса Христа, к Св[ятому] Апостолу Фадею и к Св[ятому] Антонию, сделаны новые рамы под мат крытые золотом. Старые же рамы от Пресвятой Богородицы и Распятия приделаны к иконамСв[ятых] Петра и Павла, которые находятся на стене в презбитериум[******] | |
| | Книги | Штук |
| 1. | Мшал[*******] новый один | 1 |
| 2. | Мшал старый один | 1 |
| 3. | Каноны[********] к трем престолам[*********] в чечетковых рамах за стеклом | 9 |
| | Цветы | |
| 1. | Цветы сделаны из воска, в четырех больших вазонах[**********] из саксонской старинной порцеляны[***********], штук вместе с цветами | 8 |
| 2. | Цветы в меньших двух вазонах с украшениями сделаны под чугун, всего вместе с цветами штук четыре | 4 |

[*] Цымборыум — даразахавальніца.
[**] Маецца на ўвазе — аснове.
[***] Рэлiквіяр — гэта скрыня або іншы прадмет для захавання рэліквій.
[****] Штакет (штахет) — вузкія драўляныя планкі для агароджы.
[*****] «У якасці ўпаўнаважанага» (пераклад з лацін.).
[******] Прэзбітэрыум (лацін.) — прастора паміж нефам і алтаром.
[*******] Мшал (місал) — кніга з малітвамі і спевамі для правядзення набажэнстваў.
[********] Канон — збор палажэнняў нарматыўнага характару.
[*********] Прастол — галоўная прыналежнасць алтара хрысціянскага храма.
[**********] Вазон — гаршчок для кветак.
[***********] Парцэлян — фарфор.



| | | |
|---|---|---|
| 3. | Цветы привезенные из Парижа помещицей Антониной Голынской в вазонах порцеляновых, всего с цветами четыре | 4 |
| 4. | Тоже помещица Голынская пожертвовала подсвечников больших четыре накладного серебра | 4 |
| | Орнаты | |
| 1. | Орнатов разного цвета штук пять | 5 |
| 2. | Капа белого цвета материальная одна | 1 |
| | Белье | |
| 1. | Альб[*] перкалевых[**] штук шесть | 6 |
| 2. | Комж[***] перкалевых штук шесть | 6 |
| 3. | Пурификаторов[****] изголландского полотна двенадцать | 12 |
| 4. | Гумералов[*****] перкалевых штук шесть | 6 |
| 5. | Корпораловиз полотна голландского штук шесть | 6 |
| 6. | Тувальней[******] перкалевых, обшитых разными узорами шидельковой работы на канве, штук /шесть/[*******] семь | 7[********] |
| | [Арк. 24 адв.] Ковры | |
| 1 | Ковров к ступеням алтарей штук три | 3 |
| 2 | Сукон к ступеням алтарей красных тонких три и одно старое. Всего штук четыре | 4 |
| | Серебро и золото | |
| 1. | Чаш серебряных 12 пробы штук две | 2 |
| 2. | Пушка[*********] серебряная вызолоченная одна | 1 |
| 3. | Ампулок с подносом накладного серебра штук три | 3 |
| 4. | Турибулюм[**********] с лодкой накладного серебра штук всего две | 2 |
| 5. | Крест с деревом Св[ятого] Креста бронзовый позолоченный один | 1 |
| | Хоругвей[***********] | |
| 1 | Хоругвей голубых с шитьем на канве иконами шт[ук] две | 2 |
| | Катафал[************] | |
| 1 | Катафал о четырех ступенях выкрашенный один | |

[*] Альба — доўгае белае літургічнае адзенне святара.
[**] Перкаль — шчыльная баваўняная тканіна.
[***] Комж — элемент адзення святара.
[****] Пурыфікатар — льняное палатно для выцірання келіха пасля еўхарыстыі.
[*****] Гумерал — элемент адзення святара ў выглядзе шырокай накідкі, якая цалкам пакрывае яго плечы і рукі да кісцей.
[******] Тувальня — рушнік.
[*******] У дужкі ўзяты, відавочна, памылковы варыянт.
[********] Выпраўлена з лічбы «6».
[*********] Пушка — келіх, які выкарыстоўваецца для захавання еўхарыстыі.
[**********] Турыбулум — кадзільніца.
[***********] Харугва — рэлігійны сцяг з выявай Ісуса Хрыста, Маці Божай і святых.
[************] Катафалк — узвышэнне пад балдахінам для труны.

Строение Плебаниальное

Плебаниальный жилой дом деревянный. В нем шесть комнат, вновь пристроенная прихожая, кладовая и сени — все ветхое. В комнатах находится четыре печи кирпичные, а по состоянию и долгому употреблению в топливе требует совершенной переделки. При них же имеются и вьюшки[*] двойные с дверцами из жести, все старое и негодное к употреблению, как равно и дверцы с вьюшками чугунные. Дверей на железных цепях с железными замками 9, окошек 11 и столько же двойных. Под жилым домом каменный погреб. Весь этот дом настоятелем кс[ендзом] Лубо был исправляем и переделан по возможности доступной по ветхости, и вновь покрытый дором[**] под железный гвоздь. Выходов из жилого дома два. По левой стороне от главного выхода находится ледник, покрытый дором под железный гвоздь. За ледником на черном дворе имеется официна[***] о трех комнатах с кладовой. В оной трое дверей с замками испорченными ныне на железных завесах[****] [Арк. 25] и имеет в себе 5 окошек с двойными рамами. За сею официною в соединении сделана кухня с плитой, которая находится без всякого употребления по случаю порчи. В ней одно окошко. Подле[*****] кухни следует комната, так называемая людская, с печкой простой, ныне вновь переделанной, с тремя окнами, дверь одна, весь флигель сей покрыт дором в лопаты, ныне требующим вовсе переделки. Возовня, гостиная конюшня, хлев для птиц и мелкого скота, коровник и конюшня на четырех испорченных уже стойлах; при них двери двойные на железных завесах и крюках. Фронтовые ворота сделаны на модель городской ивы, крашены маслинной краской на железных завесах и крюках, а ныне вовсе испортившихся по ветхости. Целый двор огорожен скобленной лемой[******] в шулы[*******]. Кроме сего, находится на правой стороне жилого дома вендлярня[********].

Примечание[*********]: все строение и ограда по ветхости и гнилости требует вновь переделки совершенной.

Угодья

Костел Лозовицкий не имеет никаких угодий, кроме четырех десятин земли, находящейся под усадьбою костела, плебании, экономических строений, богодельни и огородов. При этом ныне решением Климовицкого уездного суда 13º января 1855 года, возвращены сему костелу четыре десятины земли,

* В’юшка — засоўка, якая ўкладвалася ў печную трубу для спынення цягі паветра.
** Дор (драніца) — сколы прамаслойнага дрэва, якія выкарыстоўваліся для накрыцця даху.
*** Афіцына — працоўнае памяшканне.
**** На наступным аркушы слова «завясах» паўтараецца.
***** Маецца на ўвазе — каля кухні.
****** Лема — плот.
******* Шулы (шуллі) — слуп для плота.
******** Вендлярня — месца для вэнджання страў.
********* Падкрэслена хвалістай рыскай.



которые в месте из давних времен окопаны рвом с большой насыпью и кругом обсажены деревом и лозой.

Богодельня

Богодельня с двумя комнатами, с сенями и двумя кладовыми, равно с неоконченной третьей комнатой, построена на костельной земле, при которой имеется и маленький огород. В Богодельне помещается органист и одна старуха бедная. Впрочем, богодельня сия не имеет никаких обеспечений и фундушей.

Кладбище

Кладбище, не бывшее огороженным от своего существования и находящееся при самой дороге, не в дальнем расстоянии от местечка [Арк. 25 адв.], ныне огорожено в штахет самый лучший и выкрашено под цвет чугунный маслинной краской. Имеет двойные ворота на железных цепях и крюках. Все это было сделано заботливостью настоятеля ксендза Лубо, но в настоящее время по истечении десятилетнего существования во многих местах требуется переделка по гнилости дерева в шульях.

В Ризнице утварь костельная, принятая б[ывшим] настоятелем ксендзом Лубо по инвентарю значущемуся с 1º декабря 1849 года.

| № | | Штук |
|---|---|---|
| 1. | Риза или орнат белый парчовый с принадлежностями разной материи зеленой китайкой[*] подшитый | 1 |
| 2. | Орнатов белых одинаковой материи с серебряными галунами Московским китаем подшитых 3 ветхие, из коих сделан 1 и подшит белым полотном | 1 |
| 3. | Орнат белый материальный в полосы и цветы белым китаем подшитый | 1 |
| 4. | Орнат красный парчовый в паски[**] золотые с галуном шелковым | 1 |
| 5. | Орнат гредитуровый в паски и цветы красный с колюмной[***] белой подшитый китайкой | 1 |
| 6. | Орнат красный гредитуровый с колюмной белой подшитый желтой китайкой | 1 |
| 7. | Орнат красный гредитуровый с колюмной белой подшитый желтым холстом | 1 |
| 8. | Орнат с той же материи без прибора | 1 |
| 9. | Орнат штофовый[****] голубой в цветы золотые китайкой красной подшитый | 1 |
| 10. | Орнатов повседневных зеленых гредитуровых красным холстом подшитых | 2 |

* Кітайка — шчыльная баваўняная тканіна, з якой шылі верхнюю вопратку.
** Паскі — палоскі.
*** Колюмна — калона.
**** Штоф — цяжкая шаўковая або ваўняная тканіна з тканым малюнкам.

| | | |
|---|---|---|
| 11. | Орнат светло зеленый с колюмной белой красным холстом подшитый без прибора | 1 |
| 12. | Орнат черный китайковый в полоски с колюмной белой желто-зеленой китайкой подшитый | 1 |
| 13. | Стихоры[*] и дальмативы[**] галуном белым обложены | 2 |
| 14. | Тоже дальмативы белые в цветы с галуном шелковым красным китаем подшитые | 2 |
| 15. | [Арк. 26] Орнатов кофейнных в цветы серебряные с прибором | 2 |
| 16. | Орнат белый без отличий ветхий | 2 |
| 17. | Орнат атласовый в желтые фиолетовые полосы, подшитый шелковой старой материей в цветы маленькие галуном обложен | 1 |
| 18. | Орнат с дымки черный белым галуном обложен ветхий | 1 |
| 19. | Орнат полупарчевый с прибором ветхий | 1 |
| 20. | Капа[***] белая в цветы серебряные, внизу обложена галуном шелковым, в верху обе полы с каймой узорчатой шитая[****], китаем красным подшита | 1 |
| 21. | Капа гредитуровая розовая, подшита китаем небесным | 1 |
| 22. | Капа гредитуровая шита цветами, обложена калителью белой, а вокруг галуном | 1 |
| 23. | Капа траурная китайковая в полоски и цветы серебряные обложена капителью и подшита холстом черным<br><u>Примечание</u>[*****]: Все эти капы и два орнаты очень ветхие | 1 |
| 24. | Эфод или заслонка к Св[ятым] Тайнам с материи шелковой белой в паски темные, и цифрой Иисуса Христа[******] имени с галуном шелковым | 1 |
| 25. | Шаль в регисты светло-бледно-желтые около с обводкой фиолетовой | 1 |
| | <u>Белье</u> | |
| 1. | Альб миткальных[*******] с кружевами широкими в разные цветы отделанных и разноцветным холстом подбитых | 3 |
| 2. | Альба муслиновая с кружевами внизу китайкой старой кармазиновой[********] подшитая | 1 |

[*] Сціхіра (сціхора) — зборнік літургічных спеваў на біблейскія матывы.
[**] Дальматыў — зборнік для музычнага суправаджэння набажэнства.
[***] Капа — адзенне святара, якое нагадвае плашч, накідку.
[****] Выпраўлена на літару «я».
[*****] Падкрэслена хвалістай рыскай.
[******] Маецца на ўвазе напісанне літар IHS (Iesus Hominum Salvator (Ісус, спасіцель чалавецтва — лацін.).
[*******] Міткаль — неапрацаваная тонкая баваўняная тканіна палатнянага пляцення.
[********] Кармазін — ярка-чырвоны колер тканіны.



| | | |
|---|---|---|
| 3. | Альба холста швабского с кружевом внизу китайкой розовой подшита | 1 |
| 4. | Альб холста ткацкого старых исправленных с кружевами внизу две и одна с красными наметками | 3 |
| 5. | Корноралов[*] из холста голландского вовсе старых | 8 |
| 6. | Корноралов из холста швабского старых и негодных к употреблению по ветхости | 7 |
| 7. | Субкорноралов из голландского холста, также ветхих | 4 |
| 8. | Пурификаторей[**] с разного холста новых и старых 60 из коих в остатке годных к употреблению 38 штук | 38 |
| 9. | [Арк. 26 адв.] Комжробковых с кружевами белых | 1 |
| 10. | Комжа холста голландского с белым кружевом | 1 |
| 11. | В разных цветах холстяных покрывал на престол | 6 |
| 12. | Тувальни[***] голландских с кружевами две | 2 |
| 13. | Тувальни из голландского полотна с дорожками и шелковыми галунами | 5 |
| 14. | Полотен или скатертей простого холста к застиланию под тувальни | 5 |
| 15. | Утиральников[****] небольших к престолам разного холста | 12 |
| 16. | Подвязка к пасхалу с белым кружевом | 1 |
| 17. | Занавесок разной материи пар девять | 9 |
| 18. | Гумералов траурных 2 ⎡по ветхости остаются | 2 |
| 19. | Гумералов цветных 3 ⎣без всякого употребления | 3 |
| 20. | Альбы простого холста ветхие | 2 |
| 21. | Антепедиум[*****] гредитуровых светло-красных галуном обложенных | 3 |
| 22. | Антепедиум разного цвета вседневных старых и негодных к употреблению | 4 |
| 23. | Антепедиум до Великого престола из белой материи с отметкой кармазиновой гажтованых[******] фольгой | 1 |
| 24. | Антепедиум материальных зеленых с отменными цветами кармазиновыми шитья фольгой до меньших престолов | 2 |
| 25. | Антепедиум материи небесной с колонами белыми и небесной каймой | 1 |
| 26. | Антепедиум материальное дикого цвета с отметкой кармазиновой и галунами подбитый холстом | 1 |

[*] Карнарала — белая тканіна прамавугольнай формы, на якую ставіцца келіх падчас літургіі.
[**] Пурыфікатар — белая тканіна, якой аціраецца эўхарыстычны посуд пасля ачышчэння.
[***] Тувальня — ручнік.
[****] Уціральнік — ручнік.
[*****] Антыпендыум — пакрывала для вонкавага боку алтара.
[******] Гаптавана (гажтавана) — вышыта.

| | | Проба | Фунт | Лоты | Штук |
|---|---|---|---|---|---|
| 27. | Платок светло-небесного цвета шелковый старый для покрытия амбона по ветхости без употребления состоит | | | | 1 |
| 28. | Платок кафового* цвета тоже без употребления состоит | | | | 1 |
| 29. | Бург для Св[ятых] Тайн при поездке к больным | | | | 2 |
| 30. | Поясков шерстяных и нитяных | | | | 3 |
| 31. | Подушек к престолам хороших и старых | | | | 9 |
| 32. | Процессий на холсте писанных старых и к употреблению негодных | | | | 5 |
| 35**. | Капки или футлярки на чашу Св[ятых] Тайн | | | | 2 |
| | [Арк. 27] <u>Серебро костельное</u> | Проба | Фунт | Лоты | Штук |
| 1. | Оклад серебряный у великого чудотворца Св[ятого] Фадея Апостола с сиянием и обувью | 8 | 3 | | 3 |
| 2. | В престоле у Пресвятой Богородицы венец серебряный и полулуна у ног | 8 | | 31 | 2 |
| 3. | В престоле Иисуса Христа венец | 14 | | 6 | 1 |
| 4. | В иконе Спасителя сердце | 14 | | 2 | 1 |
| 5. | Монстранциум*** серебряная фольерованной работы с сиянием и лунами хорошо золоченная | 7 | | 6 | 1 |
| 6. | Ковгль**** больший серебряный внутри вызолоченный с крышкой для хранения Св[ятых] Тайн | 10 | 2 | 6 | 1 |
| 7. | Чаша великая серебряная с дискусом***** внутри вызолоченная | 8 | | 24 | 1 |
| 8. | Чаша тоже серебряная внутри вызолоченная с дискусом | 8 | | 21 | 1 |
| 9. | Тоже чаша серебряная с короной серебряной внутри вызолоченная | 8 | | 21 | 1 |
| 10. | Тоже чаш малых серебряных внутри вызолоченных с дискусами | 7 | | 23 | 2 |
| 11. | Дискус серебряный вызолоченный для ношения Св[ятых] Тайн к больным | 7 | | 7 | 1 |
| 12. | Дискус на Св[ятыя] Тайны с крышкою без позолоты | 6 | | 13 | 1 |

* Кафавы (кафейны) колер.
** Так у тэксце.
*** Манстранцыя (дараносіца) — канструкцыя з празрыстай паласцю пасярэдзіне, дзе знаходзіцца гостыя.
**** Ківорый — пасудзіна для асвячэння і захавання гостый.
***** Дыскос — сподак, які ставіцца на алтары пры асвячэнні гостый.



| | | Проба | Фунт | Лоты | Штук |
|---|---|---|---|---|---|
| 13. | Приношении серебряных разных проб пред иконою Св[ятого] Фадея Апостола, Божией Матери и Св[ятого] Антония 42 весом | | | 24 | 42 |
| 14. | Полклямерка в венжине иконы Св[ятой] Екатерины серебряная 1. крестик коронно-золотой с белым бисером 1. Серьги 2. Янтарный крестик 1. Третий же коронно-золотой за стеклом с крошечною фигурою | | | | 6 |
| 15. | Медаль серебряная 1812 году и бронзовая 1, всего две | | | | 2 |
| 16. | Крест золотой низкой пробы | | | | 1 |
| 17. | Цепочка маленькая вызолоченная серебряная | | | | 1 |
| 18. | Колечек золотых червонного золота малых 2. Французского 3, один широкий. Серьги 2. Всего | | | | 7 |
| | [Арк. 27 адв.] <u>Цына или олово</u> | Проба | Фунт | Лоты | Штук |
| 1. | Подсвечников оловянных больших на Великом престоле 6 весом по 9 фунтов каждый | | 54 | | 6 |
| 2. | Подсвечников оловянных меньших весом по 3 ф[унта] каждый | | 30 | | 10 |
| 3. | Подсвечников меньших тоже 6 весом по 3 фунта | | 18 | | 6 |
| 4. | Ампулок* на вино и воду штук шесть | | 3 | | 6 |
| 5. | Подносов к тем же ампулкам штук три | | 3 | | 3 |
| 6. | Сосуд для умывания пальцев на престоле | | 2 | | 1 |
| 7. | Чаша для Св[ятой] воды к крещению младенцев | | 8 | | 1 |
| 8. | Сосудчик на Св[ятую] воду | | 5 | | 1 |
| | <u>Медь в ризнице</u> | | | | |
| 1. | Таз небеленый | | 5 | | 1 |
| 2. | Котельчик на Св[ятую] воду | | | | 1 |
| | <u>Бронз или спиж</u> | | | | |
| 1. | Подсвечников маленьких 6 весу по ½ ф. каждый | | 3 | | 6 |
| 2. | Подсвечников на винтах вовсе испорченных два | | ¾ | | 2 |
| 3. | Колокольчиков малых при престолах 7 из коих три только годные к употреблению | | 2 | | 7 |

* Ампула — шкляная або металічная пасудзіна, у якой падаюцца віно або вада падчас набажэнства.

| | | |
|---|---|---|
| 4. | Кадильниц две, весьма старые от употребления | 2 |
| 5. | Колокольчик на стене у закристии | 1 |
| | Бляха или жесть | |
| 1. | Фонарь старый и негодный к употреблению | 1 |
| 2. | Сосудчик для складывания просфир* или гостий | 2 |
| 3. | Чаша для складу ладону крашенная, но вовсе старая и без употреб[ления] | 1 |
| | Железо | |
| 1. | Железо или форма для печения оплаток | 2 |
| 2. | Железо для вырезывания гостий или комуникантов | 1 |
| 3. | Железо для вырезывания гостий | 1 |
| 4. | Щипцов старых и инструментов | 2 |
| | Деревянные вещи | |
| 1. | В ризнице комод с тремя ящиками для риз | 1 |
| 2. | [Арк. 28] Тоже комод с двумя ящиками | 1 |
| 3. | Шкаф с двойными дверьми с ченом и висящим замком | 1 |
| 4. | Сундук большой окованный с ченом и висящим замком для хранения вещей церковных | 1 |
| | Стекло | |
| 1. | Жирандоль** о 12 подсвечниках хрустальная | 1 |
| 2. | Жирандоль с лампой тоже хрустальная | 1 |

Приход

Приход Лозовицкий граничит с Костюковицким, Ивандарским, Кричевским и Шумяцким. В оном имеется каплиц с вечными индультами четыре, а именно: Хоцимская*** и Яновская**** каменные, Забяльшинская***** и Свирельская****** деревянные, из коих первая Хоцимская филиальная состоит в 45 верстах от своего приходского костела, вторая, т. е. Яновская, тоже филиальная в 18 верстах, третья, т. е. Забяльшинская, филиальная в 25 верстах, четвертая, т. е. Свирельская, в 12 верстах. Из коих Хоцимская и Яновская филиальные каплицы находятся в хорошем состоянии, а Забяльшинская и Свирельская суть ветхие. Все же поименованные каплицы не имеют никаких особых фундушей. В сем приходе один город уездный, два местечка, околиц 17, господских дворов 24. Прихожан в оном мужеского пола 494, женского 431, а вообще 925 душ.

* Просфіра (гостыя, аплатка, камунікант) — літургічны хлеб.
** Жырандоля — дэкаратыўная падстаўка з разгалінаваннямі для некалькіх свечак.
*** Хацімск, м. Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.
**** Янава, фальв. Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.
***** Забялышына, маёнт. Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.
****** Свірэль, в. Клімавіцкага пав. Магілёўскай губ.



Библиотека

В библиотеке находится старинных малополезных книг восемьдесят штук, многие без переплета и некомплектные, а частью без начала и конца, из коих суть польские, латинские, немецкие и французские со словарями старинными.

1º Метрические книги о родившихся с 1768 по 1864 г.
2º о бракосочетавшихся с 1770 по 1864 г.
3º об умерших с 1764 по 1864 г.
4º о предбрачных экзаменах с 1825 по 1864 г.
5º [Арк. 28 адв.] Список прихожан с 1845 по 1859 год
6º Книга указов одна
7. Книга на доброхотное пожертвование адна

Книги церковные

Мшал старый маленький светский один. Ритуал* один. Агентка** старая одна. Евангеличка тоже старая одна.

Колокола

Колокола небольшие четыре, завешены в одной из башен костела

Скот и птицы

Коровы старые две. Свиньи две. Гусей четыре. Кур две.

Вещи плебаниальные

Перкат бывший старый, ныне переделан вновь и покрыт репсом*** полосатым кафового цвета с черным. Подушка одна и одеяло одно. В кладовой два большие сундука, один окованный бляхой на двух ченах, а другой простой с одним ченом, и два простые комоды или шкафы с двойными дверцами.

Овин**** состоящий в огороде на усадебной земле на шести парах столбов построен с одною осетью. Это строение по существованию своему издавна совершенно ветхое.

Чугунный котельчик для перетопки воска один.

Печать костельная одна и казенная одна.

Примечание. Показанные вещи по инвентарю писанному с 1849 г. сентября 1º дня весьма ветхие, а именно:

1º. Ковер белый средней величины по ветхости своей ничего не стоит — 1.

2º. Сукна красного два куска вовсе старые.

3º. Ковер шерстяной тоже весьма старый — 1.

4º. Ковров старых вовсе к употреблению негодных 2 и 5º. Орнат белый материальный в полосы и цветы красным китаем подшитый после переделки, как видно, переименован белым китаем подшитый, а затем первого не имеется, но все равно имеет в примечании вещей поименованных, кои уже и тогда показанные были ветхими и негодными к употреблению.

* Рытуал — прызначаны для збору святаром сакрамэнтаў і сакрамэнталіяў.
** Агентка — кніга для правядзення набажэнстваў.
*** Рэпс — шчыльная тканіна з дробнымі рубчыкамі.
**** Гумно —будынак для сушкі снапоў перад малацьбой.

[Арк. 29] Также. Писанные с 1849 г. три лошади немолодых не имеется и ныне, как значится по выданному свидетельству от Климовицкого земского суда за № 8862 октября 31 дня в том, что с 1828 года вовсе не существовали.

[…][*] [Арк. 30] *По сей описи дан костел и все к оному принадлежащее имущество, сполна принял в заведывание 16 октября 1864 года Лозовицкого приходского костела администратор ксендз Иоанн Довгялло*[**].

*По сей описи на основании распоряжения его преосвященства г[осподина] викария капитула и за сим последовавшего указа из Могилевской римско-католической консистории от 3 сентября за № 3603 все имущество передано назначенному администратором Лозовицкого*[Арк. 30 адв.] *приходского римско-католического костела ксендзу Иоанну Довгялло. 1864 октября 16 дня. Климовицко-Мстиславский декан Гарлевский*[***].

Літаратура і крыніцы


1. Антановіч, З. В., Гарбачова, В. В Лёсы святароў Магілёўскай і Мінскай рымска-каталіцкіх дыяцэзій пасля паўстання 1863—1864 гг. / З. В. Антановіч, В. В. Гарбачова // Беларускі гістарычны часопіс. — 2009. — № 12. — С. 23—28.
2. Пыко, А. В. Инвентарь 1820 г. костела Св. Михаила Архангела ордена августинцев в д. Михалишки / А. В. Пыко // Сообщения Национального художественного музея Республики Беларусь. — 2008. — Вып. 7. — С. 224—254.
3. Носевич, В. Л. Демографические показатели белорусского крестьянства во второй половине XVIII — первой половине XIX в. [Электронный ресурс]. — Режим доступа: http://new.hist.asu.ru/biblio/histdem/10.html. — Дата доступа: 30.01.2015.
4. НГАБ. — Ф. 1781. — Воп. 2. — Спр. 3261. — Справа аб размеркаванні парафій на класы, 1844 г.
5. Там жа. — Спр. 5628. — Справа аб перамяшчэнні пробашча Лазавіцкага касцёла кс. Т. Тамашэўскага ў іншую губерню, 1864 г.
6. Там жа. — Воп. 25. — Спр. 33. — Ведамасці парафій Магілёўскай архідыяцэзіі, 1854 г.
7. Там жа. — Спр. 149. — Фармулярныя спісы рымска-каталіцкага духавенства Магілёўскай архідыяцэзіі за 1860 г.
8. Там жа. — Спр. 150. — Фармулярныя спісы рымска-каталіцкага духавенства Магілёўскай архідыяцэзіі за 1861 г.
9. Polak, J. Inwentarz oraz kronika parafii i kościoła pw. św. Marcina w Międzyrzeczu 1522—1939 / J. Polak. — Międzyrzecze: SPM. — 2012. — 271 s.
10. Radwan, M. Kościół w Rosji i na Białorusi w relacjach duszpasterzy (1892—1926) / M. Radwan. — Lublin: Instytut Europy Środkowo-Wschodniej, 1999. — 215 s.


*Артыкул паступіў у рэдакцыю 09.02.2015*

[*] Апушчаны копіі дакументаў: Пасведчанне клімавіцка-мсціслаўскага дэкана Ф. Іваноўскага аб асвячэнні адрамантаванага Лазавіцкага касцёла, 15 снежня 1854 г.; Суправаджальны ліст і копія рашэння Клімавіцкага павятовага суда ад 13 студзеня 1855 г. аб звароце касцёлу зямлі, занятай памешчыкам Балашовым, 2 ліпеня 1856 г.

[**] Напісана іншым почыркам.

[***] Напісана іншым почыркам.



# РЭЦЭНЗІІ

***В. У. Герасімчык,***
*настаўнік гісторыі*
*Верцялішкаўскай сярэдняй школы Гродзенскага раёна,*
*магістр гістарычных навук*

## НОВЫ ТВОР ПА ГІСТОРЫІ ПАЎСТАННЯ 1863—1864 гг.

***Рэцэнзія на выданне***: *Матвейчык, Д. Ч. Паўстанне 1863—1864 гадоў у Беларусі: нарыс баявых дзеянняў.* — Мінск: Медысонт, 2013. — 122 с.

У серыі «Беларусь у войнах» у 2013 г. пабачыла свет кніга Дзмітрыя Матвейчыка, прысвечаная паўстанню 1863—1864 гг. Галоўнай мэтай кнігі аўтар называе «папулярызацыйную» і бачыць сваю задачу ў тым, каб «даць шырокаму колу чытачоў агульнае ўяўленне пра баявыя дзеянні паўстанцаў у Беларусі ў 1863 годзе». Аб цяжкасцях у выкананні пастаўленай задачы і працы над тэкстам слушную заўвагу выказаў адзін з укладальнікаў серыі «Беларусь у войнах» археолаг Мікалай Плавінскі, прэзентуючы выданне на сустрэчы з чытачамі ў г. Гродна 7 лістапада 2013 г., адзначыўшы, што «зрабіць кнігу навукова-папулярную значна цяжэй, чым навуковую».

Аднак ва ўмовах сённяшняй патрэбы беларускага грамадства ў творах, якія даходліва распавядаюць пра складаныя старонкі нашага мінулага, кніга Д. Матвейчыка з'явілася доўгачаканай і выклікала вялікую цікавасць да, словамі аўтара, гэтага «сціплага твора» (чым ужо дасягнула сваёй мэты).

Кніга складаецца з уступу, чатырох глаў, заключэння і спіса крыніц і літаратуры.

Ва ўступе Д. Матвейчык слушна заўважае: 1) паўстанне 1863—1864 гадоў — адна з самых неадназначных з'яў у гісторыі Беларусі перыяду яе знаходжання ў складзе Расійскай імперыі, ацэнка якой у пазнейшы час залежала ад палітычнай кан'юнктуры таго ці іншага даследчыка, 2) шматлікія даследчыкі разглядалі самыя разнастайныя бакі паўстання, але да гэтага часу паўнавартаснае комплекснае манаграфічнае даследаванне па гісторыі паўстання на беларускай мове не выдадзена, ды ўвогуле адзіным такім даследаваннем гісторыі паўстання на беларускай мове з'яўляецца кніга Усевалада Ігнатоўскага [4].

З першай думкай варта пагадзіцца цалкам, з тым дадаткам, што такая залежнасць захоўваецца і ў цяперашні час. У адносінах да другой варта заўважыць, што кніга У. Ігнатоўскага хоць і з'яўляецца адзінай канцэптуальнай манаграфіяй па паўстанні на беларускай мове, але яна не з'яўляецца адзінай у беларускай гістарыяграфіі, паколькі маецца яшчэ рускамоўная манаграфія Анатоля Смірнова [7], якая значна пераўзыходзіць паводле свайго ўплыву і навуковай паўнаты твор У. Ігнатоўскага, надоўга прыхаваны, аднак нядаўна перавыдадзены [5]. Сёння з'яўленне канцэптуальнага манаграфічнага даследавання, арыенцірам якога можа выступіць, напрыклад, праца польскага гісторыка Стэфана Кяневіча [10], застаецца вельмі чаканай падзеяй.

Нягледзячы на тое што кніга Д. Матвейчыка — перш за ўсё нарыс баявых дзеянняў паўстанцкіх атрадаў супраць царскіх войскаў, яна ахоплівае больш шырокае кола праблем, якія адлюстраваны фактаграфічна. Сярод іх і ўзмацненне напружанасці на землях Беларусі, Літвы і Польшчы напярэдадні паўстання, і падрыхтоўка вайсковага выступлення супраць царскіх улад, дзейнасць паўстанцкай арганізацыі і супярэчнасці ўнутры яе, меры па задушэнні выступлення і інш.

Першая глава «Напярэдадні паўстання» складаецца з чатырох пунктаў і распавядае пра напружаную сітуацыю, якая склалася ў Беларусі ў пачатковы перыяд панавання імператара Аляксандра II. У гэты час, нягледзячы на спробы паслаблення жорсткіх мер самадзяржаўя, расла незадаволенасць мясцовага насельніцтва, якое вылілася ў з'яўленні маніфестацыйнага і росце сялянскага руху. Таксама ў кнізе прыводзяцца звесткі пра мерапрыемствы па падрыхтоўцы вайсковага выступлення, узбраенне і суадносіны варожых бакоў: напачатку 1863 г. трохтысячнай паўстанцкай арганізацыі ў Беларусі і Літве супрацьстаялі 123,5 тыс. расейскіх вайскоўцаў (і гэта без уліку батальёнаў унутранай варты, інвалідных і этапных камандаў, паліцыі, якія таксама прымалі ўдзел у падаўленні паўстання). Тут жа варта адзначыць імкненне Д. Матвейчыка нават ва ўмовах абмежаванага фармату даць схематычны агляд таго, чым звычайна грэбуюць падручнікі — падзей у суседніх Каралеўстве Польскім і Літве. Гэта тым больш важна, што, нягледзячы на рэгіянальныя асаблівасці ў Беларусі і Літве, паўстанне 1863—1864 гг. на гэтых землях адбывалася перш за ўсё ў кантэксце больш шырокага выступлення і з'яўлялася спробай адраджэння былой Рэчы Паспалітай (форма і разуменне якой выклікалі спрэчкі).

Аднак варта заўважыць, што ў дадзенай главе бракуе, магчыма, згадкі пра шэраг важных крыніц. У першую чаргу — Маніфест аб пачатку паўстання ад 22 студзеня 1863 г., у якім ворагам абвяшчаецца царызм, які ганьбіць лепшае і культывуе найгоршае ў чалавеку. Маніфест завяршаўся зваротам да «маскоўскага народа», такога ж прыгоннага, пакутлівага і прыгнечанага, як і іншыя народы імперыі, далучыцца да барацьбы супраць рабаўніцкага самадзяржаўя [1, с. 2].

У той жа час, паколькі кніга Д. Матвейчыка з'яўляецца ў першую чаргу нарысам баявых дзеянняў, то варта было б асобную яе частку прысвяціць асноўным прынцыпам, якіх прытрымліваліся паўстанцы ў арганізацыі (склад, падзел на адзінкі, узбраенне, адзенне) атрадаў і іх тактыцы, для чаго варта згадаць падрыхтаваныя ў Варшаве «Інструкцыю для ваяводскіх і павятовых вайсковых начальнікаў» і «Інструкцыю для фарміравання партызанскіх атрадаў конных стралкоў» [1, с. 33—41]. Гэта дазволіць зразумець чытачу, чаму большасць паўстанцкіх атрадаў намагалася прытрымлівацца галоўнага прынцыпу партызанскай вайны: «Усе сродкі нішчання варожых сіл добрыя і павінны быць выкарыстаны» [3, с. 8].



Другая глава «Пачатак паўстання ў Беларусі і Літве» складаецца з двух пунктаў і прысвечана перыяду (студзень—сакавік) арганізацыі і дзейнасці першых паўстанцкіх атрадаў, а таксама рознагалоссям паміж «белымі» і «чырвонымі». Нягледзячы на невялікі аб'ём (9 старонак), прысвечаны баявым дзеянням у пачатковы перыяд паўстання, у кнізе пазначаны дзве важнейшыя падзеі дадзенага перыяду: 1) бітва пад Сямятычамі (6—7 лютага 1863 г.), паражэнне ў якой перакрэсліла план па шырокаму ўздыму паўстання ў заходніх паветах Гродзенскай губерні, і рэйд атрада Рамана Рагінскага, які за 24 дні прайшоў па Беларусі каля 750 км [6]. У той жа час, меркаванне наконт спецыяльнага падпалу генералам Захарам Манюкіным Сямятыч падчас бою (с. 26) не адпавядае рэчаіснасці. Расійская артылерыя абстрэльвала толькі дамы, у якіх заселі паўстанцы і стралялі па царскіх войсках. Аднак вецер пагнаў полымя па ўсім мястэчку. У той жа момант сам Манюкін выкарыстоўваў прыклад Сямятычаў для запалохвання жыхароў усяго краю і прадухілення іх ад удзелу ў паўстанні і яго падтрымкі. Напрыклад, у закліку да жыхароў Драгічына расійскі генерал пісаў: «Калі хочаце паспытаць долю Сямятычаў, — слухайцеся мяцежнікаў, і даю вам слова, — вы будзеце пакараны» [1, с. 50].

У дадзенай главе ўвага таксама прысвечана пытанню супярэчнасцей паміж двума палітычнымі кірункамі ў паўстанцкім руху — «чырвонымі» і «белымі», нявырашанасць якіх стала адной з падстаў паражэння паўстання. Гэтаму паспрыяла таксама сабатаванне на пачатковым этапе выступлення актыўнай дзейнасці «белымі» (у Беларусі і Літве на чале з Якубам Гейштарам), якія ў выніку перавароту адхілілі ад улады радыкальных «чырвоных» (у Беларусі і Літве на чале з Канстанцінам Каліноўскім).

Трэцяя глава «Баявыя дзеянні ў красавіку 1863 — пачатку 1864 года» складаецца з васьмі пунктаў. Яна з'яўляецца найбольш важнай, і, адпаведна, самай вялікай у кнізе (займае 63 старонкі). Аснову яе ўяўляе апісанне дзеянняў паўстанцкіх атрадаў, падзеленых у адпаведнасці з адміністрацыйна-тэрытарыяльнымі адзінкамі (губернямі), якія ўтваралі абшар сучаснай Беларусі (Магілёўская, Віцебская, Мінская, Віленская, Гродзенская). Такая структура мае падабенства з класічнай працай бібліятэкара музея ў Раперсвілі Станіслава Зяліньскага [11], дзе, аднак, узброеныя сутыкненні пададзены сухой хронікай. Д. Матвейчык жа выкарыстоўвае ў якасці формы выкладання тэксту нарыс, што толькі паляпшае якасць яго прачытання.

Сярод частак трэцяй главы найбольш поўнай з'яўляецца апісанне падзей у Мінскай губерні, у той час як пункты пра Гродзенскую і, асабліва, Віленскую губерню пажадана было б пашырыць, як гэта яскрава паказваюць некаторыя больш познія выданні [2; 8]. Аднак нават у такой форме пададзены самыя важныя падзеі і прозвішчы паўстання ў адзначаных рэгіёнах.

Апошняя, чацвёртая глава кнігі «Рэпрэсіі супраць удзельнікаў паўстання» дае пералік і кароткія апісанні мерапрыемстваў, распачатых царскімі ўладамі на чале з Міхаілам Мураўёвым па задушэнні выступлення 1863—1864 гадоў.

Асобна неабходна вылучыць шэраг станоўчых бакоў твора Д. Матвейчыка, дзякуючы якім яна з'яўляецца не толькі нарысам баявых дзеянняў паўстанцкіх атрадаў, а ператвараецца ў кнігу з элементамі комікса. Нададзеная вялікая ўвага падбору ілюстрацыйнага матэрыялу дае свой плён, з'яўляючыся не проста дадаткам да асноўнага тэксту, а ператварыўшыся ў гісторыю паўзверх гісторыі. Прычым сярод рэдкіх ілюстрацый маюцца як гравюры з французскага выдання «Le Monde illustré», так і каляровыя выявы элементаў паўстанцкай вопраткі.

Усяго ў кнізе на 122 старонках змешчана амаль 150 выяў. Сярод іх — шэсць дзясяткаў фотаздымкаў паўстанцаў, што з'яўляецца першым у Айчыннай гісторыі прыкладам збору такой колькасці постацей 1863 г. пад адной вокладкай, пераўвышаны толькі тэматычным фотаальбомам Камілы і Язэпа Янушкевічаў «Партрэты паўстаньня» (198 выяў) [9]. На дзесяцярых самых значных паўстанцаў у Беларусі кніга змяшчае асобныя біяграмы з кароткім апісаннем падзей іх жыцця (Раман Рагінскі, Юльян Бакшанскі, Людвік Остык-Нарбут, Вінцэнт Канстанцін Каліноўскі, Якуб Вільгельм Гейштар, Зыгмунт Эразм Гаспар Юзаф Серакоўскі, Людвік Звяждоўскі, Генрык Дмахоўскі, Валеры Антоні Урублеўскі, Рамуальд Траўгут). Не пакідае аўтар па-за ўвагай і самых прадстаўнічых асоб царскай машыны задушэння паўстання (Захар Манюкін-Няўструеў, Артур Эгер, Уладзімір Назімаў, Міхаіл Мураўёў), якія таксама анатацыйна ахарактарызаваны ў адпаведных біяграмах.

Такім чынам, кніга Дзмітрыя Матвейчыка з'яўляецца важным крокам на шляху папулярызацыі ў Беларусі гісторыі паўстання 1863—1864 гг. і заслугоўвае самай высокай адзнакі. Таму, падтрымліваючы яе аўтара, варта спадзявацца, «што для прафесійных даследчыкаў яна паслужыць дадатковым стымулам да напісання паўнавартаснай аб'ёмнай навуковай манаграфіі па гісторыі паўстання, а для аматараў гісторыі будзе карыснай для азнаямлення з такой цікавай і маштабнай падзеяй». На жаль, 150-я ўгодкі паўстання 1863—1864 гг. не дазволілі перайсці такую патрэбную мяжу аналітычнай працы агульнанацыянальнага значэння. Аднак, дзякуючы «Нарысу» Дзмітрыя Матвейчыка на гэтым шляху зроблены чарговы значны крок наперад.

Літаратура

1. Архивные материалы Муравьевского музея, относящиеся к польскому восстанию 1863—1864 гг. в пределах Северо-Западного края. — Часть 2. — Вильна: Губ. тип., 1915.
2. Быхаўцаў, М. І. Паўстанне 1863—1864 гадоў у Ваўкавыскім павеце. — Гародня: б. в., 2014. — 344 с.: іл., партр., карта. — (Гарадзенская бібліятэка).
3. Герасімчык, В. Валянцін Парчэўскі — прыхільнік партызанскай вайны (з гісторыі паўстання 1863—1864 гг.) // Ніва. — № 17. — 26.04.2015.
4. Ігнатоўскі, У. 1863 год на Беларусі: Нарыс падзей. — Мінск, 1930. — 275 с. (Запіскі Аддзелу гуманітарных навук. — Кн. 13. — Працы Інстытуту гістарычных навук. — Т. V).



5. Ігнатоўскі, У. 1863 год на Беларусі. Нарыс падзей // ARCHE Пачатак. — 2015. — № 3. — С. 67—362.
6. Карпович, О. В. Рейд отряда Романа Рогинского по Беларуси зимой // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А. — 2013. — № 1. — С. 37—41.
7. Смирнов, А. Ф. Восстание 1863 года в Литве и Белоруссии. — М.: Изд-во Акад. наук СССР, 1963. — 392 с.
8. Хаценчык, З. А., Канецкі, Д. В. Падзеі паўстання 1863 г. на Вілейшчыне: гістарычныя нарысы. — Мінск: Кнігазбор, 2013. — 67 с.: іл., партр., карты.
9. Янушкевіч, К., Янушкевіч, Я. Партрэты паўстання. Фотаальбом. — Ракаў, 2014. — 130 с.
10. Kieniewicz, S. Powstanie styczniowe. — Wyd. III. — Warszawa: Wydawnictwo Naukowe PWN, 2009. — 816 s.
11. Zieliński, S. Bitwy i potyczki 1863—1864. Na podstawie materiałów drukowanych i rękopiśmiennych Muzeum Narodowego w Rapperswilu. — Rapperswil, 1913. — 559 s.; tabl., mapy.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 05.06.2015*

# ПОСТАЦІ

*Д. В. Лісейчыкаў*

## ДА 70-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ АЛЫ КУПРЫЯНАЎНЫ ГАЛУБОВІЧ

Першы кіраўнік у гісторыі любой установы займае надзвычай важнае месца. Гісторыкі без цяжкасцей прыгадаюць імёны нашых першых віцебскіх і віленскіх архіварыусаў Аляксандра Сазонава і Мікіты Гарбачэўскага. Менавіта яны заклалі асновы і ў многім вызначылі накірункі далейшага развіцця архіўнай справы на беларускіх землях у канцы XIX ст. Ёсць такая знакавая постаць і ў найноўшай гісторыі Беларусі. Гэта першы дырэктар Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі Ала Купрыянаўна Галубовіч.

Ала Купрыянаўна нарадзілася 6 красавіка 1945 г. у г. Тбілісі (Грузія) у сям'і вайскоўца. Пасля сканчэння школы ў г. Віцебску паступіла на гістарычны факультэт Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

З ліпеня 1970 г. працавала навуковым супрацоўнікам у Віцебскім краязнаўчым музеі, са жніўня 1975 г. — старшым захавальнікам фондаў, старшым навуковым супрацоўнікам аддзела забеспячэння захаванасці дакументаў і навукова-даведачнага апарату Цэнтральнага дзяржаўнага гістарычнага архіва БССР у г. Мінску. З 1982 па 1984 г. працавала інспектарам навукова-выдавецкага аддзела Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў БССР. З 1985 па 1992 г. — загадчыкам чытальнай залы, пасля загадчыкам аддзела інфармацыі, публікацыі і навуковага выкарыстання дакументаў ЦДГА БССР.

У студзені 1993 г. Ала Купрыянаўна была прызначана на пасаду намесніка генеральнага дырэктара Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь (комплекс дакументаў XIV — пач. XX ст.), а ў жніўні 1995 г. узначаліла новастворaны Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі, на пасадзе дырэктара якога знаходзілася да красавіка 2012 г.

Яна ўзначаліла НГАБ, калі архіў знаходзіўся на этапе станаўлення, пошуку свайго месца ў сістэме дзяржаўных архіўных устаноў, вырашэння надзвычай важных для 1990-х гг. пытанняў фінансавання і матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння. Менавіта пад кіраўніцтвам Алы Купрыянаўны адбылася знакавая з'ява — пераезд архіва ў новы будынак па вуліцы Крапоткіна, 55, дзе ён знаходзіцца і на сённяшні дзень.

90-я гады мінулага стагоддзя — гэта час, калі архіўныя ўстановы прыстасоўваліся да патрэб новага, адкрытага грамадства. Сыходзілі ў нябыт часы, калі ў архіў можна было трапіць толькі паводле накіравання з сур'ёзных навуковых інстытутаў. Мінулым сваёй зямлі і свайго роду пачаў цікавіцца масавы карыстальнік. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі стаў першым аб'ектам «генеалагічнага буму» канца 1990-х гг. Ала Купрыянаўна, якая мела каласальны вопыт працы ў чытальнай зале і ў якасці загадчыка аддзела выкарыстання дакументаў, як ніхто разумела ўсе асаблівасці і цяжкасці гэтага накірунку архіўнай працы. Менавіта тады ў НГАБ была распрацавана методыка работы па выкананні генеалагічных запытаў — найбольш папулярнай і працаёмкай паслугі архіва. Ала Купрыянаўна брала актыўны ўдзел у працы самых разнастайных навукова-практычных канферэнцый па генеалагічнай тэматыцы не толькі ў Беларусі, але і ў Польшчы, Расіі, Украіне і нават Вялікабрытаніі.

У той складаны час архіву трэба было думаць аб актывізацыі публікацыйнай дзейнасці. Менавіта пры падтрымцы і пры непасрэдным удзеле А. К. Галубовіч былі заснаваны доўгатэрміновыя выдавецкія праекты «Беларусь у актавых кнігах» і «Гербоўнік беларускай шляхты». На сённяшні дзень у гэтых серыях выйшла 5 кніг. У 2001 г. пад рэдакцыяй Алы Купрыянаўны пачаў выходзіць зборнік навуковых паведамленняў і



артыкулаў «Архіварыус», які хутка зрабіўся вядомым і прэстыжным выданнем для апублікавання вынікаў дысертацыйных даследаванняў па гістарычных навуках. Дзякуючы намаганням дырэктара для інтэнсіфікацыі навуковай работы ў архіве ў 2004 г. быў створаны асобны аддзел публікацыі дакументаў. Сама Ала Купрыянаўна таксама актыўна ўдзельнічала ў публікацыйнай дзейнасці — яе аўтарству належаць некалькі дзясяткаў навуковых і навукова-папулярных артыкулаў у беларускіх выданнях і выданнях краін Садружнасці Незалежных Дзяржаў. Колькасць інтэрв'ю для сродкаў масавай інфармацыі, тэле- і радыёперадач з яе ўдзелам не паддаецца падлікам. Пад кіраўніцтвам А. К. Галубовіч у 2006 г. быў падрыхтаваны доўгачаканы даведнік «Фонды Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі». Папярэдняе падобнае выданне па нашых старажытных дакументах выходзіла толькі ў 1974 г.

Сёння ўспрымаецца як дадзенасць, што архіў мае ўласны афіцыйны вэб-сайт, праводзіць алічбоўку сваіх старажытных дакументаў, удзельнічае ў прэс-канферэнцыях, «круглых сталах», супрацоўнічае з установамі розных краін у пытаннях захавання дакументальнай спадчыны. Усё гэта аформілася і было, як сёння кажуць, «абкатана» менавіта ў час кіраўніцтва архівам Алы Купрыянаўны.

Асаблівую ўвагу надавала яна працы з маладымі архіўнымі кадрамі, у лік якіх у свой час пашанцавала трапіць і мне. Моладзь прыходзіла не толькі праз размеркаванне з гістарычных факультэтаў, але і мэтанакіравана ішла з жаданнем працаваць у канкрэтным, унікальным архіве. Я ж пасля работы ў адной з сярэдніх школ на Палессі не асабліва ўяўляў, чым і як буду займацца ў такой сур'ёзнай установе, як Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі. Нават не мог падумаць, наколькі родным праз некалькі гадоў ён зробіцца для мяне. Баяўся, што не хопіць ведаў і вопыту. І на ўсіх этапах сваёй архіўнай кар'еры я адчуваў падтрымку і дапамогу Алы Купрыянаўны.

Сёння не толькі архіўныя работнікі НГАБ, але і супрацоўнікі многіх устаноў архіўнай галіны, выкладчыкі вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь могуць назваць Алу Купрыянаўну Галубовіч сваёй настаўніцай.

За сваю плённую працу А. К. Галубовіч не раз атрымлівала прэстыжныя дзяржаўныя ўзнагароды: Ганаровыя граматы Нацыянальнага Сходу Рэспублікі Беларусь, Галоўнага архіўнага ўпраўлення пры Савеце Міністраў СССР і БССР, Дэпартамента па архівах і справаводстве Міністэрства юстыцыі Рэспублікі Беларусь, а таксама медаль «Ветэран працы» і знак «Ганаровы архівіст Беларусі».

Ад усяе душы віншуем Алу Купрыянаўну з юбілеем! Жадаем ёй моцнага здароўя і доўгіх гадоў жыцця ў акружэнні блізкіх людзей.

— ◊ —

*Л. В. Кисель*

## К 75-ЛЕТИЮ СО ДНЯ РОЖДЕНИЯ КАРАСЬК НИНЫ ВИТАЛЬЕВНЫ

В 2015 г. исполняется 75 лет старейшему работнику Государственного архива Гродненской области Караськ Нине Витальевне. Более сорока пяти лет она трудилась в архивных учреждениях Гродненщины: 20 лет — архивариусом, реставратором, начальником читального зала, старшим хранителем фондов Центрального государственного исторического архива в г. Гродно (ныне — Национальный исторический архив Республики Беларусь в г. Гродно), 25 лет — старшим научным сотрудником отдела фондов, учета и научно-справочного аппарата (1979—1980), архивистом 1 категории группы информации, публикации и научного использования документов, археографом 1 кате-

гории отдела информации, публикации и научного использования документов (1980—1984), заведующим отделом информации, публикации и научного использования документов (1984—2005) Государственного архива Гродненской области.

Родилась Нина Витальевна Караськ 1 августа 1940 г. в с. Савино Карагайского района Пермской области. Закончила Московский историко-архивный институт в 1966 г. Сомнений в том, кем быть, у Нины Витальевны не было. Патриархом архивного дела на Гродненщине называют Виталия Иосифовича Варычева, отца Нины Витальевны, возглавлявшего областной архивный отдел почти 30 лет. Он родился 5 мая 1917 г. в с. Обвинске Пермской области. Закончил Пермское педагогическое и Тюменское пехотное училища. С первых и до последних дней Великой Отечественной войны сражался на Северо-Западном, Волховском, Ленинградском, 3-м Прибалтийском и 1-м Белорусском фронтах. За ратные подвиги был награжден орденами Красной Звезды, Отечественной войны I и II степеней, медалями «За оборону Ленинграда», «За взятие Берлина», «За победу над Германией в Великой Отечественной войне 1941—1945 гг.».

После увольнения в запас в 1955 г. Варычев Виталий Иосифович возглавил архивный отдел управления МВД по Гродненской области, а в 1960 г. — архивный отдел исполнительного комитета Гродненского областного Совета депутатов трудящихся. Он проводил огромную работу по созданию филиалов областного государственного архива в городах Лиде и Новогрудке, совершенствованию их комплектования, созданию базы данных архивных документов, улучшению организации делопроизводства в организациях области. В. И. Варычев является автором «Справочника административно-территориального деления Гродненской области (1944—1970)», многих статей, методических пособий и инструкций. Он воспитал целую плеяду молодых архивистов, в том числе и свою дочь Караськ Нину Витальевну.

Деятельность Н. В. Караськ в архивных учреждениях Гродненщины связана с использованием документов. Она занималась усовершенствованием справочника по истории колхозов и совхозов Гродненского района, принимала участие в выявлении документов для сборников «Народное образование в БССР (1941—1965)», «Издательское дело и печать в БССР (1941—1980)», Справочника о немецко-фашистских лагерях, гетто, других местах принудительного содержания гражданского населения на временно оккупированной территории Беларуси в период Великой Отечественной войны 1941—1945 гг. (1998), книг «Память» Зельвенского, Слонимского и Сморгонского районов, рассекречиванием документов. Хорошо знала состав и содержание фондов периода вхождения современной территории Гродненской области с состав Польши, владела польским языком. В основном, именно она исполняла так называемые «консульские» запросы. Внесла значительный вклад в популяризацию и использование документов Национального архивного фонда Республики Беларусь.

В 1999 г. Н. В. Караськ присвоена высшая квалификационная категория. Она награждена медалью «Ветеран труда», дважды — Почетной грамотой Главного архивного управления при Совете Министров БССР и Белорусского республиканского комитета профсоюза работников госучреждений, Почетной грамотой Гродненского обкома профсоюза работников госучреждений и архивного отдела Гродненского облисполкома, Почетной грамотой Центрального государственного исторического архива в г. Гродно. В 2004 г. награждена нагрудным знаком «Ганаровы архівіст Беларусі».

С юбилеем Вас, уважаемая Нина Витальевна, здоровья Вам, бодрости, благополучия, долголетия!

— ◊ —



*В. Н. Надежина*

## ЧЕЛОВЕК В АРХИВНОМ ДЕЛЕ

*(80 лет со дня рождения Л. Н. Кисловой)*

5 января 2015 г. исполнилось 80 лет со дня рождения Людмилы Николаевны Кисловой, архивиста Гомельской области, бывшего сотрудника учреждения «Государственный архив Гомельской области».

Людмила Николаевна родилась в г. Острогожске Воронежской области, в 1957 г. окончила Московский историко-архивный институт и с 31 августа 1957 г. связала свою судьбу с Государственным архивом Гомельской области.

Людмила Николаевна, пройдя путь от научного сотрудника отдела общих фондов, археографа публикаторской группы архива, старшего научного сотрудника отдела использования и публикации документов до заведующего отделом информационно-поисковых систем и автоматизированных архивных технологий (с 1979 г. по 2002 г.), прекрасно знала все направления деятельности архива. Л. Н. Кислова принимала участие в работе всесоюзных, республиканских и областных конференций по вопросам архивного дела, которые проводились в Москве, Минске, Гродно, Брянске, Чернигове. Она является одним из составителей справочников «Государственные архивы Гомельской и Могилевской областей (1917—1941 гг.)» (1970), «Административно-территориальное устройство БССР. Т. 1 (1917—1941 гг.)» (1985), сборников документов «Восстановление народного хозяйства Гомельской губернии (1921—1925 гг.)» (1960), «Сила братства: О дружбе и сотрудничестве трудящихся Брянской, Гомельской и Черниговской областей (1946—1977 гг.)» (1980), «Плечом к плечу: Сборник документальных материалов о боевом сотрудничестве трудящихся Брянской, Гомельской и Черниговской областей в годы гражданской (1918—1920 гг.) и Великой Отечественной (1941—1945 гг.) войн» (1972). Принимала участие в подготовке республиканских сборников документов по истории индустриализации, коллективизации, народного образования, библиотечного дела и др.

За успехи в работе и многолетний добросовестный труд Л. Н. Кислова награждена знаком «Отличник архивной службы», Грамотой Президиума Верховного Совета БССР, Почетной грамотой Архивного управления при Совете Министров БССР и ЦК профсоюза работников государственных учреждений, Почетной грамотой Комитета по архивам и делопроизводству при Совете Министров Республики Беларусь, Почетными грамотами руководства Гомельской области и Государственного архива Гомельской области.

Архивисты Гомельской области от всей души поздравляют Людмилу Николаевну Кислову с юбилеем и желают здоровья, бодрости духа и семейного благополучия, много счастливых дней, уважения, любви и понимания близких людей.

— ◊ —

*А. М. Грыневіч*

## ДА 90-ГОДДЗЯ КАЦЯРЫНЫ ПЯТРОЎНЫ МІХАЙЛАВАЙ

10 жніўня 2015 г. Кацярыне Пятроўне Міхайлавай, аднаму з самых старэйшых і заслужаных ветэранаў архіўнай справы, споўнілася 90 гадоў.

Нарадзілася Кацярына Пятроўна 10 жніўня 1925 г. у сяле Барысава Бабаеўскага раёна Валагодскай вобласці (Расія). Гісторык, архівіст. З сям'і служачага. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1943 г. працавала піянерважатай у Барысаўскім дзіцячым доме. Скончыла гістарычны факультэт Ленінградскага педінстытута ў 1949 г. Была накіравана ў архіўны аддзел МУС па Ленінградскай вобласці, дзе працавала інспекта-

рам. З 1950 г. па 1951 г. выкладала гісторыю ў Старaладажскай сярэдняй школе, з 1951 г. па 1955 г. — у Чырвонабярэжскім тэхнікуме механізацыі сельскай гаспадаркі Жлобінскага раёна Гомельскай вобласці. З 1955 г. па 1957 г. працавала настаўнікам гісторыі ў Свяцілавіцкай сярэдняй школе Веткаўскага раёна Гомельскай вобласці.

З 1 верасня 1957 г. — навуковы супрацоўнік АУ МУС БССР, з 8 лютага 1958 г. па 31 снежня 1963 г. — навуковы супрацоўнік Дзяржархіва Мінскай вобласці, з 1 студзеня 1964 г. па 12 красавіка 1968 г. — навуковы супрацоўнік ЦДГА БССР у г. Мінску, з 12 красавіка 1968 г. — інспектар аддзела навуковага выкарыстання і інфармацыі, старшы інжынер арганізацыйна-метадычнага аддзела Галоўархіва пры Савеце Міністраў БССР. 1 кастрычніка 1976 г. прызначана намеснікам дырэктара ЦДАКФФД БССР. З 1 лістапада 1983 г. на пенсіі.

За асабісты ўклад у развіццё архіўнай справы Кацярына Пятроўна неаднаразова была ўзнагароджана падзякамі і граматамі. Кацярына Пятроўна — чалавек высокай культуры, выдатны арганізатар, сапраўдны майстар сваёй прафесіі.

Калектыў Беларускага дзяржаўнага архіва кінафотафонадакументаў віншуе Кацярыну Пятроўну Міхайлаву з юбілеем. Жадаем моцнага здароўя, натхнення і доўгіх гадоў жыцця.

— ◊ —

**_Р. Ф. Горячева_**

## ПАМЯТИ АРХИВИСТА.
## ОЛЬГА НИКОЛАЕВНА СИНИЦИНА (1930—2009)

В этом году исполнилось бы 85 лет бывшему сотруднику Национального исторического архива Беларуси в г. Гродно Ольге Николаевне Синициной.

33 года — эту немалую часть своей жизни — она отдала архивной работе. Но этой части жизни предшествовал другой жизненный отрезок, события которого приближали ее к еще нечетко видимой, маячившей где-то на далеком горизонте, мечте. А начиналось все с тяжелого детства.

Ольга Николаевна родилась 22 июня 1930 г. в Гомеле в семье рабочих. В 1940 г. семья, состоявшая из шести человек (у родителей было четыре дочери), переехала в Гродно, а через год город был оккупирован фашистами. Годы оккупации и сопровождавшие их нужда, голод, унижения оставили неизгладимый след в памяти маленькой Оли. До конца своих дней Ольга Николаевна вспоминала эти трагические события, собирала сведения о них, сопоставляла факты, и в конечном итоге написала воспоминания о судьбе жителей деревни Княжеводцы, которые были опубликованы в периодической печати. И сейчас, в год 70-летия Великой Победы, особо остро ощущаются воспоминания очевидца событий тех страшных лет.

*«… Гродно был оккупирован на второй день войны. Начались годы бесправного, унизительного, полуголодного существования. Все годы оккупации были закрыты школы, дети не учились. Все взрослое население и подростки обязаны были работать за гроши и хлебную карточку, на воскресенье хлеб не полагался. Жили впроголодь, как рабы. Был введен комендантский час с 22 часов до 6 утра.*

*Ранней весной 1943 г. из деревни к нам приехал брат отца и в разговоре с отцом упомянул, что в деревне некому пасти скот: корову и бычка. Услышав это, я стала просить дядю взять меня пастушкой. Дядя стал меня отговаривать: «надо будет очень рано вставать, пасти скот в любую погоду, что я этим никогда не занималась». Но я его упросила, и он согласился взять меня в деревню. Мне тогда шел тринадцатый год.*



*На пятый день войны, во время боя, сгорел дом дяди. Под жилье приспособили часть хлева, вставили раму, поставили печь.*

*После дойки и завтрака я угоняла корову и бычка на пастбище, которое находилось очень далеко от дома и принадлежало имению Черлена. За пастьбу надо было вносить плату в имение. В один из дней я пригнала корову на дневную дойку, дядя вывел меня на дорогу и рукой показал в сторону Скиделя, там полыхало огромное пламя. Горели дома в деревне Пузовичи, все жители были расстреляны, немцы не отпустили даже родственников, приехавших из других деревень на свадьбу. Это произошло 14 июля 1943 г. После этой страшной трагедии многие жители деревни Княжеводцы уходили к родственникам и знакомым в другие деревни. Но наступило время уборки урожая, и люди стали возвращаться домой. Этим и воспользовались немецкие палачи.*

*23 июля я проснулась очень рано от шума машин, проезжавших мимо дворов по проселочной дороге. Дядя с женой уже не спали и все время разговаривали, глядя в окно. Мимо нашего двора стали проходить немцы, каждый из них сопровождал семью. Женщин и детей размещали в одном гумне, мужчин — в другом. Моя тетя предложила мне, на всякий случай, спрятаться в несжатой ржи, а дядя дал денег на билет и сказал, чтобы я шла на железнодорожную станцию Черлена. Когда я подошла к перекрестку — увидела оцепление, немецкие солдаты стояли с автоматами, тут же стояло несколько грузовых машин с ящиками. Идти дальше мне не разрешили. Я остановилась у забора дома, из которого жителей уже увели в гумно. К машинам подходили немцы за ящиками. Всем им, проходящим мимо меня, я говорила, что из Гродно, но никто не обращал на меня никакого внимания. Я уже чувствовала, что с Княжеводцами произойдет то же, что произошло с Пузовичами. Я не плакала, но все время думала о том, как меня будут расстреливать, как я буду умирать.*

*Прошло много времени, высоко поднялось солнце, и вдруг от машины отошел военный и рукой поманил меня. Я подошла к нему, и он спросил: «Паненка из Гродно?». Я ответила утвердительно, после чего он провел меня мимо машин, вывел на дорогу и сказал, чтобы я шла не оглядываясь. Я пошла в имение Черлена, где жила моя тетя с семьей. Она все время стояла на коленях в Черленской церкви и молилась за спасение брата, его жены и всех жителей деревни.*

*Через несколько часов на попутной подводе я уехала в Гродно.*

*В этот же день моя мама узнала о том, что произошло в Княжеводцах. От Гродно до Княжеводцев 48 километров, и мама побежала за мной. В Черленах от моей тети она узнала о том, что я уехала в Гродно. Не выпив даже стакана воды, мама побежала обратно в Гродно, и когда она увидела меня живой, радости не было конца.*

*Моего дядю и его жену немцы расстреляли, две семьи соседей дяди, которые спрятались во ржи, немцы расстреляли тоже. Всего в деревне Княжеводцы было сожжено 152 дома, зверски уничтожено и погребено 922 человека. Перед своим отступлением, в июне 1944 г., немцы привезли из Гродненской тюрьмы заключенных и заставили их отрыть могилы. Заметая следы своих преступлений, сожгли все трупы».*

Познав цену человеческой жизни, Ольга Николаевна часто повторяла фразу, которая отвечала ее жизненной позиции: *«Все, что угодно, можно пережить, только бы не было войны»*.

В 1944 г. Оля поступила в третий класс общеобразовательной школы и окончила шесть классов. Дальнейшее продолжение учебы не представлялось возможным, так как надо было зарабатывать свой хлеб и помогать семье. В 1947 г. она поступила на работу в гродненский универмаг, но денег в семье хронически не хватало, и в 1949 г. Ольга Нико-

лаевна уехала по вербовке в Петрозаводск, где работала кухонным контролером в кафе. Все это время ее не покидала мысль о завершении образования, и там же, в Петрозаводске, в школе рабочей молодежи она закончила седьмой и восьмой классы. Вернувшись в Гродно в 1952 г., от старшей сестры Галины, работавшей в филиале ЦГИА БССР в г. Гродно, узнала, что в архиве имеется вакантная должность архивариуса, и без раздумий поступила туда на работу. Работая в архиве, окончила девятый и десятый классы вечерней школы. Ее цель — получить законченное десятилетнее образование — была достигнута.

Работа в архиве поглотила Ольгу Николаевну всецело. История всегда влекла ее, а столкнувшись в работе с архивными документами, отражающими историческое прошлое Гродненщины, и особенно ее родного Гродно, поняла, что архивной ниве посвятит всю свою жизнь. Результатом этого решения стало поступление в 1961 г. на заочное отделение факультета архивного дела Московского историко-архивного института. Старательно постигая основы архивоведения, результат которого более чем успешно отражался в зачетной книжке, в 1967 г. окончила институт. Мечта, которая брезжила на горизонте детства и юности, осуществилась.

За годы работы в архиве Ольга Николаевна прошла путь от архивариуса до старшего научного сотрудника отдела учета документов, информационно-поисковых систем и автоматизированных архивных технологий. Много сил и труда вложила в создание научно-справочного аппарата, комплектование документов, разработку различных методических пособий.

Долгие годы, вплоть до ухода на пенсию, Ольга Николаевна заведовала и занималась сохранением и использованием печатных изданий научно-справочной библиотеки архива. Все годы работы в архиве она проявляла живейший интерес к документам, постоянно делая для себя открытия. Работая с документами, попутно вела записи, связанные с историей родного Гродно, и ее знания о прошлом города не переставали удивлять. Долгие годы поддерживала связь со старожилом города Гродно Андреем Ивановичем Червяковским (работавшим еще до революции делопроизводителем в Гродненском губернском правлении), почерпнув из общения с ним много интересных событий и фактов исторического прошлого Гродно. Кропотливо накапливая краеведческий материал, появилась потребность поделиться им с гродненцами. Так в периодической печати стали появляться ее статьи, которые неизменно отличались живым слогом и одной ей присущим стилем.

Автору этих строк довелось проработать с Ольгой Николаевной с 1976 по 1985 г., и за все годы общения раскрывались такие черты ее характера, как пунктуальность, ответственность, скрупулезность, крайне бережное отношение к архивным документам. Всегда поражало ее доскональное знание архивных фондов, которым она щедро делилась с коллегами. Ольга Николаевна была страстным библиофилом; долгие годы собирая домашнюю библиотеку, она не переставала удивлять своими знаниями классической русской и зарубежной, мемуарной литературы.

Работая архивариусом, мне довелось проводить с Ольгой Николаевной проверку наличия фондов научно-справочной библиотеки, и что меня тогда поразило, так это обширные знания об истории комплектования библиотеки, и самое главное — об авторстве и внутреннем содержании каждого печатного издания.

Заслуженными оценками труда Ольги Николаевны стали награды, среди которых Почетная грамота Верховного Совета БССР, Почетная грамота Архивного управления при Совете Министров БССР. Ей посвящен очерк в библиографическом справочнике «Архівісты Беларусі» (Мінск, 2006).



# РЭЗЮМЭ


**Фёдараў М. Ш.** Да 75-годдзя арганізацыі архіўнай справы ў Заходняй Беларусі.

У артыкуле разглядаюцца арганізацыйныя і прававыя аспекты інтэграцыі архіваў Заходняй Беларусі ў склад Адзінага дзяржаўнага архіўнага фонду як лагічнае завяршэнне пачатых 17 верасня 1939 г. мерапрыемстваў грамадска-палітычнага характару, якія прывялі да ўз'яднання заходніх рэгіёнаў Беларусі ў адзінай беларускай савецкай дзяржаве. Адзначаецца незавершанасць працэсу інтэграцыі ў сувязі з пачаткам Вялікай Айчыннай вайны, падчас якой заходнебеларускія архівы панеслі значныя страты, якія працягваюць сказвацца да гэтага часу.

**Афанасьева Таццяна Юр'еўна**. Нацыянальны гістарычны архіў Беларусі ў г. Гродна (да гісторыі стварэння і станаўлення).

Са стварэннем Гродзенскага губернскага праўлення ў 1802 г. быў заснаваны і яго архіў, які паклаў пачатак дзейнасці сённяшняга архіва, нягледзячы на тое, што афіцыйнай датай утварэння Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі ў г. Гродна з'яўляецца 11 лютага 1940 г. У 40—60-я гг. XX ст. фонды архіва папаўняліся дакументальнымі матэрыяламі з архіваў СССР. У пачатку XXI ст. архіў прымаў дакументы рэлігійных устаноў, з аддзелаў ЗАГС Гродзенскай і Брэсцкай абласцей. У жніўні 2014 г. архіў цалкам пераехаў у новы будынак.

**Карапузава Ганна Генадзьеўна**. Дзяржаўны архіў Брэсцкай вобласці: гісторыя, развіццё, кадры (1940—2015 гг.).

Артыкул прадстаўляе кароткі нарыс гісторыі заснаванага ў 1940 г. Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці.

**Шэршань Вольга Іванаўна**. Юбілей Баранавіцкага архіва.

Артыкул прадстаўляе кароткі нарыс гісторыі заснаванага ў 1940 г. Дзяржаўнага архіва Баранавіцкай вобласці, які з 1996 г. называецца Занальным дзяржаўным архівам у г. Баранавічы.

**Адамовіч Аксана Уладзіміраўна.** Шлях даўжынёй у 75 гадоў (да юбілею ўстановы «Занальны дзяржаўны архіў у г. Маладзечна»).

Артыкул прадстаўляе кароткі нарыс гісторыі заснаванага ў 1940 г. Дзяржаўнага архіва Віленскай вобласці, які з 1996 г. называецца Занальным дзяржаўным архівам у г. Маладзечна.

**Стэфановіч Марына Міхайлаўна**. Архіўная служба горада Пінска адзначае сваё 75-годдзе.

Артыкул прадстаўляе кароткі нарыс гісторыі заснаванага ў 1940 г. Дзяржаўнага архіва Пінскай вобласці, які з 1996 г. называецца Занальным дзяржаўным архівам у г. Пінску.

**Пазднякоў Валерый Сямёнавіч**. «Беларускаму археаграфічнаму штогодніку» 15 гадоў.

У артыкуле аналізуюцца гісторыя і змест «Беларускага археаграфічнага штогодніка» за 2000—2014 гг.

**Козак Кузьма Іванавіч**. Фонды архіваў і музеяў аб германскай акупацыі Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны 1941—1944 гг.

Артыкул асвятляе архіўныя і музейныя фонды ў Беларусі і за мяжой, у якіх утрымліваюцца матэрыялы аб германскай акупацыі Беларусі ў 1941—1944 гг. Зроблены аналіз паўнаты і рэпрэзентатыўнасці гэтых фондаў, а таксама ступені захаванасці

дакументальных комплексаў германскіх органаў улады і вайсковых частак, якія дзейнічалі на акупаванай тэрыторыі Беларусі.

**Кулінок Святаслаў Валянцінавіч**. Гістарыяграфія разведвальнай дзейнасці беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны.

Артыкул прысвечаны даследванню гістарыяграфіі па разведвальнай дзейнасці беларускіх партызан у перыяд Вялікай Айчыннай вайны. Аўтар вывучае навуковыя працы па гэтым пытанні, аналізуе дасягненні, недахопы і перспектывы даследавання тэмы.

**Трацціяк Алена Іванаўна**. Аднаўленне мірнага жыцця ў БССР у 1944—1945 гг. у сюжэтах кіначасопіса «Савецкая Беларусь».

Дадзены артыкул адлюстроўвае аднаўленне ўсіх сфер мірнага жыцця БССР: эканамічнай, грамадска-палітычнай і культурнай у 1944—1945 гг. на прыкладзе сюжэтаў кіначасопіса «Савецкая Беларусь».

**Вайтовіч Сяргей Уладзіміравіч**. Крыніцы па падаткаабкладанні сялянскіх гаспадарак БССР у 1920-х гг.

Разглядаюцца крыніцы па падаткаабкладанні вёскі ў 1920—1930-х гг. Даецца характарыстыка некаторых відаў крыніц: заканадаўчых, масавых, матэрыялаў справаводства. Даецца выснова, што важнасць аналізу заканадаўчых крыніц тлумачыцца неабходнасцю разумення падатковага механізму, паўнаты паўнамоцтваў работнікаў фіску, а таксама справаздачнасці, што фарміруецца падчас падатковай кампаніі, што акрамя матэрыялаў, якія тычацца непасрэдна налічэння, выплаты падаткаў, існавалі матэрыялы, да прыкладу, уліку крыніц абкладання, якія могуць быць не менш карыснымі для аналізу сацыяльна-эканамічнага развіцця вёскі, чым канчатковыя лічбы паступлення падаткаў.

**Мальцаў Уладзімір Валер'евіч**. Беларускі тэатр у адлюстраванні нямецкага друку перыяду Першай сусветнай вайны.

На матэрыяле публікацый пра беларускі тэатр перыяду Першай сусветнай вайны выяўляюцца асноўныя, прынятыя нямецкімі выданнямі параметры этнічнай ідэнтыфікацыі культуры беларусаў і селекцыйныя крытэрыі адбору фактаў для мадэлявання самастойнай гісторыі беларускай сцэны.

**Назаранка Арцём Міхайлавіч, Смалякова Кацярына Віктараўна**. Мінскі губернскі камітэт Усерасійскага земскага саюза: арганізацыйныя аспекты дзейнасці.

Артыкул прысвечаны выяўленню і характарыстыцы статусу, напрамкаў дзейнасці, падведамнай сеткі, парадку арганізацыі работы, кадраваму і фінансаваму забеспячэнню дзейнасці Мінскага губернскага камітэта Усерасійскага земскага саюза. Выяўлены і ўдакладнены звесткі аб розных баках дзейнасці камітэта. Паказаны асаблівасці дзейнасці камітэта, абгрунтоўваецца думка аб дзяржаўным характары яго дзейнасці.

**Матвейчык Дзмітрый Часлававіч**. Манаграфія Усевалада Ігнатоўскага «1863 год на Беларусі: нарыс падзей»: спроба крытычнага аналізу.

У артыкуле робіцца спроба аналізу адной з найбольш значных прац па гісторыі паўстання 1863—1864 гг. у Беларусі беларускага гісторыка Усевалада Ігнатоўскага, выдадзеная ў 1930 г. Вызначаюцца моцныя і слабыя бакі манаграфіі, даецца ацэнка мэтазгоднасці абранай структуры, паўнаце комплексаў прааналізаваных крыніц, выкарыстанай метадалогіі і тэрміналогіі, а таксама ўкладу ў айчынную гістарыяграфію ў цэлым. Даюцца рэкамендацыі па яе выкарыстанні ў далейшых навуковых распрацоўках.

**Шумейка Міхаіл Фёдаравіч**. Ад «Бѣлорусскаго архива древнихъ грамотъ» І. Грыгаровича да «Беларускага архіва» М. Доўнар-Запольскага і Д. Даўгялы: да 90-годдзя стварэння Гісторыка-археалагічнай (Археаграфічнай) камісіі Інстытута беларускай культуры.



У артыкуле разглядаюцца генезіс і першыя крокі эдыцыйнай археаграфіі ў Беларусі ў першай трэці XIX ст., а таксама захаванне яе традыцый у БССР. У складзе Інстытута беларускай культуры ў 1925 г. была створана Гісторыка-археалагічная (Археаграфічная) камісія. Яе члены разгарнулі актыўную эдыцыйную дзейнасць, надаўшы ёй нацыянальны характар, пры гэтым яны абапіраліся на досвед і традыцыі мінулых гадоў. Асноўнае серыйнае выданне камісіі «Беларускі архіў», якое пачало выходзіць з другой паловы 1920-х гг., азначала захаванне, працяг і развіццё ў Беларусі археаграфічных традыцый, закладзеных стагоддзем раней першым беларускім археаграфічным зборнікам «Беларускі архіў старажытных грамат», падрыхтаваным гомельскім протаіерэем Іаанам Грыгаровічам.

**Бараненка Віктар Віктаравіч**. Дакументы Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Полацку як крыніцы па гісторыі праваслаўнай царквы 1920—1930-х гг.

У артыкуле разглядаецца спецыфіка, структура і інфармацыйны склад выяўленых аўтарам дакументаў па гісторыі Рускай праваслаўнай царквы, якія захоўваюцца ў фондах Занальнага дзяржаўнага архіва ў г. Полацку. Зроблена спроба сістэматызацыі комплексаў дакументаў па паходжанні (дзяржаўна-партыйныя і царкоўныя) і па відах дакументаў. Паказаны іх спецыфічныя асаблівасці, адзначаны найбольш каштоўныя дакументы. Акцэнтуецца ўвага на ўнікальнасці і разнастайнасці змешчанай у іх інфармацыі.

**Клімаў Ігар Паўлавіч**. Спецыфіка рэлігійнай камунікацыі ў сферы пісьменства (на аснове тэкстаў хрысціянства).

Артыкул прысвечаны асноўным паняццям і этапам камунікацыі паміж чалавекам і сакральным, наколькі такі працэс можна ўявіць паводле больш-менш аб'ектыўных даных. У артыкуле разглядаюцца кампаненты і ўмовы сакральнай і рэлігійнай камунікацыі, а таксама асноўныя агрэгаты і стадыі развіцця рэлігійнага пісьменства. Асноўная ўвага нададзена азначэнню і спецыфіцы сакральных тэкстаў. У беларускай навуцы такая тэма ўздымаецца ўпершыню.

**Віба Ірына Мікалаеўна, Раздорскі Аляксей Ігаравіч**. «Звесткі або Апісанні цэркваў Магілёўскай епархіі» 1832 года (крыніцазнаўчая характарыстыка).

У артыкуле прадстаўлена падрабязная крыніцазнаўчая і археаграфічная характарыстыка ўнікальнага рукапісу 1832 г. «Звесткі або Апісанні цэркваў Магілёўскай епархіі», якая захоўваецца ў Расійскім дзяржаўным гістарычным архіве. Прыведзены таксама агульныя звесткі аб складанні апісанняў розных епархій Рускай праваслаўнай царквы ў 1830—1850-я гг. У дадатку да артыкула змешчаны роспіс зместу магілёўскага рукапісу.

**Брэгер Герман Максімавіч, Лінская Ларыса Антонаўна**. Архіў Слуцкага Трайчанскага Свята-Траецкага манастыра (т. 2: дакументы 164—279 за 1762—1776 гг.).

Чарговая публікацыя дакументаў Архіва Слуцкага Трайчанскага Свята-Траецкага манастыра за 1762—1776 гг. асвятляе гісторыю манастыроў і цэркваў Слуцкай праваслаўнай архімандрыі, складанасці існавання праваслаўнай царквы ў ВКЛ у гэты перыяд, узаемаадносіны святароў і іерархаў розных канфесій і свецкіх асоб, сацыяльна-эканамічную гісторыю паселішчаў рэгіёна.

**Лаўрык Юрый Мікалаевіч**. Крыніцы трактата Сільвестра Косава «Дідаскалія альбо Наука о седми Сакраментах».

У артыкуле разглядаюцца крыніцы, якімі карыстаўся беларускі пісьменнік і царкоўны дзеяч XVII ст. Сільвестр Косаў пры падрыхтоўцы «Дыдаскаліі» — першага

айчыннага трактата па праваслаўнай сакраманталогіі. Вывучэнне заходнееўрапейскіх і польскіх тэалагічных выданняў XVI — першай трэці XVII ст. паказала, што асноўнай крыніцай для працы Косава паслужыла кніга былога рэктара Віленскай езуіцкай акадэміі Пятра Скаргі — «Kazania o Siedmiu Sakramentach Kościoła Katolickiego». Параўнанне тэкстаў «Дыдаскаліі» і «Kazań» сведчыць, што Косаў запазычыў з гэтай кнігі для свайго трактата істотную частку матэрыялу, які перапрацаваў у рэчышчы праваслаўнай традыцыі, а таксама дапоўніў спасылкамі на дакументы кананічнага права Усходняй царквы і на творы грэчаскіх айцоў.

**Макіенка Аляксей Анатольевіч**. Праблемы захаванасці дакументальнай спадчыны ў дзейнасці Асаблівай Усеўкраінскай архіўнай камісіі (1920—1922 гг.).

У артыкуле разгледжаны праблемы функцыянавання Асаблівай Усеўкраінскай архіўнай камісіі ў кантэксце макулатурнай кампаніі ў архівах Украіны, санкцыянаванай органамі савецкай улады ў пачатку 1920-х гг. Аўтарам прааналізаваны абставіны і перадумовы стварэння камісіі, вызначаны арганізацыйныя прылады, задачы, асноўныя напрамкі работы АУАК і яе мясцовых органаў, а таксама выяўлены фактары, якія паўплывалі на выніковасць іх дзейнасці. Асаблівая ўвага нададзена ўсталяванню ролі Асаблівай Усеўкраінскай архіўнай камісіі ў забеспячэнні захаванасці архіўных каштоўнасцей у рэгіёнах Украіны.

**Самахвалаў Дзмітрый Сяргеевіч**. Архівы «вуснай» гісторыі ў ЗША.

У першыя дзесяцігоддзі свайго развіцця як напрамку даследаванняў «вусная» гісторыя разглядалася ў ЗША ў якасці даступнай альтэрнатывы працы з пісьмовымі дакументамі. Аднак паступленне вялікага аб'ёму інфармацыі спараджае праблемы ў яе далейшым захаванні і выкарыстанні.

**Злобін Сяргей Сяргеевіч**. Паняцце «мяжа» як аснова посткаланіяльнага павароту ў індалогіі.

У артыкуле разглядаецца, як у рамках посткаланіяльнага павароту ў індалогіі развіваецца крытыка меж найважнейшых аб'ектаў гісторыі і культуры Індыі, якія прадпісваюцца цывілізацыйным падыходам. Падкрэсліваецца, што асновай гэтай крытыкі з'яўляецца прызнанне сувязі паходжання гэтых меж з рэалізацыяй уладных інтэнцый брытанскіх каланізатараў, якія выкарыстоўвалі такія катэгорыі як «каста», «канчына Індыі», «санскрыт» для канструявання Індыі як экзатычнага Іншага для Брытаніі, далёкага і незразумелага. Асаблівая ўвага надаецца тэхніцы апісання аўтарамі, якія знаходзяцца пад уплывам посткаланіялізму, канструявання сучаснага разумення аб'ектаў гісторыі і культуры Індыі ў каланіяльным кантэксце. Таксама вылучаецца прынцыповая немагчымасць пабудовы ў рамках посткаланіяльнага павароту якой-небудзь альтэрнатывы дыскурсу гісторыі і культуры Індыі, які ўзнік у эпоху каланіялізму, па прычыне ўзаемасувязі посткаланіялізму з постмадэрнізмам і адсутнасцю ўсялякіх прэтэнзій на адзіную пануючую ідэю.

**Латушкін Андрэй Мікалаевіч**. Аб гісторыі ўключэння грамат і актаў дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага ў склад архіва Нясвіжскай ардынацыі князёў Радзівілаў у другой палове XVII ст.

Аўтар разглядае гісторыю часткі дзяржаўнага архіва Вялікага Княства Літоўскага. У яе ўваходзілі 4 групы актаў: 1) прывілеі на правы і свабоды землеўладальнікаў (шляхты) ВКЛ; 2) акты уній ВКЛ і Каралеўства Польскага; 3) пагадненні аб міры паміж ВКЛ і Маскоўскай дзяржавай, Малдавіяй; 4) граматы рымскіх пап, што былі дадзены вялікім князям літоўскім на адпушчэнне грахоў і іншыя прывілеі. Аўтар разглядае новыя крыніцы, якія асвятляюць гісторыю ўключэння гэтых дакументаў у склад архіва



Нясвіжскай ардынацыі Радзівілаў у другой палове XVII ст. (пры жыцці князёў Міхала Казіміра Радзівіла (1635—1680) і яго жонкі Кацярыны з Сабескіх Радзівіл (?—1694). Аўтар выказвае меркаванне, што першапачаткова гэтай часткай архіва завалодалі князі Януш (1612—1655) і Багуслаў (1620—1669) Радзівілы. У артыкуле публікуецца вопіс дадзенай часткі дзяржаўнага архіва ВКЛ 1685 г. — як часткі архіва Кацярыны Радзівіл. Ён захоўваецца ў складзе Галоўнага архіва старажытных актаў у Варшаве.

**Антановіч Зінаіда Васільеўна**. Інвентар Лазавіцкага рымска-каталіцкага касцёла за 1864 г.

У артыкуле публікуецца інвентар Лазавіцкага касцёла Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні, складзены падчас прыёму-перадачы яго маёмасці ад пробашча Ф. Тамашэўскага, які высылаўся па загадзе дзяржаўных улад па палітычных матывах пасля паўстання 1863—1864 гг. у Пермскую губерню пад нагляд паліцыі, ксяндзу Я. Даўгялу. У прадмове вылучаны шэраг асаблівасцей складання гэтага віду дакументаў, прымяняльна да прыёму-перадачы маёмасці, звязаных з афармленнем інвентара, а таксама яго структурай і зместам.

# РЕЗЮМЕ

**Федоров М. Ш.** К 75-летию организации архивного дела в Западной Беларуси.

В статье рассматриваются организационные и правовые аспекты интеграции архивов Западной Беларуси в состав Единого государственного архивного фонда как логическое завершение начатых 17 сентября 1939 г. мероприятий общественно-политического характера, которые привели к воссоединению западных регионов Беларуси в едином белорусском советском государстве. Отмечается незавершенность процесса интеграции в связи с начавшейся Великой Отечественной войной, в ходе которой западнобелорусские архивы понесли значительные потери, продолжающиеся сказываться до сих пор.

**Афанасьева Татьяна Юрьевна**. Национальный исторический архив Беларуси в г. Гродно (к истории создания и становления).

С учреждением Гродненского губернского правления в 1802 г. был создан и его архив, который положил начало деятельности современного архива, несмотря на то, что официальной датой образования Национального исторического архива Беларуси в г. Гродно является 11 февраля 1940 г. В 40—60-е гг. XX в. фонды архива пополнялись документальными материалами из архивов СССР. В начале XXI в. архив принимал документы религиозных учреждений, из отделов ЗАГС Гродненской и Брестской областей. В августе 2014 г. архив полностью переехал в новое здание.

**Карапузова Анна Геннадьевна**. Государственный архив Брестской области: история, развитие, кадры (1940—2015 гг.).

